FUNDAMENTAL

BYELORUSSIAN

BOOK 2

V. PASHKIEVICH

БЕЛАРУСКАЯ

МОВА

FUNDAMENTAL
BYELORUSSIAN

BOOK 2

V. PASHKIEVICH

EDITED BY

A. ADAMOVICH

БЕЛАРУСКАЯ

МОВА

TORONTO 1978

FROM THE PUBLISHING COMMITTEE

"FUNDAMENTAL BYELORUSSIAN" Book 2 like Book 1 has been published by the Byelorussian Community in Canada with the assistance of the Canadian Federal Government which, through the Canadian Citizenship Branch of the Department of the Secretary of State, contributed $9,000.00 towards the completion of this textbook.

We express our most sincere gratitude to the Secretary of State, and to all Byelorussians who with their generous support made possible the conclusion of our project.

Particular acknowledgement and appreciation should also be extended to the author, editors, proofreaders, and to those involved in fund raising to cover the publication costs of this book. All these persons voluntarily contributed their time and efforts with the objective of producing, at long last, a badly needed bilingual textbook of the Byelorussian language.

THE PUBLISHING COMMITTEE
Byelorussian-Canadian Coordinating Committee

АД ВЫДАВЕЦТВА

Гэтая кніга — другая й апошняя частка падручніка **"FUNDAMENTAL BYELORUSSIAN"** — "БЕЛАРУСКАЯ МОВА". Яна, як і першая частка, выдадзеная за грошы беларускага грамадзтва ды пры дапамозе (у суме 9,000 далараў) Канадзкага фэдэральнага ўраду **(The Canadian Citizenship Branch).**

Гэтта выказваем нашую шчырую падзяку Дзяржаўнаму Сакратару Канады, як і беларускаму грамадзству за іхнае падтрыманьне ды шчодрую дапамогу.

На асабліва вялікае прызнаньне заслугоўваюць аўтар і рэдактары, а таксама карэктары ды зьбіральнікі фінансавых сродкаў на выданьне кнігі, што ўсю нялёгкую карплівую працу ўкладалі бескарысьліва з надзеяй на адзіную заплату, што будзе ўрэшце выдадзены гэтак канечна патрэбны двумоўны падручнік беларускае мовы.

ВЫДАВЕЦКІ КАМІТЭТ
пры Каардынацыйным Камітэце Беларусаў Канады

Printed by
HARMONY PRINTING LTD.
3194 Dundas St. W., Toronto, Ont., Canada, M6P 2A3

FOREWORD

"FUNDAMENTAL BYELORUSSIAN", the first textbook of its kind, is intended not only to provide the student with information on the fundamentals of Byelorussian grammar and to develop his or her skill in reading and writing, as well as his or her fluency in oral self-expression and aural comprehension, but also to assist those interested in teaching, research, or advanced study of Byelorussian. For this purpose grammatical terminology and the formulation of rules is presented in both English and Byelorussian.

ORGANIZATION OF MATERIAL

Book 2, the final part of "FUNDAMENTAL BYELORUSSIAN", is a continuation of Book 1. It contains units 19 — 29 and is divided into two sections: Section IV and Section V.

Each unit has the same structure as those in Book 1, i.e.:

1. A story for reading supplemented by a vocabulary.
2. A section on grammar consisting of:
   a) rules of pronunciation and spelling which are indicated by the Byelorussian letter "Ф" in the text, and
   b) rules of inflection and word-formation.
3. Exercises for written and oral work.

ORGANIZATION OF THE APPENDIX

Following the text there is a comprehensive appendix which contains:

1) grammatical tables summarizing the declensions of nouns, adjectives, and pronouns, as well as the conjugations of verbs, and tables of numerals; and
2) Byelorussian-English and English-Byelorussian vocabularies covering new words which have been used in Book 2, as well as some of those found in Book 1 but not included in its vocabulary.

The Byelorussian-English vocabularies of both books provide useful grammatical references, such as the gender and genitive ending of all nouns, the present tense and perfective future forms of verbs, and others.

The author wishes to express once more her deepest appreciation to all those who with their encouragement, and financial and academic assistance made possible the appearance of this textbook. Particular thanks are due to the editor of the book prof. Anthony Adamovich, to Dr. Vincent Zuk-Hryskievic, Dr. Vitaut Tumash, Dr. Raisa Zuk-Hryskievic, and Mr. U. Rusak for their special contributions.

Valentyna Pashkievich

ПРАДМОВА

Кніга "FUNDAMENTAL BYELORUSSIAN" — "БЕЛАРУСКАЯ МОВА", — гэта першы й дагэтуль адзіны двумоўны беларуска-ангельскі падручнік беларускае мовы, і затым, як ужо было адзначана ў прадмове да першае часткі, яна ўкладзеная шырэй, як для ўжытку толькі вучняў. Кніга мае быць таксама дапаможнікам для настаўнікаў ды тых, хто зацікаўлены ў грунтаўнейшым вывучэньні ды пазнаньні беларускае мовы. Дзеля гэтага граматычныя правілы пададзеныя ў ёй ня толькі паангельску, але й пабеларуску.

Арганізацыя матар'ялу

Кніга другая становіць працяг кнігі першай. У ёй зьмешчаныя IV і V разьдзелы, разам адзінаццаць кругоў (19—29). Матар'ял у кажным крузе, як і ў першай кнізе, падзелены на тры часткі:

1. Апавяданьне на чытаньне із слоўнікам новых словаў.

2. Граматычныя правілы, зь якіх фанэтычныя абазначаныя літарай "Ф", іншыя правілы — з марфалёгіі.

3. Практыкаваньні, вусныя й пісьмовыя, на засваеньне новапададзеных правілаў.

Дадатак

Пры канцы кнігі зьмешчаны дадатак, у які ўвайшлі:

1. Граматычныя табліцы, г. зн. табліцы скланеньняў назоўнікаў, прыметнікаў, займеньнікаў, табліцы спражэньняў дзеясловаў ды табліцы лічэбнікаў.

2. Беларуска-ангельскі ды ангельска-беларускі слоўнікі новых словаў з другое кнігі ды некаторых словаў зь першае, асабліва тых, што ня ўведзеныя ў слоўнік першае кнігі.

Яшчэ раз шчыры дзякуй усім, хто чым-колечы, матар'яльна ці дапамогай у працы над кнігай, спрычыніўся да выданьня гэтага падручніка. Асабліваю-ж мая падзяка рэдактару кнігі праф. Антону Адамовічу, дактаром Вінцэнту й Раісе Жук-Грышкевічам, др. Вітаўту Тумашу ды за выкананьне карты — сп. Уладзімеру Русаку.

Валентына Пашкевіч

Toronto. The Byelorussian flag white-red-white is flown at the Toronto City Hall during Byelorussian Week to honour Byelorussian Independence Day, March 25th

CONTENTS / ЗЬМЕСТ

Page

FROM THE PUBLISHING COMMITTEE / **АД ВЫДАВЁЦТВА** II
FOREWORD III
ПРАДМОВА IV
CONTENTS / ЗЬМЕСТ VI
TABLE: Byelorussian Alphabet—print and script XII

SECTION IV / РАЗЬДЗЕЛ IV

UNIT 19 / КРУГ 19

Я жыву́ ў сталі́цы 1

19—I The Dative Plural of Nouns / **ДАВА́ЛЬНЫ СКЛОН НАЗОЎНІКАЎ, множны лік** 3
19—II The Locative Plural of Nouns / **МЁСНЫ СКЛОН НАЗОЎНІКА́Ў, множны лік** 3
19—III Verbs of Motion / **ДЗЕЯСЛОВЫ РУ́ХУ** 4
19—IV Actual and Habitual Forms of Verbs / **ПРАЦЯ́ЖЛІВАЯ І ПАЎТОРЛІВАЯ ФОРМА ДЗЕЯСЛОВАЎ: ісьці́ — хадзі́ць éхаць — éзьдзіць** 4
19—V Conjugation of Some Actual and Habitual Verbs / **СПРАЖЭНЬНЕ** дзеясловаў: **ісьці́ — хадзі́ць; éхаць — éзьдзіць; бе́гчы — бе́гаць; ляце́ць — лётаць; плы́сьці́ — пла́ваць** 6
EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 216 — 223 8
Reading Exercises/ **У аўтабу́се** 12
На чыта́ньне:

UNIT 20 / КРУГ 20

Беларýскія рэкі (паводля Язэпа Лёсіка) 14
20—23Ф Compound Words / **ПРАВАПІС СКЛАДАНЫХ СЛОВАЎ** 16
20—I Declension of Adjectives in the Plural / **СКЛАНЁНЬНЕ ПРЫМЕТНІКАЎ у множным ліку** 17
20—II Three Kinds of Adjectives / **ПРЫМЕ́ТНІКІ ЯКАСНЫЯ, АДНОСНЫЯ** або **АДКАЗНЫЯ И ПРЫНАЛЕЖНЫЯ** 18
20—III **Long and Short Forms of Adjectives / ПРЫМЕ́ТНІКІ ПОЎНЫЯ И КАРОТКІЯ** 19
20—IV Adverbs / **ПРЫСЛОЎІ** 21
20—V GEOGRAPHICAL NAMES AND NAMES OF PERSONS ENDING IN **-оў(аў), -ёў(еў), -ін(ын)** / **СКЛАНЁНЬНЕ ПРОЗЬВІШЧАЎ І ГЕАГРАФІ́ЧНЫХ НАЗОВАЎ НА -оў(аў), -ёў(еў). -ін(ын)** 23
EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 224 — 234 24
Reading Exercises/ На чыта́ньне: **Нава́градак — пе́ршая сталі́ца Вялі́кага Кня́ства Літоўскага** 25

Мар / КА́РТА 28
Supplementary Information about Byelorussia / **ДАВЁДКІ ПРА БЕЛАРУ́СЬ** 30
Сьняжынкі 31
Касьмі́чны экіпа́ж, П. Мака́ль 34
37

UNIT 21 / КРУГ 21

Твар у твар з навýкай (паводля аповесьці Алёны Васілёвіч "Пачака́й, затрыма́йся...") 39
21—24Ф The Changing of Consonants in the Stem / **ЧАРГАВА́НЬНЕ ЗЫЧНЫХ** 45
21—25Ф The Changing of Vowels in the Stem / **ЧАРГАВА́НЬНЕ ГАЛОСНЫХ** 46
21—I Degrees of Comparison. The Comparative of Adjectives / **СТУПЁНІ ПАРАЎНА́НЬНЯ. ВЫШЭЙШАЯ СТУПЕНЬ ПРЫМЕ́ТНІКАЎ** 47
21—II The Superlative of Adjectives / **НАЙВЫШЭЙШАЯ СТУПЁНЬ ПРЫМЕТНІКАЎ** 50
21—III The Comparative and Superlative of Adverbs / **ВЫШЭЙШАЯ И НАЙВЫШЭЙШАЯ СТУПЁНІ ПРЫСЛОЎЯЎ** 52
21—IV Ordinal Numerals / **ПАРА́ДКАВЫЯ ЛІЧЭБНІКІ: 1 — 20** 54
EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 235 — 243 56
Reading Exercises/ На чыта́ньне: **Госьць,** П. Варанько 57
Сарочыны блі́нцы, Васіль Вітка 61

UNIT 22 / КРУГ 22

Славя́не 62
22—I Suffixes in Adjectives / **ПРА́ВАПІС СУ́ФІКСАЎ У ПРЫМЕ́ТНІКАХ: -н-; -енн-, -энн-; -еньк-, -эньк-(-аньк-); -ск-** 64
22—II Compound Adjectives / **ПРА́ВАПІС СКЛАДА́НЫХ ПРЫМЕ́ТНІКАЎ** 66
22—III Adjectives Used as Nouns / **ПРЫМЕ́ТНІКІ Ў РОЛІ НАЗОЎНІКАЎ** 67
22—IV Nouns Ending in / **НАЗОЎНІКІ НА: -і́сты(ая), -ысты(ая)** 68
22—V Declension of Nouns / **РОЗНАСКЛАНЯ́ЛЬНЫЯ НАЗОЎНІКІ** тыпу: **імя́, дзіця́(ё), цялё(я); селянін** and Indeclinable Nouns / **ДЫ НЕСКЛАНЯ́ЛЬНЫЯ**, як **ма́ці, ра́дыё, кіно** 68
22—VI Capitalization of Terms of Nationality / **ПРА́ВАПІС НАЗОЎНІКАЎ І ПРЫМЕ́ТНІКАЎ, што азнача́юць НАЦЫЯНА́ЛЬНАСЬЦЬ** 70
EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 244—253 71
Reading Exercises/ **На́ша Белару́сь,** Я́нка Купа́ла 73
На чыта́ньне:

UNIT 23 / КРУГ 23

Страшное спатка́ньне I (паводля Якýба Коласа) 77
23—I Cardinal and Ordinal Numerals, 21 through 100 / **КОЛЬКАСНЫЯ Й ПАРА́ДКАВЫЯ ЛІЧЭ́БНІКІ 21—100** 79
23—II Declension of Compound Ordinal Numerals / **СКЛАНЁ́НЬНЕ ПАРА́ДКАВЫХ СКЛАДА́НЫХ ЛІЧЭБНІКАЎ** 82
23—III Declension of Cardinal Numerals **1—100** **СКЛАНЁ́НЬНЕ КОЛЬКАСНЫХ ЛІЧЭБНІКАЎ 1—100** 82
23—IV Reciprocal Pronous / **УЗАЁ́МНЫЯ ЗАЙМЕНЬНІКІ: адзі́н (адно) аднаго, адна́ адну́** 85
23—V Declension of **чалаве́к** (man), pl. **лю́дзі** / **СКЛАНЁ́НЬНЕ** назоўніка **"чалаве́к, лю́дзі"** 86
EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 254—261 87
Reading Exercises/ **У старога вераб'я́,** Васіль Ві́тка 87
На чыта́ньне: **Пя́ты,** В. Ві́тка 89
Бу́сел, Максім Танк 91

UNIT 24 / КРУГ 24

REVIEW / **ПАЎТАРЭ́НЬНЕ. Страшное спатка́ньне II (праця́г)** 92
EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 262—264 93
Reading Exercises/ **Ве́льмі "ве́тлівы" Мікі́та...,** Эдзі Агняцьве́т 94
На чыта́ньне:

SECTION V / РАЗЬДЗЁЛ V

UNIT 25 / КРУГ 25

Пача́ткі Таронта 96

25—I Cardinal and Ordinal Numerals: **101 and Above** / **КОЛЬКАСНЫЯ Й ПАРА́ДКАВЫЯ ЛІЧЭБНІКІ: 101 ДЫ ВЫШЭЙ** 100

25—II Declension of Cardinal and Ordinal Numerals **101 and Above** / **СКЛАНЁНЬНЕ КОЛЬКАСНЫХ І ПАРА́ДКАВЫХ ЛІЧЭБНІКАЎ 101 ДЫ ДАЛЁЙШЫХ** 101

25—III Agreement of Cardinal Numerals with Nouns. Dual Forms / **ЗГОДА НАЗОЎНІКАЎ З КОЛЬКАСНЫМІ ЛІЧЭБНІКАМІ. ПА́РНЫ ЛІК** 103

25—IV Possessive Pronouns / **ПРЫНАЛЕ́ЖНЫЯ ЗАЙМЕНЬНІКІ: мой, твой, ягоны, е́йны; свой; на́ш(ы), ва́ш(ы), і́хны, усі́хны** 104

EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 265—271 108

Reading Exercises/ **Дома ўве́чары** 113

На чыта́ньне: **Цягні́кі,** І. Мураве́йка 114

UNIT 26 / КРУГ 26

На крызе (паводля **Я́нкі Ма́ўра**) 115

26—I Collective Numerals / **ЗБОРНЫЯ ЛІЧЭБНІКІ: абодва, абе́дзьве, абое** ды **двое, трое, чацьвёра, пяцёра...** 118

26—II Agreement of Numerals with Verbs / **ЗГОДА ДЗЕЯСЛОВА ЗЬ ЛІЧЭБНІКАМ** 120

26—III Numerals-Fractions / **ДРОБАВЫЯ ЛІЧЭБНІКІ** 121

26—IV Leaving Out the "Ь" Before the Suffix **"-ЧЫК"** / **ВЫПАДА́НЬНЕ "Ь" ПЕ́РАД СУ́ФІКСАМ "-ЧЫК"** 123

26—V Impersonal Verbs Ending in **-цца, -ся** / **БЕЗАСАБОВЫЯ ДЗЕЯСЛОВЫ** на **-цца, -ся,** прыкл.: **здае́цца, здалося** 123

26—VI The Definite Adjective-Pronouns / **АЗНАЧА́ЛЬНЫЯ ЗАЙМЕ́НЬНІКІ: уве́сь, сам, са́мы** 124

26—VII The Reflexive Pronoun **сябе́** (myself, yourself...) / **ЗВАРОТНЫ ЗАЙМЕ́НЬНІК сябе́** 124

EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 272—279 125

UNIT 27 / КРУГ 27

Франьцішак Багушэвіч і ягоныя часы 129
27—26Ф Spelling of Foreign Words / **ПРАВАПІС ІНШАМОЎНЫХ СЛОВАЎ** 132
27—I The Multiplication Table in Byelorussian / **ТАБЛІ́ЦА МНОЖАНЬНЯ ПАБЕЛАРЎСКУ** 137
27—II Indefinite Pronouns / **НЕАЗНАЧА́ЛЬНЫЯ ЗАЙМЕ́НЬНІКІ** 137
27—III Negative Pronouns / **АДМОЎНЫЯ ЗАЙМЕ́НЬНІКІ** 139
27—IV Three Moods of Verbs: Indicative, Imperative and Conditional / **АБВЕ́СНЫ, ЗАГА́ДНЫ І ЎМОЎНЫ лад дзеясловаў** 139
27—V Conditional Mood, Conditional Sentences / **УМОЎНЫ ЛАД. СКА́ЗЫ ЎМОВЫ** 140
27—VI The Particles / **ЧАСЬЦІ́НКІ: не(ня), ні** 143
EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 280—292 145
Reading Exercises/ **Каб я кня́зем быў,** Янка Купа́ла 150
На чыта́ньне:

UNIT 28 / КРУГ 28

Сіняя-сіняя I-II (паводля Ўладзімера Караткéвіча) 153
28—I [illegible] Intransitive Verbs / [illegible] **І НЕПЕРАХОДНЫЯ ДЗЕЯСЛОВЫ** 157
28—II [illegible] Passive Voice of Verbs / **ДЗЁЙНЫ (ВЯРТА́ЛЕЖНЫ) І ЗАЛЕЖНЫ СТАН ДЗЕЯСЛОВАЎ** 158
28—III [illegible] **ДЗЕЯПРЫМЕ́ТНІКІ** 161
28—IV Verbal Adverbs / **ДЗЕЯПРЫСЛО́ЎІ** 164
28—V The Pluperfect Tense and the Future Perfect Tense / **ЗАПРОШЛЫ ЧАС І ПРАДБЎДУЧЫ ЧАС** 168
EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 293—300 169

UNIT 29 / КРУГ 29

Сіняя-сіняя, III (заканчэньне) 174
29—I Dates / **ДА́ТЫ** 177
29—II Expressions of Age / **ВЫРАЗЫ ВЕ́КУ** 178
29—III Time of Day—on the Hour / **ВЫРАЗЫ ЧА́СУ** 179
29—IV The Past Tense of the Verb with the Conjunction **"КАБ"** / **ПРОШЛЫ ЧАС ДЗЕЯСЛОВА З ЗЛЎЧНІКАМ "КАБ"** 180
29—V Punctuation Marks in Byelorussian / **ЗНАКІ́ ПРЫПЫНКУ ПАБЕЛАРЎСКУ** 181
29—VI Some Important Rules for the Use of the Comma in Byelorussian / **ВАЖНЕЙШЫЯ ВЫПАДКІ, КАЛІ́ ТРЭБА СТА́ВІЦЬ КОСКУ** 181
EXERCISES / **ПРАКТЫКАВА́НЬНІ** 301—309 188
Reading Exercises/ **Каторая гадзіна?** 191
На чыта́ньне: **Пе́сня вясьне́,** Я. Колас 192
Доктар Франьцішак Скарына, Сымон Бра́га 193

TABLES / ГРАМАТЫЧНЫЯ ТАБЛІЦЫ

Declension of Nouns / СКЛАНЁНЬНЕ НАЗОЎНІКАЎ 196
Table 1. Masculine Nouns 198
Table 2. Neuter Nouns 200
Table 3. Feminine Nouns 201

Declension of Adjectives / СКЛАНЁНЬНЕ ПРЫМЕТНІКАЎ
Table 4. Hard and Hardened Declension 202
Table 5. Soft Declension 202
Table 6. Mixed Declension 203

Declension of Pronouns / СКЛАНЁНЬНЕ ЗАЙМЕНЬНІКАЎ
Table 7. Personal Pronouns: я, ты, ён, яна́, яно — мы, вы, яны 203
Table 8. Interrogative and Relative Pronouns (+ the Demonstrative Pronoun "такі" and Indefinite Pronouns) 204
Table 9. The Interrogative Pronoun чый? чыя? чыё? and the Definite Pronoun — увёсь, уся́, усё (+ the Possessive Pronouns мой, твой, свой) 205
Table 10. Demonstrative Pronouns (+ the Possessives ягоны, е́йны, наш, ваш, і́хны, усі́хны; the Definite Pronouns уся́кі, ка́жны (кожны), і́ншы; the Interrogative or Relative каторы; the Indefinite некаторы) 205
Table 11. Definite Pronouns: сам, сама́, само, са́мі; са́мы, са́мая, са́мае, са́мыя 205
Table 12. The Reflexive Pronoun — сябе́

Verbs / ДЗЕЯСЛОВЫ
Table 13. The First Conjugation and the Second Conjugation 205
Table 14. Reflexive Verbs 209
Table 15. The Conjugation of "быць" and the Irregular Verbs "е́сьці" and "даць" (pf.) 210

Numerals / ЛІЧЭБНІКІ
Table 16. Cardinal and Ordinal Numerals 211

Guide to the Use of the Vocabularies 213
ЯК КАРЫСТА́ЦЦА СЛОЎНІКАМ 214
Byelorussian-English Vocabulary / БЕЛАРУ́СКА-АНГЕ́ЛЬСКІ СЛОЎНІК 216
English-Byelorussian Vocabulary / АНГЕ́ЛЬСКА-БЕЛАРУ́СКІ СЛОЎНІК 336

БЕЛАРУСКІ АЛЬФАБЭТ

BYELORUSSIAN ALPHABET

PRINT	SCRIPT	PRINT	SCRIPT	PRINT	SCRIPT
А а	*А а*	Й	*Й й*	Ў ў	*Ў ў*
Б б	*Б б*	К к	*К к*	Ф ф	*Ф ф*
В в	*В в*	Л л	*Л л*	Х х	*Х х*
Г г	*Г г*	М м	*М м*	Ц ц	*Ц ц*
Д д	*Д д*	Н н	*Н н*	Ч ч	*Ч ч*
Е е	*Е е*	О о	*О о*	Ш ш	*Ш ш*
Ё ё	*Ё ё*	П п	*П п*	Ы ы	*Ы ы*
Ж ж	*Ж ж*	Р р	*Р р*	Ь ь	*Ь ь*
З з	*З з*	С с	*С с*	Э э	*Э э*
І і	*І і*	Т т	*Т т*	Ю ю	*Ю ю*
		У у	*У у*	Я я	*Я я*

КРУГ 19

Я ЖЫВУ́ Ў СТАЛІ́ЦЫ

(Ліст ву́чня)

Дарагі́ ся́бра!

Ты просіш, каб я напіса́ў Табе́ пра наш горад. Зрабі́ць гэта ве́льмі ця́жка. Менск * такі́ вялі́кі цяпе́р, і гэтулькі ў ім прыгожага, што мне й сшытка́ ня хопіць, каб пра ўсё напіса́ць. А́ле пастара́юся Табе́ расказа́ць са́мае галоўнае.

Жыву́ я ў цэнтры на́шае сталі́цы, на галоўным праспэкце. На на́шай ву́лі́цы ёсьці музэ́й з апошняе вайны́. Мы туды хадзі́лі ўсёй кля́сай і ба́чылі на здымках, як выглядда́ў наш горад адра́зу пасля́ вайны́. Ох, і страшны́я-ж былі́ руі́ны: стая́лі абгарэ́лыя пе́чы, ву́лі́цы былі́ зава́леныя цэглаю ад разбу́раных дамоў. Гораду бада́й ня было зусі́м. А цяпе́р, каб Ты толькі ве́даў, яка́я прыгожая на́шая сталі́ца там, дзе яна́ адбудава́ная.

Калі́ прые́дзеш да нас, вы́йдзеш на Прывакза́льную плошчу, паба́чыш, якія вялі́кія й высозныя дамы́ стая́ць вакол яе́. Праз плошчу сную́ць а́ўты, таксі́, праходзяць трамва́і, аўтобусы, тралей́бусы: адсю́ль ты можаш тра́піць у які́-хаця́ канец гораду. А нада́ўна над чыгу́нкаю і над колькімі ву́лі́цамі пабудава́лі вялі́зны мост. Пад ім іду́ць цягні́кі й трамва́і, а па мосьце імча́цца а́ўты, ходзяць лю́дзі.

Галоўная ву́лі́ца гораду ў нас ве́льмі шырокая. Яна́ ўся ўскры́тая асфа́льтам, па бакох абса́джаная вялі́кімі лі́памі. Уле́тку яны́ цьвіту́ць і хораша па́хнуць. На праспэкце ўсе дамы́ на пяць і на шэсьць паве́рхаў. Уні́зе — кра́мы, кніга́рні, рэстара́ны, а наве́рсе ў кватэрах жыву́ць лю́дзі.

Недалёка ад праспэкту знаходзіцца наш стадыён. Ты-б паглядзе́ў, што тут робіцца ўле́тку! Дзесяткі ты́сячаў людзе́й зьбіра́юцца сюды́, каб паглядзе́ць, як гуля́юць у футбол.

На са́мым прыгожым сквэры гораду стаі́ць тэа́тр Я́нкі Купа́лы і непадалёк ад яго — помнік на́шаму вялі́каму паэту Я́нку Купа́лу. Праз ву́лі́цу — кінатэа́тр "Навіны дня". У ім глядзі́м фі́льмы, слу́хаем ціка́выя гу́таркі й канцэрты. А кры́шку да-

---

* **Miensk** is the capital city of the Byelorussian Soviet Socialist Republic (BSSR) which today includes only about 3/5 of the Byelorussian etnographic territory.

ле́й, тэатр маладога гледача́. Мы ча́ста ходзім туды ўсёй кля́сай на спэкта́клі, а яны́ ве́льмі ціка́выя.

А ме́нскі цырк адзін зь ле́пшых у сьве́це! Гэта вялі́зны кру́глы будынак пад бліш-ча́стым зяле́зным да́хам. Штанядзе́лі ўдзень арты́стыя цы́рку даю́ць пака́зы спэцы-я́льна для дзяце́й. Ве́льмі-ж ціка́ва й вясёла быва́е ў на́шым цы́рку!

Уле́тку я ве́льмі люблю́ хадзіць у Батані́чны сад. Там расту́ць розныя дрэвы. А колькі там прыгожых кве́так!

Побач з Батані́чным са́дам — парк імя́ Чалю́скінцаў, а за ім — дзіця́чая чыгу́нка — Мала́я Белару́ская, як яна́ заве́цца, адкры́тая ў 1955 годзе. За па́ркам пабудава́ны прасторны ўту́льны вакза́л з усі́мі патрэ́бнымі слу́жбамі ды праклада́ныя рэйкі больш за чаты́ры кіламэтры ўдаўжкі. Чыгу́нку абслугоўваюць ву́чні ме́нскіх школаў. Яны́ працу́юць машыні́стымі, стрэлачні́камі, канду́ктарамі, дыжу́рнымі ста́нцыі, кан-тралёрамі, але́ ездзяць ею ня толькі дзе́ці. Асабліва ўле́тку ча́ста й дарослыя сяда́-юць у малёнькія блакітныя вагоны ды е́дуць да ста́нцыі "Сасновы бор", каб адпачы́ць ды падыха́ць све́жым паве́трам у прыгарадных перале́сках.

Е́сьць у нас і ўся́кія заводы! МА́Зы з зубра́мі на радыя́тары Ты, хіба́, ба́чыў? Іх вырабля́юць МА́Замі, што робяць іх на Ме́нскім аўтамабі́льным заводзе. Магу́тныя ма́шыны, вядо́ма, маю́ магу́тныя самазва́лы ў Саве́цкім Саю́зе.

Пабу́даваны ў нас і тра́ктарны завод ды ўся́кія і́ншыя. Ме́нскія заводы вырабля́юць халады́льнікі, ве́лясіпе́ды, самака́ты, радыёпрыёмнікі, тэлевізары, гадзін-нікі і тэлефо́ны.

Ну, бра́тка, расчаруе́ся я. Замучы́шся. Ты чыта́ць, а я ўжо му́шу сьпяша́цца ў кіно, сяброўка ўжо, мусіць, на мяне́ чака́е, дык трэба канча́ць. Будзь здаро́ў ды хутчэй адпі-шы́ мне, як толькі ве́рнешся ад цёткі.

Твой Раман

Слоўнік (Vocabulary)

сталі́ца, -ы (f.) capital
галоўны, -ая, -ае main
праспэкт, -у (m.) avenue
руі́ны, (pl. of **руі́на**) ruins
абгарэлы, -ая, -ае burnt, charred
зава́лены, -ая, -ае blocked up
разбу́раны, -ая, -ае destroyed
прывакза́льная плошча (f.) railway station square
мост, -у (m.) bridge
лі́па, -ы (f.) linden tree
спэкта́кль, -ю (m.) performance
пры́гарад, -у (m.) suburb
пры́гарадны, -ая, -ае suburban
слу́жба, -ы (f.) service
рэйкі (pl.) (way) tracks
абслугоўваць, (I); абслугоўваю, -еш, -юць to attend, to operate, to serve
машыні́сты, -ага (m.) engineer, engine-driver
стрэлачні́к, -а (m.) switchman, pointsman
кантралёр, -а (m.) controller, inspector
дыжу́рны, -ага (m.) assistant station-master
самазва́л, -а (m.) dump truck
перале́сак, перале́ска (m.) little woodland of small trees and undergrowth

19 — I DATIVE PLURAL OF NOUNS
ДАВА́ЛЬНЫ СКЛОН НАЗОЎНІКАЎ, множны лік

У **давальным** склоне **множнага ліку** назоўнікі **мужчынскага** й **ніякага роду** ды **жаноцкага з чыстай асновай** маюць канчаткі:

-ом (ём) пад націскам (брат**ом**, лас**ём**, пал**ём**, касьц**ём**)
-ам (ям) не пад націскам (хлопц**ам**, кон**ям**, пе́ч**ам**, пыта́ньн**ям**)

Назоўнікі **жаноцкага роду на "-а (я)"** у гэтым склоне **заўсёды** маюць **канчаткі:**

-ам (ям) — ма́тк**ам**, рука́**м**, пе́сьн**ям**

***

The **dative plural** endings are **-ом (-ём)** or **-ам (-ям).**

a) **All masculine and neuter** nouns and **feminine** nouns **ending in a consonant**, take the ending **"-ом"** or **"-ём"** when **finally stressed:**

брат**ом**, лас**ём**, пал**ём**, касьц**ём**

b) **All masculine and neuter** nouns and **feminine** nouns **ending in a consonant** which are **not finally stressed,** and **all feminine** nouns ending **in "-а" or "-я" regardless of the stress,** take the ending **"-ам" or "-ям":**

хлопц**ам**, кон**ям**, ма́тк**ам**
пыта́ньн**ям**, пе́ч**ам**, рука́**м**

19 — II LOCATIVE PLURAL OF NOUNS
МЕ́СНЫ СКЛОН НАЗОЎНІКАЎ, множны лік

У **месным** склоне **множнага ліку** назоўнікі **мужчынскага** й **ніякага** роду ды **жаноцкага з чыстай асновай** маюць канчаткі:

-ох (ёх) пад націскам
а **-ах (ях)** не пад націскам.

аб вал**ох**, на стал**ох**, аб лас**ёх**, на пал**ёх**, на касьц**ёх**
і ў народ**ах**, у мор**ах**, аб це́сьц**ях**, у зада́ньн**ях**

Назоўнікі **жаноцкага роду на -а (я)** у гэтым склоне **заўсёды** маюць канчаткі **-ах (ях)**, прыкладам:

у рука́**х**, на нага́**х**, у ха́т**ах**, пры наста́ўніц**ах**
у пе́сьн**ях**, на лі́ні**ях**

***

The **locative plural** endings are **-ох (ёх)** or **-ах (ях)**

a) **All masculine** and **neuter** nouns, and **feminine** nouns ending **in a consonant,** take the ending **"-ох"** or **"-ёх"** when **finally stressed:**

пры сын**ох,** на стал**ох,** аб ласё**х,** кавалё**х,** на палё**х,** на касьцё**х**

b) **All masculine** and **neuter** nouns, and **feminine** nouns **ending** in a **consonant** which are not finally stressed, and all feminine nouns ending in **"-а" or "-я",** regardless of the stress, take the ending **"-ах"** or **"-ях"**:

пры наст[illegible]**ах,** на в[illegible]**ах,** [illegible]**ях,** у пе́**чах**
у рука́**х,** на ног[illegible]**х,** у хат[illegible]**х,** [illegible]**ях,** на лініях

19 — III VERBS OF MOTION / ДЗЕЯСЛОВЫ РУХУ

[illegible] не **азначаюць кірунку дзеяньня,** як пры-

[illegible]ve, to arrive;

[illegible] на **кірунак паказваюць прыстаўкі або прыназоўнікі,** ужытыя пасьля іх, ці адно й другое. Прыкладам:

я йду (**прыходжу**) **ў** школу; я **выходжу із** школы

*

Verbs of motion in Byelorussian **do not indicate direction.** Direction is indicated by **prepositions or by prefixes, or by both,** e.g.:

Я йду **ў** школу.	I am **going** to school.
Я йду **із** школы.	I am **coming** from the school.
Я **прых**ходжу **ў** школу.	I **arrive** at the school.
Я **вых**ходжу **із** школы.	I **leave** the school.

19 — IV ACTUAL AND HABITUAL FORMS OF VERBS: **ісьці — хадзіць**
е́хаць — е́зьдзіць

ПРАЦЯ́ЖЛІВАЯ І ПАЎТОРЛІВАЯ ФОРМА ДЗЕЯСЛОВАЎ

A) Усе **дзеясловы руху** маюць дзьве формы:

гэтак званая **працяжлівая** форма	я **йду**
й **паўторлівая** форма	я **хаджу́**

УВА́ГА. Апрача дзеясловаў руху, гэтыя формы могуць мець таксама й некаторыя **дзеясловы ста́ну**, хаця іх вельмі няшмат.

Прыкладам: працяжлівая — **быць**; паўторлівая — **быва́ць**.

1. **Праця́жлівыя** дзеясловы выражаюць канкрэтнае дзеянье **бесьперапынна-цяглае** ў **вадным кірунку** і ў **вадным часе: ісьці, е́хаць, не́сьці:**

я **йду** ў школу; мы **е́дзем** у лес; яна́ **нясе́** кнігі

2. **Паўторлівыя** дзеясловы выражаюць

а) **паўтаранае** дзеянье **са зьменаю** пры гэтым **кірунку або часу:**

я **хаджу́** ў школу; мы **е́зьдзім у** школу; яна́ **носіць** кнігі.

б) або наагул толькі ўласьцівасьць прадметаў, як:

зьвяры́ **ходзяць,** пту́шкі **лётаюць**, а ры́бы **пла́ваюць.**

Б) **Пасьля** словаў: **заўсёды, ніколі, ча́сам, штадня́, штагоду...** трэба ўжываць дас- словы **паўторлівае** формы.

В) Запамятайце добра, як прыклад, гэтыя **па́ры праця́жлівых** і **паўторлівых** дзея- словаў:

Праця́жлівыя: ісьці́, бе́гчы, ляце́ць, плысьці́, паўзьці́... быць
Паўторлівыя: хадзі́ць, бе́гаць, лётаць, пла́ваць, поўзаць... быва́ць

***

Verbs of motion have two distinct forms: the **actual** and the **habitual.**

1. The **actual** verb implies **actual** performance **at a given time:**

Я **йду** ў школу.	I **am going** (walking) to school.
Учора мы **йшлі** ў царкву́ ды сустрэлі Янку.	Yesterday we **were walking** to church and we met John.
За́ўтра мы **е́дзем** на горад.	We **are going** downtown tomorrow.

2. The **habitual** verb implies **repeated performance** at an **unspecified time, or at various times:**

Я **хаджу́** ў школу.	I **go to school** (I attend school, or I walk to school).
Учора мы **хадзі́лі** ў царкву́.	We **went** (walked) to church yesterday.
Мы ча́ста **е́зьдзім** на горад.	We often **go** downtown.
Мы ніколі ня **пла́ваем.**	We never **swim.**

Note, that 1. **with** such words as **заўсёды, ніколі, ча́сам, штадня́, штагоду,** etc., implying repetition or habit, the **habitual** form must be used.

2. In **most cases** Byelorussian **actual** verbs are **counterparts** of English **verbs of motion** ending in **"-ing."**

19 — V CONJUGATION OF SOME ACTUAL AND HABITUAL VERBS

СПРАЖЭНЬНЕ дзеясловаў: 1. **ісьці́ — хадзі́ць; е́хаць — е́зьдзіць;** бе́гчы — **бе́гаць; ляце́ць — лята́ць; плысьці́ — пла́ваць.**

ACTUAL	HABITUAL	ACTUAL	HABITUAL
1. **ісьці́** (I)	**хадзі́ць** (II)	2. **е́хаць** (I)	**е́зьдзіць** (II)

PRESENT TENSE

я йду́	я хаджу́	я е́ду	я е́жджу
ты йдзеш	ты ходзіш	ты е́дзеш	ты е́зьдзіш
ён ідзе́(ць)	ён ходзіць	ён е́дзе	ён е́зьдзіць
мы йдзём	мы ходзім	мы е́дзем	мы е́зьдзім
вы йдзяцё	вы ходзіце	вы е́дзеце	вы е́зьдзіце
яны́ йдуць	яны́ ходзяць	яны́ е́дуць	яны́ е́зьдзяць

PAST TENSE

ішоў, ішла́ (яно) йшло; ішлі	хадзіў, хадзіла (яно) хадзіла; хадзілі	е́хаў, е́хала, (яно) е́хала; е́халі	е́зьдзіў, е́зьдзіла, (яно) е́зьдзіла; е́зьдзілі

COMPOUND FUTURE TENSE

я бу́ду йсьці...	я бу́ду хадзіць...	я бу́ду е́хаць...	я бу́ду е́зьдзіць...

PERFECTIVE FUTURE TENSE

я пайду́...	я пахаджу́	я пае́ду...	я пае́жджу...

IMPERATIVE

ідзі́! (go!)	хадзі́! (come!)	едзь!	езьдзь!
ідзе́це!	хадзе́це!	е́дзьце!	е́зьдзьце!
3. **бе́гчы** (irr.) *	**бе́гаць** (I)	4. **ляце́ць** (irr.) *	**лята́ць** (I)

---

* The verbs **"бе́гчы"** and **"ляце́ць"** are called **irregular** because in the **3rd person pl.** (**"ляце́ць"** also in the **1st person pl.**) they take the **endings** of the **I Conjugation.** Otherwise they are conjugated according to the **II Conjugation.**

PRESENT TENSE

я бягу́	я бе́гаю	я лячу́	я лётаю
ты бяжы́ш	ты бе́гаеш	ты ляці́ш	ты лётаеш
ён бяжы́ць	ён бе́гае	ён ляці́ць	ён лётае
мы бяжы́м	мы бе́гаем	мы ляцём (-ом, -ім)	мы лётаем
вы бяжыцё	вы бе́гаеце	вы ляціцё	вы лётаеце
яны бягу́ць	яны́ бе́гаюць	яны́ лячу́ць	яны́ лётаюць

PAST TENSE

бег, бе́гла	бе́гаў, бе́гала	ляце́ў, ляце́ла	лётаў, лётала
бе́глі	бе́галі	ляце́лі	лёталі

COMPOUND FUTURE TENSE

я бу́ду бе́гчы...	я бу́ду бе́гаць...	я бу́ду ляце́ць...	я бу́ду лётаць...

PERFECTIVE FUTURE TENSE

я пабягу́...	я пабе́гаю...	я палячу́...	я палётаю...

IMPERATIVE

бяжы!	бе́гай!	ляці!	лётай!
бяжэце!	бе́гайце!	ляце́це!	лётайце!

	ACTUAL	HABITUAL
5.	**плысьці** (I)	**пла́ваць** (I)
PRESENT:	я плыву́, ты плывёш... яны́ плыву́ць	я пла́ваю, ты пла́ваеш... яны́ пла́ваюць
PAST:	плыў, плыла́, плыло плылі́	пла́ваў, пла́вала, пла́вала пла́валі
COMPOUND FUTURE:	я бу́ду плысьці...	я бу́ду пла́ваць
PERFECTIVE FUTURE:	я паплыву́	я папла́ваю
IMPERATIVE:	плыві́! плывёце!	пла́вай! пла́вайце!

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 216. а) Перапішэце ў слупок **назоўнікі** ды побач, паводля ўзору, напішэце іх у **множным ліку ў назоўным, родным, дава́льным і вінава́льным** склонах. Ране́й прыпомніце пра́вілы 17-I, 17-II ды 19-I.

УЗОР.	**Назоўны**	**Родны**	**Дава́льны**	**Вінава́льны**
шко́ла	шко́лы	шко́лаў	шко́лам	шко́лы
пе́сьня				
ды вучаніца	ву́ліца	брат	пыта́ньне	гусь
дзя́дзька	ключ	за́йчык	печ	ла́ня
лес	трамва́й	крэсла	соль	во́зера

б) Да́дзеныя **назоўнікі** так, як і ў практыкава́ньні "а)", перапішэце ў слупок, а тады́ дапішэце да іх **множны лік** у назоўным склоне, **творным і ме́сным.** (Глядзе́це пра́вілы 17-VI і 19-II.)

сталіца, цэ[illegible]ст, аўтабу́с, зу́бар, мост,
[illegible], пяро, [illegible]

[illegible] **МЕС.**

сталіца [illegible] у сталіцах

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 217. а) [illegible] за наста́ўнікам.

ЖАНОЦКІ РОД З КАНЧАТКАМ НА **"-а", "-я".**

1. **Адзіночны лік**

Назоўны — **хто?** (тут)		сястра́	цётка	Ганну́ля
Родны — **каго?** (нама́)		сястры́	цёткі	Ганну́лі
Дава́льны — **каму́?** (даю́)		сястры́	цётцы	Ганну́лі
Вінава́льны — **каго?** (ба́чу)		сястру́	цётку	Ганну́лю
Творны — **зь кім?** (ідзе́ш)	зь	сястрою(й)	цёткаю(й)	Ганну́ляю(й)
Ме́сны — **пры кім?** (сядзіш)	пры	сястры́	цётцы	Ганну́лі

Множны лік

Назоўны — **хто?** (тут)	сёстры	цёткі	Ганну́лі
Родны — **каго?** (нама́)	сясьцёр (сёстраў)	цётак (цёткаў)	Ганну́ляў

Дава́льны — **каму́?** (даю́)		**сёстрам**	**цёткам**	**Гану́лям**
Вінава́льны — **каго?** (ба́чу)		**сясьцёр** (**сёстраў**)	**цётак** (**цёткаў**)	**Гану́ляў**
Творны — **зь кім?** (ідзе́ш)	зь	**сёстрамі**	**цёткамі**	**Гану́лямі**
Ме́сны — **пры кім?** (сядзіш)	пры	**сёстрах**	**цётках**	**Гану́лях**

2. **Адзіночны лік**

Назоўны — **што?** (тут)	**сьцяна́**	**папе́ра**	**нага́**	**ві́шня**
Родны — **чаго?** (нямá)	**сьцяны́**	**папе́ры**	**нагі́**	**ві́шні**
Дава́льны — **чаму́** (даю́)	**с:цяне́**	**папе́ры**	**назе́**	**ві́шні**
Вінава́льны — **што?** (ба́чу)	**сьцяну́**	**папе́ру**	**нагу́**	**ві́шню**
Творны — **чым? (за чым?)**	**сьцяно́ю(ой)**	**папе́раю(ай)**	**нагою(ой)**	**ві́шняю(яй)**
Ме́сны — **на чым?**	**на сьцяне́**	**папе́ры**	**назе́**	**ві́шні**

Множны лік

Назоўны — **што?**	**сьце́ны**	**папе́ры**	**ногі**	**ві́шні**
Родны — **чаго?** (нямá)	**сьце́наў**	**папе́раў**	**ног**	**ві́шняў**
Дава́льны — **чаму́?**	**сьце́нам**	**папе́рам**	**нага́м**	**ві́шням**
Вінава́льны — **што?** (ба́чу)	**сьце́ны**	**папе́ры**	**ногі**	**ві́шні**
Творны — **чым? (захапля́юся)**	**сьце́намі**	**папе́рамі**	**нага́мі**	**ві́шнямі**
Ме́сны — **на чым?**	**на сьце́нах**	**папе́рах**	**нага́х**	**ві́шнях**

б) Паводля ўзораў а) 1. і 2. дома праскланя́йце назоўнікі:

1. **студэнтка, вучаніца, бабу́ля;**
2. **ха́та, кні́га, пе́сьня.**

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 218. а) **Ву́снае.** Наста́ўнік скланя́е ўголас назоўнік **"брат"**, пасьля́ ка́жнага склону паўтара́е ву́чань, толькі скланя́е назоўнік **"сын"**, у вадзіночным, а пасьля́ ў множным ліку.

Адзіночны лік

1.

Наста́ўнік:		Ву́чань:	
Назоўны — хто?	**брат**	Назоўны — хто?	**сын**
Родны — каго?	**бра́та**	Родны — каго?	**сы́на**
Дава́льны — . . . . і г. д.		Дава́льны — . . . . і г. д.	

2. Гэтак-жа настáўнік скланяе **“кравéц”**, а вýчні адзін па адным **“друкáр”.**

3. Настáўнік скланяе а) **“пісьмéньнік”**, а вýчні адзін па адным **“настáўнік”.**
б) **“верабéй”** — вýчні: **“кавáль”.**

4. Настáўнік скланяе а) **“вакно”** — вýчні: **“крэсла”.**
б) **“сынéданьне”** — вýчні **“пытáньне”.**

б) Дома вýчні **пісьмова скланяюць** назоўнікі 1. **студэнт, воўк,** 2. **вýчань, конь** ды 3. **гняздо, пяро,** пішучы назовы ды пытаньні да склонаў, як у практыкавáньні 217.

(Глядзí табліцы на канцы́ кнíгі).

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 219. а) Паводле узору практыкавáньня 217 а) 2., гэта знáчыць, пішучы назовы й пытáньні склонаў, **праскланяйце назоўнікі: зáвязь, ноч** (пéрад гэтым увáжна прачытáйце **таблíцу 3.** на канцы́ кнíгі).

б) Перапішэце пры́казкі, **азначце склон** усíх назоўнікаў.

1. Нáша Сора то шы́е, то пора, а ўсё нíткам гора. 2. Тады́ мáю, як у рукáх трымáю. 3. У нагáх прáўды нямá. 4. Чужы́мі рукáмі жар заграбáць. 5. Сем разоў адмéр, адзін раз адрэж. 6. Спры́тны, як мядзьвéдзь да тáнцаў.

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 220. а) **Прачытáйце** сказы, замíж кропак **устаўляючы** адпавéдна і да сэнсу **словы з прáвага слупкá,** а пасля́ запішэце сказы.

а) Я вязу́ . . . , каб адмяніць.	**кнíгі**	б) Я важу́ . . . на самакáце.	**цэгла**
Ты вязéш . . . на стáнцыю.	**госьці**	Ты возіш . . . у садочак.	**дровы**
Янá вязé . . . у школу.	**сукéнка**	Ён возіць . . . на гарáж.	**брат**
Мы вязём . . . на лéцішча.	**абразы́**	Мы возім . . . на дом.	**матар'я́л**
Вы везяцё . . . дамоў.	**мáма**	Вы возіце . . . у мéста, каб прадавáць.	**сынок**
Яны вязýць . . . на выстаўку.	**дзéці**	Яны́ возяць . . . зь лéсу.	**садовíна**

в) Дзеясловы **вéзьці, вазíць** напішэце ў **прошлым** чáсе, **бýдучым складáным і простым** ды ў **загáдным** лáдзе. (Ранéй паглядзéце пр. **14-II, 2** ды **19-V**).

г) Сказы з пýнкту “а)” ды “б)” напішэце ў прошлым чáсе.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 221. а) Перапішэце ска́зы, а тады́ **падчыркне́це** аднэй **ры́скай працяжлівыя** дзеясловы (actual), а **паўторлівыя** (habitual) дзьвюма́.

1. Сёньня мы йдзём у парк, мы ча́ста туды́ ходзім падве́чар.
2. Я́нка йдзе ў школу бяз ша́пкі. Ён ніколі ня ходзіць у ша́пцы.
3. Яны́ заўсёды е́зьдзяць у горад а́ўтам, а сёньня пае́дуць аўтабу́сам, а тады́ перася́дуць у падзе́мку.
4. Да пры́стані йдзе тава́рны карабе́ль. Тут ча́ста ходзяць караблі́.
5. Глядзі́, яка́я ціка́вая пту́шка ляціць. Іх тут шмат такіх лётае.
6. Цяпе́р брат плыве́ на другі бе́раг ракі́, адпачне́ ды бу́дзе плысьці наза́д. Ён ве́льмі лю́біць пла́ваць і ча́ста пла́вае.
7. Хлопчык бяжы́ць праз ву́ліцу, яго затрыма́ў паліцыя́нт і ка́жа: Праз ву́ліцу ня можна бе́гчы. Трэба ўва́жна йсьці, глядзе́ць, ці нема́ а́ўта. Бе́гаць можна толькі . . . — у па́рку, — дакончыў хлопчык, — нам наста́ўніца каза́ла.

б) Перапішэце ска́зы, **выбіра́ючы** з ду́жак адзін патрэбны **дзеяслоў** ды **ста́вячы** яго ў **вадпаве́дным лі́ку й ча́се.**

1. Калі́сь лю́дзі ўле́тку (е́хаць, е́зьдзіць) возам, узімку саньмі, а цяпе́р зіма́ й ле́та (е́хаць, е́зьдзіць) а́ўтам ці аўтабу́сам, а ў далёкую дарогу (ляце́ць, лётаць) самалётам.
2. За́ўтра мы (ісьці́, хадзі́ць) у тэа́тр, мы лю́бім (ісці́, хадзі́ць) у тэа́тр.
3. Куды́ яны́ цяпе́р (е́хаць, е́зьдзіць)? Яны́ (е́хаць, е́зьдзіць) на ле́цішча. Штасы-боты яны́ туды́ (е́хаць, е́зьдзіць).
4. Куды́ ты ўчора так ху́тка (е́хаць, е́зьдзіць)? Заўсёды ты (е́хаць, е́зьдзіць) пама́лу.
5. Ты заўсёды (ісьці́, хадзі́ць) у школу так пама́лу? Не, ча́сам я (ісьці́, хадзі́ць) ве́льмі ху́тка, а калі́ пазьню́ся, я ня (ісці́, хадзі́ць), а (бе́гчы, бе́гаць).
6. Калі́ я бу́ду мець а́ўта, заўсёды бу́ду (е́хаць, е́зьдзіць) на пра́цу, а цяпе́р ча́сам (ісьці́, хадзі́ць).

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 222. а) У кля́се **ву́снае.** Слу́хайце, як наста́ўнік вымаўля́е, а тады́ са́мі паўтара́йце насту́пныя ска́зы.

Я заўсёды е́ждж ў парк, а сёньня я йду пехатой.
Ты заўсёды е́зьдзіш у школу, а сёньня ты йдзеш пехатой.
Яна́ заўсёды е́зьдзіць у тэатр, а сёньня йдзе пехатой.
Мы заўсёды е́зьдзім у кра́му, а сёньня йдзём пехатой.

Вы заўсёды ёзьдзіце над возера, а сёньня йдзяцё пехатой.
Яны заўсёды ёзьдзяць на працу, а сёньня йдуць пехатой.

б) Прачытайце гэтыя сказы, замі́ж **“ёзьдзіць”** устаўляючы **“хадзіць”**, а замі́ж **“ісьці пехатой”** - **“ёхаць аўтам”.**

Дома напішэце сказы ў зьменены выглядзе.

в) Перапішэце сказы, **патрэбны** дзеяслоў з дужак **пастаўце ў вадпаведным ліку** й часе. Паводля ўзору азначце ўгарі гэтыя дзеясловы, ці яны **працяжлівыя** ці **паўторлівыя.**

паўт.

УЗОР. ёзьдзіць

гэтым разам (ляцець, лётаць) самалётам.

Ці ты калі раней (ляцець, лётаць) сама-

, толькі дачы частку дарогі (ляцець, лётаць), а частку (

4. Над лугам ляціць самалёт, а дзеці (бегчы, бегаць) зь ім навыпарадкі.
5. Узімку мы (бегчы, бегаць) на канькох, а ўвесну на роліках.
6. Калі халодна, мы (бегчы, бегаць) у школу, каб не замерзнуць.
7. Куды вы так (бегчы, бегаць), як на пажар? Мы (бегчы, бегаць) не на пажар, а над возера глядзець сусьцігі ветразьнікаў.

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 223. Выразна чытаць.

У АЎТАБУСЕ

Андрэй: А, здароў, Вінцук, нечаканая сустрэча!
Вінцук: Здароў! Я ніколі ня ежджу ў школу, таму й сустрэча нечаканая. Заўсёды хаджу, па дарозе заходжуся па сябру ды йдзём удвух, а часта й больш хлопцаў сустракаем. Люблю я хадзіць лепш, як ёзьдзіць.
Андрэй: Дык чаму ты сёньня едзеш?
Вінцук: Сёньня ў мяне баліць нага. А вунь, глядзі, два хлопцы, зь якімі я часта хаджу.
Андрэй: Ну, сёньня яны ня йдуць, а бягуць.

Polacak (Polotsk). Christ the Redeemer Cathedral and the Monastery of St. Euphrosinia of Polacak on the River Polata built about 1161

Вінцу́к: Але́, яны́ лю́бяць бе́гаць, абодвы трэну́юцца, каб бе́гаць навы́перадкі.
Андрэй: Я жыву́ ве́льмі далёка. Далёка йсьці, таму́ е́жджу.
Вінцу́к: Наш наста́ўнік матэма́тыкі жыве́ зусім бліска, а́ле ніколі ня ходзіць у школу пехатой, заўсёды е́зьдзіць а́ўтам.
Андрэй: Му́сіць малады́ ды не наце́шыўся яшчэ сваім а́ўтам.
Вінцу́к: Не, гэта ста́ршы й ве́льмі пава́жны дзя́дзька.
Андрэй: Вось, я ўжо прые́хаў, гэта мой прыста́нак, табе́ лепш яшчэ адзін прае́хаць. Быва́й, хай хутчэй твая́ нага́ папраўля́ецца.
Вінцу́к: Дзя́кую. Быва́й здароў!

КРУГ 20

БЕЛАРУ́СКІЯ РЭКІ

З на́шага кра́ю выцяка́юць важне́йшыя рэкі ў Эўропе.

У Смале́ншчыне зь імша́раў выцяка́е сла́ўны Дняпро; у яго ўліва́юцца сотні й ты́сячы рэчак, аж пакуль ён ня зробіцца магу́тным і шырокім. Тады́ да яго прылуча́юць сваю́ ваду́ вялікія ягоныя дзе́ці — Бярэзіна, што цячэ зь лясі́стае ды пяшча́нае Ме́ншчыны, Сож, што аж спад Смале́нска навы́перадкі ляціць, каб абагна́ць свайго ба́цьку — Дняпро, Пры́пяць, што залі́ла сваёю вадою безграні́чныя прасторы Пі́нскага балота, Дзясна́, што ляглá мяжою між Белару́сяй і Ўкраі́най ды ў высокіх берагох абмыва́е зямлю́ Чарні́гаўскую зь яе́ глыбокімі я́рамі, сы́пкімі пяска́мі ды ліповымі гаямі. Напіўшыся ўдо[illegible] ў бе[illegible]ру́скае, пясе́ ваду́ сваю́ Дняпро праз Украі́ну ў далёкае Чорнае мора. З Украі́ны яму́ ма́ла пажы́вы — колькі невялі́чкіх рэчак. Усю́ сі́лу й магу́тнасьць сваю́ бярэ Дняпро зь зямлі́ Белару́скае.

А зь лясоў Ме́ншчыны пасыла́е Белару́сь у другі́ бок ганцá, сьве́тлы, чароўны Нёман; ён цячэ адту́ль празь зямлю́ Жамойцкую ў Балты́цкае мора. Абві́ўшы срэбным поясам бага́тую Нава́градчыну, хава́ецца ён ізноў у пу́шчах, аж пакуль ня вы́бяжыць адту́ль за горадзенскія пале́ткі. Та́мака чака́е яго вялі́кі пасі́лак. Зь дзікіх балатоў, спад сьвяты́няў Жыровіцкіх, плыве́ парослая чарата́мі, многаводная Шча́ра. Весялéй бе́гчы Нёмну, і борзда ён падплыва́е да сьце́наў старога белару́скага Горадна. Пра-бе́гшы яшчэ крыху́, ра́птам заварочвае Нёман убок, каб паглядзе́ць на харошыя Друзге́нікі ды барджэй сустрэцца з красу́няй — Вяльлёй.

А та́я прарэзала старасьве́цкую сталіцу вялі́кіх князёў на́шых Ві́льню ды, не зважа́ючы на цудоўныя горы Пана́рскія, на дубовыя гаі, бяжы́ць насу́страч роднаму Нёмну.

Сустрака́юцца яны́ на зямлі́ Жамойцкай, там зьліва́юць сваé воды й бягу́ць ра́зам у Балты́цкае мора.

Да Стоўпцаў на Нёмне паба́чыш толькі чаўны́ ды плыты́. За Стоўпцамі луча́юцца ча́сам і караблі́, а ад Горадна ходзяць вялі́кія параплáвы.

Яшчэ адну́ сла́ўную раку́ ма́юць Белару́сы — гэта Дзьвіну́. Пачына́ецца яна́ на са́май далёкай поўначы, зьбіра́е ўсе рэкі й рэчкі зь лясоў Смале́ншчыны й Ві́цебшчыны, якія ня ўпра́віўся перахапіць сабе́ Дняпро. Паўнаводнай ракой падкочваецца яна́

да Віцебска, што параскідáў сваé бязь лíку цэрквы па зялёных узгорках, і далéй плывé да Полацку, што стаіць задýманы аб слáўнай сваёй мінýўшчыне. Нéкалі поўна было на Дзьвінé чаўноў, багáты й магýтны быў Полацак. Цяпéр абмялéла Дзьвінá, апусьцéў Полацак. Паціху коціць сваю́ ваду́ Дзьвінá ў зямлю́ Латгольцаў, Латышоў да багáтае Рыгі, да мора.

Рэкі для крáю — усяроўна, што жы́лы для цéла чалавéчага. Па жы́лах цячэ кроў, а па рэчках перавозяцца ўсе важнéйшыя тавáры. Па сваіх рэках Беларýсы сплаўля́юць лес і збожжа.

Паводля **Язэпа Лёсіка**

УВАГА. Пытáньні да апавядáньня глядзí практыкавáньне **224**.

Слоўнік (Vocabulary)

выцякáць (I), выцякáе, -юць 1. to flow out 2. to have its source
прылучáць (I), прылучáю, -еш, -юць to join
абагнáць (I), (pf.) past **абагнáў, -ла, -лі** to outrun, to leave behind
безгранíчны, -ая, -ае infinite, boundless
яр, -у (m.) ravine
гай, гáю (m.) grove
удосыць (adv.) in plenty, in abundance
пажы́ва, -ы (f.) gain, profit
пасылáць (I); пасылáю, -еш, -юць to send
ганéц, ганцá (m.) messenger
зямля́ Жамойцкая (f.) Lithuania (to-day)
пасíлак, пасíлку (m.) reinforcement
Жыровíцы,* -аў Zhyrovicy, a town in Grodno province
чарот, -у (m.) cane, rush
парослая чаратáмі rushy
мнагаводны, -ая, -ае abounding in water
борзда (adv.) fast, quickly
барджэй faster, sooner
харошы, -ая, -ае beautiful, pretty, handsome
красýня, -і (f.) beauty
прарэзаць (I); (pf.) past **прарэзаў, -ла, -лі** to cut through, (in this case) to flow through
зважáць (I); зважáю, -еш, -юць to take notice of
родны, -ая, -ае 1. own 2. native (country)
плыт, -á (m.) float, raft
лучáюцца чáсам (караблí) (ships) are sometimes encountered (seen)
ня ўпрáвіцца (I); (pf.) to miss
перахапíць (II); (pf.) fut. **перахаплю́, перахопіш, -яць** to intercept
паўнаводны, -ая, -ае deep
падкочвацца (I); падкочваюся, -ешся, -юцца to roll to, to get to
мінýўшчына, -ы (f.) past
слáўная мінýўшчына glorious past
абмялéць (I); (pf.) past **абмялéў, -ла, -лі** to become shallow
апусьцéць (I); past **апусьцéў, -ла, -лі** to become empty
Латы́ш, -á (m.) Latvian
Ры́га, -і (f.) Riga
усяроўна што just like
жы́ла, -ы (f.) vein
сплаўля́ць (I); сплаўля́ю, -еш, -юць to float, to raft
Горадна, -а (n.) Grodno, a city in north-western Byelorussia

* In Zhyrovicy are found an old monastery from the fifteenth century and a shrine to the Mother of God.

20 — 23Ф COMPOUND WORDS / ПРАВАПІС СКЛАДА́НЫХ СЛОВАЎ

1. **Складаныя словы,** складзеныя з двух ці больш словаў (асноваў), **звычайна** разглядаюцца як словы з **адным націскам,** і тады яны **падпарадкуюцца** ўсім **правілам аканьня.** Прыкладам:

самалёт	**даўганосы**	**поўдзень**	**штагоду**
сенажа́ць	**паўнаводны**	**поўнач**	**штаночы**
землятру́с	**разнаста́йны**	**паўгоду**	**штадзённы**
дабрадзе́й	**стагадовы**	**паўмэтра**	**стаміліённы**

2. Некаторыя адна[illegible] складаныя словы захавалі **націскі** ў **вабедзьвюх** складовых **частках** і такім парадкам маюць **два націскі.** У гэтакіх словах дапушчаецца напісаць два **о,** ці **о** й **э, о** й **ё** і г. д. Прыклады:

[illegible] **лёгкаатлетычны** ды **шэсьцьсо́т, шэсьцьсо́тны, во́семсо́т, во́семсо́тны . . .** (Глядзі пр. **25—I, УВАГА 1.**)

УВА́ГА 1. Некаторыя складаныя словы паміж складовымі часткамі **маюць злучаль-**

[illegible]вадка (whey, fluid in cottage cheese)
[illegible]дні (dry fasting)
[illegible]): самалёт, пустацьве́т, землятру́с,
[illegible] задняязы́чны

УВА́ГА 2. [illegible] толькі **пад націскам,** а **не пад націскам**
[illegible]паў"

а) **поўнач, поўдзень, полудзень,** але
б) **паўгоду, паўмэтра, паўдаля́ра, паўме́сяца, паўтара́, паў-Эўропы, паў-Ві́цебска**

УВА́ГА 3. Ненаціскнае **"э"** у першай частцы складаных словаў захоўваецца **бязь зьмены:** мэтазгодны, шэравокі, тэлеба́чаньне.

***

1. **Compound words** (words composed of two words), are usually regarded as single words with **one stress.** For example:

самалёт	airplane	**поўдзень**	noon
землятру́с	earthquake	**поўнач**	1. midnight; 2. north
паўнаводны	deep	**паўгоду**	half of a year

2. **Sometimes compound words** retain the original stress in both parts and thus have **two stresses:**

тро́хпаве́рхавы	three-storey high	**шэсьцьсо́т**	six hundred
каро́ткатэрмі́но́вы	short-term	**шэсьцьсо́тны**	six-hundredth

NOTE 1. In **some compound words** vowels are inserted to join the two parts. The **joining vowels** are:

о, е (when **stressed**): сыр**о**вадка (whey), сух**е́**дні (dry fasting)
а, я (when **unstressed**): сам**а**лёт, земл**я**тру́с (earthquake), кан**я**гадоўля (horse-breeding)

NOTE 2. "э" in the **first part** of a compound word, either stressed or unstressed, remains **unchanged:**

шэравокі	grey-eyed
мэтазгодны	advisable
тэлеба́чаньне	television

20 — I DECLENSION OF ADJECTIVES IN THE PLURAL
СКЛАНЁНЬНЕ ПРЫМЕ́ТНІКАЎ у множным лі́ку

1. **У множным ліку** прыметнікі маюць **адну форму** для **ўсіх трох родаў:**

Адз. лік: добры хлопец
добр**ая** дзяўчы́на
добр**ае** дзіця́

Множны лік: добр**ыя** — хлопцы, дзяўча́ты, дзе́ці

2. **Узор скланеньня** (скланеньне ў вадзіночным ліку глядзі правіла 16-I, б)

Для ўсіх родаў

а) **Цьвярда́я** аснова й **зацьвярдзе́лая** (незалежна ад націску).

Н.	чорн**ыя**	стары́**я**
Р.	чорн**ых**	стары́**х**
Д.	чорн**ым**	стары́**м**
В.	як Н. або Р.	
Т.	чорн**ымі**	стары́**мі**
М.	чорн**ых**	стары́**х**

б) **Мяккая́** аснова й **задняязы́чныя** (на **г, к, х**).

					Параўнайце да займенніка "яны́"
Н.	сі́н**ія**	даўгі́**я**	высокі**я**	сухі́**я**	**яны́**
Р.	сі́н**іх**	даўгі́**х**	высокі**х**	сухі́**х**	**іх**
Д.	сі́н**ім**	даўгі́**м**	высокі**м**	сухі́**м**	**ім**
В.	як Н. або Р.		як Н. або Р.		**іх**
Т.	сі́н**імі**	даўгі́**мі**	высокі**мі**	сухі́**мі**	**і́мі**
М.	сі́н**іх**	даўгі́**х**	высокі**х**	сухі́**х**	**іх**

УВАГА. Пры **мяккой** аснове й **задняязы́чнай** (на **г, к, х**) у **множным ліку канчаткі** прыметнікаў ва ўсіх ускосных склонах **адпаведна такія самыя,** як і **форма** ад **займенніка "яны́".**

**
*

In the **plural**, unlike in the singular, adjectives **have one form for all three genders.** For example:

SINGULAR	PLURAL
добры хлопец	хлопцы
добрая дзяўчына	добрыя — дзяўчáты
добрае дзіця́	дзéці

NOTE 1. The **accusative** of adjectives modifying **inanimate** nouns is **the same as** the **nominative** (мáю цікáвыя кнíгі); the accusative of adjectives modifying **animate** nouns is **the same as** the **genitive** (ён мáе прыгожых сяcьцёр).

NOTE 2. The **plural endings** of adjectives with a **soft stem** or **back stem** ending in **г, к, х,** in all cases other than the nominative, respectively **are identical** to the **forms of the personal pronoun "яны́", see** 20-I, 2б.

20 — II THREE KINDS OF ADJECTIVES
ПРЫМЕ́ТНІКІ ЯКА́СНЫЯ, АДНО́СНЫЯ (або АДКА́ЗНЫЯ) І ПРЫНАЛЕ́ЖНЫЯ

Па значэньню прыметнікі дзеляцца на тры групы: **я́касныя, адносныя** (або **адка́зныя**), **прынале́жныя.**

1. Я́касныя [illegible] **я́касьці,** якія **могуць** выяўляцца ў **большай** ці меншай ступені, [illegible] колер (**зялёны, чорны**), смак (**салодкі**), форма або памер (**кру́глы, даўгі́**), нутраныя якасьці чалавека (**добры, разу́мны, адва́жны**) і г. д.

2. **Адносныя** (або **адка́зныя**) прыметнікі паказваюць на: **матар'ял,** зь якога дадзены прадмет (**драўля́ны** дом, **зале́зны** мост); **ме́сца** знаходжаньня яго (**тутэйшы, гарадзкі́, вясковы**); паходжаньне ці стан (**белару́скі, кана́дзкі, студэнцкі, ба́цькаўскі**); **час існава́ньня** (**зімовы, учара́шні**); **вагу́** (**пяцíфунтовы**) і да г. п.

Адносныя прыметнікі так, як і якасныя прыметнікі, адказваюць на пытаньне **які́? яка́я? якое?**

3. а) **Прынале́жныя** прыметнікі адказваюць на пытаньне **чый? чыя́? чыё?** ды паказваюць на **прыналежнасьць** прадмету асобе ці жывёліне, ад назову якіх утвораныя гэтыя прыметнікі, прыкладам:

рыбакоў човен,	**бра́тава** ха́та,	**ба́цькава** а́ўта
ма́тчын абру́с,	**сястрына́** кніга,	**вавёрчына** гняздо

б) **Прынале́жныя** прыметнікі **ўтвараюцца** ад асноваў **ажыўленых** назоўнікаў даданьнем: I. да назоўнікаў **мужчынскага** роду -- суфіксаў:

-оў, -аў (камар**оў**, ся́бр**аў**), або
-ёў, -еў (кавал**ёў**, слан**ёў**, Васіл**ёў**, Але́с**еў**)

II. а да назоўнікаў **жаноцкага** роду суфіксаў: **-ін, -ын.**

-ін — пасьля **цьвярдой** асновы: варона — варон**ін**; Зіна — Зін**ін**
ды **мяккой** асновы: Зося — Зос**ін**, Нáсьця — Нáсьц**ін**
-ын — пасьля **ўсіх іншых** асноваў: сястрá — сястр**ы́н**; цётка — цётч**ын**

***

1. The **Possessive** adjectives answer **the question чый? чыя? чыё?** They indicate possession by a **person or an animal** from whose name they are formed. For example:

father's cap — бáцьк**ава** шáпка

2. **To form a possessive** adjective:

a) the suffix **-оў, -аў, -ёў** or **-еў is added** to the stem of a **masculine animate** noun. For example:

краўц**оў**, сы́н**аў**, кавал**ёў**, лосе**ў**

b) and the suffix **-ін** or **-ын** (the suffix **-ін to nouns** with **hard or soft stems**, the suffix **-ын to all other** stems) **is added** to the stem of a **feminine animate** noun:

Н**ін**ін, Зос**ін**, мáтч**ын**, сястр**ы́н**

3. In **expressions** of possession, such as "father's house", **instead of the genitive** case as in English for example, in Byelorussian, **possessive adjectives are used.** For example:

father's house — бáцьк**аў** дом,
sister's book — сястр**ынá** кнíга,
a sparrow's nest — вераб'ёв**а** гняздо

When the names of persons or **animals** are used **in the possessive with other descriptive words, the genitive** case is also used. For example:

my father's house — дом майго бáцькі
the little sparrow's nest — гняздо малога вераб'я́

20 — III LONG AND SHORT FORMS OF ADJECTIVES
ПРЫМЕ́ТНІКІ ПОЎНЫЯ Й КАРОТКІЯ

1. Бальшыня **я́касных** прыметнікаў могуць мець форму **поўную** й **кароткую.** Прыкладам:

а) **поўныя:** малады́, вялíкі, зялёная, салодкі, хíтры
кароткія: молад, вялíк, зялёна, саладок,* хіцёр*

* У кароткіх прыметніках мужчынскага роду, калі аснова канчаецца на колькі зычных, зьяўляюцца беглыя галосныя: **а, о, е** або **ё.**

б) **Кароткія** якасныя прыметнікі ужываюцца **радзей,** як поўныя, ды **толькі** ў **назоўным** склоне адзіночнага й множнага ліку. У іншых склонах яны прыймаюць канчаткі поўнае формы.

У сказе кароткія прыметнікі выступаюць пераважна ў ролі выказьнікаў:

І сéна цэла, і козы сы́ты. Вочы сіні, як васількі.

в) Кароткая форма якаснага прыметніка ўтвараецца ад поўнай "скарачэньнем" канчаткаў:

прыгожы	прыгожая	прыгожае	прыгожыя
сіні (сінь)	сіняя	сіняе	сінія

Гэтак кароткая форма мае наступныя канчаткі:

Адзіночны лік — мужчынскі род — **ніякага канчатку**
— жаноцкі род — **а, я**
— ніякі род — **а, е**

Множны для ўсіх родаў — **ы, і**

2. **Адносныя** [illegible] маюць **толькі поўную** форму: беларускі, зялёзны,

3. **Прыналéжныя** [illegible] **толькі кароткую** форму:

бра́таў	[illegible]ава ша́пка,	бра́тава пяро
Алéсеў мяч,	[illegible]ева кніга,	Алéсева крэсла
ма́тчын сын,	ма́тчына дачка́,	ма́тчына дзіця́

***

There are two forms of adjectives—**the long** and **the short.**

a) **Except** for **possessive** adjectives which in the nominative singular and plural can only be short, **the short forms** in modern Byelorussian are used **very seldom** and even then **only in the nominative.** In all other cases the short adjectives take the endings of the long form.

The **short forms** are used mainly as **predicative** adjectives. For example:

у яго вочы сіні, як васількі

b) The **short** form **is obtained from** the stem of **the long form** as follows:

SINGULAR

	Long form	Stem	+	Short ending	=	Short form
m.	прыгожы сіні	прыгож сінь	+	**none**	=	прыгож сінь

f.	прыгожая сі́няя	прыгож сінь	+	а я	=	прыгожа сі́ня
n.	прыгожае сіняе	прыгож сінь	+	а е	=	прыгожа сіне

PLURAL

m. f. n.	прыгожыя сінія	прыгож сін	+	ы і	=	прыгожы сі́ні

c) Unstable -a-, -o-, -e- or -ë- in short forms.

Long adjectives whose stems end in two consonants generally insert "o", "ë" when stressed and "a", "e" when unstressed **in the masculine** nominative when shortened.

чорны — чоран, чорна
горкі — горак, горка
салодкі — саладок, салодка
поўны — повен, поўна
грозны — грозен (or гразён), грозна
мудры — мудзер (or мудзёр), мудра

20 — IV ADVERBS / ПРЫСЛОЎІ

1. Словы, што адказваюць на пытаньні **як? калі? дзе? куды?** завуцца **прыслоўямі.** Прыклады:

Ён (**як?**) **прыгожа** малюе.
Мы прыехалі (**калі?**) **ўчора.**
Усё зазелянела (**дзе?**) **навокал.**
Дарога йдзе (**куды?**) **направа.**

Прыслоўі - **нязьменныя** словы. У сказе яны паясьняюць:

а) перш-наперш **дзеясловы: прыгожа малюе.**

б) **прыметнікі** й **прыслоўі** (тут яны азначаюць звычайна ступень выражанае імі прыметы): **вельмі прыгожы дзень**
надта прыгожа пяе

в) і рэдка **назоўнікі: чытаньне ўголас, язда конна.**

2. Паводля свайго значаньня прыслоўі дзеляцца на рад групаў, вось важнейшыя зь іх:

а) прыслоўі **способу дзеяньня** (адказваюць на пытаньне **як?**): **добра, высака, вельмі, надта, прыгожа . . .**

б) прыслоўі **месца** (на пытаньне **дзе? куды?**): **тут, там, туды, адтуль, блізка, уверх, уверсе, дома, дамоў . . .**

в) прыслоўі **часу** (на пытаньне **калі?**): **цяпер, сёньня** (або **сяньня, сягоньня**), **заўтра, пазаўчора, летась, улетку, зранку, раньні . . .**

3. **Правапіс прыслоўяў.**

а) **Прыслоўі з прыназоўнікамі** пішуцца **заўсёды зьліта:**

пазаўчора	назаўсёды	зáвідна	бясконца
поначы	надарэмна	зáраз	удаўжкі
папрáўдзе	нáнава	зáмуж	удосыцьце
потым	нáнач	здалёк	улéтку
пазáўтра	насýстрач	зосну	узíмку

і таксама: пабеларýску, паангéльску, пафранцýску, памойму, патвойму, панашаму, пановаму, памáлу, паасобку, паблізу, папросту, папéршае, падругое, патрэйцяе, павоўчы і г. д.

б) Трэба адрозьніваць **назоўнікі з прыназоўнікамі** ад **прыслоўяў,** што падобна гучаць:

назоўнік з прыназоўнікам — пішацца **асобна**	**прыслоўе** — пішацца **зьліта**
З пачáтку (чаго?) дня.	**Спачáтку** (калí?) пісáлі.
У ночы (якія?) зімовыя.	Ен уп[illegible] (калí?) éхаў.
У восень (якýю?) **халодную.**	[illegible] (калí?) гэта здáрылася.
У дзень (які?) **лéтні.**	[illegible] калí?) было горача.

в) Адмоўе **не(ня)** пішацца **зьліта** ў прыслоў[illegible] **нéяк, нéдзе** (= дзéсьці), **нéкуды** (= кудысьці), **нéкалі** (= калісьці), а таксама ў прыслоўях, дзе **"не"** ўтварае новае паняцьце і паняцьце гэтае можна замяніць сынонімам бязь **"не"**, прыкладам:

нядобра (блáга), **нялёгка** (цяжка), **недалёка** (блізка).

Але калі робіцца супрацьстáўленьне двух паняцьцяў, дык **не(ня)** пішацца асобна: Самалёт ляцéў **ня** высака, **а** зусім нізка.

***

1. **Adverbs of manner** (спосабу дзéяньня) formed from adjectives, end in **"-а"** (unstressed). These adverbs are identical in form to short neuter adjectives. For example:

adjectives: прыгожы, добры, высокі, даўгі
adverbs: прыгожа, добра, вúсака, доўга

Adverbs formed from adjectives ending in **"-скі"**, however, are prefixed by **"па"** and end in **"-у"**. For example: беларýскі – **па**беларýску (in Byelorussian)
пафранцýску, **па**сяброўску.

2. Adverbs with the **prepositions (за, з, без, на, у, or па)** are **always written together.** For example:

зараз	**бяс**конца	**у**досыць	**па**заўчора	**па**другое
замуж	**на**дарэмна	**у**лётку	**па**новаму	**па**французску
здалёк	**на**права	**у**поперак	**па**пе́ршае	**у**даўжкі

3. The particle **"не"** is usually written together with the adverb. For example: **не́калі, няпрыго́жа, нядо́бра.**

Only in sentences where contrast is expressed, **"не"** and the adverb are written separately. For example:

Ён **ня** добра напісáў, **а** зусім блáга.
Самалёт ляцéў **ня** вы́сака, **а** ні́зка над лéсам.

4. **Adverbs with prefixes,** such as **"спача́тку, удзе́нь, увосень",** have to be **distinguished from nouns with prepositions.** When a word is followed by a noun in the genitive, or by a modifying adjective, it is a **noun with a preposition** and as usual it must be written **separately.** For example:

ADVERBS	PREPOSITION + NOUN
Спача́тку (калі́?) яны́ пісáлі.	**З пача́тку** (чаго?) ме́сяца.
Удзе́нь (калі́?) ён éхаў.	**У дзень** лéтні прыéмна над рэчкай.
Гэта здáрылася **ўвосень** (калі́?).	**У восень** халодную прырода рыхтуецца да зімы́.

5. Note the spelling of adverbs, such as:

раз-по-раз	**калі́-ні-калі**	**час-часом**	**сяды́-тады́**
перш-на́перш	**я́к-ні-як**	**ся́м-там**	**ледзь-ледзь**
гады́-ў-рады	**дзе́-ні-дзе**	**туды́-сюды́**	**больш-менш**

20 — V GEOGRAPHICAL NAMES AND NAMES OF PERSONS ENDING IN -оў(аў), -ёў(-еў), -ін(-ын)
СКЛАНЕ́ННЕ ПРОЗЬВІШЧАЎ І ГЕАГРАФІ́ЧНЫХ НАЗОВАЎ НА -оў(аў), -ёў(-еў), -ін(-ын)

Прозьвішчы й геаграфічныя назовы з вышэйпададзенымі канчаткамі, г. зн. з формай прыналежных прыметнікаў, скланяюцца так, **як назоўнікі** мужчынскага роду з чыстай асновай. Прыкладам:

а) НАЗ. пісьме́ньнік Бы́каў, паэт Пы́сін
РОД. пісьме́ньніка Бы́кава, паэта Пы́сіна
ДАВ. пісьме́ньніку Бы́каву, паэту Пы́сіну
ТВОРН. зь пісьме́ньнікам Бы́кавам, паэтам Пы́сінам
МЕС. пры пісьме́ньніку Бы́каву, паэту Пы́сіну

б) НАЗ. горад Пскоў, Крычаў, Магілёў, Дзярэчын
РОД. з гораду Пскова, Крычава, Магілёва, Дзярэчына
ТВОРН. пад горадам Псковам, Крычавам, Магілёвам, Дзярэчынам
МЕС. у горадзе Пскове, Крычаве, Магілёве, Дзярэчыне

***

Geographical names and names of persons ending in **-оў(-аў), -ёў(-еў), -ін(-ын)** are declined as **masculine** nouns **ending in a consonant.**
For examples look up the Byelorussian text.

ПРАКТЫКАВА́ННЕ 224. ... найбо́льш ўва́жна апавяда́ньне "Белару́скія рэкі" ды ад-кажэце на паста́ўленыя пыта́ньні.

1. Дзе бярэ свой ... Дняпро? 2. Напішэце, якія тут назва́ныя прытокі Дняпра́? 3. П... Дняпро? 4. У якое мора ўпада́е рака́ Дняпро? ... недалёка ад Смале́нска? 6.Скуль выцяка́е рака́ Нёман? ... прытокі Нёмна. 8. Якія гарады́ стаяць над Нёманам? ...ман? 10. Які́ вялікі стары́ белару́скі горад стаіць над Вяль... ...плыва́е Вяльля́? 12. У якое мора ўпада́е Нёман? 13. Яка́я ... Балты́цкае мора? 14. Якія большыя белару́скія гара... ...зна́чаньне ма́юць рэкі для кра́ю?

ПРАКТЫКАВА́ННЕ 225. а) Прачыта́йце ўголас **склада́ныя словы** й словы, з каранёў якіх яны ўтвораныя.

(Словы з **адны́м на́ціскам** і са злуча́льнымі галоснымі: **"а, я"**)

самалёт — **сам** і **лётае**
сенажа́ць —**се́на** й **жаць**
вадала́з — **вада́** й **ла́зіць**
даўгано́сы — **даўгі́** й **нос**
чарнавало́сы — **чорны** й **волас**
сінявво́кі — **сі́ні** й **вока**
паўнаводны — **поўны** й **вада́**
ды белару́скія гарады́:
Нава́градак
Нававяле́йка
Наваполацак
Старадуб

б) Прачыта́йце словы ды ўкладзе́це зь імі ска́зы.

поўнач
поўдзень
полудзень
паўме́сяца
паўмэтра
паўдаля́ра
паў-Кана́ды
паў-Віцебска
паў-Чыка́га

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 226. а) Ад да́дзеных словаў утварэце **склада́ныя словы,** як пе́ршую складовую ча́стку дадаючы **“паў”:**

УЗОР: вядро — паўвядра́
Год, ліст, кру́глы, востраў, кілягра́м, ме́сячны, круг,
Амэрыка, гадзі́на, цэнтымэтр, мі́ля, працэнт, дарога.

б) Замяне́це падчы́ркнутыя словазлучэньні адны́м словам.

УЗОР: Ішоў **палаві́ну гадзі́ны.** — Ішоў **паўгадзі́ны.**

1. Сьпіса́ў **палаві́ну сшытка́.**
2. Дзяўчы́нка **пяцёх год.** (пяцігадовая)
3. Будзі́нак на **пяць паве́рхаў.**
4. Прайшоў **палаві́ну кілямэтра.**
5. Бу́сел з **даўгі́м носам.**
6. Хлопец зь **сі́німі вачы́ма.**
7. Нёман **поўны вады́.**
8. Аб'е́зьдзіў **палаві́ну Эўропы.**

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 227. а) Прачыта́йце ска́зы, а тады́ перапішэце. Падчыркне́це **склада́ныя словы,** ды калі́ ёсьць у іх **злуча́льны галосны,** падчыркне́це яго другі́ раз.

1. Землятру́сы ча́ста быва́юць у Японіі. 2. Вайстраносы човен шыбу́е ўпоперак Пры́пяці. 3. На будаўні́цтве працу́юць бэтонамяша́лкі, зе́млячарпа́лкі, ка́менядрабі́лкі. 4. Будаўні́кі будзю́ць шматпаве́рхавыя дамы́. 5. Ву́чні хадзі́лі на электраста́нцыю. 6. Нава́градак, Нававяле́йка, Наваполацак і Старадуб — белару́скія гарады́. Нава́градак зь іх са́мы стары́, а Наваполацак — са́мы малады́. 7. Дваццацьпяцігра́дусны мароз — невялі́кі мароз.

б) Ува́жна прачыта́йце.

НАВА́ГРАДАК — ПЕ́РШАЯ СТАЛІ́ЦА ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА

Нава́градак, ве́льмі стары́ белару́скі горад, быў сядзі́бай вялі́кага кня́зя Міндо́ўга.

У палаві́не трына́ццатага стагодзьдзя (у 1242 годзе) князь Міндоўг спыні́ў тата́рскія войскі ў ваколіцы Лі́ды, а сем гадоў па тым разьбі́ў іх у бі́цьве пад Койданавам. Тата́ры адступі́лі далёка на ўсход, пакіда́ючы Міндоўгу вялі́кую здабы́чу ды сла́ву пераможца. Ягоную найвышэйшую ўла́ду прызна́лі тады́ ўсе і́ншыя князі́, і Міндоўг пача́ў тварыць новы дзяржа́ўны цэнтр у Нава́градку, загадзя́ забясьпе́чыўшы ему́ абарону ад усяля́кіх варожых напа́даў.

Вялікі князь Міндоўг пашыра́ў сваю́ ўла́ду ня толькі на зе́млі белару́скія, але́ й на Жамойць, цяпе́рашнюю Лятýву, ды ста́ўся такі́ моцны й сла́ўны, што ў 1253 годзе на за́мку ў Нава́градку быў каранава́ны на караля́.

З сталі́чнага Нава́градка ра́зам зь дзяржа́ўнай ула́дай пашы́рылася на ўсе і́ншыя зе́млі, што цяпе́р завю́цца белару́скімі, і ймя прынава́градзкае зямлі́, а зва́лася яна́ Літва́. Ад таго ча́су наш край праз больш, як паўты́сяча гадоў зва́ўся Літвой, дзяржа́ва - Вялі́кім Кня́ствам Літоўскім, а на́шыя пра́шчуры – Ліцьві́на́мі. Гэтак зва́лі наш край і і́ншыя народы ды і́хныя гісторыкі.

У Вялі́кае Кня́ства Літоўскае ўваходзіла як ягоная правінцыя і ся́ньняшняя Лятýва, толькі тады́ яна́ зва́лася Жамойць або Жмудзь.

Жамойці не падаба́лася падляга́ць Ліцьві́ном, ужыва́ць і́хную мову, бо літоўская мова была ўра́давай на ўсей тэрыторыі Вялі́кага Кня́ства Літоўскага, у ёй толькі пі-са́лася правы и кні́гі, і Жамойць ціра́з прабава́ла адарва́цца ад Літвы́. Пе́ршыя паўста́ньні яна́ ўчыні́ла ўжо́ за жыцьцём Міндоўга. У змага́ньні з Жамойцяй у 1263 годзе заў[illegible] і сам кароль Міндоўг.

Навагр[illegible]лі[illegible]лі[illegible]лі

в) Прачыта́йце пыта́ньні ды адкажэце на іх паводля чыта́нкі з пу́нкту “б”.

1. У каторым стагодзьдзі жыў князь Міндоўг?
2. У каторым годзе і зь кім была́ бітва пад Койданавам? Хто ў ёй перамог?
3. Дзе й калі Міндоўг быў каранава́ны на караля́?
4. Як зва́ўся калісь наш край, і як зва́лася тады́ на́шая дзяржа́ва?
5. Чаму́ Жамойць узняла́ паўста́ньне супроць Міндоўга?

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 228. а) Прачыта́йце ўголас і запамята́йце **прыме́тнікі**, утвараныя **ад назоўнікаў.**

вішня — вішнёвы	зяле́за — зяле́зны	горад — гарадзкі
дуб — дубовы	паве́тра — паве́траны	восень — восенскі
клён — кляновы	мароз — марозны	грамада́ — грама́дзкі
зіма́ — зімовы	ноч — ночны	ся́бра — сяброўскі
вясна́ — веснавы́	рака́ — рэчны	ву́чань — вучнёўскі

б) Паводля ўзору **прыме́тнікі** з пункту “а)” напішэце **з назоўнікамі**, мужчы́нскага, жаноцкага або ніякага роду.

УЗОР. Вішнёвае дрэва

в) Праскланя́йце ў множным ліку:

1. Новыя сшыткі, кнігі, пёры.
2. Дубовыя сталы́, ла́ўкі, крэслы.
3. Сардэчны ся́бра, сардэчная пе́сьня, сардэчнае слова.
4. Прыгожы дом, прыгожая рака́, прыгожае ме́ста.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 229. Паводля ўзору ад да́дзеных назоўнікаў утварэце **прынале́жныя прыме́тнікі** ў трох родах і дада́йце да іх адпаве́дна назоўнікі.

УЗОР. 1. Ба́цькаў сад, ба́цькава ха́та, ба́цькава а́ўта.
2. Ма́тчын сын, ма́тчына суке́нка, ма́тчына крэсла.

а) 1. Ба́цька, брат, ся́бра, дзя́дзька, наста́ўнік, Антось, кава́ль, бу́сел, рыба́к, краве́ц, Васіль, Вітаўт, Франу́к, Віця.

2. Ма́тка, сястра́, сяброўка, цётка, варона, Зіна, Зося, На́сьця, Ганю́ля.

ESTONIAN S.S.R.
Pskoŭ
Vostraŭ
BALTIC SEA
RIGA
LATVIAN S.S.R.
Apočka
Siebież
Nieviel
Dźvinsk
Aśviejskaje Voz.
Brasłaŭ
Dzisna
Navapołacak
Połacak
Dźvina
Viciebsk
Pastavy
Voz. Narač
Lepiel
Vorša
Viella (Vilija)
Maładečna
Łahojsk
Barysaŭ
Škloŭ
Lida
Horadna (Hrodna)
Niaman
342
MIENSK (Minsk)
346 + h Sviataja
Navahradak
Stoŭpcy
POLAND
Białystok
Narva
Ščara
Słonim
Baranavičy
Babrujsk
Žyrovicy
Słucak
Žłobin
Pcič
Salihorsk
Hancavičy
Svietłahorsk
Pružany
Belavieŭskaja Puščа
WARSZAWA (Warsaw)
Bieraście
Rečyca
Dnieper
52°
(Brest)
Pinsk
Prypiać
Turaŭ
Mazyr
Bug
Haryń
Lublin
Wisła
UKRAINIAN S. S. R.
SCALE 1:4,000,000 1cm=40km
20°

The eastern, northern and northwestern boundaries of the Byelorussian language are presented according to the maps prepared and published by the Moscow Dialectologic Commission of the **Russian Academy of Arts and Sciences** in Petrograd — Moscow 1914-15.

Межы засягу беларускае мовы на ўсходзе, поўначы й паўночным захадзе пададзеныя паводля картаў **Маскоўскае Дыялекталягічнае Камісіі Расейскай Акадэміі Навук** Петраград—Масква, 1914-15.

SUPPLEMENTARY INFORMATION ABOUT BYELORUSSIA

The area of the Byelorussian Soviet Socialist Republic (BSSR) which encompasses approximately three-fifths of Byelorussian ethnographic territories is 207,600 sq. km. (80,134 sq. miles).

The Republic is divided into six administrative districts or voblasc: Bierascie (Brest), Horadna (Grodno), Viciebsk (Vitebsk), Mahileu (Mogilev), Homiel (Gomel), and Miensk (Minsk) in which the capital city of Miensk is located.

Population

The population of the Byelorussian SSR as of January, 1977 was 9,451,000. The composition of the population by nationality (based on the census of 1970) is as follows: Byelorussians, 80.4%; Russians, 10.4%; Poles, 4.3%; Ukrainians, 2.1%; Jews, 1.6%; and others, 0.6%.

As of January, 1977 there were 10 cities in Byelorussian SSR with a population of 100,000 or more: Miensk, 1,261,000; Homiel, 373,000; Viciebsk, 293,000; Mahileu, 282,000; Babrujsk, 201,000; Horadna, 192,000; Bierascie, 174,000; Baranavichy, 131,000; Vorsha (Orsha), 116,000; and Barysau, 108,000.

There are 30 Post-Secondary Educational Institutions in the republic including two universities located in the cities of Miensk and Homiel, and a third one currently being established in Horadna.

Natural resources

The country is rich in water resources as there are roughly 10,800 lakes found in Byelorussia. The largest of them is Narach, with surface area of 79.6 sq. km.

The main rivers of Byelorussia are: the Dniapro (Dnieper), Prypiac (Pripet), Nioman (Nemen), and the Dzvina (Western Dvina). In all there are approximately 20,800 rivers with a total length of over 90,600 km., of which about 4,000 km. are navigable.

Another valuable natural resource of Byelorussia are the 7 million hectares of forest.

Mineral resources

In the period between 1965 and 1975, Soviet Byelorussia became the major producer of potash salt and potash fertilizer in the Soviet Union. The surveyed potash salt deposits amount to about 40 billion tons.

ДАВЕДКІ ПРА БЕЛАРУСЬ

Тэрыторыя Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі (БССР, якая абымае каля $\frac{3}{5}$ беларускіх этнаграфічных земляў) — 207,600 квадратных кілямэтраў.

Рэспубліка адміністрацыйна падзеленая на 6 акругаў (вобласьцяў): Берасьцейская, Горадзенская, Віцебская, Магілеўская, Гомельская ды Менская з выдзеленым местам Менскам.

Жыхарства

Колькасьць жыхароў на 1-га студзеня 1977 г. у Беларускай ССР была 9,451,000.

Склад жыхарства рэспублікі паводля нацыянальнасьці ў перапісе 1970 г.: Беларусы 81%, Расейцы — 10.4%, Палякі — 4.3%, Украінцы — 2.1%, Жыды — 1.6%, іншыя — 0.6%.

Месты Беларускае ССР з жыхарствам больш за 100,000 на 1-га студзеня 1977 г. у тысячах: сталіца рэспублікі Менск — 1,261, Гомель — 373, Віцебск — 293, Магілеў — 282, Бабруйск — 201, Горадна - 192, Берасьце — 174, Баранавічы — 131, Ворша — 116, Барысаў — 108.

У рэспубліцы 30 вышэйшых навучальных установаў, у гэтым два ўнівэрсытэты — Менскі й Гомельскі ды ў працэсе арганізацыі трэйці — у Горадне.

Рэкі, азёры й лясы

Найбольшыя рэкі ў Беларусі: Дняпро, Прыпяць, Нёман, Дзьвіна. Лік усіх рэкаў даходзіць да 20,800 з агульнай даўжынёй больш за 90,600 км.

Багатая Беларусь і на вазёры, усіх каля 10,800. Найбольшае зь іх возера Нарач з плошчай 79.6 кв. км.

Іншае важнае натуральнае багацьце Беларусі — гэта больш за 7 міліёнаў гэктараў лесу.

Мінэральныя багацьці рэслублікі

Калійныя солі каля Старобіна й Петрыкава (у Менскай і Гомельскай вобласьцях).

Каменная соль залягае каля Старобіна (Менская вобл.), Мазыра й Давыдаўкі (Гомельская вобл.).

Since the discovery of oil in Byelorussia in the mid 1960s its output has steadily increased with the largest deposits found in the eastern Polesie.

The land is rich in **peat,** — providing material for the chemical industry and for the production of electrical energy, — **rock salt, coal, shale, phosphates, dolomites, limestone, kaolin, sand and gravel,** and other building materials.

Industry and Production

Although power and energy production are the major industrial concern in Byelorussia, the republic is prominent in the metallurgical, chemical, textile, lumber, pulp and paper, and fertilizers industries of the Soviet Union. Some products, of which Byelorussia produces a disproportionate amount in the Soviet Union, include tractors, motorcycles and scooters, metal-cutting lathes, bearings, computers, wrist watches, pianos, chemical fibres, and televisions.

Agriculture specializes in flax-fibre, grain, sugar, meat, eggs, and dairy products. It produces about one-tenth of the world's total potato crop.

The Salihorsk [illegible] of Byelorussia's chemical industry

Нафта знаходзіцца ў пяцёх радовішчах на ўсходнім Палесьсі.

Каля 12% тэрыторыі рэспублікі займаюць тарфянікі, у якіх знаходзіцца каля 30.4 міліярдаў кубамэтраў **торфу,** сыравіны для хэмічнай прамысловасьці й для вытворчасьці электрычнай энэргіі.

Бурае вугальле залягае ў Гомельскай, Берасьцейскай і Менскай вобласьцях ды **гарушчыя сланцы** (shale) каля Турава, Любані (Гом. вобл.) і Старобіна.

Зялезная руда знойдзеная каля Стоўпцаў і Карэлічаў (Менская й Горадзенская вобл.).

Апрача гэтага Беларусь багатая на іншыя вартасныя для народнае гаспадаркі выкапні: **фасварыты, лёгкаплаўкія гліны, пяшчана-жвірова-галечныя** матар'ялы, **сылікатныя й будаўляныя пяскі** (сыравіну для вырабу цэмэнту), **граніт, вапняковую сыравіну, будаўляны камень, шкляныя пяскі, тугаплаўкія гліны й каалін** (для вырабу порцаляны), а таксама **лекавыя мінэральныя воды** ды іншыя.

Прамысловасьць: машынабудаўляная, аўтамабільная, мэталяапрацоўная, электратэхнічная, хэмічная, мінэральных угнаеньняў, нафтавая, будаўляных матар'ялаў, лесаапрацоўная, паперная, тэкстыльная, штучнага валакна, абутку, харчавая, цукровая.

Прадукцыя рэспублікі: грузавыя аўтамабілі, трактары, кампютары, машынабудаўнічыя прылады, тэлевізары, радыяапараты, халадзільнікі, машыны шыць, гадзіньнікі; бульба, лён, збожжа, яйкі, мясныя й малочныя прадукты.

б) Прыме́тнікі з назоўнікамі з пу́нкту "а)" **(ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 229)** напішэце ў **множным ліку.**

УЗОР. 1. Ба́цькавы сады́, ба́цькавы ха́ты, ба́цькавы а́ўты.
2. Ма́тчыны сыны́, ма́тчыны суке́нкі, ма́тчыны крэслы.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 230. а) Перапішэце ска́зы. Вы́пішце **прыме́тнікі ў кароткай форме** ды побач дапішэце іхную **поўную форму**.

1. Пе́ршыя громы, сэрцу вы мі́лы, люб мне ваш сьмех паміж гор! (Колас)
2. Забурлі́ла сіне мора ад віхроў. (Купа́ла)
3. Стаў чы́рван ме́сяц круглаліцы. (Колас)
4. Мне мі́лы рэчка, лес і луг.
5. Уда́ўся гарох тонак і высок, на лі́сьце шырок.
6. Ня той харош, хто на твар прыгож, а той харош, хто на спра́ву гож.
7. Повен хлявёц бе́лых авёц. (Рот і зу́бы).

б) Перапішэце паводля ўзору да́дзеныя **поўныя прыме́тнікі**, а побач іхную **кароткую форму**.

вялі́кі, вялі́кая, вялі́кае; малы́, мала́я, малое; стары́, стара́я, старое; бе́лы бе́лая, бе́лае; чырвоны (чы́рван), кароткі (каротак), гла́дкі (гла́дак), грозны (грозен), мі́лы, мі́лая, мі́лае, дарагі́ (дораг).

УЗОР.

Мужчынскі род		Жаноцкі род		Ніякі род	
Поўны	**Кароткі**	**Поўны**	**Кароткі**	**Поўны**	**Кароткі**
вялі́кі	вялі́к	вялі́кая	вялі́ка	вялі́кае	вялі́ка
. . .	. . .	. . .	. . .	. . .	. . .

в) Прачыта́йце, а тады навучэцеся напа́мяць.

СЬНЯЖЫ́НКІ

Закружы́ліся
Сьняжы́нкі
Ні́зка, ні́зка
Над зямлёй.
Ці́ха лётаюць
Пушы́нкі
Нязьлі́чонай
Чарадой.
Бы́ццам ты́я
Матылёчкі,
Весяля́цца
Нездарма́ —
Адамкну́ла
Ўсе замочкі
Ў не́бе ім
Сама́ зіма́

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 231. а) Прачыта́йце **прыслоўі** ды запішэце іх у альфабэтным па-ра́дку зь іхным англе́льскім зна́чаньнем.

1.	цяпе́р	памойму	ра́на	здалёк
	сягоньня	уле́тку	узімку	нале́та
	назаўсёды	за́раз	адту́ль	ці́ха
	учора	не́калі	бясконца	на́нач
2.	не́дзе	вы́сака	ху́тка	ура́ньні
	пазаўчора	дамоў	шпа́рка	шмат
	ле́тась	дома	пама́лу	на́дта
	на́нава	вясёла	ча́ста	папе́ршае

б) У кля́се ву́чні склада́юць ву́сна кароткія **ска́зы** з гэтымі **прыслоўямі.**

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 232. а) Прачыта́йце ска́зы, а тады́ ў вадзін слупок вы́пішце дзе-ясловы **з прыслоўямі,** а ў другі — **назоўнікі з прыме́тнікамі.** Паста́ўце пыта́ньні.

УЗОР. Паказа́ліся (калі?) позна. Вясна́ (яка́я?) позная.

1. Сёлета позная вясна́ не сьпяша́лася. На дрэвах позна паказа́ліся пе́ршыя зялёныя лісточкі.
2. Прыгожая я́блынка стая́ла ў ружовым убра́ньні. Прыгожа вясна́ апрану́ла прыроду.
3. Высокая хвоя вы́расла на ўзьле́сьсі. Вы́сака на ма́чту ўзьнімаецца бел-чырвона-бе́лы сьцяг.
4. Дзе́ці вясёла гуля́лі. Зь ле́су вясёлая гу́рба дзяце́й ськівава́лася да рэчкі.
5. Каля́ ракі́ бы́ў шырокі луг. Рака́ разьліла́ся шырока.
6. Самалёт узьня́ўся ў высокае не́ба. Вы́сака ў не́бе мігце́лі зоркі.

б) Дапіса́ць да да́дзеных **прыслоўяў прыслоўі з супрацьле́жным** зна́чаньнем ды ў кля́се ву́сна ўкла́сьці зь імі ска́зы.

УЗОР. Уніз — уве́рх

зьле́ва	сьпе́раду	зблізку	вясёла	добра
гло́ыбака	нізка	зьнізу	павольна	ра́на
ця́жка	уве́чары	уве́рсе	удзе́нь	упе́рад

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 233. а) Перапішэце ска́зы. Растлума́чце, да яки́х часьці́наў мовы нале́жаць падчы́ркнутыя словы. Перакладзе́це ска́зы ў анге́льскую мову.

1. Некаторыя хва́брыкі працу́юць **удзе́нь** і **ўночы**.
2. **У дзень**, такі́ прыгожы, добра ла́дзіць маёўку.
3. Мы прые́халі **ўночы. У ночы** зімовыя быва́юць моцныя маразы́.
4. Яны́ жыву́ць **уні́зе,** а на паве́рсе жыве́ і́хны сын зь сям'ёю. **У ні́зе** і́хнага дому ніхто ня жыве́, там яны ма́юць кра́му.
5. **Увосень** ча́ста йдуць дажджы́. **У восень** позную дні кароткія, а ночы даўгія.
6. Воз перакулі́ўся **набок.** Мы зье́халі **на бок дарогі**.
7. **За́раз** пачне́цца ле́кцыя. Тут гэтулькі кні́гаў, мы іх не забяром **за раз,** ані́ за два разы́.

б) Перапішэце, **словы з ду́жак** адпаве́дна напішэце **зьлі́та** або **асобна** з насту́пным словам. Зьмяне́це, дзе трэба, **"з"** на **"с"**.

1. (У) гары над хвойнікам зялёным снуюцца пчолкі зь ці́хім звонам.
2. (У) гары́ гэтай ёсьць пячора.
3. (У) восень пту́шкі адлята́юць у вы́рай.
4. (У) восень цёплую добра расту́ць грыбы́.
5. (З) пача́тку вясны́ расьцьві́лі прале́скі.
6. (З) пача́тку разьвяза́лі зада́чы, а тады́ перапіса́лі практыкава́ньне.
7. Не́дзе (з) боку ці́ха бу́лькала рэчка.
8. (З) боку ле́су бліснула мала́нка.
9. Совы (у) дзень сьпяць, а (у) ночы лётаюць.
10. (У) дзень пагодны на пля́жы ўсю́ды шмат людзе́й.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 234. а) Перапішэце ска́зы, замі́ж падчы́ркнутых **прыслоўяў** устаўля́ючы блізкія зна́чаньнем з часьці́нкай **"не(ня)"** са слупка́ з пра́вага боку.

УЗОР. Нам **ма́ла** давялося адпачыва́ць. Нам **няшма́т** давялося адпачыва́ць.

1. Нам **ма́ла** давялося адпачыва́ць. **нярэдка**
2. Мы **ча́ста** наве́двалі маста́цкую галерэю. **нягу́чна**
3. Яны́ знайшлі́ **шмат** баравікоў у бары́. **нядобра**
4. **Бліска** ад школы працяка́е рака́. **нема́ла**
5. Пту́шкі ляце́лі **ні́зка**. **няпрые́мна**
6. **Раптоўна** пе́рад на́мі адкры́лася прыгожая паля́на. **няшма́т**
7. **Ці́ха** ён гаварыў, а́ле выра́зна. **няпрыгожа**
8. Ён шмат хварэе й **бла́га** выглядае. **нявысока**

9. Я́нка, **бры́дка** гэтак пла́каць. **недалёка**
10. Сустрэцца з маім кало́шнім ся́брам з клясы Антосем Пысінам было ве́льмі **пры́кра.** **нечака́на**

б) Перапішэце ска́зы, пі́шучы **“не (ня), ні” зьлі́та** або **асобна.**

1. Ты сам (не) шмат тут зробіш. 2. Згу́бленае золата можна знайсьці́, згу́блены час — (ні) колі. 3. Дажджы́ ў тра́вені ме́сяцы йшлі (не) рэдка, а ве́льмі ча́ста. 4. Зь нізі́ны па гэты бок Нёмна (не)сьціха́на, аднатонна крактáлі жáбы. 5. Тут (не) су́ха, а вадá сочыцца пад нагáмі. 6. “Народныя ду́мы й ка́зкі давáлі мне сі́лы (не) ма́ла” — сказáў Я́нка Купа́ла. 7. (Не) даўно, а толькі сёлета мой брат скончыў унівэрсытэт. 8. (Не) даўно яны́ былі́ ў Сяднёва. Хто яны́? “Мой брат з Антосем (За́йцаў) і Язэпам (Чыгры́н)”.

в) Выра́зна чыта́ць, **вы́пісаць** у вадзі́н слупок усе́ **прыслоўі,** а ў другі ўсе **прыме́тнікі.**

КАСЬМІ́ЧНЫ ЭКІПА́Ж

Хлопчык ра́нкам у кватэру
Прыцягну́ў з двара́ фане́ру
І за ша́фаю
Тайком
Доўга сту́каў малатком:
Забіва́ў цьвікі́
Упа́рта.
І глядзе́це —
Вось дык цуд! —
Карабе́ль гатоў да ста́рту,
Аж да зор яго маршру́т.
Пазайздросьцяць Сла́ўку дзе́ці!
Касмана́ўт мале́нькі наш
Для палёту на раке́це
Падбіра́е экіпа́ж.

— Ма́ці перш за усё, вядома,
Зь ёю бу́дзе лёгка мне.
Зажыву́ ня горш, як дома,
На касьмі́чнай цаліне́.

З ма́май бе́ды ўсе — ня бе́ды!
У міжзорным караблі́
І сьняда́нкі, і абе́ды
Бу́дуць, як і на зямлі́.
На аднэй нябёснай ма́ньне
Хіба́-ж доўга праляці́ш?.. —
Ад відна́ і да зьмярка́ньня
Непакоіцца малы́.
— А які́ палёт бяз ба́цькі?
Бу́дзе ме́сца і ямý.
Хто купля́ць мне бу́дзе ца́цкі,
Калі́ та́ткі не вазьмý?
А сябры́:
Антось, Мікола,
І Ната́лька, і Рыгор,
Ты́я, зь кім хаджу́ я ў школу?
Як бязь іх ляце́ць да зор?
. . . Так вядзе́ сваé падлі́кі
Касмана́ўт мале́нькі наш.
І расьце́, расьце́ вялі́кі,
Нябыва́лы экіпа́ж.

П. Мака́ль

Слоўнік (Vocabulary)

фанéра, -ы (f.) plywood
тайком (adv.) secretly
цьвік, -á (m.) nail
цуд, -у (m.) miracle
маршрýт, -у (m.) route
палёт, -у (m.) flight
падбірáць (I); падбірáю, -еш, -юць to select, to pick
экіпáж, -у (m.) crew
касьмічная цаліна́ (f.) (in this case) outer space
нябёсная мáнна (f.) heavenly manna (biblical)
зьмяркáньне, -я (n.) dusk
непакоіцца (II); непакоюся, -ішся, -яцца to worry, to be anxious about
малы, -ога (m.) little boy
вазьмý (pf.) fut. of **бярý** I shall take
падлíк, -у (m.) calculation
нябывáлы, -ая, -ае unprecedented

Ruins of the Castle [illegible] the 10th and 16th centuries) in Navahrudak

КРУГ 21

ТВАР У ТВАР З НАВУ́КАЙ

(Паводля аповесьці Алёны Васілёвіч "Пачака́й затрыма́йся...")

За пе́ршым днём вучэньня йдзе другі́, ідзе́ трэйці. Так праходзіць ты́дзень. А потым, пасьля́ ўсяго аднаго толькі выходнага дня — у нядзе́лю — зноў пачына́ецца пе́ршы дзень, другі́ дзень, трэйці . . . Га́нька прыкме́тна стамля́ецца на ле́кцыях, аста-е́цца ад старэйшых у дарозе (і старэйшыя крыча́ць на яе́), не пасьпява́е навучы́цца як нале́жыць ле́кцыяў дома... Бо хоць і ду́малася ёй, што як пойдзе яна́ ў школу, то назаўсёды ўжо разьлі́чыцца з па́шай і сьві́ньмі, — нічога з гэтага ня вы́йшла. І сьві́ньні засталі́ся, і па́ша засталася́. І цётка Хвядора, ледзь толькі Га́нька пасьпе́е пад'е́сьці пасьля́ школы, адра́зу-ж адпраўля́е яе́ на вы́ган.

— З навуку́ ва́шай, ка́жа цётка да Га́нькі, — я вам сква́ркі ў торбу не пакладу́. Пасе́це сьві́ньні, каб са́ла было...

І Га́нька бярэ пу́жку й гоніць сьві́ньні на вы́ган. Хоць яка́я кары́сьць? Усяро́ўна ніхто ёй тае́ сква́ркі ў торбу не кладзе́. Ёй — у школу — цётка дае́ сма́жаныя пе́рад полымем на скаварадзе́ сухія скры́лікі бу́льбы...

Ле́кцыі наза́ўтра Га́нька рыхту́е ве́чарам. Сяда́е ў "сталовай", здыма́е са сьцяны й ста́віць на стол ля́мпу ды бярэцца за піса́ньне. Ужо што-што, а гэта піса́ньне Га́ньцы — адна́ паку́та! Наста́ўнік патрабу́е, каб піса́ць чы́ста й роўненька, з на́ціскам... А Га́нька не пасьпе́ла напіса́ць аднаго радка́, як глядзіш, на сярэдзіне чы́стай як сьнег бе́лай балонкі сядзіць ужо чарні́льная "перапе́чка". Пачне́ Га́нька сьціра́ць ту́ю няшча́сную "перапе́чку" сьці́ркай, дык яшчэ прадзярэ дзі́рку! А пачне́ пла́каць ад гора — дык зальле́ сьлёза́мі ўсю балонку...

— От за́ўтра бу́дзе табе́ ад наста́ўніка! — загляда́е ў Га́ньчын сшы́так сястра́ Ва́ля. У яе́ самое сшы́ткі й кні́жкі чы́сьценькія, акура́тныя. (Вядома, яна́-ж вялікая!). Ад гэтай пагрозы Га́нька яшчэ больш разьлива́ецца ракой.

— Вазьму́ й парву́ гэта дурное піса́ньне... Гэта дурное "ы"! — наме́рваецца й запраўды́ парва́ць сшы́так Га́нька.

"Ы" і, пра́ўда, у яе́ ніяк ня пі́шацца. Усе́ дзе́ці яшчэ на ле́кцыі навучы́ліся піса́ць яго, а ў Га́нькі яно ніяк ня выходзіць! Цэлая балонка не́йкіх крыву́ляў, а ня "ы".

— Навошта табе́ сшы́так ірва́ць, - падыходзіць супакоіць Га́ньку дзя́дзька Мікала́й, — вы́рві лепш ужо адну́ гэту няўда́лую балонку ды перапішы́ яе́ зноў.

І Га́нька слу́хаецца дзя́дзькі: вырыва́е балонку ды зноў бярэцца за гэта сваё непадаўко́е "ы".

Дзя́дзька ніко́лі ня сва́рыцца на Га́ньку, ніко́лі не сьмяе́цца зь е́йных памы́лак. Наадварот. Ён ве́льмі лю́біць слу́хаць е́йнае чыта́ньне. А чыта́ць Га́нька ўме́е! У кля́се яна́ ўме́е чыта́ць лепш за ўсіх дзяцёй — пры ма́ме яшчэ навучы́лася — на́вет у сто разоў лепш за Жука́ Іва́на, хоць ён і другагоднік. Дзя́дзька Мікала́й лю́біць разгляда́ць малю́нкі ў Га́ньчыным буквары́. І ве́льмі-ж яму́ заўсёды сьме́шна з буржу́яў: усе́ яны́ як адзі́н у капялю́шох, і пу́за ў ка́жнага таўстое-таўстое, як паду́шка.

— Я на́вет у Амэрыцы такі́х таўсты́х паноў ня ба́чыў, — сьмяе́цца дзя́дзька.

— Бо ў Амэрыцы былі́ паны, а гэта буржу́і, — сур'ёзна тлума́чыць дзя́дзьку Га́нька.

— Хіба́ што так, — згаджа́ецца дзя́дзька.

[illegible] і сваім малява́ньнем. Толькі дзя́дзька, хоць і [illegible] разьбіра́е, што намалява́ла Га́нька ў сваім [illegible]

[illegible] ляту́ць? — пыта́ецца дзя́дзька ў Га́нькі, адносячы ад [illegible] йны малю́нак.

— Журавы... Якія журавы́ - гэта-ж кве́ткі! — абура́ецца такі́м дзя́дзькавым не́вуцтвам Га́нька, — Нічога вы ня ба́чыце!

[illegible] ня бу́ду, [illegible] лагодна згаджа́ецца дзя́дзька Мікала́й.

І Га́нька, добры настрой якой у момант псуе́цца ад гэтых "журавоў", адбіра́е ў дзя́дзькі альбом ды пачына́е сярдзіта склада́ць наза́ўтра ўсю сваю́ навуку ў торбу.

II.

Дзя́дзька варочаецца ў свой куток на ку́хні, дзе ён мудру́е вечара́мі над шы́лам і дра́твай — шы́е й ла́дзіць усёй сваёй сям'і (дый сусе́дзям таксама́) абу́так.

— Хадзі́, Га́нька, — кліча ён з ку́хні, — паглядзі́, якія важне́цкія ту́флі ў цябе́ бу́дуць.

Га́нька нічога не адка́звае, а́ле не адмаўля́ецца, ідзе́.

— Дзе яны́? — пазіра́ючы спадылба, пыта́ецца яна́.

— А вось — на, памера́й! — дастае́ са сваё шаве́цкае скры́нкі санда́лі не санда́лі, ту́флі ня ту́флі дзя́дзька.

— Я такі́х ня хочу! — яшчэ больш надзіма́ецца Га́нька, — яны́ брыдкія. Такі́х ніхто ня носіць.

— Бач, яка́я па́ні ва́жная! — ня вытры́мвае на гэта, адклі́ка́ецца ад пе́чы цётка

Хвядора, — "брыдкія!..". А дзе-ж табе́ ле́пшых узя́ць?.. Другія носяць ле́пшыя, дык у іх бацькі...

— Ну, годзе! — спыня́е цётку дзя́дзька. — А ты памёрай. Ты-ж памёрай толькі... — хоча ўсу́нуць Га́ньчыну нагу́ ў пантофаль дзя́дзька.

Га́нька не даецца.

— Я хачу́ такія, як у Ва́лі...

— Дык Ва́ля-ж ужо ў чацьве́ртай гру́пе! — зноў ня вытры́мвае цётка.

— Табе́ я пашы́ю такса́ма гэтакія, як у Ва́лі. Толькі тава́ру даста́ну, — угаворвае Га́ньку дзя́дзька, — ты толькі прыме́рай.

— Я ня хочу... — ня можа стрыма́ць пла́чу Га́нька ды усё-ж ме́рае нямі́лыя дзя́дзькавы пантофлі.

І тут-жа залива́ецца сьлязьмі яшчэ больш: на назе́ яны́ здаю́цца ёй зусім як ла́пці.

— Я ня бу́ду іх насіць...

— Ня бу́дзеш... Мне толькі не става́ла тваё хваробы. Усе́ дзе́ці ходзяць ужо абу́тыя, а яна́ адна́ бу́дзе босая. Гэтакі холад.

А восень і запраўды́ ра́ньняя й халодная. Раніцо́й як вы́скачыш з ха́ты босы, дык ногі аж заходзяцца. І таму́, як толькі вы́берашся з Кляпча́нскага балота — адра́зу-ж трэба ўсу́нуць ногі ў не́шта сухое й цёплае, бо ня вы́трываць! І ўсе дзе́ці й запраўды́ ма́юць ужо хоць які́ абу́так. Адна́ Га́нька ходзіць дасю́ль босая, бо ў яе́ нямá нічога на ногі.

— Дык трэба яшчэ гэтыя вы́думкі: бры́дка — хораша... Як бы́ццам у яе́ ба́цька ці ма́ці ся́дуць ды паедуць у Слу́цак ды прывязу́ць ёй са́мыя ле́пшыя чарави́кі...

Гэта ўжо зноў цётка. Але дзя́дзька не даé ёй разагна́цца.

— Паку́ль што паносіш гэтыя, а там я пашы́ю табе́ ле́пшыя. Дый наста́ўнік абяцáў, што школа табе́ такса́ма дасьць новую сьві́тку й чарави́кі...

Абяцáў гэта наста́ўнік і Га́ньцы. Ужо некаторым дзе́цям, у каго нямá бацькоў (Га́нька ня лю́біць, калі́ ка́жуць "сіраты", калі́ яе́ саму́ю такса́ма завýць "сіратой" — тады ёй хочацца пла́каць), падава́лі.

. . . Напамі́нак пра чарави́кі й сьві́тку, якія, сказа́ў наста́ўнік, і ёй такса́ма ху́тка падару́е школа, адра́зу мяня́е Га́ньчын настрой. Чорт іх бяры́, гэтыя пантофлі! Можа яна́ іх яшчэ й ня бу́дзе насіць, можа яшчэ й пацяплée, а можа калі́ й паносіць, то зусім нядоўга... А потым яна́ іх вы́кіне дзе-не́будзь у лазовы куст на Кляпча́нскім балоце... Га́нька ўяўля́е, як яна́ размахне́цца і як шпурне́ гэтыя дзя́дзькавы пантофлі! І ёй ад гэтага робіцца сьме́шна й вясёла. І яна́ абува́е пантофлі.

— Вось ты ў нас і маладзе́ц, — хва́ліць яе́ дзя́дзька, на́вет не здага́дваючыся, што зробіць Га́нька з гэтымі брыдэзнымі ягонымі пантофлямі...

— Ато, бач, надýмалася! — астыга́е й цётка. — Ды лезь ужо на печ, кладзіся спаць, — зага́двае яна́, — ато раніцо́й цябе́ ніяк не дабýдзішся.

III.

І гэта пра́ўда. Чым больш праходзіць ча́су, тым менш застае́цца ў Га́нькі ахвоты да нав**у́**кі, да школы.

Як бы́ццам і добра ўсё: і наста́ўнік нязлосны, і паўсты́нскія хлопцы ўжо больш ня б'ю́цца (пасьля́ таго, як на́шыя не́калькі разоў добра далі́ ім!), і як раздаждж**ы́**ц-ца, то ў школу іх падвозяць конна...

Пра́ўда, падвозу гэтага конна, праз паўсты́нскія брады́! — Га́нька ня лю́біць і ба́іцца. Яна́ ўся як асі́навы ліст трасе́цца, абы́ толькі конь зайшоў у брод. Ёй так і здае́цца, што конь возьме ды ля́жа ў ваду́, і тады́ яна́ ўтопіцца... І хоць коні разу́мныя і ні адно [illegible] Міхася́ Няронскага, не кладзе́цца ў вадзе́, усяроўна Га́нька ба́іцца...

[illegible] жыць, калі́ настаю́ць пе́ршыя за́маразкі, калі́ выпада́е пе́рш[illegible] прыціска́е ўжо й добры мароз. Тады́ Кляпча́нскае бало[illegible] замярза́юць брады (і ня трэба пераяжджа́ць іх [illegible] да школы збудоўвае зіма́ коўзанкі. Тады́...

Каб ня [illegible] дому ка́жны бярэ па невялі́чкім аха́пку саломы-аўся́нкі. Ве́льмі-ж удала́ [illegible] ёю надэшвы ботаў ці валёнак. І коўзайся колькі [illegible] дома ня бу́дзе ля́яць!) І балота ўзі́мку такое даступ[illegible] таго́, што чві́ркае пад нага́мі й гнюсіць усё, на што ні нападзе, ні [illegible] ле́ту ці ўвосень: як зася́дзеш, дык здае́цца, век ня выберашся. І куст ка́жны [illegible] бі́ццам брат табе́ родны ня тое, што ўле́тку: адно й глядзі́, каб гадзю́ка ня сы́кнула... Узі́мку на балоце гуля́й, дзе хочаш, у хованкі, коўзайся на ледзе, шука́й зайцоў. А яны́ пасьля́ ночы, па парошы асабліва, бы машы́най вы́страчаць — гэтак зьбе́гаюць усё балота...

Га́нька лю́біць зіму́!

Узі́мку можна спазні́цца на ле́кцыі. Наста́ўніку ў школе ска́жаш, што замяло дарогу, а сам тымча́сам ганя́й ры́бу на бродзе з канца́ ў кане́ц, з канца́ ў кане́ц! А яе́ гэтулькі пад лёдам пла́вае!.. Або яшчэ ве́льмі ціка́ва паглядзе́ць, як прыходзіць які́-не́будзь паўсты́нскі дзя́дзька выбіра́ць зь ме́хам заме́рзлую ры́бу з паста́ўленае на ноч у палонцы ве́ршы... Дык як ты пасьпе́еш на ту́ю пе́ршую ле́кцыю ці на́вет і на другу́ю. Добра, што хаця́ пасьпе́еш на трэйцюю... За гэта адка́з нясу́ць старэйшыя ву́чні, і таму́ на першакля́сьнікаў наста́ўнік ве́льмі ня сва́рыцца: ён сам добра ве́дае, яка́я дарога зь Зялёнай Дубровы да школы.

Вясёла таксама́, калі́ падвозяць з дому ці забіра́юць на са́нях са школы — хто-не́будзь з бацькоў ці старэйшыя браты́ й сёстры. Малы́х пазаху́тваюць, каб не паме́рзьлі, у кажухі́ — тырча́ць адно толькі насы́ — і пасаджа́юць на сярэдзіну сане́й. Старэйшыя пачапля́юцца з бакоў, павіснуць зза́ду на палазох. Цесната́. Піск. Сьмех... А малы́я, як нава́ляцца на іх ды добра прыціснуць, узьні́муць плач...

Адны́м словам — і добрая рэч школа, і ня ве́льмі. Каб менш ле́кцыяў было вучы́цца ды каб больш выходных дзён было — тады́-б Га́нька, напэ́ўна, была́-б са́май леп́шай вучаніцай. А так — на пе́ршыя ў сваім жыцьці зімовыя канікулы Га́нька варочаецца з адны́м толькі ве́льмі добрым чыта́ньнем. Зада́чы-ж разьвя́звае яна́ сла́ба й пі́ша такса́ма няпрыгожа. І дзён прапусьці́ла нама́ла. (Паду́маеш, у яе́ то галава́ бале́ла, то жывот, то зу́бы...)

І ўсё-ж дове́дка з такімі, хоць і ня выда́тнымі адзна́камі Га́ньку не засмуча́е. Па-пе́ршае, "энзэдэ"-ж у яе́ нама́ ніводнага. А падругое, цэлых дзе́сяць дзён ня трэба бу́дзе хадзі́ць у школу. Цэлых дзе́сяць дзён бу́дуць канікулы.

Жыцьцё цудоўнае!

Слоўнік (Vocabulary)

твар у твар face to face
затрыма́цца (I) (pf.) fut. **затрыма́юся, -ешся, -юцца** to stay longer
выходны дзень (m.) day off
стамля́цца (I); стамля́юся, -ешся, -юцца to get tired
аставáцца (I); астаю́ся, -е́шся, -ю́цца to be behind
разьлічы́цца (II) (pf.) fut. **разьлічу́ся, -ышся, -ацца** to get rid of
па́ша, -ы (f.) pasture
вы́ган, -у (m.) common pasture ground
сквáрка, -і (f.) fried bacon, crackling
па́сьвіць (II); пасу́, па́сьвіш, па́сьвяць 1. to tend grazing (pigs, cattle), 2. to graze
са́ла, -а (n.) salt pork, bacon
пу́га, -і (f.) (dim. **пу́жка, -і**) whip
сма́жаныя сухія скры́лікі бу́льбы potato chips
паку́та, -ы (f.) torment, torture
патрабавáць (I); патрабу́ю, -еш, -юць to demand, to insist
роўненька (adv.) evenly
перапе́чка, -і (f) small loaf of bread
чарні́льная "перапе́чка" ink blot
разьліва́цца ракой (in this case) to cry
парвáць (I); (pf.) fut. **парву́, -е́ш, -у́ць** to tear to pieces
дурны́, -а́я, -ое stupid
намéрвацца (I); намéрваюся, -ешся, -юцца to be about, to intend
непадаўкі́, -а́я, -ое tenacious, unyielding, difficult
сварыцца (II); свару́ся, -ышся, -ацца (на + acc.) to scold
буквáр, -а́ (m.) ABC book, primer
буржу́й, -я (m.) bourgeois
пу́за, -а (n.) belly
паду́шка, -і (f.) pillow
згаджáцца (I); згаджáюся, -ешся, -юцца to agree
хвалі́цца (II); хвалю́ся, -ішся, -яцца (with instr.) to brag (of, about), to boast (of)
акуля́ры (pl.) eye glasses
разьбіра́ць (I); разьбіра́ю, -еш, -юць to make out, to understand
абура́цца (I); абура́юся, -ешся, -юцца to be indignant
не́вуцтва,-а (n.) ignorance
лагодна (adv.) gently, mildly
сярдзі́та (adv.) angrily, with anger
торба, -ы (f.) bag, schoolbag

II.

мудравáць (I); мудру́ю, -еш, юць to ponder, (in this case) to toil
шы́ла, -а (n.) awl
дра́тва, -ы (f.) wax-end (strong thread)
пазіра́ць спады́лба to glower, to look distrustfully, sullenly (at)
памéраць (I) (pf.) fut. **памéраю, -еш, -юць** to try on

надзіма́ цца (I); надзіма́юся, -ешся, -юцца to distend
брыдкі́, -а́я, -ое ugly
вытры́мваць (I); вытры́мваю, -еш, -юць to contain oneself, to refrain
спыня́ць (I); спыня́ю, -еш, -юць to stop
усу́нуць (I) (pf.) fut. **усу́ну, -еш, -уць** to shove in, to thrust in
дава́цца (I); даю́ся, -е́шся, -ю́цца to let oneself be caught
не дава́цца to evade, to dodge
тава́р, -у (m.) goods, (in this case) material, leather
ла́паць, ла́пця (m.) type of moccasin made of flexible bark (lapti)
хадзі́ць абу́тым to wear shoes on
босы, -
г
с
с
н
ч
л
размаху́ цца (I) (pf.) fut. **размаху́ся, -ешся, -уцца** to swing one's arm
шпурну́ць (I); (pf.) fut. шпурну́, -е́ш, -у́ць to hurl
сьме́шна (adv.) funny
брыдэзныя = ве́льмі брыдкія very ugly
астыга́ць (I); астыга́ю, -еш, -юць 1. to cool down, 2. to get cold
печ, -ы (f.) oven (built of brick)
дабудзі́цца (II) (pf.) fut. **дабуджу́ся, дабу́дзішся, -яцца** to manage to wake up, to rouse

III.

ахвота да наву́кі, школы an inclination or wish to learn
паўстынскія хлопцы boys from the village Paustyn
падвозіць конна to give a horseback ride
брод, -у (m.) ford, shallow spot in the river or marsh
асі́навы ліст, -а (m.) aspen leaf
утапі́цца (II); (pf.) fut. утаплю́ся, утопішся, -яцца to drown, to be drowned
ток, -у (m.) hard clay threshing floor
аха́пак, аха́пку (m.) bunch
салома-аўся́нка (f.) oat straw
падэшва, -ы (f.) sole
валёнкі (pl.) (a type of) felt boots
прыхі́льны, -ая, -ае favourable, helpful, propitious
руда́, -ы́ (f.) red stain on a swamp
гнюсі́ць (II); гнюсі́ць, -яць to stain, to make filthy
гадзю́ка, -і (f.) adder, viper
хованкі (pl.) hide and seek
вы́страчыць (II); (pf.) fut. вы́страчу, -ыш, -аць to stitch, (in this case) to leave a pattern of footprints
ганя́ць (I); ганя́ю, -еш, -юць to chase
палонка, -і (f.) ice-hole
ве́рша, -ы (f.) fishing-basket, creel
не́сьці адка́з to be responsible
Зялёная Дуброва Green-Oak Grove (the name of a village)
пазаху́тваць, (I); (pf.) fut. пазаху́тваю, -еш, -юць to cover up, to tuck in
кажу́х, -а́ (m.) sheepskin overcoat
пачапля́цца (I); (pf.) fut. яны пачапля́юцца to hang on
палазы́ (pl. of **полаз, -у**) runners of a sleigh
варочацца (I); варочаюся, -ешся, -юцца to come back, to come home
прапусьці́ць (II); pf. past **прапусьці́ў, -ла, -лі** to miss
жывот, -а́ (m.) stomach
дове́дка, -і (f.) 1. mid-term report, 2. reference
засмуча́ць (I); засмуча́ю, -еш, -юць to make sad, worried
папе́ршае (adv.) firstly, first of all, for one thing
"энзэдэ" (short of **нездавальня́юча**) unsatisfactory mark
падругое (adv.) secondly
кані́кулы (pl. only) vacation

ПЫТА́НЬНІ

1. У каго Га́нька жыла́, як яны́ зва́ліся?
2. Чаму́ Га́нька не пасьпява́ла рыхтава́ць ле́кцыі, калі́ яна́ іх рыхтава́ла?
3. Якія́ прадме́ты Га́нька любі́ла найбольш, і што было ёй найцяжэйшае? Знайдзе́це й прачыта́йце радкі́ ў вапавяда́ньні, дзе пра гэта ка́жацца.
4. Хто Га́ньку найбольш любі́ў у ха́це? Прачыта́йце ту́ю мясьці́ну ў вапавяда́ньні, дзе ка́жацца пра гэта.
5. Хто любі́ў разгляда́ць малю́нкі ў Га́ньчыным буквары́?
6. За што Га́нька ча́сам злава́лася на дзя́дзьку Мікала́я?

II.

1. Што рабі́ў дзя́дзька вечара́мі?
2. Яка́я была́ пара́ году, і якое надвор'е?
3. Ці бліз́ка было Га́ньцы хадзі́ць у школу, і яка́я была́ дарога?
4. Які́ быў горад недалёка ад вёскі, дзе жыла́ Га́нька?
5. Чаму́ Га́нька жыла́ ў дзя́дзькі Мікала́я?
6. Чаму́ Га́нька не хаце́ла памёраць санда́лі, якія нала́дзіў ёй дзя́дзька Мікала́й, і чаму́ нарэшце згадзі́лася?

III.

1. Як зва́лася вёска, дзе была́ Га́ньчына школа, ды балота па дарозе ў школу?
2. Чаму́ дажджлі́вым надвор'ем дзяце́й падвозілі ў школу конна?
3. Ці Га́нька любі́ла е́зьдзіць конна? Чаму́?
4. Прачыта́йце ды назаве́це ўсе прычы́ны, чаму́ Га́нька больш любі́ла хадзі́ць у школу ўзі́мку?
5. У якія́ гу́льні дзе́ці гуля́лі ўзі́мку на балоце?
6. Як зва́лася Га́ньчына вёска?
7. Яку́ю дове́дку атрыма́ла Га́нька пе́рад зімовымі вака́цыямі?

21 — 24Ф THE CHANGING OF CONSONANTS IN THE STEM
ЧАРГАВА́НЬНЕ ЗЫ́ЧНЫХ

1. Пры ўтварэньні й зьмене словаў некаторыя зычныя гукі асновы могуць падмяняцца іншымі зычнымі, як мы, прыкладам, ужо бачылі ў дзеясловах:

пісáць	—	пішу́		пячы	—	пяку́
хадзі́ць	—	хаджу́		рэзаць	—	рэжу

Гэтая **падмена** адбываецца **паводля** пэўных **адпаведнасьцяў**:

с можа падмяняцца з **ш,** але **ня** з **ж**
к з **ч,** ці яшчэ з **ц**
з з **ж,** а **ня** з **ш.** Гэткая падмена ў граматыцы завецца **чаргава́ньнем.**

Чаргава́ньне зычных адбываецца ня толькі ў **дзеясловах,** але і ў **назоўніках, прыметніках, прыслоўях.** Прыклады:

ша́пка	[illegible]	сухі́	— сушэйшы
нага́	[illegible]	ту́га	— тужэй
му́ха	[illegible]	вы́сака	вышэй

2. Галаўныя [illegible] ЗЬМЕНЫ ЗЫЧНЫХ (для дапаве́дак)

к-ш-ч: [illegible] ша́пачка;
к-ч: [illegible] сячэш; горка — гарчэй;
ц-ч: [illegible] сталі́ца сталі́чны;
х-с-ш: [illegible] сухі́ — сушэйшы;
х-ш: [illegible] – ву́шы; пух — пушы́сты; ці́ха — ці́шэй;
с-ш: напіса́ць — напішу́;
г-з-ж: луг — на лузе — лужок;
г-ж: бягу́ — бяжы́ш; стрыгу́ — стрыжэш; доўга — даўжэй;
з-ж: каза́ць — кажу́; ма́заць — ма́жу;
д-дз-дж: ход — хадзі́ць — хаджу́; язда́ — е́зьдзіць — е́жджу;
т-ц-ч: сьвятло — сьвяці́ць — сьвячу́;
д-с: кладу́ — кла́сьці; вяду́ — ве́сьці;
т-с: цьвіту́ць — цьвісьці́;
ск-шч: трэск — трашча́ць; бліскае — блішчы́ць;
ст-сц-шч: мост — масьці́ць — машчу́; пусьці́ць — пушчу́;
б-бл: рабі́ць — раблю́; любі́ць — люблю́;
в-ўл: мова — размаўля́ю; сла́ва — сла́ўлю;
м-мл: карміць — кармлю́; зама́ць — зама́млю́;
п-пл: купі́ць — куплю́; сыпаць — сы́плю;
ф-фл: графі́ць — графлю́.

21 — 25Ф THE CHANGING OF VOWELS IN THE STEM
ЧАРГАВА́НЬНЕ ГАЛОСНЫХ

1. Пры ўтварэньні й зьмене словаў могуць **чаргавацца** й **галосныя** гукі асновы, прыкладам: збо**о**р — зьбі**і**ра́ю (**о** чаргуецца зь **і**), нёс — не́сьці — нясу́ - но**ш**ка (bundle) (**ё-е-я-о**).

2. Галоўныя выпа́дкі **ЧАРГАВА́НЬНЯ ГАЛОСНЫХ** (для дае́дак)

е-ё-я-о: ве́сьці — вёў — вяду́; не́сьці — нёс — нясу́ — ношка;
о-а: воз — вазіць; ношка — насіць; } **пра́віла а́каньня**
э-а: стрэл — страля́ць; рэкі — рака́;
е-о-і: вы́берам — зборны — зьбіра́ю;
е-і: цьвет — цьвісьці;
о-у-ы: сохнуць — сухі — прасыха́ць;
ой-аі: рой — раіцца; пойла (swill, hogwash) — паіць.

**
*

In some words, when they change their form, certain consonants (or vowels) are changed according to certain rules. For these rules and examples look up the Byelorussian text:

a) for the changing of **consonants § 21—24Ф, 2;**
b) for the changing of **vowels § 21—25Ф, 2.**

21 — I DEGREES OF COMPARISON. THE COMPARATIVE OF ADJECTIVES СТУПЕ́НІ ПАРАЎНА́НЬНЯ. ВЫШЭЙШАЯ СТУПЕ́НЬ ПРЫМЕ́ТНІКАЎ

а) **Я́касныя прыме́тнікі** (і толькі я́касныя) маюць **тры ступе́ні** параўнаньня:

звыча́йная (the positive) — нов-ы
вышэйшая (the comparative) — нав-**е́йш**-ы
найвышэйшая (the superlative) — **най**-наве́йшы

б) **Утварэньне вышэйшае ступе́ні.**

1. **Вышэйшая ступе́нь,** якая паказвае, што ў вадным прадмеце якасьці больш, як у другім, твораіцца пры дапамозе суфіксаў: **-ейш-, -эйш-, -ш-** ад асновы прыметнікаў **звыча́йнае ступе́ні,** прыкладам:

сін-і — сіне́йшы, -ая, -ае
прыгож-ы — прыгажэ́йшы, -ая, -ае, -ае
малад-ы — маладзе́йшы, -ая, -ае або малодшы, -ая, -ае

2. У прыметніках з **задняязычнай** асновай на **г, к, х** пры ўтварэньні **вышэйшае ступені** "**г**" чаргуецца з "**ж**": тугі, тужэйшы
"**к**" з "**ч**": мяккі, мякчэйшы
"**х**" з "**ш**": сухі, сушэйшы

ды падобна "**с**" у канцы асновы чаргуецца з "**ш**", а "**з**" із "**ж**".

3. У некаторых-жа **прыметніках** з асновай на **"-к"** або на **"-ок"** у **вышэйшай** ступені **"-к"** і **"-ок"** выпадаюць, прыкладам:

кароткі — **карацéйшы**
глыбокі — **глыбéйшы**
нізкі — **ніжэйшы**
высокі — **вышэйшы**

4. Колькі прыметнікаў як **добры, благі, дрэнны, вялікі, малы вышэйшую ступень** параўнаньня **ўтвараюць ад іншага караня,** гэтак:

благі (дрэнны) — горшы
вялікі — большы (й вялікшы)
малы — мéншы
добры — лéпшы

5. Вышэйшая ступень [illegible] творыцца **даданьнем** да звычайнае ступені словаў **больш** або **менш:**

цíхі — **больш** цíхі, сьпéлы — **менш** сьпéлы.

в) **Скланеньне** [illegible]

1. [illegible] **склоняюцца гэтак-жа,** як і ў **звычайнай.** Прыкл.:

У вышэйшага хлопца чорныя валасы, а ў **ніжэйшага** сьвéтлыя.

2. Назовы прадметаў, да якасьці якіх **параўноўваецца** тая-ж якасьць дадзенага прадмету, **могуць мець форму:**

I. **вінавальнага склону** з прыназоўнікам **"за":**

брат старэйшы **за** сястрý,

або II. **назоўнага склону** са злучнікам **"як", перад якім** у сказе **заўсёды трэба ставіць коску:**

брат старэйшы, **як** сястрá;
маí прáца лягчэйшая, **як** твaí.

***

I. Degrees of Comparison of Adjectives.

In Byelorussian, as in English there are **three degrees of comparison:**

the positive — **звычáйная** ступéнь
the comparative — **вышэйшая** ступéнь
and the superlative — **найвышэйшая** ступéнь

II. The Comparative of Adjectives.

a. Formation.

1. The **simple comparative is formed** by inserting between the stem and the ending of the positive form the suffix **-ейш-, -эйш-,** or **-ш-.** For example:

POSITIVE	COMPARATIVE
сі́н-і, -яя, ае	сін-**е́йш**-ы, -ая, -ае
прыгож-ы, -ая, -ае	прыгаж-**эйш**-ы, -ая, -ае
малад-ы́, -а́я, -ое	маладз-**е́йш**-ы, -ая, -ае or
	малод-**ш**-ы, -ая, -ае

2. If the stem ends in **"-г, -к, -х"** or **"-с"** the **following change** of consonants usually **takes place:**

г	changes	to **ж**	тугі́ (tight)	— ту**ж**эйшы (tighter)
к	"	to **ч**	мяккі́	— мя**кч**эйшы (softer)
х	"	to **ш**	сухі́	— су**ш**эйшы (dryer)
с	"	to **ш**	высокі	— вы**ш**эйшы (higher, taller)

3. **Some adjectives** with stems ending with **"-к" or "-ок" drop these suffixes** in the simple **comparative.** For example: кароткі — карац**е́йшы;** глыб**окі** — глыб**е́йшы.**

4. A **few** common adjectives have **special forms** for **the comparative** formed **from different roots.** For example:

добры		— **ле́пшы** (better)
благі́ *	**(дрэнны)**	— **горшы** (worse)
	вялі́кі *	— **большы** (bigger)
	малы	— **ме́ншы** (smaller)

* **благі́** and **вялі́кі** have two meanings:

благі́, горшы	— bad	**вялі́кі, большы**	— big
благі́, блажэйшы	— unhealthy or sickly	**вялі́кі, вялі́кшы**	— great

5. The **compound comparative,** although very rarely used, **is formed by adding** the adverbs **больш** (more) or **менш** (less) to any of the declensional forms of the positive.

For example: гэта **больш (менш)** сьпе́лы я́блык, як той;
гэтыя ву́чні **менш** здольныя за тых.

b. Declension and use.

1. Adjectives **in the comparative** are **declined** in exactly the same manner **as in the positive.** This means they take the same endings. For example:

Singular — ме́ншы, ме́ншага, ме́ншаму, зь ме́ншым, пры ме́ншым
Plural — ме́ншыя, ме́ншых, ме́ншым, зь ме́ншымі, пры ме́ншых

2. **After comparative adjectives** the conjunction **"than"** may be expressed either by **"за"** or by "як":

I. By **"за"** + **the accusative** case of the name of the thing compared. For example:

Брат старэйшы **за** сястру́. The brother is older **than** the sister.

II. By **"як"** + **the nominative** case of the thing compared. For example:

Брат старэйшы, **як** сястра́. The brother is older **than** the sister.

Note that the conjunction "як" is **always preceded** by a **comma.**

21—II THE SUPERLATIVE OF ADJECTIVES
НАЙВЫШЭЙШАЯ СТУПЕНЬ ПРЫМЕ́ТНІКАЎ

а) **Утварэньне.**

Найвышэйшая ступень прыметнікаў, якая паказвае, што ў дадзеным прадмеце якасьці больш, як ува усіх іншых, **творыцца:**

1 [illegible] прыстаўкі **"най-** або нязьменнага слова **"са́ма",** прыкладам:

старэйшы	— **най**старэйшы	або **са́ма старэйшы**
ле́пшы	— **най**ле́пшы	" **са́ма** ле́пшы
ле́пшая (-ае)	— **най**ле́пшая (-ае)	" **са́ма** ле́пшая (-ае)

2 [illegible] даданьнем адпаведна займеньніка **са́мы, са́мая** або **са́мае,** прыкладам:

са́мы глыбокі (або **са́мы** глыбе́йшы) яр
са́мая высокая (або **са́мая** вышэ́йшая) гара́
са́мае старое (або **са́мае** старэ́йшае) ме́ста

Форма з **"най-"** ужываецца **шмат шырэй,** як формы з **са́мы, -ая, -ае** ці з **са́ма.**

б) **Скланёньне й ужыва́ньне.**

1. Прыметнікі ў **найвышэйшай ступені скланяюцца гэтак-жа,** як і прыметнікі ў **звычайнай ці вышэйшай ступені,** прыкладам:

найле́пшага ву́чня, з **най**ле́пшым ву́чнем,
са́мым ле́пшым ву́чням, пры **най**ле́пшых ву́чнях.

2. У **форме са** словам **"са́ма"** скланяецца **толькі другая частка:**

са́ма ле́пшы ву́чань атрыма́ў узнагароду;
ня было **са́ма** ле́пшага ву́чня;
піса́лі пра **са́ма** ле́пшых ву́чняў.

3. Пасьля **найвышэйшае ступені назовы прадметаў,** да якасьці якіх параўноўваецца якасьць дадзенага прадмету, **ставім у родным склоне множнага ліку** з прыназоўнікам **"з"**, пасьля якога часта дадаецца займеньнік **"усіх"**, прыкладам:

Антось **найлéпшы** з братоў, Антось **сáма** старэйшы **з** брат**оў**.
Гáння **най**прыгажэйшая **з** усіх дзяўч**áт** у клáсе.
Таполя **най**вышэйшая **з** усіх дрэв**аў** у пáрку.

***

a. **Formation.**

The superlative degree of adjectives **is obtained:**

1. by adding the prefix **"най-"** to the **comparative** form, or
2. by using the word **"сáма"** (the most) before the **comparative** or
3. by using the pronoun **сáмы, сáмая** or **сáмае** accordingly before **the positive** or the **comparative.** For example:

COMPARATIVE	SUPERLATIVE
прыгажэйшы	**най**прыгажэйшы or **сáма** прыгажэйшы most beautiful (handsome)
глыбéйшы	**най**глыбéйшы, **сáма** глыбéйшы (the deepest)
лéпшы	**най**лéпшы or **сáма** лéпшы or **сáмы** добры, **сáмы** лéпшы (the best)

The form with the prefix "най-" is the superlative form of adjectives **most frequently used.**

b. **Declension and use.**

1. Adjectives **in the superlative** formed by the prefix **най- are declined** as adjectives **in the positive** or **the comparative degree.** For example:

найлéпшы вýчань, у **най**лéпш**ага** вýчня
пра **най**лéпш**ых** вýчняў, нямá **сáмых** добрых вýчняў

2. **In the form with "сáма", the second part only is declined.**

нямá **сáма** лéпш**ага** вýчня — the best student is not here
мы гаварылі пра **сáма** лéпшых вýчняў — we were talking about the best students.

3. The **superlative form** indicates that **the quality** attributed to an object **is the highest,** as compared with that of other objects. In a sentence **the name of** those **other objects is** expressed **in the genitive plural,** preceded by the preposition **"з"**, followed sometimes by **"усіх"**:

Барыс **най**вышэйшы **з усіх** хлопцаў. Boris is the tallest of all the boys.

21 — III COMPARATIVE AND SUPERLATIVE OF ADVERBS
ВЫШЭЙШАЯ І НАЙВЫШЭЙШАЯ СТУПЕ́НІ ПРЫСЛО́ЎЯЎ

I. **Вышэйшая ступе́нь.**

а) **Вышэйшая ступень прыслоўяў творыцца** ад ступені **звычайнае** пры дапамозе суфікса **"-ей"** або **"эй"**, што дадаецца заміж **"-а"** на канцы. Гэты суфікс гэтак-жа, як і ў вышэйшай ступені прыметнікаў, найчасьцей пад націскам. Прыкл.:

моцна	мацне́й	прыгожа —	прыгажэй
вясела	весялёй	дорага —	даражэй

б) Так, як і ў прыметніках, у **прыслоўях,** утвораных ад іх, у **вышэйшай ступені адбываецца чаргаваньне зычных** ды ў некаторых выпадаюць суфіксы **"-к-"** ды **"-ок(ак)"**. Прыклады:

		доўга —	даўжэй
		мя́кка —	мякчэй
3.	шы́рака —		шырэй
	глы́бака —		глыбе́й

[illegible] ад прыметнікаў **зь нерэгулярнай вышэйшай ступеняй,** [illegible] ксама **творыцца ад іншага караня́** ды якраз ад таго самага, [illegible] ступень адпаведных прыметнікаў. Прыклады:

добра — лепш (або ле́пей ці ляпе́й)

бла́га, дрэнна } — горш (або го́рай ці гарэй)

ма́ла, крыху́ } — менш (або ме́ней)

шмат, многа } — больш (або болей ці бале́й)

II. **Найвышэйшая ступе́нь.**

Найвышэйшая ступень **прыслоўяў** творыцца ад ступені **вышэйшае** далучэньнем да яе прыстаўкі **"най-"**. Прыклады:

мацне́й —	**най**мацне́й	цяжэй —	**най**цяжэй
хутчэй —	**най**хутчэй	больш —	**най**больш

III. **У вы́разах з параўнаньнем:**

а) **пасьля вышэйшае ступені** прыслоўяў трэба ўжываць прыназоўнік **"за"** або **"як"** (заўсёды з коскай перад ім):

Юрка зьвяза́ў па́чку мацне́й **за** Антося, або — мацне́й, **як** Антось.
Га́нна ву́чыцца **лепш за** Я́нку, або лепш, **як** Я́нка.

б) а **пасьля найвышэйшае ступені** словазлучэньне **"з усіх":**

Га́нна ву́чыцца **найле́пш з усіх** у сям'і.

***

Adverbs, derived from adjectives which have degrees of comparison, **also have a comparative** and **superlative form.**

I. The Comparative of adverbs.

a) **Comparative** adverbs **are formed** from the positive **by adding** the suffix "-éй" or "-эй" at the end, instead of "-а". For example:

моцна (strongly, hard) мацне́й (harder)
дорага (expensively) даражэй (more expensively)

b) **All irregularities** and changes such as **the changing of consonants** in the stem, **or the dropping** of the **suffixes "-к-" or "-ок(ак)-"** when forming the comparative of adjectives, **also take place in adverbs** derived from these adjectives. For example:

1. **changing of consonants:**

ху́тка (quickly) — хутчэй (more quickly)
ці́ха (quietly) — ці́шэй (more quietly)
до́ўга (for a long time) — даўжэй (longer)

2. **dropping "-к-" or "-ок(ак)":**

бл і́зка (closely) — бл і́жэй (closer)
ця́жка (hard, difficult) — цяжэй (more difficult)
шы́рака (widely, wide) — шырэй (wider)
гл ы́бака (deeply) — глыбе́й (deeper)

3. **irregular comparatives:**

добра (well) — лепш (or ле́пей) (better)
бла́га, дрэнна (badly) — горш (or горай) (worse)

II. The Superlative of adverbs.

Superlative adverbs are formed by prefixing **"най-"** to comparative adverbs. For example:

хутчэй (faster) — **най**хутчэй (fastest)
часьце́й (more frequently) — **най**часьце́й (most frequently)

III. Notice the following important **irregular comparisons:**

добра, лепш (or **ле́пей**),		**найле́пш** (or **найле́пей**)
бла́га, дрэнна }	**горш** (or **горай**),	**най**горш (or **най**горай)
шмат * многа }	(much), **больш** (or **болей**),	**най**больш (or **най**болей)
ма́ла (a little),	**менш** (or **ме́ней**),	**найме́нш** (or **найме́ней**)

* **шмат** is also used to mean "many". For example: **шмат** вераб'ёў—**many** sparrows.

IV. a) After comparative adverbs [illegible] conjunction **than** is expressed by **"як"** which is always preceded by a comma [illegible] the nominative), or by the pronoun **"за"** (+ the accusative). For example:

Мы часьцéй чытаем беларýскія кнігі, **як** францýскія
We read Byelorussian books more often **than French books;**

[illegible] брат. **Hanna ran faster than her brother.**
[illegible] свайго бра́та.

b) After the [illegible] the genitive **plural with the preposition "з"** must be used. For example:

Янка бег **найхýтчэй з** усіх — **John ran the fastest of all.**

21 — IV ORDINAL NUMERALS ПАРА́ДКАВЫЯ ЛІЧЭБНІКІ: 1 — 20

а) **Колькасныя** лічэбнікі адказваюць на пытаньне **колькі?** Прыкладам:

Колькі кнíгаў тут ма́еш? — **пяць** кнíгаў.

Пара́дкавыя лічэбнікі адказваюць на пытаньне **каторы з пара́дку?** Прыкл.: **Каторую** кнíгу ты чыта́еш? — **пя́тую** кнíгу.

б) **Утварэньне.**

1. **Парадкавыя** лічэбнікі **1—4: пе́ршы,** -ая, -ае; **другí,** -а́я, -ое; **трэйці,** -яя, -яе; **чацьве́рты,** -ая, -ае **творацца парознаму, пе́ршы,** прыкладам, зусім ад іншага караня́.

2. У лічэбніках ад **"пяць"** да **"два́ццаць"** пры **ўтварэньні парадкавых "ць"** на канцы **заменьваецца** ў **"т"** ды **дадаюцца** адпаведна для трох родаў **канчаткі прыметніка** зь цьвярдой асновай. Прыкладам: **пяць** — пя́ты, -ая, -ае. Прычым у **"шэсьць"** карэннае **"э" пераходзіць у "о"** (шосты), ды гэтак-жа ў **"сем", "е" пераходзіць у "ё"** — сёмы, -ая, -ае. У **"дзе́вяць"** — **"дзявя́ты", "дзе́сяць"** — **"дзяся́ты"** — **націск зь першага** складу **пераходзіць на другі.**

в) **Склане́ньне.**

Пара́дкавыя лічэбнікі скланяюцца, **як прыме́тнікі зь цьвярдой асновай,** (за выняткам **"другі", "трэйці"**) ды згаджаюцца **ў родзе, ліку й склоне з назоўнікам,** які яны азначаюць. Прыкладам:

1. На восьм**ым** паве́рсе.
2. Двана́ццат**ая** ле́кцыя.
3. За трэйц**ім** возерам.
4. У пе́рш**ых** днё**х** вясны́.

***

a. **Cardinal and ordinal numerals: 1 to 20.**

CARDINAL	ORDINAL	
1. адзі́н, адна́, адно	пе́ршы, -ая, -ае	first
2. два, дзьве	другі́, -а́я, -ое	second
3. тры	трэ́йці, -яя, яе	third
4. чаты́ры	чацьве́рты, -ая, -ае	fourth
5. пяць	пя́ты, -ая, -ае	fifth
6. шэсьць	шосты, -ая, -ае	sixth
7. сем	сёмы, -ая, -ае	seventh
8. восем	восьмы, -ая, -ае	eighth
9. дзе́вяць	дзявя́ты, -ая, -ае	ninth
10. дзе́сяць	дзяся́ты, -ая, -ае	tenth
11. адзіна́ццаць	адзіна́ццаты, -ая, -ае	eleventh
12. двана́ццаць	двана́ццаты, -ая, -ае	twelfth
13. трына́ццаць	трына́ццаты, -ая, -ае	thirteenth
14. чатырна́ццаць	чатырна́ццаты, -ая, -ае	fourteenth
15. пятна́ццаць	пятна́ццаты, -ая, -ае	fifteenth
16. шасна́ццаць	шасна́ццаты, -ая, -ае	sixteenth
17. сямна́ццаць	сямна́ццаты, -ая, -ае	seventeenth
18. васьміна́ццаць or васямна́ццаць	васьміна́ццаты or васямна́ццаты, -ая, -ае	eighteenth
19. дзевятна́ццаць	дзевятна́ццаты, -ая, -ае	nineteenth
20. два́ццаць	двацца́ты, -ая, -ае	twentieth

b. **Formation.**

1. The ordinal numerals from **1** to **4** are formed irregularly: **пе́ршы** is formed from a stem other than **адзі́н; другі́, трэ́йці** and **чацьве́рты** are formed from altered stems of **два, тры, чаты́ры.**

2. The ordinal numerals from 5 to 20 are formed from the stems of the corresponding cardinal numerals by changing the "**ць**" at the end to "**т**", and adding the hard adjectival endings "**-ы, -ая, -ае**". For example:

пяць — пя́ты, -ая, -ае.

дзе́вяць — дзявя́ты*, **-ая, -ае;** дзе́сяць — дзяся́ты*, **-ая, -ае.**
сямна́ццаць — сямна́ццаты, два́ццаць — дваццА́ты*, **-ая, -ае.**

* Note the shift of stress in **дзе́вяць, дзе́сяць** and **два́ццаць** from the first syllable to the second.

c. Declension of ordinal numerals.

Ordinal numerals are all declined like hard-stem adjectives (except **"другі"** which has a stem ending in "г" and "трэйці" with a soft stem), and agree in gender, number, and case with the nouns they modify.

На восьмым паве́рсе. — On the eighth floor.
ДваццА́тая ле́кцыя. — The twentieth lesson.
За трэйцім возерам. — Past the third lake.
У першых днях вясны. — During the first days of spring.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 35. Падбяры ўзору да вы́дзеленых словаў падбярэце з практыкава́ньня аднакарэнныя. Зьвярніце ўвагу, што **чаргу́юцца,** падчыркне́це.

а) **УЗОР.** Му́ха — му́се — му́шка.

Му́ха, рука́, кні́га, бе́раг, мука́, гарох, сьце́жка, кры́га,
кні́зе, му́се, ру́чка, на бе́разе, у руцэ, кні́жка, му́шка, беражок, муцэ, у гаросе, кры́зе, мучны́, сьце́жцы, гарошак.

б) **УЗОР:** Насі́ць — нашу́.

Насі́ць, грузі́ць, вяза́ць, ву́да, гла́дкі, пусьці́ць, купі́ць, любі́ць, сухі́, лад, сьцерагчы́
нашу́, гружу́, ву́джу, вяжу́, гла́джу, куплю́, ву́дзіць, гладзь, пушчу́, ла́джу,
сьцеражэш, люблю́, сушу́.

в) Да вы́дзеленых словаў падбярэце з практыкава́ньня аднакарэнныя словы. **Галосныя, што чаргу́юцца,** падчыркне́це.

Вяду́, не́сьці, вазі́ць, дзіця́, блеск, сухі́, воз, нясу́, дзе́ці, бліскаць, сохнуць, ве́сьці, ве́зьці.

г) Да́дзеныя назоўнікі пастаўце ў **дава́льным** склоне **адзіночнага** ліку. Падчыркне́це **гу́кі, што чаргу́юцца.**

Бу́лка, завіру́ха, кні́га, ша́пка, ха́та, ру́чка, хада́, страха́, рэчка, горка, чыгу́нка, му́ха, вада́.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 236. а) Прачыта́йце ніжэ́й пада́дзеныя прыме́тнікі. Перш вы́пішце ў слупок усе́ прыме́тнікі ў **звыча́йнай ступе́ні** параўна́ньня, а тады́ падбярэце да іх і́хную **вышэ́йшую ступе́нь.**

Тонкі, цішэйшы, даўгі́, тужэйшы, лёгкі, вышэйшы, ціхі́, танчэйшы, мяккі́, сушэйшы, даўжэйшы, дарагі́, звонкі, мякчэйшы, рэдкі, званчэйшы, лягчэйшы, тугі́, даражэйшы, сухі́, высокі, радзе́йшы.

б) Навучэцеся выра́зна чыта́ць. Вы́пішце словы, у якіх адбыва́ецца **чаргава́ньне зы́чных або галосных.**

ГОСЬЦЬ

Сьнег-сьняжок
На дали́не,
Стог-стажок
У лагчыне.
У стажку́ схава́ўся за́яц,
Ма́е хле́ба ён акра́ец,
Бу́льбы сопкай
Шалупі́ны,
З ба́гны топкай
Журави́ны.
Не́як трус прыбе́г пад стог,
ка́жа за́йцу:
“Я прадрог,
Ра́ды я з табой сустрэцца,
Дай хоць трошкі абагрэцца”.
“Госьця я прашу́ прысе́сьці,
Абагрэцца
І пае́сьці, —
Адказа́ў гасьці́нны за́яц. —
Ма́ю хле́ба я акра́ец,
Бу́льбы сопкай
Шалупі́ны,
З ба́гны топкай
Журави́ны”.

Трус нічо́га не сказа́ў,
Толькі ву́сы абліза́ў,
Моўчкі схру́мстаў шалупі́ны
Бу́льбы сопкай,
Журави́ны
З ба́гны топкай,
Навалі́ўся
На акра́ец.
І зьдзіві́ўся
Шчы́ры за́яц:
“От-жа госьць дык госьць сядзі́ць —
Есьць бага́та і маўчы́ць”.

Трус пае́ў усё да крошкі,
Абагрэ́ў у стозе ножкі,
Ці́ха му́ркнуў штось у вус
І паймча́ў стралою трус.
Сьнег-сьняжок
На дали́не,
Стог-стажок
У лагчы́не.
У стажку́ галодны за́яц
Аржаны́ сасьні́ў акра́ец.

П. Варанько

Слоўнік (Vocabulary)

стог, -у (m.) haystack
стажок = **малы́ стог**
лагчы́на, -ы (f.) hollow, glen, dell
акра́ец, акра́йца (m.) crust (the end of a loaf)
сопкі, -ая, -ае starchy
шалупі́на, -ы (f.) peel
ба́гна, -ы (f.) swamp, marsh
топкі, -ая, -ае boggy (swampy)
трус, -а́ (m.) rabbit
я прадро[illegible] I am shivering

прысе́сьці (I); (pf.) fut. **прыся́ду, -еш, -уць** to sit down, to take a seat
абліза́ць (I); (pf.) past **абліза́ў, -ла, -лі** to lick
моўчкі (adv.) silently, without a word
навалі́цца (II); (pf.) past **навалі́ўся, -лася, -ліся** to attack, to fall on
навалі́цца на е́жу to eat greedily
шчы́ры, -ая, -ае frank, open-hearted
страла́, -ы (f.) arrow
паймча́ў стралою he flew like an arrow

в) Прачытайце ўважліва [illegible] на пытáньні й запішэце адказы.

1. Хто быў гасьцём, а хто гаспадаром?
2. Дзе за́яц жыў, што ён меў у запа́се?
3. Які[illegible] мясьціны, зь якіх гэта відáць.
4. Што м[illegible] характар і што пра характар труса́?
5. Ці[illegible] трусі́ жывуць, ды дзе напэўна й гэты трус жыў?

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 237. а) Ад да́дзеных прыме́тнікаў утварэце прыме́тнікі **вышэйшае ступе́ні.**

Мяккі, цьвярды́, сьме́лы, жоўты, высокі, шырокі, глыбокі, прыгожы, кіслы, малады, благі, вузкі, малы́, лёгкі, стары́, салодкі, сіні.

б) Перапішэце ска́зы. Замі́ж кропак дапішэце прыме́тнікі **вышэйшае ступе́ні.**

1. Дрэва цьвярдое, а ка́мень . . .
2. Серабро дарагое, а золата . . .
3. Туліпа́ны прыгожыя, а ру́жы . . .
4. Рака́ Дняпро шырокая, а рака́ Сьвятога Лаўрэна . . .
5. Таронта вялікае, а Монтрэаль . . .
6. Цу́кар салодкі, а мёд . . .
7. Палёт пту́шкі ху́ткі, а самалёту . . .
8. Зялёны я́блык кіслы, а лімон . . .

в) Да прыме́тнікаў дапішэце **іхную вышэйшую** й **найвышэйшую** ступе́нь. Падчыркне́це **зычныя, што чаргу́юцца.**

Дарагі, лёгкі, нізкі, блізкі, даўгі, тугі, мяккі, благі, сухі, добры, малы́, вялікі.

г) Ска́зы з пу́нкту "б)" перабудуйце сьпярша́ паводля **"ўзору 1."** а пасьля́ паводля **"ўзору 2."**.

УЗОР 1. Ка́мень цьвярдзе́йшы за дрэва.
УЗОР 2. Ка́мень цьвярдзе́йшы, як дрэва.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 238. а) Утварэце ад да́дзеных прыме́тнікаў прыме́тнікі **найвышэйшае ступе́ні,** сьпярша́ ўжыва́ючы прыста́ўку **"най-",** а пасьля́ са словам **"са́ма".**

УЗОР. Ху́ткі, найхутчэйшы, са́ма хутчэйшы.

Ху́ткі, смачны́, халодны, вузкі́, цьвярды́, густы́, сьме́лы, бліскі́, чы́сты, моцны, малы́, добры, вялі́кі, просты.

б) Да прыме́тнікаў у **найвышэйшай** ступе́ні дада́йце адпаве́дныя **назоўнікі.**

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 239. а) **Фанэты́чнае.** Уголас паўтара́йце за наста́ўнікам па́ры **я́касных прыме́тнікаў** ды ўтвораных ад іх **прыслоўяў.**

1.	позны	—	позна	2.	шчы́ры	—	шчы́ра	3.	сумле́нны	—	сумле́нна
	густы	—	гу́ста		я́сны	—	я́сна		пра́вільны	—	пра́вільна
	чы́сты	—	чы́ста		ча́сты	—	ча́ста		ве́тлівы	—	ве́тліва
	поўны	—	поўна		су́мны	—	су́мна		ве́тлы	—	ве́тла

б) Прачыта́йце ска́зы, а тады́ паводля ўзору перапішэце, пасьля́ падчы́ркнутых словаў **ста́вячы** адпаве́дныя **пыта́ньні.**

УЗОР: Ужо позны (які?) час. Ён прыйшоў позна (калі?).

А. 1. Ужо **позны** час.
2. Ідзе́ **густы́** дождж.
3. На стале́ **чы́сты** абру́с.
4. Ён вы́піў **поўную** шкля́нку малака́.
5. На не́бе сьвяціў **я́сны** ме́сяц.
6. Я́нка ў нас **ча́сты** госьць.
7. Стары́ чалаве́к пяя́ў **су́мную** пе́сьню.
8. Ён быў **сумле́нны** працаўні́к.

Б. 1. Яна́ прыйшла́ **позна.**
2. Гарох **гу́ста** абыйшоў.
3. Яна́ заўсёды піша **чы́ста.**
4. Не налі́вай гэтак **поўна!**
5. Ме́сяц сьвяціў **я́сна.**
6. Ён у нас **ча́ста** быва́е.
7. Стары́ паці́ху **су́мна** пяя́ў.
8. Трэба **сумле́нна** працава́ць.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 240. а) Паводля ўзору **ад да́дзеных я́касных прыме́тнікаў** утварэце **прыслоўі** ды напішэце **іх у трох ступе́нях.**

УЗОР. Моцны — моцна, мацне́й, наймацне́й.

моцны	слабы́	павольны	стары́
прыгожы	лагодны	уда́лы	сардэчны
мі́лы	цёплы	ціка́вы	стройны (slender)

б) Перапішэце сказы, устаўля́ючы адпаве́дныя **прыслоўі** з пра́вага слупка́.

1. Грузавікі ходзяць ... за а́ўты.	**сардачне́й**
2. Падве́чар ста́ла яшчэ	**цяпле́й**
3. Ва́ля ... рысу́е, як пі́ша.	**прыгажэй**
4. Зачыні́ вакно, бу́дзе	**халадне́й**
5. Мы прыйшлі́ ... , як звыча́йна.	**павальне́й**

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 241. а) Фанетычнае. У кля́се паўтара́йце ўголас за наста́ўнікам прыслоўі ў **звыча́йнай** і **вышэйшай** ступе́ні. Дома перапішэце, падчыркне́це **зы́чныя, што чаргу́юцца,** ды **су́фіксы, што** ў вышэйшай ступе́ні **выпада́юць.**

1.	ху́тка	—	хутчэй	су́ха	—	сушэй	рэдка	—	радзе́й
	шпа́рка	—	шпарчэй	доўга	—	даўжэй	соладка	—	саладзе́й
	го́рка	—	гарчэй	ту́га	—	тужэй	шы́рака	—	шырэй
	бры́дка	—	брыдчэй	2. бл і́зка	—	бліжэй	вы́сака	—	вышэй
	л е́гка	—	лягчэй	ця́жка	—	цяжэй	глы́бака	—	глыбе́й
	ці́ха	—	цішэй	н і́зка	—	ніжэй	далёка	—	дале́й

б) Перапішэце **прыслоўі** з пункту "А" у слупок ды дапішэце да іх з пу́нкту "Б" **супрацьле́жныя сэнсам.**

А. сла́ба, вясёла, ста́ра, сьцюдзёна, ра́на, баязьлі́ва, прыгожа, цёмна, рэдка, павольна, голасна, горка.

Б. сьме́ла, су́мна, цёпла, позна, соладка, бры́дка, моцна, гу́ста, молада, сьве́тла, ці́ха, ху́тка.

в) Усе **прыслоўі** з пу́нкту "А" напішэце ў **вышэйшай ступе́ні,** а з пу́нкту "Б" у **найвышэйшай.**

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 242. а) Да́дзеныя **лі́кі** перапішэце ў слупок **словамі** ды побач напішэце іх у **пара́дкавай** форме. 6, 11, 5, 2, 16, 7, 1, 18, 3, 13, 19, 10, 20.

б) **Праскланя́йце** ў вадзіночным і множным лі́ку перш ву́сна, а тады запішэце:

Чатырна́ццаты год, сёмая кля́са, пя́тае дрэва.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 243. Выра́зна чыта́ць. Вы́пішце ўсе лічэбнікі, побач напішэце, які́я гэта лічэбнікі.

САРОЧЫНЫ БЛІ́НЦЫ

Клапатлі́вая сарока,
Гаспады́ня белабока,
Па пры́печку скака́ла,
Бліны́ рашчыня́ла.

А дачу́шка памага́ла.
Сынок це́ста мясі́ў.
Другі́ сын ваду́ насі́ў.
Трэйці ў пе́чы пале́ў.

А чацьве́рты сядзе́ў,
На аге́нчык глядзе́ў,
Памага́ць не хаце́ў.
Бліны́ ма́ці даставА́ла,
Усі́х дзе́так частава́ла:

— На, дачу́шка, блі́не́ц,
Ты ў мяне́ — маладзе́ц.

І сынок — маладзе́ц,
І яму́ даю́ блі́не́ц,

І табе́, сынок другі́,
Мой памочнік дарагі́.

Са́мы сма́чны блі́нок
Возьме трэйці мой сынок...

Дзе́ці ўсе бліны́ пае́лі.
Шух, шух — паляце́лі.

— Ну, а дзе-ж, а дзе мой блін? —
Папыта́ў чацьве́рты сын. —
Ма́ма, дзе мой блі́не́ц?
— А табе́ нама́.

Кане́ц.

Васі́ль Ві́тка

Слоўнік (Vocabulary)

блі́не́ц, блі́нца́ (m.) or
блін (dim. **блі́нок**) pancake
клапатлі́вы, -ая, -ае diligent, bustling, fussy
белабокі, -ая, -ае with white sides
пры́печак, пры́печка (m.) a type of counter at the front of an oven made from brick
рашчыня́ць (I); рашчыня́ю, -еш, -юць (це́ста) to start / to mix (dough)
це́ста мясі́ць (II); мяшу́, ме́сіш, -яць to knead dough
у пе́чы паліць (II) (палю́, па́ліш, -яць) to heat an oven
дастава́ць (I); дастаю́, -е́ш, -ю́ць to get out
маладзе́ц (m.&f.) **малайца́** good boy (girl)

КРУГ 22

СЛАВЯ́НЕ

Як англі́йская мо[illegible] моваў германскіх, францу́ская да рама́нскіх, гэтак мова бела[illegible] славя́нскіх. Хто-ж гэтыя Славя́не?

Як мяркуюць н[illegible] да́ўнымі часа́мі, бо яшчэ на пача́тку на́шае эры, слав[illegible] паміж ракой Пры́пяцяй на Пале́сьсі, Карпа́цкімі гора́мі ды ве́рхняй пло́ыняй ракі Ві́слы.

Кал[illegible] ві́, у пошуках відавочна новых вальне́йшых пра[illegible] гэтыя пачалі расьсяля́цца ў розныя бакі: на за́хад, по́ўд[illegible] гэта Славя́не й занялі́ прыбліз́на ты́я зе́млі, на якіх і ся́ння жывуць [illegible] гаворяць славя́нскімі мовамі.

На пра[illegible]рах, ш[illegible] Славя́не, скрозь расьлі непраходныя пу́шчы ды лясы́. Адзі́нымі бло[illegible] вялі́мі камунікацыя былі́ рэкі, таму́ Славя́не й сяліліся ка́ля вялі́кіх рэка́ў і вазёраў, над і́мі будава́лі сваé пе́ршыя се́лішчы.

На новых мясцох Славя́не сутыка́ліся з рознымі і́ншымі пле́мямі, што жылі́ там да і́хняга прыходу. Жывучы ра́зам сотнямі гадоў, Славя́не перамешваліся з гэтымі іншамоўнымі жыхара́мі, а́ле бліз́у ўсю́ды як агу́льная мова заставалася мова славя́нская, хоць у ёй зьяўля́ліся й некаторыя асаблівасьці мовы тых мясцовых неславя́нскіх жыхароў, што зьліліся з Славя́намі.

Гэткім вось спосабам паўста́ў з ча́сам цэлы рад славя́нскіх народаў, што розьняцца ся́ньня сваім хара́ктарам, псы́хікай, культу́рай, а на́вет і мовай, хоць у гэтых мовах захава́ныя асноўныя славя́нскія моўныя ры́сы супольныя ім усім, бо ўсе гэтыя мовы разьвіліся з калі́шняй аднэй славя́нскай мовы.

Дагістары́чнымі часа́мі на зе́млях, дзе цяпе́р жыве́ белару́скі народ, да прыходу Славя́наў жылі́ розныя пле́мі мовы ба́лцкай. Ба́лты вялі́ асе́лае жыцьцё, займа́ліся земляробствам, ме́лі сваé се́лішчы. Засталі́ся яны́ тут жыць і з прыходам славя́нскіх пра́шчураў сучасных белару́саў, зь якімі паступова мяша́ліся, пераймалі́ і́хны лад жыцьця́, зві́чаі, ды з ча́сам і і́хную славя́нскую мову, хоць у яé яны́ адначасна пераняслі́ й некаторыя асаблівасьці сваé мовы ба́лцкае.

Гэтак над ве́рхняй пло́ыняй Нёмна, Дзьві́ны, Дняпра́ ды і́хных прытокаў з новасе́лых тут Славя́наў ды тых усходняба́лцкіх пле́мяў, што жылі́ там ужо да прыходу

Славя́наў, паўста́ў народ, які́ ся́ньня заве́цца белару́скім народам.

Да сям'і славя́нскіх моваў, апрача́ белару́скае, нале́жаць яшчэ́ мовы польская, кашу́бская, сэрбалужы́цкая, чэ́ская, слава́цкая, славе́нская, харва́цкая, сэрбская, македонская, баўга́рская, украі́нская ды расе́йская.

Слоўнік (Vocabulary)

германскія мовы (pl.) Germanic languages
раманскія мовы (pl.) Romanic languages
славянскія мовы (pl.) Slavonic languages
плямя́, -я́ (pl. **плямёны**) tribe
Славяні́н, -а (m.) (pl. **Славя́не**) Slav
эра, -ы (f.) era
ве́рхняя плынь ракі́ the upper reaches of a river
Карпа́цкія горы (pl.) The Carpathian Mountains
Ві́сла, -ы (f.) Visla, river in Poland
славя́нскі, -ая, -ае Slavonic, Slavic
відавочна (adv.) apparently
у пошуках (+ gen.) in search of
вольны, -ая, -ае free, vacant
тэрыторыя, -і (f.) (in this case) land, region
расьсяля́цца (I); расьсяля́ецца, -юцца to settle separately (in a new place)
непраходны лес impenetrable forest
шлях, -у (m.) way
се́лішча, -а (n.) settlement
сотнямі гадоў in hundreds of years
сутыка́цца (I); сутыка́юся, -ешся, -юцца (з) to meet, to come into contact with
прыход, -у (m.) coming, arrival
перамёшвацца (I); перамёшваецца, -юцца to become mixed
асабліва́сьць, -і (f.) peculiarity, feature
зьлі́цца (I); pf. past **зьлі́ўся, -ла́ся, -ліся** to merge, to blend
рад народаў a number of peoples
асноўны, -ая, -ае basic, fundamental
дагістары́чнымі часа́мі in prehistoric times
супольны, -ая, -ае common
розны, -ая, -ае various, different
Ба́лты, -аў (pl.) (in this case) Baltic tribes
ве́сьці асе́лае жыцьцё to lead a settled way of life
займа́цца земляробствам to be occupied with agriculture
сучасны, -ая, -ае contemporary
паступова (adv.) gradually, little by little
перайма́ць (I); перайма́ю, -еш, -юць 1. to adopt, 2. to imitate
лад жыцьця́ way (manner) of life
прытока, -і (f.) (**ракі**) tributary (of a river)
новаасе́лы, -ая,- ае newly settled, newly arrived
сэрбалужы́цкі, -ая, -ае Lusatian or Wendish
славе́нскі, -ая, -ае Slovenian
харва́цкі, -ая, -ае Croatian
македонскі, -ая,-ае Macedonian
баўга́рскі, -ая, -ае Bulgarian
сэрбскі, -ая, -ае Serbian

Пыта́ньні й зада́ньні.

1. Дзе жылі́ Славя́не пе́рад расьсяле́ньнем?
2. Калі́ й куды́ пачалі́ Славя́не расьсяля́цца?
3. Які́мі шляха́мі яны́ расьсяля́ліся, чаму́?
4. Ці гэткае перасяле́ньне магчы́мае было-б сёньнешнімі часа́мі, тым больш, што й камуніка́цыя цяпе́р гэтак разбудава́ная?
5. Ці на абша́ры, дзе цяпе́р Белару́сь, ужо хто жыў пе́рад тым, як сюды́ прыйшлі́ Славя́не? Калі́ так, дык хто?

6. Апішэце, як тады́ выглядáў Беларýскі край, ды чым займáліся ягоныя жыхары́? Дзе лю́дзі будавáлі сваé сéлішчы?
7. Пералічэце мовы, якія налéжаць да сям'і славя́нскіх моваў.

22 — I SUFFIXES in ADJECTIVES: -н-; -енн-, -энн-; -еньк-, -эньк- (-аньк-), -ск- ПРА́ВАПІС СЎФІКСАЎ У ПРЫМЕ́ТНІКАХ

1. Суфікс **-н-.**

а) Калі карэнь назоўніка заканчваецца на **-н**, і ад гэтага назоўніка ўтвараецца прыметнік з суфіксам **-н-**, дык прыметнік мае два **"н"**, і пішацца праз два **"н".** Прыкладам:

карэнь	—	карэнны	дзень	—	штадзённы
конь	—	конны	сьцяна́	—	насьце́нны
раён	—	раённы	машы́на	—	машы́нны

б) А калі ў васноўе назоўніка няма **"н"** на канцы, дык у вытвараным ад яго прыметніку ёсьць толькі адно "н", і пішацца адно **"н".** Прыклады:

шкло	—	шкляны́	дзе́рава	—	дзераві́яны
ха́та	—	ха́тні	дрэва	—	драўля́ны

2. Суфіксы **-енн-, -энн-.**

Прыметнікі маюць падвойнае **"н"** таксама ў суфіксах **-енн-, -энн-,** прыкл.:

здараве́нны, страшэнны, пісьме́нны.

УВА́ГА. Два **"н"** ёсьць і пішацца таксама ў прыметніках, утвораных ад назоўнікаў ніякага роду на **"-мя".** Прыкладам:

імя́	—	іме́нны (займе́ньнік)
плямя́	—	пляме́нны (пляме́ньнік)
це́мя	—	цяме́нная (косьць)

3. Суфіксы **-еньк-, -эньк- (-аньк-).**

У прыметніках з памяншальным або ласкальным зна́чанынем суфіксы **-еньк-,** а пасьля зацьвярдзелага зычнага **-эньк- (-аньк-),** пішуцца **заўсёды зь мяккім знакам:**

маленькі	лёгенькі	старэнькі	прыгожанькі
новенькі	мя́кенькі	даражэнькі	сьвежанькі
сухенькі	ці́хенькі	добранькі	хворанькі

4. Суфікс **-ск-.**

а) Пасьля карэннага **"н"**, навет калі яно й мяккое, перад суфіксам **-ск- "ь" ніколі ня пішацца; "н"** траціць сваю мякчыню. Прыкладам:

Кромань	—	кроманскі		сту́дзень	—	сту́дзенскі
восень	—	восенскі		жні́вень	—	жні́венскі

б) Пасьля **"л"** наадварот перад суфіксам **-ск- заўсёды** пішацца **"ь".** Прыкладам:

сяло	—	се́льскі		кава́ль	—	кава́льскі
Ура́л	—	ура́льскі		Гомель	—	гомельскі

УВА́ГА. Пра суфікс **-ск-** пасьля іншых зычных глядзе́це правіла 16-22Ф, 1, 3, 4.

***

Adjectives with the suffixes: -н-, -енн-, -энн-, -еньк-, -эньк- (-аньк-), -ск-.

1. The suffix **-н-.**

a) When the stem of a noun **ends in "н"** and the adjective of this noun is formed by adding the suffix **-н-, a double "н" must** be written and pronounced. For example:

карэнь	—	карэнны		дзень	—	штадзённы
конь	—	конны		сьцяна́	—	насьце́нны
раён	—	раённы		машы́на	—	машы́нны

b) But when there is **no "н"** at the **end of the stem** of a noun, in the adjective with the suffix **-н-**, only **one "н"** is written and pronounced. For example:

шкло	—	шкляны́		дзе́рава	—	дзераві́ны
ха́та	—	ха́тні		дрэва	—	драўля́ны

2. The suffixes **-енн-, -энн-.**

Adjectives with the suffixes **-енн-** or **-энн-** also have **a double "н".** For example:

здарове́нны, пісьме́нны, страшэнны

This also applies to adjectives formed from neuter nouns ending in **"-мя".** For example:

імя́ — име́нны (займе́ньнік)
плямя́ — пляме́нны (пляме́ньнік)
це́мя (top of the head) — цяме́нная (косьць)

3. The suffixes **-еньк-, -эньк-** or **-аньк-** which give adjectives a diminutive meaning, **are written with a "ь".** (The suffixes **-эньк-** or **-аньк-** are used **after hardened** consonants **only**). For example:

малéнькі	лёгенькі	but:	старэнькі	прыгожанькі
новенькі	мя́кенькі		даражэнькі	хваранькі
сухéнькі	ціхенькі		добранькі	сьвéжанькі

4. The suffix **-ск-**.

a) After "н" followed by the suffix -ск- the **"ь" is always omitted** in adjectives. For example:

Kr[illegible] of Miensk) надкроманскі
восень — восенскі, жнівень — жнівенскі, ліпенскі . . .

b) but after "л" [illegible] -ск- a **"ь" must always be written.** For example:

сяло	—	сéльскі		кавáль	— кавáльскі
Урáл	—	урáльскі		Лéпель	— лéпельскі

With regard to the suffix -ск- after other consonants, look at rule 16-22Ф, 1, 3, 4.

22 — II COMPOUND ADJECTIVES ПРАВАПІС СКЛАДАНЫХ ПРЫМЕ́ТНІКАЎ

1. Складаныя прыметнікі **пішуцца зьліта:**

а) калі абазначаюць **адцені колераў.** Прыкл.: **цёмнасіні, сьвéтлазялёны**

б) калі прыметнік утвораны з прыметніка, лічэбніка, займеньніка або прыслоўя й **назоўніка.** Прыкладам:

чарнавалосы	**даўгавéчны**	**двугадзíнны**
сінявокі	**дабраякасны**	**пяцідаляровы**
белагаловы	**усебеларýскі**	**шматпавéрхавы**

2. Складаныя прыметнікі **пішуцца праз злучок,**

калі паміж словамі, ад якіх прыметнік вытварыўся, можна ўставіць злучнік **"і".** Прыкладам:

фізы́чна-матэматы́чны (факультэт) (фізы́чны й матэматы́чны)
беларýска-англéльскі (слоўнік) (беларýскі й англéльскі)
гандлёва-прамысловы горад, паўдзённа-заходні вéцер,
Паўночна-Амэрыка́нскія краі.

**
*

1. Compound adjectives.

a) Compound adjectives formed from an **adjective, numeral, pronoun or adverb** and a **noun** are written as one word. For example:

сінявокі (сіняя вочы)	blue-eyed
чарнагаловы	with black hair
шыракаплéчы	with wide shoulders
даўгавéчны	long-living or -lasting
пяцідаляровы	five-dollar
усеканáдзкі	all Canadian

b) Compound adjectives describing the **shade of a colour** are also written as one word. For example:

цёмначырвоны	—	dark red
сьвéтлазялёны	—	light green

2. **Compound adjectives** formed from two words between which the conjunction "і" could be inserted are written with a hyphen. For example:

фізы́чна-матэматы́чны (фізы́чны й матэматы́чны) факульта́т
— (physical and mathematical) faculty of science
белару́ска-англе́льскі (белару́скі й англе́льскі) слоўні́к Byelorussian-English dictionary
паўдзённа-заходні ве́цер south-west wind
Паўночна-Амэрыка́нскі край North American country

22 — III ADJECTIVES USED AS NOUNS / ПРЫМЕ́ТНІКІ Ў РОЛІ НАЗОЎНІКАЎ

Прыметнікі могуць **набываць** значаньне **назоўнікаў.**

Такія прыметнікі ўжываюцца ў сказе без назоўніка ды азначаюць **прадмет** або **асобу,** але скланяюцца яны як прыметнікі. Прыкладам:

Стары́ ўвайшоў у пакой. **Хто** увайшоў? — **стары́.** У гэтым сказе слова **"стары́"** — **назоўнік.**

Стары́ чалаве́к увайшоў у пакой. **Які** чалаве́к? — **стары́.** Тут слова **"стары́"** — **прыме́тнік.**

**
*

Some adjectives are also used as nouns, but they are always declined as adjectives. For example:

Стары́ сядзе́ў на ла́ўцы.	The **old man** was sitting on a bench.
Да **старога** падыйшоў мали́ хлопчык.	A little boy came up to the **old man.**
Стары́ не́шта сказа́ў, і **малы́** такса́ма сеў на ла́ўку.	The **old man** said something and the **little boy** also sat on the bench.

22 — IV NOUNS ENDING IN / НАЗОЎНІКІ НА: -істы(ая), -ысты(ая)

а) Пад уплывам беларускіх прыметнікаў на **-істы, -ысты,** як прыса́дзісты, плячы́сты, пазычаныя з чужых моваў назоўнікі з суфіксам **-іст-(-ыст-)** прынялі на канцы **"ы".**
Прыкладам:

арганісты,	**гімназісты,**	**капіталісты,**	**ідэалісты,**
цымбалісты,	**сацыялісты,**	**шавіністы,**	**артысты . . .**

б) Гэтыя назоўнікі скланяюцца, як прыметнікі:

	Адзіночны лік		**Множны лік**
Н.	сацыялісты	сацыялістая (або сацыялістка)	сацыялістыя
Р.	сацыялістага	сацыялістае	сацыялістых
Д.	сацыялістаму	сацыялістай	сацыялістым
В.	сацыялістага	сацыялістую	сацыялістых
Т.	сацыялістым	сацыялістай	сацыялістымі
М.	аб сацыялістым	сацыялістай	аб сацыялістых

**
*

Nouns ending in -істы(ысты), -істая(ыстая) are declined as **hard adjectives.**

22 — V DECLENSION of NOUNS / РОЗНАСКЛАНЯ́ЛЬНЫЯ НАЗОЎНІКІ тыпу: імя́, дзіця́(ё), цялё(я), селянін.
and INDECLINABLE NOUNS / ды НЕСКЛАНЯ́ЛЬНЫЯ, як ма́ці, ра́дыё, кіно

1. Скланенне **розназкланя́льных.**

Адзіночны лік

Н. В.	ім-я́	дзіц-ё(я́)	цял-ё(я́)	Н.	сел-ян-ін
Р.	ім-я́, ім-ен-і	дзіц-я́ц-і	цял-я́ц-і	Р. В.	сел-ян-ін-а
Д.	ім-ю́, ім-ен-і	дзіц-я́ц-і	цял-я́ц-і		сел-ян-ін-у
Т.	ім-ём, ім-ен-ем	дзіц-ём or дзіц-я́ц-ем	цял-ём		сел-ян-ін-ам
М.	ім-і́, ім-ен-і	дзіц-я́ц-і	цял-я́ц-і		сел-ян-ін-е

Множны лік

Н. В.	ім-і, ім-ён-ы	дзе́ц-і	цял-я́т-ы	Н.	сял-я́н-е
Р.	ім-яў, ім-ён-аў	дзяц-е́й	цял-я́т-аў	Р. В.	сял-я́н (аў)
Д.	ім-ям, ім-ён-ам	дзе́ц-ям	цял-я́т-ам		сял-я́н-ам
Т.	ім-ямі, ім-ён-амі	дзе́ць-мі or дзе́ця-мі	цял-я́т-амі		сял-я́н-амі
М.	ім-ях, ім-ён-ах	дзе́-цях	цял-я́т-ах		сял-я́н-ах

2. Да **розназкланя́льных** назоўнікаў належаць:

а) Назоўнікі **ніякага роду на -мя: плямя́, це́мя, бярэмя...,** што, як і **"імя́",** ува ўсіх

склонах, апрача назоўнага й вінавальнага склонаў адзіночнага ліку, могуць ужывацца і з устаўкай (суфіксам) **-ен(ён)-**, прыкладам:

плямя́ — пле́м-**ен**-і — плям-**ён**-ы

УВА́ГА. "Полымя" скланяецца толькі бяз устаўкі (суфіксу).

б) Назоўнікі **ніякага роду на -ё(я),** што азначаюць назовы **маладых істотаў, цялё (**або **цяля́), куранё (кураня́), качанё(я), кацянё(я), шчанё(я), зубранё(я),** а таксама **(кня́жа), дзяўчо (дзе́ўча)...,** ды якія, як і **"цялё",** ува ўсіх склонах, апрача назоўнага й вінавальнага склонаў адзіночнага ліку, маюць суфікс **-яц-(ят),** прыкл.:

куран-ё, куран-**я́ц**-і, куран-**я́т**-ы
дзяўч-о, дзаўч-**а́ц**-і, дзяўч-**а́т**-ы

УВА́ГА. Слова **"дзіця́"(ё) суфікс -яц-** мае **толькі ў ускосных** (г. значыць — усіх за выняткам **назоўнага**) склонах **адзіночнага ліку,** прычым у творным склоне адзіночнага ліку звычайна ўжываецца бяз суфіксу **(дзіцём).**

в) Назоўнікі **мужчынскага роду** з падвойным **суфіксам: -ан-ін** ды **-ян-ін-**, прыкладам:

мянч-**а́н-ін,** палач-**а́н-ін,** Слав-**я́н-ін,** грамадз-**я́н-ін**

Гэтыя назоўнікі ў **назоўным** склоне **множнага ліку** маюць канчатак **-е.** Апрача таго, ува **ўсіх склонах множнага ліку** ў іх **выпадае суфікс -ін-,** прыкладам:

мянч-**а́н**-е з палач-**а́н**-амі, Слав-**я́н**-е

г) Назоўнікі **"не́ба"** й **"кола"**, якія ў множным ліку прыймаюць суфікс **-ёс-**:

не́ба — няб-**ёс**-ы, кола — кал-**ёс**-ы, прычым **"калёсы"** маюць іншае значаньне, калёсы значаць "воз", а множны лік ад "кола" звычайна ўжываецца бяз суфіксу — "колы".

3. **Нескланя́льныя назоўнікі:**

а) **"Ма́ці"** не зьмяняецца **ні ў склонах, ні ў ліках.** У множным ліку заміж **"ма́ці"**, можна ўжываць множны лік ад скланяльных: **"мацяркі"**, або **"ма́ткі"**.

б) Не скланяюцца й словы **іншамоўнага паходжаньня**, як **"ра́дыё"**, **"кіно"** і падобныя, хоць у гутаркавай мове, асабліва слова **"кіно"**, пачынаюць зьмяняць: ля кіна́ (родны склон), у кіне́ (месны) і г. д.

**
*

1. **Nouns such as імя́, дзіця́(ё)** (child), **цялё** (calf), and **селянін** (peasant) are **declined irregularly.** For examples look up the Byelorussian text (1.).

a) **Neuter nouns** ending in **"-мя"** like **імя́, плямя́** (tribe), **цемя́** (top of the head)... in all cases except the nominative and accusative singular, may take the suffix **-ен-(ён)** e.g.: **імя́ — ім-ен-і** (gen. sing.), **ім-ён-ы** (nom. pl.).
The noun **полымя** (flame) **never takes the suffix -ен-(ён).**

b) **Neuter nouns** ending in -ё(я) or -о(а) which denote young creatures such as **цялё** or **цяля́, куранё(я́)** (chick), **шчанё(я́)** (puppy) **дзіцё(я́)** and **дзяўчо** (or **дзе́ўча**) (girl) take in the singular, except in the nominative and accusative, the suffix **-яц-** and in the plural the suffix -ат-. For example: **куранё, куран-я́ц-і** (gen. sing.), **куран-я́т-ы** (nom. pl.).

Note that the noun дзіця takes the suffix **-я́ц-** in the singular only (but in the instrumental is declined without a suffix — **дзіцём**).

c) **Masculine nouns** with [illegible] **-ан-ін-** or **-ян-ін- such as сел-ян-ін, гарадж-а́н-ін** (townsman) . . . have [illegible] **"-е"** in the nominative plural and drop the suffix **"-ін-"** in all plural [illegible] **-ін, сял-я́н-е, сял-я́н-ам.**

d) Noun- such as **не́ба** [illegible] suffix **"-ёс"** in **all plural cases.** Thus: **не́ба** (sky) has a plural [illegible] wheel) besides its normal plural **колы** (wheels) has a plural [illegible] new meaning—"cart."

2. **Indeclinable nouns.**

a) The noun **ма́ці** (mother) has one form for all cases both in the singular and plural. For example: яны былі ў іхнае ма́ці.

Ён паéхаў у Эўропу із сваёю ма́ці.

b) Nouns of foreign origin e.g.: **кіно,** ра́дыё are also usually not declined. For example:

Ён учора быў у **кіно.** Яна́ працу́е ў **ра́дыё.**

22 — VI CAPITALIZATION of TERMS of NATIONALITY
ПРА́ВАПІС НАЗОЎНІКАЎ І ПРЫМЕ́ТНІКАЎ, што азнача́юць НАЦЫЯНА́ЛЬНАСЬЦЬ

Назоўнікі, што азначаюць нацыянальнасьць, як **Белару́с, Францу́з, Канады́ец, Амэрыка́нец, Аўстралі́ец** пішуцца зь вялікае літары, а прыметнікі, утвораныя ад іх, з малой: **белару́скі, францу́скі, канадыйскі** або **кана́дзкі...**

***

In Byelorussian only nouns designating nationality are capitalized, adjectives of this nature are not. For example:

Шмат Белару́саў прыéхала ў Кана́ду яшчэ пе́рад вайною. Яна́ ву́чыцца белару́скае мовы, францу́скае й гішпа́нскае.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 244. 1. Фанэтычнае. Паўтара́йце ўголас за наста́ўнікам па́рамі **назоўнікі ды вытвараныя** ад іх **прыме́тнікі.**

2. Перапішэце й падчыркне́це ў прыме́тніках **су́фіксы.**

а) карэнь — карэнны, туман — тума́нны, тэлефон — тэлефонны
конь — конны, ка́мень — каме́нны, мілія́н — мілія́нны
раён — раённы, ячме́нь — ячме́нны, машы́на — машы́нны
дзень — штадзённы, сьцяна́ — насьце́нны, чыгу́н — чыгу́нны
сон — сонны, вакно — ваконны, паўдзён — паўдзённы

б) за́хад — заходні, тра́ктар — тра́ктарны, смак — смачны́*
поўнач — паўночны, страх — страшны́*, пшаніца — пшані́чны*
ха́та — ха́тні, сьмех — сьме́шны*, шкло — шкляны́
лес — лясны́, ву́ха — вушны́*, вада́ — вадзяны́
зяле́за — зяле́зны, вока — вочны*, дрэва — драўля́ны*

* Глядзе́це **"ЧАРГАВА́НЬНЕ ЗЫ́ЧНЫХ",** пра́вілa 21—24Ф, 2.

в) імя́ — іме́нны, іме́нная
це́мя — цяме́нны, цяме́нная
плямя́ — пляме́нны, пляме́нная

3. Перапішэце ў слупок **прыме́тнікі** з пу́нктаў "а)", "б)" ды дапішэце да іх **назоўнікі да сэнсу.**

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 245. а) Прачыта́йце ска́зы ды ву́сна назаве́це **прыме́тнікі** з **суфіксам "-н".**

1. Карэннае **"я"** пішацца ў словах незале́жна ад на́ціску. 2. Конны пе́шаму не тава́рыш. 3. Яна́ выпісвае штадзённую газэту. 4. Бана́ны прывозяць да нас з Паўдзённай Амэрыкі. 5. Тэлефонная гу́тарка — найхутчэйшы спосаб камуніка́цыі. 6. Ён быў такі сонны, што заснуў пры тэлевізары. 7. Менск ужо мілія́нны горад, а Таронта двумілія́нны. 8. Увосень ча́ста быва́юць тума́нныя ра́ніцы й вечары. 9. Даўне́й для аграва́ньня дамоў найбольш ужыва́лі дровы або каме́ннае вуга́льле, а цяпе́р ужыва́юць алі́ву, газ або эле́ктрыку.

б) Перакладзе́це ска́зы з пу́нкту "а)" ў анге́льскую мову.

в) Прачыта́йце ска́зы, а тады́ перапішэце іх. Падчыркні́це **су́фіксы ў прыме́тніках.**

1. Ягоны дзя́дзька працу́е на тра́ктарным заводзе ў Ме́нску інжыне́рам. 2. Я сьні́ла страшны́ сон. 3. Учора мы ба́чылі ве́льмі сьме́шны фільм. 4. Зь Ме́нску ў Вільню трэба е́хаць у паўночна-заходнім кіру́нку. 5. Вочных лекароў завуць акулістымі. 6. Вушны́ боль нязвыча́йна даку́члівы. 7. Уле́тку прые́мна ў лясны́м халадку́. 8. Ма́ма купіла шкляну́ю ва́зу да кве́так. 9. Мы атрыма́лі име́нныя запросіны на навагодны баль. 10. Індыя́не ча́ста вялі лю́тыя міжплямённыя войны. 11. Цяпе́р у Белару́сі ці ў Амэ-рыцы нема́ няпісьме́нных малады́х людзе́й, але́ малапісьме́нных ве́льмі шмат.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 246. Паўтара́йце ўголас за наста́ўнікам.

1. малы́	—	мале́нькі	2. сі́ні	—	сі́неньк**і**		лёгкі	—	лёгеньк**і**
новы	—	новеньк**і**	сухі́	—	сухе́ньк**і**	3. стары́		—	старэньк**і**
кі́слы	—	кі́сьленьк**і**	ці́хі	—	ці́хеньк**і**	дарагі́		—	даражэньк**і**
чырво́ны	—	чырво́неньк**і**	глыбо́кі	—	глыбо́кеньк**і**	до́бры		—	до́бранькі
жо́ўты	—	жо́ўценьк**і**	мя́ккі	—	мя́кеньк**і**	прыго́жы		—	прыго́жанькі

б) Перапішэце ў слупок **прыме́тнікі** з су́фіксамі ды дапішэце да іх адпаве́дныя назо́ўнікі.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 247. Перапішэце назо́ўнікі й вы́твараныя ад іх прыме́тнікі ды заўва́жце, што ў прыме́тніках **"ь"** пе́рад су́фіксам **"-ск-" захо́ўваецца толькі** пасьля́ **"л".**

1. восень	—	восенскі	2. сяло	—	се́льскі
конь	—	конскі	Ура́л	—	ура́льскі
Кромань	—	надкроманскі	кава́ль	—	кава́льскі
сту́дзень	—	сту́дзенскі	Гомель	—	гомельскі
жні́вень	—	жні́венскі	Ле́пель	—	ле́пельскі

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 248. а) Фанэтычнае. Паўтара́йце ўголас за наста́ўнікам **склада́ныя прыме́тнікі.** Дома перапішэце.

1. цёмнасі́ні		сьветлажо́ўты
цёмнашэры		сьветлазялёны
2. чарнагаловы	даўганосы	3. двудаляровы	усебелару́скі
чарнавокі	даўганогі	трыпаве́рхавы	усебаковы

белагаловы	дабраякасны	стагадовы	сваячасовы
касавокі	сельскагаспадарскі	васьмімесячны	малалетні
шыракаплечы		шматлюдны	малаводны

б) Прыметнікі з пункту **"а)" напішэце** паводля ўзору ў вадпаведнай форме з адпаведным назоўнікам.

УЗОР. Цёмнасінія вочы;

Назоўнікі на выбар:

1. куст, папера, вочы, колер;
2. нафта, бусел, хлопчык, чапля, выстаўка, мужчына, дзяўчынка, заяц, Янка;
3. сын, рака, сход, адказ, будынак, царква, кангрэс, каток, крытыка, банкнот.

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 249. а) Выразна з інтанацыяй чытаць. Незнаёмыя словы выпішце із слоўніка.

НАША БЕЛАРУСЬ

Глянь, зірні наўкола:
Бачыш логі, сенажаці,
А на іх крыніцы?
Далей — бор зялёны, гонкі
Што у высь глядзіцца?
Сотні вёсак і мястэчак
Гарадоў ці мала,
Рэк бурлівых, пушч гамонкіх
Зь неапетай славай.
Там плывуць Дняпро і Сожа
Ды Дзьвіна і Нёман;
Белавежы, Налібокаў
Там чуваці гоман.
Гарады там — Менск і Вільня,
Магілеў, Гародна
І Смаленск зь сьцяной цагляной
Разьляглі выгодна.
Во ўсё гэта, маё дзеткі,
Ад межаў да межаў
Беларусяй і завецца
І да нас належа.

Янка Купала

б) Выпішце сьпяршá ўсе беларускія гарады, названыя ў гэтым вершы, тады ўсе рэкі ды ўсе пушчы.

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 250. а) Паўтарайце ўголас за настаўнікам.

Менск	—	мянчанін	—	мянчане	Віцебск	—	віцябляніи —	віцябляне
Слуцак	—	случанін	—	случане	Смаленск	—	смаляніи —	смаляне

Полацак	—	палача́нін	палача́не	Пінск	—	пінча́нін	— пінча́не
Ві́льня	—	вільня́нін	— вільня́не	Парыж	—	парыжа́нін	— парыжа́не

б) Перапішэце й дакончце паводля ўзору.

УЗОР. Юрка радзіўся й жыў у Нава́градку, ён **наваградча́нін.**

1. Юрка радзіўся й жыў у Нава́градку, ён . . . 2. Юлю́к зь Ме́нску, ён . . .
3. Маé бабу́ля й дзяду́ля радзіліся ў Вільні, яны́ . . .
4. Я́нкавы сябры́ зь Пінску, яны́ . . . 5. Наш дырэктар з Горадна, ён . . .
6. Мой наста́ўнік францу́скае мовы з Парыжу, ён . . .

в) Перапішэце, назоўнікі ў дужках ставячы ў вадпаве́дным ліку ды склоне.

1. Вогнішча гарэла я́ркім (полымя)
2. (Дзіця́) дакрану́лася па́лачкам (полымя) сьве́чкі ды папякло па́льчык.
3. Маé бацькі радзіліся ў Беларусі, але дзе́ яны́ канады́йскія (грамадзя́нін).
4. Яны́ вучы́ліся ў белару́скай гімназіі (імя) Максіма Багдановіча.
5. (Імя́) сла́ўнага белару́скага першадрукара́ й гуманіста Францы́шка Скары́ны назва́ны цяпе́р Белару́скія Бібліятэка і Музэй у Лёндане ды Белару́скае Навуковае Тава́рыства ў Нью-Ёрку.
6. Лю́дзі, што жыву́ць на вёсцы, зову́цца (селянін), а ты́я, што ў горадзе, (гараджа́нін) або (мешчанін).
7. (Ма́ці) купіла ўсім (дзіця́) новыя боты.
8. Прывіта́ць (ма́ці) з нарадзінамі прые́халі сын і дачка́ з усімі сваймі (дзіця́).
9. У на́шае (ма́ці) дзьве дачкі й тры сыны́.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 251. а) Дапоўніце ды запішэце ска́зы, паводля ўзору да́дзеныя назоўнікі ста́вячы ў вадпаве́дным склоне адзіночнага й множнага ліку.

УЗОР. 1. Я́нка даé е́сьці кураня́ці (кураня́там).
2. Зося поіць куранё (кураня́ты).

1. Я́нка даé е́сьці (куранё)
(качанё)
(ягнё), (кацянё)
(жарабё), (птушанё)

2. Зося поіць (куранё)
(гусянё)
(цялё), (казьлянё)
(зайчанё), (сабачанё)

б) Перапішэце ска́зы, словы ў ду́жках ста́вячы ў вадпаве́дным склоне.

Мы купля́лі паштовыя ка́ркі, ды ўсе вы́бралі зь не́йкай пту́шкай ці зьвярком.

Юрка купі́ў ка́ртку з (кураня́ты).
Ма́ня купі́ла ка́ртку з (ка́чка й качанё).
Стась купі́ў з (кацяня́ты).
Га́ля купі́ла з (за́яц і зайчаня́ты).
Воля з (зу́бар і зубранё), а Алёнка з (сабачаня́ты).

в) Прачыта́йце ве́ршыкі, вы́пішце **рознаскланя́льныя** назоўнікі.

1. Зайцы́ ў ле́се робяць ха́ты.
Мох падносяць зайчаня́ты.
Ім мядзьве́дзь дапамага́е.
Ён пляцоўку рашчышча́е.
Бу́дзе тут дзіця́чы сад
Для мале́нькіх зьвераня́т.

Н. Галіноўская

2. Асачы́ў я ў гушчары́
Дзьве лісі́ныя нары́,
Калі́ пойдзе ўсё на лад,
Дык паба́чым лісяня́т.

М. Лужа́нін

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 252. Перапішэце пры́казкі ды падчыркне́це **прыме́тнікі** аднэй ры́скай, а **прыме́тнікі ў ролі назоўнікаў** дзьвюма́.

1. Добраму ўсю́ды добра. Добрым словам сы́ты ня бу́дзеш. Добры слова паслу́хае, а ліхі́ й кія не.
2. Ня пла́ціць бага́ты, а вінава́ты.
3. Шану́й старога, як малога. За вялі́кім пагонішся й малое згу́біш.
4. Ня ўсіх добрых людзе́й ваўкі́ пае́лі.
5. На сьме́лага саба́ка брэша, а нясьме́лага куса́е.
6. Пераборлівы заўсёды галодны.
7. Не ганьбу́й стары́м ботам, паку́ль новага не пашы́ў.

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 253. а) Праскланяйце ў вадзіночным ліку й множным: **машыні́сты, цымбалі́сты.**

б) Прачыта́йце ска́зы. Выпіпіце ўсе назоўнікі з канча́ткам на **-істы,** абазна́чце склон і лік.

1. У мяне́ адзін брат цымбалі́сты, а другі́ гітары́сты.
2. Асабліва цымбалі́стага ча́ста запраша́юць граць на канцэртах.
3. Калісьці ўсе гімназі́стыя насі́лі форму. 4. Гімназі́стым забаронена было ха-дзіць бяз формы. 5. У гімназі́стых з розных гімна́зіяў была́ розная форма.
6. На ста́нцыі стаялі загна́ныя машыні́стым у тупік вагоны.
7. Загна́ўшы ў тупік вагоны, машыні́сты зьлез з паравозу.

The Church of St. Ilya in Viciebsk built 1643, from the drawing by Byelorussian-Canadian artist I. Šymaniec-Survilla (1965)

КРУГ 23

СТРАШНОЕ СПАТКА́НЬНЕ

(Паводля Яку́ба Коласа)

I

— Вось што, Тара́ска: годзе табе́ ўжо ка́ля рэчкі бе́гаць, а лепш занёс-бы ты дзя́дзьку полудзень на Высокі Бе́раг, — сказа́ла мне ма́тка...

Я жы́ва сабра́ўся, узя́ў сваю́ дубі́нку, бо ў ле́се мог налучы́цца воўк, узя́ў дзя́дзькаў полудзень і вы́йшаў з ха́ты. На дварэ каля́ хлява́, на сухой кастры́цы, ляжа́ў Га́лас, зь яки́м я быў у вялі́кай дру́жбе. Паба́чыўшы мяне́, Га́лас завіля́ў хвастом у знак прывіта́ньня.

Я сьві́снуў.

— Гала́ска, цю́цік! На, цю, на! — пазва́ў я яго.

Га́лас неахвотна пабе́г за мною, правёў мяне́ за кла́дку; а́ле як толькі я ўвайшоў у лес, мой Га́лас пача́ў аставацца: ся́дзе на дарозе й сядзіць.

Га́лас зрабі́ў мне яшчэ адну́ ці дзьве ўсту́пкі ды сяк-так дайшоў да ле́су. А́ле тут ён спыні́ўся ка́ля пе́ршых хвояў, доўга нюхаў зямлю́ і ўжо не падыма́ў на мяне́ галавы́, як я яго ні кліка́ў. Панюхаўшы, Га́лас азірну́ўся вакол, штось разважа́ючы, трушком пабе́г кра́ем ле́су й ху́тка зьнік зусім.

— Ну, я-ж табе́ пакажу́! — патрос я дубі́нкаю ў бок Га́ласа й пайшоў дале́й.

Гэтае здарэньне крыху́ пару́шыла той добры настрой, у яки́м быў я, выходзячы з дому...

А лес быў стары́ й глухі́. Па адзі́н бок дарогі стая́лі больш е́лкі, а́ле такія цёмныя й пану́рыя, што нічога добрага не каза́лі майму́ сэрцу...

Цяпе́р я адчу́ў, што гэта дарога не така́я й лёгкая, якою здава́лася яна́ мне дома... Мне ста́ла маркотна й сьці́шна. А гэтая дубі́нка, якою я так казыры́ўся, паказа́лася мне проста сьмяхотнай.

Я прайшоў яшчэ крокаў сто. Па пра́вай руцэ цягну́ўся е́льнік уперамешку з малады́мі хвоямі, а зь ле́вага боку пачына́ўся бярэзьнік. Тут пачына́лася дарога на Млыновішча.

І толькі зірну́ў я на куст між гэтых дарог, як адра́зу спыні́ўся й аслупяне́ў.

Валасы́ на галаве́ ста́лі падыма́цца й расьці, ша́пка насу́нулася на вочы, а ногі стра́цілі здольнасьць ру́хацца. Ску́ра на мне шорхнула, сэрца замле́ла.

Сярод стары́х бярэзін, нагну́тых таўсты́мі камля́мі над зямлёю й абросłых сівым мохам, стая́ў зьвер. Зьвер гэты быў нязвы́чайнае вялі́чыні. Асабліва вялі́кай была́ ягоная галава́ й наагу́л уве́сь пе́рад. Ма́сьці ён быў шэрай, шэрсьць меў кудла́тую й даўгу́ю. Пе́ршы момант аняме́ньня й адзервяне́ньня прайшоў, і ду́мкі маé пачалі́ крыху́ варушы́цца й выяўля́ць сваю́ работу. Я на́вет перста́ў адчува́ць уплы́ў стра́ху й ціхенька, зусі́м бяз словаў, засьпява́ў сам сабе́ пе́сьню:

Ходзіць сьвёкар па двару́,
Рашчаса́ўшы бараду́.

Чаму́ яна́, гэтая пе́сьня, прыйшла́ цяпе́р мне на па́мяць, я не магу́ растлума́чыць. А зьвер стая́ў на адным ме́сцы, не ру́шыў мне дарогу. Ён стая́ў нярухома, толькі зрэ́дку, і то ледзь заўважна, варушы́ў ягоная страшна́я галава́ й вяліза́рныя ву́шы. Ду́мкі аб тым, як разьмяркоўваліся ў ім фа́кты і як занесьці дзя́дзьку полудзень, у мяне́ ня было, бо я цвёрда ве́даў у тым, што дале́й таго ме́сца, дзе я стаю́ цяпе́р, я ня зру́шуся ні на крок. Разгледзе́ўшы зьве́ра, я перакана́ўся, што гэта быў воўк. Я колькі разоў ба́чыў ваўко́ў, але такога вялі́кага й страшнога мне не даводзілася ба́чыць ніколі...

Мімаволі я пача́ў памале́ньку адступа́ць наза́д, ня спушча́ючы вачэй з ваўка́. Воўк нічога - стаіць. Мне стала крыху́ лягчэй. Я ступі́ў наза́д яшчэ, яшчэ. Ужо крокаў два́ццаць адыйшоўся я такім пара́дкам. Воўк ледзь-ледзь відаць, але не вару́шыцца.

(Праця́г у 24 кру́зе)

Слоўнік (Vocabulary)

жы́ва (adv.) fast
сабра́цца (I); pf. past **сабра́ўся, -ла́ся, -лі́ся** to get ready
дубі́нка, -і (f.) cudgel, club
налучы́цца (II; pf. to come across
хлеў, хлява́ (m.) cattle-shed
кастрыца, -ы (f.) boon (hard skin) of flax-fibre
сьві́снуць (I); pf. past **сьві́снуў, -ла, -лі** to whistle (once)
кла́дка, -і (f.) planked footway
усту́пка, -і (f.) compromise
сяк-так (adv.) somehow
разважа́ць (I); **разважа́ю, -еш, -юць** to reason
трушком пабе́г (he) ran at a trot
патрэсьці (I) pf. past **патрос, патрэсла, -лі** to shake
пару́шыць добры настрой to spoil a good mood
край ле́су outskirts of the forest
мне ста́ла маркотна й сьці́шна I felt sad and terrified
казыры́цца (II) to flaunt
хвоя, -і (f.) pine
аслупяне́ць (I); pf. past **аслупяне́ў, -ла, -лі** to be dumbfounded
ску́ра на мне шорхнула it made my flesh creep
сэрца замле́ла (his) heart sank
каме́ль, камля́ (m) trunk
масьць, -і (f.) colour

сьвёкар, сьвёкра (m.) father-in-law (husband's father)
загарадзіць (II) (pf. past **загарадзіў, -ла, -лі) дарогу** to block the road
разьмінýцца (I) (pf. of **разьмінáцца, I**) to pass each other
я быў цьвёрда ўпэўнены I was fully assured
пераканáцца (I); pf. past **пераканáўся, -лася, -ліся** to be convinced
не даводзілася мне бáчыць I did not happen to see
ня спушчáючы вачэй (з + gen.) not taking one's eyes off
такім парáдкам in this way
ледзь-ледзь (adv.) slightly

ПЫТАНЬНІ И ЗАДАНЬНІ. У школе вýчні вýсна адкáзваюць на пытáньні, а дома адкáзы запíсваюць у сшыткі.

1. Хто напісáў апавядáньне "Страшное спаткáньне"?
2. Каго Тарáска клíкаў, каб ішоў зь ім рáзам?
3. Што ўзяў хлопчык для абароны? Каго, ён дýмаў, можа ў лéсе сустрэць?
4. Ці Гáлас ахвотна пайшоў з Тарáскам, як далёка Гáлас яго правёў?
5. Як выглядáў лес, празь які хлопцу трэба было йсьці?
6. Прачытáйце зь кнігі мясьціну, дзе áўтар апíсвае Тарáскаў пéршы пярэпалах, калí ён пабáчыў зьвéра?
7. Што заўвáжыў Тарáска ў зьвéра, калí мінýў пéршы пярэпалах?
8. Што за зьвер гэта быў, як хлопчык дýмаў?
9. Куды́ Тарáска йшоў празь лес?

23 — I CARDINAL AND ORDINAL NUMERALS 21 through 100
КОЛЬКАСНЫЯ И ПАРАДКАВЫЯ ЛІЧЭБНІКІ 21 — 100

1.	КОЛЬКАСНЫЯ	ПАРАДКАВЫЯ
21	**двáццаць** адзíн (аднá, адно)	**двáццаць** пéршы, **-ая, -ае**
22	**двáццаць** два, дзьве	**двáццаць** другí, **-áя, -ое**
23	**двáццаць** тры	**двáццаць** трэ́йцí, **-яя, -яе**
	. . . . .	. . . . .
29	**двáццаць** дзéвяць	**двáццаць** дзявя́ты, **-ая, -ае**
30	**трыццаць**	**трыццáты, -ая, -ае**
40	**сорак**	**саракавы, -áе, -ое** або **сараковы, -ая, -ае**
50	**пя́ць дзесят**	**пя́ць дзяся́ты, -ая, -ае**
60	шэсьць **дзесят**	шэсьць **дзяся́ты, -ая, -ае**
70	сéм **дзесят**	сéм **дзяся́ты, -ая, -ае**
80	восем **дзесят**	восем **дзяся́ты, -ая, -ае**
90	дзéвяць **дзесят**	дзéвяць **дзяся́ты, -ая, -ае**
100	**сто**	**сотны** (або соты), **-ая, -ае**

УВÁГА. Парáдкавыя лічэбнікі 1 — 20 глядзí прáвіла 21-V.

2. Утварэньне **колькасных лічэбнікаў 21 — 100.**

а) **Колькасныя складаныя** лічэбнікі, што азначаюць **круглыя дзесяткі,** утвараюцца гэтак:

трыццаць — так, як і **дваццаць,** даданьнем да **"тры"** часткі **"ццаць".**

Усе іншыя, за выняткам **сорак** ды **сто,** што маюць зусім іншыя карані, утвараюцца даданьнем да колькасьці дзесяткоў — **"пяць . . . дзевяць"** часткі **"дзесят",** прыкл.: пяцьдзесят, семдзесят. Усе **гэтыя складаныя** лічэбнікі маюць **адзін націск** на **першай** частцы.

б) **У колькасных складаных** лічэбніках, што азначаюць **дзесяткі ды адзінкі,** як прыкл. у **"дваццаць два",** да колькасьці дзесяткоў проста дадаюцца адзінкі. Лічэбнікі складаныя з **"адзін"** або **"два"** згаджаюцца ў родзе з назоўнікамі **гэтак-жа, як і самыя "адзін", "два",** прыкл.:

дваццаць **адзін** стол	трыццаць **два** сталы, **крэслы**
сорак **адна** шафа	пяцьдзесят **дзьве** шафы
семдзесят **адно** крэсла	

3. Утварэньне парадкавых лічэбнікаў 21 — 100

а) **Парадкавы** ад **"трыццаць"** утвараецца так, як і ад **дваццаць,** заменаю канцавога **"ць"** на **"т"** ды даданьнем адпаведна для трох родаў прыметнікавых канчаткаў — **"-ы, -ая"** або **"-ае":** трыццаты год, трыццатая гадзіна, трыццатае слова.

б) **Парадкавыя** ад **"сорак"** — саракавы, **-ая, -ое** (або сараковы, **-ая, -ае**)

ад **"сто"** — сотны, **-ая, -ае** (або соты, **-ая, -ае**)

в) У **парадкавых**-жа ад лічэбнікаў **пяцьдзесят . . . дзевяцьдзесят** родавыя канчаткі **"-ы, -ая"** або **"-ае"** дадаюцца проста да формы адпаведнага колькаснага, прычым у **"дзесят" "е"** паводля правіла аканьня заменьваецца ў **"я",** бо парадкавыя складаныя лічэбнікі зь **"дзесят"** маюць два націскі, прыкладам:

пяцьдзясяты, восемдзясяты, дзевяцьдзясяты

г) У **парадкавых** лічэбніках, выражаных **колькімі словамі, парадкавую** форму прыймае толькі **апошняе слова,** іншыя застаюцца бязь зьмены, прыкл.:

сорак **пяты** год, дваццаць **другая** гадзіна, сто **першае** слова.

***

Cardinal and Ordinal Numerals 21 — 100

Study the table in the Byelorussian text and notice:

1. the **cardinal** numerals from **21** to **100** are formed as follows:

   a) in 30 — тры́**ццаць** — **"ццаць"** is added to "тры" just as in "два́**ццаць**";

   b) in 50 — 90, пя́ць**дзесят** — дзе́вяць**дзесят**, to "пяць, шэсьць... дзе́вяць" — instead of **"ццаць", "дзесят"** is added.

   All these cardinal numerals have **one stress** on the **first part.**

   c) **Сорак** (40) and **сто** (100) are formed with different roots.

   d) **Compound cardinals** such as **21, 32** or **46** are formed the same way in Byelorussian as in English except that those compounds with "адзі́н, адна́, адно" or with "два, дзьве" have different endings for the three genders. For example:

два́ццаць **адзі́н** хлопец два́ццаць **адна́** дзяўчына два́ццаць **адно** дзіця́	twenty-one — boys / girls / children
тры́**ццаць два** ча́сапісы тры́**ццаць дзьве** кнігі	thirty-two magazines, books
сорак **шэсьць** алавік**оў** (гу́мак)	forty-six pencils (erasers)

2. The **compound ordinal** numerals **21 — 100** are formed from **cardinal** numerals by **adding the adjectival endings "-ы, -ая" or "-ае":**

   a) In the numeral **30th** —тры**цца́ты, -ая, -ае** (from тры́**ццаць**) the **"ць"** at the end changes to "т" before the adjectival endings are added.

   b) **In the numerals 50th, 60th . . . 90th**

пя́ць**дзяся́ты**, -ая, -ае	**from** пя́ць**дзесят**
шэсьць**дзяся́ты**, -ая, -ае	**from** шэсьць**дзесят**
дзе́вяць**дзяся́ты**, -ая, -ае	**from** дзе́вяць**дзесят**

   only the **"е"** in **"дзесят"** is changed to **"я"** because these compound ordinal numerals **have two stresses.**

   c) The ordinal from **сорак** is **сарака́вы́, -а́я, -ое** or **сараковы, -ая, -ае**
   and from **сто** is **сотны, -ая, -ае** or **соты, -ая, -ае**

d) In **compound ordinal** numerals such as **21, 34 or 65, only the last word** takes the **ordinal form.** For example:

21st — два́ццаць **пе́ршы, -ая, -ае**
34th — трыццаць **чацьве́рты, -ая, -ае**
65th — шэсьцьдзесят **пя́ты, -ая, -ае**

Два́ццаць пе́ршая гадзі́на — the twenty-first hour.
Тры́ццаць чацьве́рты год — the thirty-fourth year.
Шэсьцьдзесят пя́тае слова — the sixty-fifth word.

23 — II DECLENSION of COMPOUND ORDINAL NUMERALS
СКЛАНЁНЬНЕ ПАРА́ДКАВЫХ СКЛАДА́НЫХ ЛІЧЭБНІКАЎ

Парадкавыя складаныя лічэбнікі 21 — 100 і вышэй, як і простыя парадкавыя лічэбнікі, **скланяюцца** та́к, як прыметнікі, ці найчасьцей як прыметнікі зь цьвярдой асновай. Прычым у парадкавых лічэбніках, што складаюцца з **колькіх словаў, скланяецца** толькі а**пошняе слова.** Прыкл.:

. . . , два́цца́тым радку́
прачыта́ў тры́ццаць пе́ршую кні́гу

The **compound ordinal** numerals from 21 to 100 and higher are mainly **declined like hard-stem adjectives.** In compound numerals consisting of **more than one word only the last word is declined. For example:**

У два́цца́тым стагодзьдзі. — In the twentieth century.
Ён ужо́ прачыта́ў тры́ццаць трэ́йцюю кні́гу. — He has already read the thirty-third book.

23 — III DECLENSION of CARDINAL NUMERALS 1 — 100
СКЛАНЁНЬНЕ КОЛЬКАСНЫХ ЛІЧЭБНІКАЎ 1 — 100

Усе колькасныя лічэбнікі **скланяюцца,** адныя падобна да прыметнікаў, іншыя падобна да назоўнікаў.

1. Скланеньне **адзі́н, адна́, адно.**

	Адзіночны лік			**Множны лік**
	(муж. р.)	(жан. р.)	(ніякі р.)	(для ўсіх родаў)
Н.	адзі́н	адна́	адно	адны́я, адны́
Р.	**аднаго**	аднае́, аднэ́й	**аднаго**	адны́х
Д.	**аднаму́**	аднэ́й	**аднаму́**	адны́м
В.	як Н. або Р.	адну́	як Н.	як Н. або Р.
Т.	адны́м	аднэ́ю, аднэ́й(ою)	адны́м	адны́мі
М.	адны́м	аднэ́й	адны́м	адны́х

2. Скланeньне **два** (муж. і ніякі р.), **дзьве** (жан. р.).

Н.	два	дзьве
Р.	**двох** і **двух**	**дзьвёх** і **дзьвю́х**
Д.	**двом** і **двум**	**дзьвём** і **дзьвю́м**
В.	як назоўны або родны	
Т.	**двама́** і **двума́**	**дзьвямá** (або дзьвёма) і **дзьвюмá**
М.	**двох** і **двух**	**дзьвёх** і **дзьвюх**

Таксама, як **два, дзьве,** скланяюцца **абодва, абе́дзьве:** абодвух, абе́дзьвюх; абодвум, абе́дзьвюм і г. д.

УВА́ГА. Скланeньне **"абое"** — глядзеце правіла 26-I, 3. а.

3. Падобна скланяюцца **тры, чаты́ры** (для ўсіх родаў).

Н.	тры чатыры	Р.М.	тр**ох** чатыр**ох**	Д.	тр**ом** чатыр**ом**	Т.	трымá чатырмá

4. Лічэбнікі, пачынаючы ад **пяцёх** і да **дваццацёх,** а таксама **трыццаць** скланяюцца гэтак:

Н.	пяць	дзе́сяць	тры́ццаць	ву́чняў (кнігаў)
Р.	пяцёх	дзесяцёх	тры́ццацёх	ву́чняў (кнігаў)
Д.	пяцём	дзесяцём	тры́ццацём	ву́чням (кнігам)
В.	як назоўны або родны			ву́чняў (кнігаў)
Т.	пяцьмá	дзесяцьмá	тры́ццацьмá	ву́чнямі (кнігамі)
М.	пяцёх	дзесяцёх	тры́ццацёх	ву́чнях (кнігах)

5. Лічэбнікі ад **пя́цьдзесят** да **дзе́вяцьдзесят** зьмяняюцца, як **пяць,** або **найчасьцей зусім не зьмяня́юцца.** Прыкладам:

з усі́мі пя́цьдзесят людзьмі́, з усіх дзе́вяцьдзесят ву́чняў і г. д.

У складаных-жа лічэбніках, выражаных двума (ці больш) словамі, скланяюцца толькі адзінкі, прычым скланяюцца абавязкава. Прыкладам: з два́ццаць сямá ву́чнямі, з трыццаць адным* работні**кам,** адна́ ізь се́мдзесят дзьвё**х**(юх) студэнтак; у два́ццаць пяцё**х*** кні**гах***.

* Пра згоду назоўнікаў з колькаснымі лічэбнікамі глядзеце правіла 25-III, 1-4.

6. **Скланeньне** лічэбнікаў **сорак** ды **сто.**

Н.	сорак	сто	В.	як назоўны	
Р.	саракý	сту	Т.	саракмá	стома
Д.	саракý	сту	М.	саракý	сту

**
*

Study the declension of the numerals **адзі́н, адна́, адно; два, дзьве** etc. in the Byelorussian text and note:

1. The declension of **адзі́н, адна́, адно** follows in the main the hard adjectival declension.

2. **Абодва** and **абе́дзьве** (both), are also declined like **два** and **дзьве.** For example:

Яны́ абодва ў ваднэ́й кля́се.	They are both in the same class.
Нам абодвум падаба́ецца гэ́ты абра́з.	We both like this picture.
У абе́дзвюх сёстраў падо́бныя суке́нкі.	Both sisters have similar dresses.
Трыма́й абе́дзьвюма рука́мі	Hold it with both hands.

NOTE. For the declension of "абое" look at **rule 26-I, 3 a.**

3. The numerals "**тры**", "**чатыры**" are declined as follows:

Nom. тры чатыры	Gen. Loc. трох чатырох	Dat. тром чатыром	Instr. трыма́ чатырма́

4. The numerals "**пяць**" to "**дзьвяно́сто**" as well as "**тры́ццаць**" have one pattern of declination. (See the Byelorussian text rule 23-III, 4.). For example:

Gen. пяцёх сыно**ў** (дачок)	Instr. з трыццацьма́ ву́чнямі
Dat. дзесяцём коням	Loc. у дванаццацёх кні́гах

NOTE. Look also at rule 25-III, 3. a) and b).

5. The numerals "**пя́ць дзесят**" to "**дзе́вяць дзесят**" (50—90) need not be declined, especially in colloquial speech. If they are declined, then they can be declined like the numeral "**пяць**". For example:

з усі́мі **пя́ць дзесят** людзьмі	—	with all fifty people
з усіх **дзе́вяць дзесят** ву́чняў or з усіх дзевяць дзесяцёх ву́чняў	—	from all ninety pupils

6. In compound numerals consisting of two (or more) words such as "**два́ццаць адзі́н** (21)" or "**се́мдзесят два** (72)" only the units are declined. For example:

Наста́ўнік з два́ццаць **адны́м** ву́чнем пае́халі ў горы, а другі́ наста́ўнік із **стома** ву́чнямі пае́халі на ўзмор'е.	One teacher went to the mountains with twenty-one students and the other teacher went to the sea with a hundred students.
Адна́ ізь се́мдзесят дзьвюх студэ́нтак.	One of seventy-two students.

23 — IV THE RECIPROCAL PRONOUN / УЗАЕ́МНЫ ЗАЙМЕ́НЬНІК:

Адзі́н (адно) аднаго, адна́ адну́ — each other or one another

1. Ужыва́ньне

а) **адзі́н аднаго** — ужываецца, калі абедзьве асобы **мужчы́нскага роду;**
б) **адна́ адну́** — ужываецца для абедзьвюх асобаў **жаноцкага роду;**
в) **адно аднаго** — ужываецца для абедзьвюх асобаў **ніякага** роду ды для **розных** родаў.

Прыклады: а) **Казю́к** і **Я́нка** даўно ўжо **адзі́н аднаго** зна́юць.
б) **Га́ля** й **Зоя** нядаўна **адна́ адну́** зна́юць. Яны адра́зу **адна́ аднэй** спадаба́ліся.
в) **Птушаня́ты** палохалі **адно аднаго.**
"Бу́дзем піса́ць **адно аднаму́**" — сказа́ла **Га́ля Але́гу.**

2. Скланёньне

Як ужо з пададзеных прыкладаў відаць, скланяецца толькі другое слова паводля ўзору скланеньня **"адзі́н, адна́, адно".**

***

1. The reciprocal pronoun **адзі́н (адно) аднаго, адна́ адну́** (meaning **one another**) in Byelorussian, unlike in English, has different forms for different genders and different cases:

адзі́н аднаго — is used when **both** persons are of the **masculine** gender, e.g.: **Браты́** лю́бяць **адзі́н аднаго.** (The brothers love each other);
адна́ адну́ — is used when **both** persons are of the **feminine** gender, e.g.: **Сёстры** лю́бяць **адна́ адну́.** (The sisters love each other);
адно аднаго — is used a) when both persons are of the **neuter** gender and also b) for **mixed** genders, e.g.:

Птушаня́ты палохалі **адно аднаго.** **Га́ля й Але́г** паба́чылі **адно аднаго.**

2. Only the second word is declined according to the declension of **"адзі́н, адна́, адно".** For example:

Казю́к і Я́нка даўно ўжо **адзі́н аднаго** зна́юць. — **Kaziuk and Janka have known each other for a long time.**
Га́ля й Зоя лю́бяць **адна́ адну́.** — **Hala and Zoja like each other.**
Кацяня́ты ча́ста **адно з адны́м** гуля́юць. — **Kittens often play with one another.**
"Бу́дзем піса́ць **адно аднаму́**" — сказа́ла **Га́ля Але́гу.** — **"We shall write to each other" — Hala said to Aleh.**

23 — V DECLENSION OF "чалаве́к" (man), pl. "лю́дзі"
СКЛАНЁНЬНЕ НАЗОЎНІКА "чалаве́к, лю́дзі"

"Чалаве́к" у вадзіночным ліку скланяецца, як назоўнікі мужчынскага роду з чыстай асновай, а для множнага ліку звычайна ўжываецца слова іншага кораня — **"лю́дзі"**, якое адзіночнага ліку само ня мае.

а)	**Адзіночны лік**		**Множны лік**
Н.	хто?	чалаве́к	лю́дз-**і**
Р.В.	каго?	чалаве́к-**а**	людз-**éй** або людз-**ёў**
Д.	каму́?	чалаве́к-**у**	лю́дз-**ям** або людз-**ём**
Т.	кім?	чалаве́к-**ам**	людзь-**мі**
М.	пры кім?	чалаве́к-**у**	пды лю́дз-**ях** або людз-**ёх**
Кліч ны		чалаве́ч-**а**!	лю́дз-**і**!

б) Толькі **пры колькасных** [illegible] формы множнага ліку **"лю́дзі"** часта ўжываецца **"чалаве́кі"** або **"чалаве́каў"**. Гэтак:

1. Пры лічэбніках "два . . . [illegible] зь імі на канцы — ўжываецца форма **чалаве́кі:**

   два (тры, чаты́ры) чалаве́кі; два́ццаць чаты́ры **чалаве́кі.**

   УВА́ГА. Толькі **пасьля** зборных [illegible]каў: **"двое, трое, чацьвёра . . . дзесяцёра..."** (гл. правіла 26-I, 2., 3в.) заўсёды ўжываецца форма **"людзе́й"**: двое **людзе́й,** чацьвёра **людзе́й.**

2. Пры лічэбніках **пяць, шэсьць** і далейшых за выняткам складаных з 1, 2, 3, 4 на канцы, аднолькава правільна "пяць **чалаве́каў**" ці "пяць **людзе́й**", а найлепш "пяцёра **людзе́й**". Прыкл.:

   трыццаць пяць **чалаве́каў** або **людзе́й.**
   сто, сорак **чалаве́каў** або **людзе́й.**

***

1. The normal plural form of "чалаве́к" (man) is "лю́дзі" (people). Study the declension of "чалаве́к" and "лю́дзі" in the Byelorussian text rule 23-V, a).
2. Note the following expressions:
   a) **два (тры, чатыры) чалаве́кі;**
      трыццаць **чаты́ры чалаве́кі,** сто **два чалаве́кі;**
   b) **пяць** (**дзе́сяць . . .) людзе́й** (або **чалаве́каў**);
   c) **двое, пяцёра, дзесяцёра . . . людзе́й.**

   and remember:

a) after **два, тры, чатыры** and any compound cardinals in which they are the last digit (22, 43, 64 etc.) instead of "**лю́дзі**" the plural form "**чалаве́кі**" must be used;

b) with the numerals **пяць, шэсьць . . .** and onwards both "**людзе́й**" and "**чалаве́каў**" may be used;

c) and the collective numerals such as **двое, трое . . . дзесяцёра** (see rule 26-I, b.) can be followed **only** by "**людзе́й**".

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 254. а) У кля́се наста́ўнік вымаўля́е ўголас па адным лічэбнікі з табліцы 23-I, а ву́чні па адным за ім паўтара́юць.

б) Дома ву́чні перапі́сваюць табліцу ў сваé сшыткі.

в) Напішэце словамі ў слупок усé лікі ад **31** да **40** ды ад **81** да **100,** а пасьля́ побач дапішэце іхную пара́дкавую форму.

УЗОР. тры́ццаць адзін, адна́, адно; тры́ццаць пе́ршы, -ая, -ае
тры́ццаць два, дзьве; тры́ццаць другі́, -а́я, -ое

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 255. а) Прачыта́йце верш. б) Вы́пішце ўсе **лічэбнікі,** абазна́чце іхны склон ды які гэта лічэбнік, колькасны ці пара́дкавы.

У СТАРОГА ВЕРАБ'Я́

У старога вераб'я́
Грашаві́тая сям'я́:
У ка́жнага верабе́йкі
Па чаты́ры капе́йкі.

Зьляце́ліся вераб'і́ —
Налічы́лі два рублі́.*
У самога вераб'я́
Было роўна паўрубля́.

Ка́жнаму верабе́йку
Даў стары́ яшчэ капе́йку.

Колькі-ж ма́е дзяце́й
Наш бага́ты верабе́й?

(Пя́ць дзесят)

Васіль Ві́тка

* **рубе́ль, рубля́** (m.) = **100 капе́ек** (саве́цкія грошы). Rouble = 100 copecks (money of Soviet Union).

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 256. а) Ніжэй пада́дзеныя назоўнікі паводля ўзору вы́пішце ў 4 слупкі: у 1-шы зь лічэбнікам **адзі́н,** у 2-гі з **адна́,** у 3-ці з **адно,** а ў 4-ы з **адны.**

УЗОР. адзі́н аўтабу́с адна́ ву́ліца адно поле адны́ дзьве́ры.

Назоўнікі на **вы́бар:**

Дзяўчы́на, касьцю́м, ву́ліца, дзіця́, нажні́цы, цётка, ца́рства, ля́лька, дзьве́ры, аўтабу́с, вароты, ся́бра, пяро, пакой, са́ні, экза́мен, гру́па, жыцьцё, ірты́.

б) Укладзе́це ска́зы з **назоўнікамі** ды **лічэбнікамі** з пу́нкту "а)".

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 257. а) Пра[illegible]йце ска́зы, **лічэбнікі й назоўнікі** ста́вячы ў вадпаве́днай форме, а тады́ ска́зы запішэце.

1. Ка́ля дому з адна́го бо́ку раст[illegible] (зарбі́на) ды 2 (клён), а з другога боку 5 (таполя) ды 1 (рабі́на).
2. Наста́ўнік з 30 (ву́чань) пайшлі́ ў тэа́тар.
3. У кля́се 23 (вучаніца) ды 16 (ву́чань).
4. Янка зарабіў 17 (даля́р) і 96 (цэнт).
5. Калі́ мы былі́ ў Нью-Ёрку, мы наве́далі 3 (галерэя абразоў) ды 2 (музэй).
6. Шырыня́ на́шага пля́цу 26 (мэтар), а даўжыня́ 84 (мэтар).
7. У гадзі́не 60 (мінў́та, або часі́на), а ў мінў́це (часі́не) 60 (сэкў́нда, або хвіліна).
8. Кошка з 3 кацяня́ткамі грэюцца на сонцы.
9. На ве́чары было ка́ля 100 (асоба).

б) Перакладзе́це ска́зы з пу́нкту "а)" ў англе́льскую мову.

в) Прачыта́йце ска́зы, ста́вячы **лічэбнікі** ў **пара́дкавай** форме ды ў вадпаве́дным склоне.

1. У ча́се вы́перадкаў Казю́к прыбе́г 1, Я́нка 3, а Стасю́к аж 8.
2. Мой малодшы брат ву́чыцца ў 3 кля́се, старэйшы ў 7, а я ў 13.
3. Е́дучы ў Мантрэа́ль, на 80 мі́лі мы зрабі́лі адпачы́нак.
4. Мой дзя́дзька жыве́ на 8 паве́рсе ў 33 кватэры, а ся́бра на 22 паве́рсе ў 15 кватэры.
5. Мой та́та нарадзі́ўся ў 19 годзе, ма́ма ў 24 годзе, а я ў 51 годзе.
6. Наста́ўнік даў пятнаццацём ву́чням па кні́зе зь ве́ршамі Яку́ба Коласа, а 16 ву́чню Коласаў рама́н "На ростанях".

г) Перапішэце задáньні словамі, як пакáзвае ўзор, ды дапішэце адкáзы:

УЗОР: Ад чатырох два бýдзе два.

4 — 2 =	47 — 8 =	19 — 17 =
5 — 1 =	52 — 11 =	90 — 25 =
21 — 5 =	16 — 9 =	100 — 65 =

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 258. а) Прачытáйце верш, а тады́ перапішэце ды падчыркнéце ўсе **лічэбнікі.** Парáдкавыя ўвéрсе азнáчце лíтарай **"п"**, а колькасныя — лíтарай **"к".**

ПЯ́ТЫ

Чаты́ры салдáты
Лічы́лі пя́ты,
Далучы́ўся пя́ты:
— Залічэце маé пя́ты.

Падыйшло двáццаць
І яшчэ пятнáццаць.

Пяць сказáлі: — Брáтцы,
Трэба разабрáцца:

Сорак пя́таў
І сорак пя́таў —
Колькі-ж нас
Усíх салдáтаў?

В. Вíтка

Слоўнік (Vocabulary)

пятá, -ы́ (f.) heel (of the foot)
салдáты лічы́лі пя́ты the soldiers counted their heels
залічы́ць (II); (pf.) fut. **залічу́, -ыш, -аць** to include, to count
разабрáцца (I); (pf. of **разьбірáцца, I**) to investigate, to look into, (in this case) to figure out

б) Прачытáйце зáгадкі, вы́пішце ўсе лічэбнікі.

1. Які́ год ця́гнецца адзíн дзень? (Новы год.)
2. Двáццаць безь пятнаццацёх, трох не далажы́ўшы, двух не далічы́ўшы, колькі бýдзе? (Нíчога.)
3. Нéсла гаспады́ня ў кошыку дзéсяць яéц, а дно ўпáла. Колькі засталося? (Нíчога, усé разьбíліся.)
4. Як пастáвіць чатырох салдáтаў у вадны́м боце? (Зьняць у кáжнага па адны́м боце.)

в) Прачыта́йце ска́зы, устаўля́ючы, дзе трэба, **адзі́н (адно) аднаго** або **адна́ адну́** ў вадпаве́днай форме.

1. Га́ля й Зі́на вялі́кія прыя́целькі. Яны́ толькі пазна́лі . . . і адра́зу . . . спада-ба́ліся. Яны́ ча́ста быва́юць . . . ў . . . . Яны́ ра́зам ву́чацца ды . . . дапамага́юць. 2. Зі́на й Я́нка ча́ста пі́шуць . . . . 3. Цётка й дзя́дзька заўсёды гавораць . . . пра . . . Яны лю́бяць жартава́ць ды насьміха́цца . . . з . . . . 4. Раман і Юрка ча́ста ходзяць . . . да . . . або звоняць . . . па тэлефоне. 5. І ня зна́лі мы . . . пра . . . нічагу́сенькі, сказа́ў Ігна́т да свайго новага ся́бры.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 259. а) Пера[illegible]лі́кі словамі ў слупок ды дапішэце да іх пара́дкавую форму.

6, 8, 10, 11, 14, 15, 18, 19, 20, 21, 25, 37, 49, 50, 52, 64, 73, 86, 90, 94, 100.

б) Да колькасных лічэбні[illegible]лада́йце назоўнікі ды ўкладзе́це зь імі ска́зы.

Узор: шэсьць я́блыкаў. На стале́ шэсьць я́блыкаў.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 260. а) Фанэтычнае. Наста́ўнік вымаўля́е ўголас, а ву́чні паўта-ра́юць.

Адзіночны лік.

Хто?	два́ццаць пе́ршы ву́чань	адзіна́ццат**ая** наста́ўніца
Каго нама́?	два́ццаць пе́ршага ву́чня	адзіна́ццат**ае** наста́ўніцы
Каму́ даю́?	два́ццаць пе́ршаму ву́чню	адзіна́ццат**ай** наста́ўніцы
Каго ба́чу?	два́ццаць пе́ршага ву́чня	адзіна́ццат**ую наста́ўніцу**
Зь кім?	з два́ццаць пе́ршым ву́чнем	з адзіна́ццат**аю** наста́ўніцаю
Пры кім?	пры два́ццаць пе́ршым ву́чню	пры адзіна́ццат**ай** наста́ўніцы

Множны лік

Што?	сорак трэ́йція нумары́
Чаго ня ба́чу?	сорак трэ́йціх нумаро́ў
Чаму́ прыглада́юся?	сорак трэ́йцім нумаром
Што ба́чу?	сорак трэ́йці**я** нумары́
Чым (з чым)?	з сорак трэ́йці**мі** нумара́мі
У чым?	у сорак трэ́йціх нумарох

Contemporary Horadna (Grodno). In the background we can see the Historical-Archeological Museum located in an Old Castle built in the period between 11th and 19th centuries

5) Прачыта́йце ды перапішэце ска́зы, азна́чце **склоны** ў падчы́ркнутых **назоўніках.**

1. **Чалаве́к** ня ве́дае, калі́ ён знойдзе і калі́ ён згу́біць.
2. **Чалаве́ка** вочы водзяць. 3. Саба́ка — найле́пшы **чалаве́ку** пры́яцель.
4. Не цані́ **чалаве́ка** па тва́ры, а цані́ па душы́.
5. Вер сваім вачом, а не таму́, што **лю́дзі** ка́жуць.
6. Ду́малі, шмат **людзе́й** прыйдзе́, а прыйшло толькі чатыры́ **чалаве́кі.**
7. Ці шмат было **людзе́й?** Не, ня шмат, каля́ дзесяцёх **чалаве́каў.**
8. Супакойся, **чалаве́ча,** усё бу́дзе добра!

ПРАКТЫКАВА́ННЕ 261. Навучы́цца чыта́ць, а тады́ напа́мяць.

БУ́СЕЛ

Вы́йшаў бу́сел пагуля́ць.
Зьеў рапу́х ён два́ццаць пяць.
Два́ццаць пяць ці два́ццаць шэсьць?
Зьбі́ўся зь лі́ку — больш ня есьць.

На аднэй стаіць назе́
І на па́льцах лік вядзе́.
Ды як зьлі́чыш? У яго
Восем па́льцаў усяго.

Вёў ён лік і так і сяк,
А тады́ пайшоў, бядна́к,
Да рапу́х, каб іх спыта́ць:
— Два́ццаць шэсьць ці два́ццаць пяць?

Толькі штось рапу́хі ўсе́
Пахава́ліся ў лазе́.
Скуль ім знаць, чаго ізноў
Бу́сел з клёкатам ішоў.

Максім Танк

КРУГ 24

ПАЎТАРЭНЬНЕ

СТРАШНОЕ СПАТКА́НЬНЕ

(Праця́г)

II

Павярну́ўся я тады́, у ваднэй руцэ па́лка, у другой збан зь дзя́дзькавым полуднем, і як засмалі́ў, як пры́гнаў! Аглянуўся толькі тады́, калі́ зь ле́су пачала́ выплыва́ць на́ша ха́та. Тут я спыні́ўся, пайшоў ці́ха і ва́жна, ду́маючы аб тым, як паве́сьці дома апавяда́ньне пра гэты выпа́дак.

На дварэ мяне́ сустрэ́ў Га́лас і кі́нуўся кулём да мяне́.

— Ідзі́, ідзі́! Я цябе́ пачасту́ю!

І як толькі Га́лас хаце́ў падскочыць, каб лізну́ць мяне́ ў твар, я злосна штурхну́ў яго.

— Чаму́ вярну́ўся? — папыта́ла ма́ма.

Я стаў раска́заць, што было ў дарозе. Ма́ці слу́хала мяне́ ўні́кліва. А як уве́чары прыйшоў зь ле́су мой та́та й сказа́ў, што ў Пятровічах (якра́з недалёка ад ме́сца, дзе быў гэты выпа́дак) воўк патрывожыў пастухоў і аве́чак, то ўсе ў нас дома перакана́ліся, што я запраўды́ спатка́ўся з ваўком.

***

Ты́дні за два давялося мне зноў і́сьці па гэтай дарозе. А́ле цяпе́р я быў не адзі́н: я йшоў на крок зза́ду за сваі́м ба́цькам. Прыйшоўшы на гэтае са́мае ме́сца, я зірну́ў туды́, дзе стая́ў воўк.

І што-ж вы ду́маеце?

Гэты са́мы воўк стая́ў і цяпе́р!

Нічога не сказа́ў я свайму́ та́ту, іду́ й пазіра́ю.

Дасьцё ве́ры: гэта была́ стара́я крыва́я бярэзіна, аброслая мохам і нахі́леная над долам!

Я бая́ўся сьме́ху й нікому не сказа́ў аб гэтай памы́лцы, і толькі цяпе́р, маé дараго́ія, прызнаю́ся вам ува́ ўсёй пра́ўдзе.

Слоўнік (Vocabulary)

па́лка, -і (f.) stick
збан, -а́ (m.) pitcher
павярну́цца (I) (pf. of **паварочвацца, I**) to turn
як засмалі́ў, як прылёг! (an expression to describe very fast running)
павёсьці (I) апавяда́ньне to tell a story
выпа́дак, выпа́дку (m.) incident
кі́нуцца кулём да... to rush headlong at...
уні́кліва (adv.) attentively
патрывожыць (II) pf. past **патрывожыў, -ла, -лі** to harass
пасту́х, -а (m.) shepherd
крывы́, -а́я, -ое crooked
дасьцё ве́ры would you believe
дол, -у (m.) ground

ПЫТА́ЬНІ да ча́сткі II-ое

1. Што дадало Тара́ску адва́гі ўцяка́ць?
2. Калі́ Тара́ска асьме́ліўся азірну́цца наза́д, і як тады́ ён пача́ў ісьці́?
3. Чаму́ дома далі ве́ры, што Тара́ска ба́чыў ваўка́ ў ле́се?
4. Калі́ Тара́ска раскры́ў сваю́ памы́лку? Ці ён сказа́ў пра гэта ўдома, чаму́ не?

ПРАКТЫКАВА́ЬНЕ 262. Зь I-ае ча́сткі апавяда́ньня "Страшное спатка́ньне" выпішце ў слупок усе́ **прыме́тнікі,** а тады дапішэце да іх іхную вышэйшую ступе́нь ды найвышэйшую.

УЗОР: высокі, вышэйшы, найвышэйшы

ПРАКТЫКАВА́ЬНЕ 263. а) Прачыта́йце ска́зы, **прыме́тнікі** або **прыслоўі** ў ду́жках адпове́дна паста́ўце ў **вышэйшай ступе́ні** ці **найвышэйшай,** а тады́ перапішэце ска́зы.

1. Міха́сь (высокі) за Але́ся, Але́сь (высокі) за Я́нку, а Ю́рка з усіх іх (высокі).
2. Эдзік (малады́) за сваю́ сястру́ Га́ню на 3 гады́ й 5 ме́сяцаў, а́ле ён куды (высокі) за я́е. Га́ня затое куды (пі́льная) за яго ды куды (добра) ву́чыцца ў школе.
3. Марыля (добрая) Зосіна сяброўка. Яна́ крыху (стара́я) за Зосю ды куды́ (прыгожая) за я́е. Зося ду́мае, што Мары́ля(прыгожая) з усіх дзяўча́таў у іхнай школе.
4. На́шыя суседзі ве́льмі бага́тыя лю́дзі. Яны́, му́сіць, (бага́тыя) на ўсю́ на́шую ву́ліцу.
5. Віця няблі́га гаворыць пафранцу́ску, (добра) — паангельску, а (добра) пабелару́ску. Ён з усіх сваіх братоў і сясьцёр (здольны) да моваў ды (інтэлігэнтны).
6. Ён (добра) ву́чыцца за свайго бра́та, бо ён куды (пільны), як брат.

б) Прачыта́йце ска́зы, а тады́ перапішэце. **Лі́кі** напішэце **словамі,** а вы́разы ў ду́жках у вадпаве́дным скло́не.

1. Найбольшае возера ў Белару́сі — возера На́рач — маé плошчу 80 (квадра́тны кі-лямэтар), а другое пасля́ яго — возера Асьве́йскае—58 (квадра́тны кілямэтар).
2. Найвышэйшая ча́стка Белару́сі — гэта Ме́нскае Ўзвышша. На Ме́нскім Узвышшы знаходзяцца 3 найвышэйшыя гары́ ў Белару́сі: гара́ Сьвята́я* — 346 (мэтар) увы́шкі над узроўнем мора, у Лагойшчыне гара́ Лы́сая — 341 (мэтар) увы́шкі над узроўнем мора ды гара́ Маяк — 335 (мэтар) над узроўнем мора. Чацьве́ртай з вышынь гэтых гораў ідзе́ За́мкавая гара́ ў Нава́градку — 323 (мэтар) увы́шкі.

* Гара́ Сьвята́я ад [illegible] на́на ў гару́ Дзяржы́нскую. Дзяржы́нскі быў кіраўні́ком ЧЭКА — апара́ту саве́цкага дзяржа́ўнага тэрору.

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 26

а) [illegible]ы, вы́разы **“адзі́н аднаго”** ста́вячы ў вадпаве́дным скло́не, а тады́ запішэце ска́зы.

1. Сяброўкі падалі адна́ ... ру́кі, а тады́ пацалава́ліся.
2. Яны́ ве́льмі рэдка адзін з ... сустрака́юцца.
3. Стары́я сябры́ пасля́ 20 гадоў ледзь пазна́лі адзін ....
4. Яны́ заўсе́ды гэтак адно з .... спрача́юцца і ўсё-ж моцна адно ... каха́юць.

б) Прачыта́йце верш.

ВЕ́ЛЬМІ “ВЕ́ТЛІВЫ” МІКІ́ТА...

У сьпякоту або ў сту́дзень,
Незале́жна ад умоў,
Лю́дзі ўсе ідуць як лю́дзі:
— Добры дзень!
— Галё!
— Здароў!

Усьміхне́цца той другому —
І абодвум весялёй.
Толькі ён выходзіць з дому,
Як гуса́к ці Бармале́й:

І надзьму́ты, і сярдзі́ты
Ве́льмі “ве́тлівы” Мікі́та!
Ён пакла́ў свой “Добры дзень”
У партфэль або ў кішэнь?

І каго ён пераймае?..
У дрыму́чых джу́нглях слонь
Галавой сланю́ ківа́е —
Аддае́ і слонь паклон.

А як звонка ў пу́шчы на́шай!
Берасьця́нка: — цінь-цінь-цень!
— Добры дзень! — шчыгол адка́жа.
Пра́ўда, пень маўчы́ць як пень.

І надзьму́ты, і сярдзі́ты
Ве́льмі "ве́тлівы" Мікі́та!
Ён пакла́ў свой "Добры дзень"
У партфэль або ў кішэнь?

Эдзі Агняцьве́т

Няве́дамыя словы вы́пішце із слоўніка.

в) Перапішэце зада́ньне ды адка́з. Абазна́чце, які́я часьці́ны мовы ўжы́тыя ў вадка́зе?

ЗАДА́НЬНЕ. Пералічэце пяць дзён з пара́дку, не называ́ючы да́таў і назоваў дзён.

АДКА́З. Пазаўчора, учора, сёньня, за́ўтра, паза́ўтра.

Mirski Castle built in the 16th century

КРУГ 25

ПАЧА́ТКІ ТАРОНТА

Пасьля́ адкры́цьця во́зера Анто́рыё ў тысяча шэсьцьсот пятна́ццатым го́дзе (1615) ў індыя́нскае Таро́нта. гэта зна́чыць індыя́нскі шлях уздоўж паўно́чнага бе́рагу Антэры́ё паміж рэкамі Га́мбэр і Дочам. усе́ часьце́й пачалі́ даходзіць скупнікі ску́раў. За му́ку, розныя ха́тнія прыла́ды, ша́рам і зброю вымяня́валі яны́ ад Індыя́наў ску́ры, якія пасьля́ прада́валі зь вялі́кім прыбы́ткам у Эўро́пу на дарагія́ ху́тры.

Гэтак на працягу пя́ці[illegible] над утокай ракі Га́мбэр разбудава́лася вялі́кая індыя́нская ве́ска, [illegible], у ваколіцы цяпе́рашніх руі́наў Старога Млына́ (Old Mill) у заходня[illegible]ру́га́я, у якой перш жылі́ сябры плямя́ Сэнэ́ка а зату́м плямя́ Місыса́га.

Пройдзе адна́к яшчэ бо́льш ча́ўстагодзьдзя, пакуль і Францу́зы разбуду́юць тут сваю́ ста́лую гандлёвую пляцоўку дзе́ля ахо́вы сваіх купцо́ў ды іхнага каштоўнага тава́ру. Афіцы́йна гэты форт зва́ўся у гонар тагача́снага францу́скага міні́стра ваенна́га фле́ту ды кале́ніяў Fort Rouillé, а практы́чна зва́лі яго "le fort royal de Toronto". Толькі нядо́ўга стая́ў гэты форт. За дзе́вяць гадо́ў са́мі Францу́зы спалі́лі яго дашчэ́нту, каб ён не папа́ўся ў ру́кі Анге́льцаў, якія ў ты́сяча се́мсот пя́ць дзесят дзявя́тым го́дзе (1759) канча́льна перамаглі́ Францу́заў у Но́вым Сьве́це ды захапі́лі на́вет Квэбэ́к.

На працягу́ насту́пных гадо́ў Індыя́не ды іхнае Таронта йзно́ў былі́ пакі́нутыя са́мі сабе́. Анге́льшчына была́ занята́я вайно́ю із сваймі́ трынаццацьма́ калёніямі, напаўдня́ ад во́зера Антэры́ё. Калі́-ж гэту́ю вайну́ яна́ праграла́, ды калёніі абве́сьцілі сябе́ самастойнай дзяржа́вай Задзіно́чаных Шта́таў Паўно́чнае Амэры́кі (1776), тады́ некаторыя жы́хары гэтых калёніяў, хочучы заставацца ве́рнымі Анге́льшчыне, пачалі́ эміграва́ць у Анге́льскую Кана́ду.

Мясцовасьць, дзе калі́сь стаяў францу́скі форт, з працярэбленымі дарогамі ў лясны́ гушча́р, Брыта́нскаму губэрна́тару ў Квэбэ́ку вы́далася ве́льмі адпаве́днай, каб пасяліць туды́ ляялістых, што прыбыва́лі з паўдня́. Да таго-ж разуме́ў ён, што карысна бу́дзе йзно́ў ажывіць гандлёвы пункт, які́ не́калі дава́ў такія вялі́кія прыбыткі Францу́зам, а цяпе́р мог-бы дава́ць гэтыя прыбы́ткі для ягонага ска́рбу. Ён і пача́ў перамовы з галавара́мі мясцовых Індыя́наў, каб адкупіць ад іх зямлю́, дый неўза-

ба́ве за няцэлыя дзьве ты́сячы анге́льскіх фу́нтаў, паўтары́ сотні бочак мукі́ ды і́ншую дробязь купі́ў дзяля́нку ле́су, што ўсёй сваёю шы́рынёю — 14 мі́ляў — упіра́лася ў возера Антэрыё (ме́сца сёньнешняга Таронта) ды цягну́лася ў глыб ле́су на 30 мі́ляў напоўнач, ма́ла не да другога возера, што цяпе́р заве́цца Лэйк Сымко (Lake Simcoe).

Тады́-ж быў укла́дзены плян пабудовы гораду ды пры́стані Таронта, а́ле правадзіць у жыцьцё гэты плян пачалі толькі пасьля́ падзе́лу Кана́ды на: Ніжнюю Кана́ду, гэта зна́чыць на ўсходнюю, старэйшую ча́стку з жыха́рствам у бальшыні францу́скага паходжаньня, ды Ве́рхнюю Кана́ду, заходнюю, новапаўста́лую ча́стку, у бальшыні англамоўную (1791).

II.

Пе́ршы наме́сьнік-губэрна́тар Ве́рхняе Кана́ды Джон Грэйвс Сымко адра́зу ўзя́ўся шука́ць адпаве́днага ме́сца на сталі́цу новае правінцыі, ды вы́браў Лёндан. Тымча́сам-жа зь Нюа́рку (Newark — цяпе́р Niagara-on-the-Lake), дзе спача́тку знаходзіўся ўрад, часова ра́зам з ура́дам перабра́ўся над Таронцкую затоку, бо, як ён сам піса́ў каралю́ ў Анге́льшчыну, "пад гарма́тамі варожага форту ня ме́сца на сталі́цу Брыта́нскае правінцыі". Як сядзібу для ўра́ду загада́ў ён пабудава́ць на ўзьбе́ражжы возера форт зь бярве́ньняў і часа́нага дрэва, ды, не зважа́ючы на даўне́йшы плян і тради́цыю, даў ямý ймя не Таронта, а Форт Ёрк — у гонар сына анге́льскага караля́ Джорджа III. Аўтэнтычна рэканструява́ны Форт Ёрк можна і сёньня агляда́ць як адзін зь цікаве́йшых гістары́чных помнікаў у Тароньце.

Палкоўнік Сымко ня спыні́ўся на пабудове новага форту. Ён паста́віў сваё войска, каб працерабіць дарогу ўздоўж купленае дзяля́нкі ле́су праз усю́ е́йную даўжыню́. Дарога гэтая, зробленая за параўна́льна кароткі час, спрычыні́лася да ху́ткага расьсяля́ньня піяне́раў у глыб абша́ру. Сёньня гэтая дарога — гэта найстарэйшая й найважне́йшая ву́ліца Таронта — Янґ Стрыт. Янґ Стрыт, як некаторыя ка́жуць, найдаўжэйшая ву́ліца на сьве́це, бо, перайшоўшы ў аўтастра́ду, канча́ецца яна́ ажно ля Ніпіган (Антэрыё), 868 мі́ляў напоўнач ад Таронта.

У 1795 г. закончылі будава́ць ле́тні дом для наме́сьніка-губэрна́тара й ягонае жонкі на стромкім заходнім бе́разе ракі́ Дону. Дом гэты меў стыль старагрэцкае сьвятыні. Спада́рыня Сымко піса́ла ў сваім дзёньніку, што ве́льмі ціка́ва было жыць у іхным новым доме, зва́ным Castle Frank. У ле́се поўна дзікіх казу́ляў, а ў крынічнача́стай вадзе́ шпа́ркае ракі́ поўна ры́бы лахакоў. Се́дзячы ўве́чары на сваёй вэра́ньдзе, ціра́з яна́ назіра́ла, як Індыя́нс пры сьвятле́ паходняў лавілі ры́бу дзідамі. Цяпе́р на гэтым ме́сцы на ву́ліцы Блю́ры (Bloor East) стаіць сярэдняя школа — Castle Frank High School.

Новая сталіца адра́зу ня на́дта ху́тка разбудоўвалася. Запі́сана, што ў 1795 го-дзе ў се́лішчы было 12 дамоў. За восем гадоў гэты лік узрос толькі да 75, а яшчэ за насту́пныя шэсьць гадоў да 107, у гэтым лі́ку было 27 двупаве́рхавых драўля́ных дамоў.

Калі-ж горад пача́ў расьці хутчэй, у 1827 годзе атрыма́ў ён ад караля́ Джорджа IV каралеўскую гра́мату-дазвол на адчыне́ньне ўнівэрсыте́ту. Адра́зу гэта быў ка́ледж (King's College). Зь яго з ча́сам разрасьце́цца сучасны Таронтаўскі Унівэрсыте́т, адзін з найбольшых на сьве́це, што займае цяпе́р блізу́ сотню будынкаў, раскі́нутых у колькіх унівэрсыте́цкіх асяродках (campuses).

А ў 1834 годзе, калі жыхарства Ёрку налічвала 9,254 чалаве́кі, Ёрку нада́дзеныя былі муніцыпа́льныя правы́, гэта значыць, ад таго ча́су ён быў ме́стам (city). Ме́ста ў той-жа час адкінула назоў Ёрку і назвалася да свайго першапача́тнага йме — Таронта.

Слоўнік (Vocabulary)

ску́пнік or **скупні́к, -а** (m) ску́пщык trader
мука́, -і (f.) flour
ха́тняя прыла́да, -ы (f.) household tool
зброя, -і (f.) arms
выме́ньваць (I); **выме́ньваю, -еш, -юць** to trade
прыбы́так, -у (m.) profit
гандлёвая пляцоўка, -і (f.) trading post
ахова, -ы (f.) protection
купе́ц, купца́ (m.) trader, merchant
каштоўны, -ая, -ае valuable
міні́стар вае́ннага флёту ды калёніяў Minister of the Marine and Colonies
дашчэнту (adv.) completely
прагра́ць (I) (pf.) past **прагра́ў, -ла, -лі** to lose
абве́сьціць (II); (pf. of **абвяшча́ць**, I) to proclaim
самастойны, -ая, -ае independent
ве́рны, -ая, -ае loyal
працярэбленая дарога (f) established trail
губэрна́тар, -а (m.) governor
намесьні́к-губэрна́тар Lieutenant-Governor
ляя́лісты, -ага (m.) loyalist
скарб, -у (m.) treasury
перамовы (pl. only) negotiations, talks
бочка, -і (f.) barrel
дзяля́нка ле́су small section of forest
упіра́цца (I) **(у што)** to rest (set) against
упіра́цца ў возера to extend along the lakeshore
быў укла́дзены плян a plan was made
пры́стань, -і (f.) harbour
Ні́жняя Кана́да (f.) Lower Canada
Ве́рхняя Кана́да Upper Canada

II.

знаходзіцца (II); **знаходжуся, -ішся, -яцца** to be located
часова (adv.) temporarily
сядзіба, -ы (f.) dwelling-place, seat, abode
часа́нае дрэва (n.) squared timber
не зважа́ючы disregarding
гістары́чны помнік, -а (m.) historic sight
працерабіць дарогу to cut a road through the forest
старагрэцкая сьвяты́ня (f.) Grecian Temple
дзёньнік, -а (m.) diary
казу́ля, -і (f.) deer
лаха́к, -а́ (m.) salmon
вэра́нда, -ы (f.) porch
паходня, -і (f.) torch
дзі́да, -ы (f.) spear

сéлішча, -а (n.) settlement
караléўская грáмата Royal Charter
займáць (I); займáю, -еш, -юць to take up, to occupy
універсытэ́цкі асяродак, -у (m.) campus
першапачáтны, -ая, -ае original, initial
адкíнуць (I); (pf.) fut. адкíну, -еш, -уць to abandon

Прачытáйце ўвáжна I-ую чáстку "ПАЧÁТКАЎ ТАРОНТА" ды адкажэце на пы-
áньні поўнымі скáзамі. Усé лíкі пішэце словамі ў вадпавéднай форме. А тады́ зрабéце
эта сáмае з чáсткай II-ой.

ПЫТÁНЬНІ Й ЗАДÁНЬНІ

I.

1. Хто ды калí адкры́ў возера Антэ́рыё? (гл. "Як адкры́лі возера Антэ́рыё кр. 10.)
2. Дзе былí 2 пéршыя індыя́нскія вёскі ў ваколíцы Таронта?
3. Як звáўся францýскі форт? Навошта яго пабудавáлі?
4. Ці доўга стаяў гэты форт? Чамý?
5. У каторым годзе Англéльцы перамаглí Францýзаў у Паўночнай Амэрыцы?
6. Што стáлася ў 1776 годзе?
7. Ці мéла якí ўплыў на Канáду паўстáньне Задзіночаных Штáтаў Паўночнае Амэрыкí? Якí?
8. Чамý брытáнскі губэрнáтар вы́браў аколíцы сёньнешняга Таронта на мéсца пасялéньня ляялíстых, што прыяжджáлі з паўдня́?
9. Якóй вялíчынí быў кавáлак зямлí, які Брытáнцы тады́ купíлі ад Індыя́наў?
10. У каторым годзе ды як Канáда былá падзéленая на Нíжнюю й Вéрхнюю Канáду?

II.

1. Хто быў пéршым намéсьнікам-губэрнáтарам Вéрхняе Канáды?
2. Што добрага ён зрабíў для Канáды?
3. Як завéцца цяпéр пéршая вýліца, якóю правялí ў Тароньце, ды як тады́ звáлася Таронта, калí яé праводзілі?
4. Ад чаго паходзіць назоў сёньнешняй таронтаўскай сярэдняй школы Castle Frank High School?
5. Як завéцца ракá, што плывé праз усход Таронта, ды як — што плывé праз зáхад гэтага гораду?
6. Падлíчэце,* у каторым годзе ў Ёрку было 107 дамоў.
7. Як звáўся спачáтку цяпéрашні Таронтаўскі ўнівэрсытэ́т, і калí ён быў адчы́нены?
8. Калí Ёрк пачáў звáцца Таронта?

* **падлíчы́ць** to figure out, to count

25 — I CARDINAL and ORDINAL NUMERALS: 101 and above
КОЛЬКАСНЫЯ І ПАРАДКАВЫЯ ЛІЧЭБНІКІ: 101 ды вышэй

1.	КОЛЬКАСНЫЯ	ПАРАДКАВЫЯ
101	**сто** адзін (адна́, адно)	сто **пе́ршы, -ая, -ае**
199	**сто** дзе́вяцьдзесят дзе́вяць	сто дзе́вяцьдзесят дзявя́ты, **-ая, -ае**
200	дзьве́**сьце**	дву́х**сотны** or двух**соты, -ая, -ае**
300	тры́**ста**	трох**сотны** or трох**соты, -ая, -ае**
400	чаты́рыста	чатырох**сотны** or чатырох**соты, -ая, -ае**
500	пя́ць**сот**	пя́ць**сотны** or пя́ць**соты, -ая, -ае**
600	шэсьць**сот**	шэсьць**сотны** or шэсьць**соты, -ая, -ае**
700	се́м**сот**	се́м**сотны** or се́м**соты, -ая, -ае**
800	восем**сот**	восем**сотны** or восем**соты, -ая, -ае**
900	дзе́вяць**сот**	дзе́вяць**сотны** or дзе́вяць**соты, -ая, -ае**
1,000	**тысяча**	ты́сячны, **-ая, -ае**
2,000	дзьве тысячы	двухты́сячны, **-ая, -ае**
5,000	пяць тысячаў	пяцьты́сячны, **-ая, -ае**
1,000,000	**міліён**	міліённы, **-ая, -ае**
2,000,000	два міліёны	двухміліённы, **-ая, -ае**
1,000,000,000	**мілія́рд** (амэрыка́нскі біліён)	мілія́рдны, **-ая, -ае**

2. Утварэньне

а) **Колькасных** лічэбнікаў **200 — 900:**
200 — дзьве + **сьце** = **дзьве́сьце;**
300, 400 — тры, (чаты́ры) + **ста** **тры́ста (чаты́рыста);**
500 . . . 900 — пяць . . . дзе́вяць + **сот;** прыкл.: **се́мсот.**

б) **Парадкавых** лічэбнікаў **200** і **далейшых:**

200 . . . 400 — двух, трох, чатырох + **сотны** (або **соты**). Прыкладам:

двухсот(н)ы, трохсот(н)ы, чатырохсот(н)ы

500 . . . 900 — проста да "пяць . . . дзе́вяць" дадаецца **"сот(н)ы",** прыкладам:

шэсьцьсот(н)ы, восемсот(н)ы . . .

в) У парадкавых **складаных** лічэбніках, выражаных трыма і больш словамі, **парадкавую форму** прыймае **толькі апошняе слова.** Прыкл.:

сто сорак **дзявя́ты,** ты́сяча шэсьцьсот **дванаццатая,**
міліён пяцьсот ты́сячаў дзьве́сьце дзе́вяцьдзесят **трэйці.**

г) Парадкавыя: **ты́сячны, міліённы, мілія́рдны, біліённы** твораца ад асноваў адпаведных ім колькасных лічэбнікаў **даданьнем суфіксу -н-** ды родавых канчаткаў **-ы, -ая, -ае.**

УВАГА 1. Усе колькасныя складаныя лічэбнікі **з** другою часткаю **сот** як і **ўсе парадкавыя з** другой часткаю **сотны** маюць **два націскі.** Прыкл.:

шэсьцьсо́т, се́мсо́т, во́семсо́т ды **тро́хсо́тны, во́семсо́тны.**

УВАГА 2. Дзьве (сорак **чаты́ры**) **ты́сячы,** два **міліёны, мілія́рды** . . .
а́ле **пяць** (сто **шэсьць**) ты́сяч**аў**, міліён**аў**, мілія́рд**аў** . . .

***

Study the **cardinal** and **ordinal** numerals **101** and above from the table in the Byelorussian text and remember:

a) The **cardinals 200, 300** to **900** are formed as follows:

200 — дзьве + **сьце** = **дзьве́сьце;**
300, 400 — тры, чаты́ры + **ста** = **тры́ста, чаты́рыста;**
500 . . . 900 — пяць... дзе́вяць + **сот** = **пяцьсот, . . . дзе́вяцьсот**

b) And **the ordinals 200th, 300th** and above are formed:

200th ... 400th — to **"двух", "трох", "чатырох"** (the genetive form of **два, тры, чаты́ры**), **"сотны"** (or **соты**) is added, e.g.: двух**сотны,** трох**сотная,** чатырох**сотнае.**
500th ... 900th — to **пяць ... дзе́вяць, "сот(н)ы"** is added. For example: пяць**сот(н)ы,** сем**сот(н)ы...**

c) In **compound ordinal** numerals consisting of three or more words (just as in those consisting of two) **the ordinal form** is taken by **the last word only.** For example:

сто сорак **дзявя́ты** чалаве́к **the 149th man**
міліён пяцьсот ты́сячаў дзьве́сьце **дзевяцьдзяся́тая міля**..**the 1,500,290th mile**

d) **The ordinal** numerals of **ты́сяча, міліён, мілія́рд, біліён** are formed by adding the suffix **-н-** and the gender endings to the stem of the corresponding cardinal. For example:

ты́сяч-а	ты́сяч-**н**-ы, -ая, -ае
міліён	міліён-**н**-ы, -ая, -ае
мілія́рд	мілія́рд-**н**-ы, -ая, -ае

25 — II DECLENSION of CARDINAL AND ORDINAL NUMERALS 101 AND ABOVE
СКЛАНЁНЬНЕ КОЛЬКАСНЫХ І ПАРА́ДКАВЫХ ЛІЧЭБНІКАЎ 101 ды далёйшых.

1. **Колькасныя** лічэбнікі, як **200, 300, 400 . . . 900** як правіла **не зьмяняюцца,** прыкл.:

з восемсот ву́чня**ў** толькі сто пае́хала на экску́рсію,
завод зь семсот работні**камі** перабра́ўся ў другі горад.

2. а) **Ты́сяча** скланяецца як назоўнікі жаноцкага роду з канчаткам на **-а:**

Адз. л. тысяча, тысячы, тысячы, тысячу, тысячай, у тысячы
Мн. л. тысячы, тысячаў, тысячам, тысячы, тысячамі, у тысячах

Гэтак: чаты́ры ты́сячы, зь пяцьма́ ты́сячамі.

б) **міліён, міліярд, біліён** — скланяюцца **як назоўнікі мужчынскага роду з чыстай асновай** у наз. склоне адз. ліку:

адз. л. міліён, міліёну, міліёну, міліёнам, у міліёне
мн. л. міліёны, міліёнаў, міліёнам, міліёнамі, у міліёнах

Прыкл.: У ме́сьце пяць міліёнаў жыхароў.

3. У **складаных лічэбніках** з трох ды больш словаў, як **у колькасных,** так і **у парадкавых, скланяецца** толькі апошняе слова. Прыкл.:

Сярод ты́сяча пяцьсот сорак двух ву́чняў.
У бібліятэку купі́лі міліён шэсьць ты́сячаў тры́ста дзяся́тую кні́гу.

4. Як скланяюцца [illegible] гэткі правілы **21-IV в)** ды **23-II.**

1. Cardinal numerals such as 200, 300 . . . 900 are **not declined.** For example:

Завод вы́браўся з восемсот работнікамі.	The plant moved with 800 workers.
У школе восемсот ву́чняў.	There are 800 pupils in the school.
З усіх восемсот ву́чняў.	From all 800 pupils.

2. **Ты́сяча** (1000) is declined **like feminine nouns** ending in **-a:**

Singular: Nom.	ты́сяча	**Plural:** Nom. Acc.	ты́сячы
Gen. Dat. Loc.	ты́сячы	Gen.	ты́сячаў
Acc.	ты́сячу	Dat.	ты́сячам
Inst.	ты́сячаю	Inst.	ты́сячамі
		Loc.	у ты́сячах

3. **Міліён, міліярд, біліён** are declined like **masculine nouns ending in a consonant** in the nominative case singular:

Singular: Nom. Acc.	міліён	**Plural:** Nom. Acc.	міліёны
Gen. Dat.	міліёну	Gen.	міліёнаў
Inst.	міліёнам	Dat.	міліёнам
Loc.	у міліёне	Inst.	міліёнамі
		Loc.	у міліёнах

4. **In compound cardinal** as well as **ordinal numerals** consisting of three or more words **only the last word is declined.** For example:

Сярод ты́сяча пяцьсот сорак **двух** ву́чняў. Among 1,542 pupils.
У бібліятэку, купі́лі мілі́ён шэсьцьсот ты́сячаў тры́ста **дзяся́тую** кні́гу.
They bought the 1,600,310th book for the library.

5. **For the declension of ordinal numerals** look up rules 21-IV c and 23-II.

25 — III AGREEMENT OF CARDINAL NUMERALS WITH NOUNS
ЗГОДА НАЗОЎНІКАЎ З КОЛЬКАСНЫМІ ЛІЧЭБНІКАМІ

1. **Пасьля** лічэбніка **адзі́н, адна́, адно** ды **ўсіх складаных зь імі** на канцы (як 21, 31 ... 101 ...), калі яны ўжытыя ў назоўным склоне або аднолькавым зь ім вінавальным, назоўнік стаіць у **назоўным склоне адзіночнага** ліку, а пасьля **адны,** зразумела, у **назоўным** склоне **множнага** ліку. Прыкл.:

адзі́н стол – ды тры́ццаць **адзі́н** стол;
ты́сяча дзьве́сьце **адна́** кніга, сто **адно** дрэва, **адны́я** дзьве́ры.

2. **Пасьля** лічэбнікаў **два (дзьве), тры, чаты́ры** ды ўсіх **складаных зь імі** на канцы (як 23, 34 ... 102 ...), ужытых у назоўным або аднолькавым зь ім вінавальным склоне:

а) назоўнікі **мужчынскага** роду ставім у **назоўным** склоне **множнага** ліку, **б)** а назоўнікі **жаноцкага** ды **ніякага** роду ставім у назоўным склоне **па́рнага** ліку. Па́рная форма часта супадае з множным лікам, але ў некаторых назоўніках яна розная, дый галоўна націскам (глядзеце практыкаваньне **268а).** Прыкладам:

а) Яму́ **тры́ццаць два** гады́. Пабудава́лі **сто чаты́ры** дамы́.

б) **Дзьве** нагі́ (а мн. лік — ногі́)
чаты́ры сястры́ (мн. лік — сёстры)
тры сьцяны́ (мн. лік - сьце́ны)
два́ццаць два пяры́, вядры́ (а мн. лік пёры́, вёдры)

3. Пры лічэбніках **пяць, шэсьць** ды далейшых (за выняткам складаных з **адзі́н, два, тры** або **чаты́ры**) у форме назоўнага ці аднолькавага зь ім вінавальнага склону назоўнік ставіцца ў **родным** склоне **множнага** ліку. Прыкладам:

шасна́ццаць алавіко**ў**, дзьве́сьце тры́ццаць **сем** міля**ў**.

4. У іншых ускосных склонах колькасныя лічэбнікі згаджаюцца з назоўнікамі ў склоне ды ў некаторых выпадках і ў родзе. Прыкладам:

Мы былі́ ў кіно зь дзьвюма́ сяброўкамі ды двума́ сябра́мі.
Стыпэндыю далі́ тры́ста шэсьцьдзесят васьмём студэнтам.

***

a) When the **cardinal** numeral is in the **nominative,** or in an **accusative identical** in form **with** the **nominative,** it agrees with the noun according to the following rules.

1. **"Адзін, адна́, адно"** and **any compound** in which **they are the last digit** (21, 41, 51 etc.) **requires** the noun in the **nominative singular.** For example:

Два́ццаць **адзін** стол	—	twenty-one tables.
Тысяча **адна́** кні́га	—	one thousand and one books.
Сто **адно** дрэва	—	one hundred and one trees.

2. "Два, тры, чаты́ры" and any compound in which they are **the last digit** (22, 43, 64 etc.) are followed by the noun in the **nominative plural, if masculine,** and by **dual** forms for feminine and neuter nouns. For example:

Яму́ два́ццаць **два** га́ды.	He is twenty-two years old.
Пабудава́лі пяцьдзесят **чатыры** дамы.	They built fifty-four houses.

But дзьве **нагі** (cf. nom. pl. — **ногі**)

чаты́ры **сястры́** (nom. pl. — сёстры)
гры **сьцяны́** (nom. pl. — сьце́ны)

Note. For more examples of dual forms of feminine and neuter nouns see **"практыкава́ньне" 268a.**

3. **Cardinal** numerals from **"пяць" onwards** (except compounds with **"адзін, два, тры"** and **"чатыры"**) are used with the noun in the genitive plural. For example:

шаснáццаць алавікоў, дзьвéсьце трыццаць **сем** мі́ляў — 237 miles

b) When **the cardinal** numeral is **in an oblique case** (other than the nominative), it **agrees in case with the noun. For example:**

Я́нка йдзе зь дзьвюма́ дзяўча́тамі й двума́ хлопцамі.	John is walking with two girls and two boys.
Стыпэндыі далі трыста шэсьцьдзесят сямём студэнтам.	Scholarships were granted to 367 students.

25 — IV POSSESSIVE PRONOUNS: мой, твой, ягоны, е́йны, свой . . . ПРЫНАЛЕ́ЖНЫЯ ЗАЙМЕ́НЬНІКІ

1. Да **прынале́жных** займе́ньнікаў **залічáюцца:**

мой, мая́, маё	**наш(ы), на́ша(я), на́ша(е)**	
твой, твая́, твае́	**ваш(ы), ва́ша(я), ва́ша(е)**	
свой сваё́, сваё		
ягоны, ягоная, ягонае	**і́хны,**	**і́хная,** **і́хнае**
е́йны, е́йная, е́йнае	**усі́хны,**	**усі́хная,** **усі́хнае**

2. Скланeньне.

а) **Мой, мая́, маё** (чый? чыя́? чыё?)

	Адзіночны лік						Множны лік	
	м.	**ж.**	**н.**	**м.**	**ж.**	**н.**	(для ўсіх родаў)	
Н.	чый?	чыя́?	чыё?	мой	мая́	маё	чы́е?	ма́е
Р.	чыйго?	чы́е(ей)?	чыйго?	майго	ма́е(е́й)	майго	чы́іх?	ма́іх
Д.	чыйму́?	чыёй?	чыйму́?	майму́	маёй	майму́	чы́ім?	ма́ім
В.	як Н. або Р.	чыю́?	чыё?	як Н. або Р.	маю́	маё	як Н. або Р.	як Н. або Р.
Т.	чыім?	чыёю(ёй)?	чыім?	маім	маёю(ёй)	маім	чыймі?	майміі
М.	у чыім?	чыёй?	у чыім?	у маім	у маёй	у маім	у чыіх?	у маіх

б) Займeньнікі **“твой, твая́, твае”** ды **“свой, сваі́, сваё”** скланяюцца гэтак-жа, як займeньнікі **“мой, маі́, маё”** ды **“чый, чыя́, чыё”.** Заўважце, што яны ў **родным** ды **дава́льным** склонах **адзіночнага** ліку ды ў **творным** склоне **множнага** ліку маюць **скарочаныя канчаткі** (зь **“й”**):

Р. — майго, твайго, свайго, чыйго
Д. — майму́, твайму́ свайму́, чыйму́
Т. — майміі, твайміі, свайміі, чыймі

в) Займeньнікі **“мой, твой, свой, чый”** ды азначальны займeньнік **“уве́сь”** у **назоўным** і падобным да яго **вінавальным** склонах **множнага** ліку маюць форму **“маé, твае́, сваé, чыé, усé”** з націсным **“е”** на канцы. (Скланeньне **“уве́сь”** гл. 26-VI, 2а).

г) Займeньнікі **ягоны, ягоная, ягонае; е́йны, е́йная, е́йнае;**
наш(ы), на́ша(я), на́ша(е); ваш(ы), ва́ша(я), ва́ша(е);
іхны іхная, іхнае; усіхны, усіхная, усіхнае
скланяюцца, як **прыметнікі зь цьвярдой асновай** і **націскам** на **аснове,** прыкладам **“чорны”.** (Гл. правіла 16-I, б). Прыклады:

Мы ба́чылі яго зь ягонаю жонкаю.
Мы былі́ ў е́йнае ма́ткі. Я́нка е́зьдзіў на на́шую фэрму з ва́шым дзя́дзькам.
На іхнай ву́ліцы шмат дрэваў.

3. Ужыва́ньне.

а) Займeньнікі **“мой, наш”** паказваюць на **прыналежнасьць** прадмету да **першае** асобы: **Мой** родны кут, як ты **мне** мілы! (Колас)

б) Займeньнікі **“твой, ваш”** — на прыналежнасьць да **другое** асобы:
Сла́вен, грозен і **ты,** і **твой** хорам-астрог... (Купа́ла)

в) Займeньнікі **“ягоны, е́йны, іхны”** — да **трэйцяе** асобы:
Га́нна й **е́йная** сястра́ сёньня ня былі́ ў школе.

г) Займеньнік **"свой"** можа паказваць на прыналежнасьць да **ўсіх трох** асобаў. Прыкладам: **Ты, мой** брат, каго зваць Беларýсам,
Роднай мовы **сваé** ня чурáйся... (Гарýн)
або — А мову ў сэрцы, у **сваім** сэрцы хавáлі — нясьлі **мы**. (Гарýн)

I. Пры гэтым, калі дзейнік-собсьнік у **першай** ці другой **асобе,** займеньнік **"свой" заўсёды можна ўжываць** заміж **"мой** і **наш"** ці **"твой** ды **ваш",** у аснаўным не мяняючы сэнсу сказанага (**"свой"** толькі больш падчыркваe адцéньне собскасьці). Прыкл.:

"Ты даглядáеш **свой** гарод" значыць тое самае, што
"Ты даглядáеш **твой** гарод" — гутарка пра той сáмы гарод.

II. Калі-ж дзейнік-собсьнік у трэцяй асобе, **у вадных выпадках** трэба ўжываць **толькі "свой",** у іншых — толькі **"ягоны, éйны, іхны".** Замена аднаго займеньніка другім зьмяняе сэнс сказанага. Гэтак у сказах:

Алéсь любіць **сваю** сястрý — гýтарка пра Алéсеву сястрý.
Алéсь любіць **ягоную** сястрý — гýтарка не пра Алéсеву сястрý, а нéкага іншага.

а') "Свой" заўсёды ўказвае на належнасьць **да асобы ці прадмету,** што **належыць** да дзейніка дадзенага сказу. Пры гэтай **асобы** ці прадмету звычайна стаіць ува **ўскосным** склоне. Прыкладам:

Янка любіць **свайго** сабáку.
Янка купíў **сваёй** сястры падарýнак.
Янка із **сваім** сябрам паéхаў у Эўропу.

б') Калі-ж **асоба ці прадмет,** да якога датычыць прыналежны займеньнік, **не належыць да дзейніка** дадзенага сказу **або** выражаны **ў назоўным склоне, заміж** займеньніка **"свой, свая, сваё"** трэба ўжываць адпаведна **"ягоны, ягоная, ягонае", "éйны, éйная, éйнае"** ці **"іхны, іхная, іхнае".** Прыкладам:

Янка й **ягоная** сястрá ня былі ў школе. (**"ягоная"**, бо прадмет прыналежнасьці ў наз. склоне.)

Гáння казáла, што **éйная** сястрá дома. (**"éйная", "іхнага",** бо собсьнік ня ёсьць
Кáля **іхнага** дому плывé рэчка. дзейнік сказу.)

**
*

1. The possessive pronouns are:

a) **Мой, мая́, маё** (my) and **наш(ы), на́ша(я), на́ша(е)** (our) which indicate the **possession** of an object by the **first** person. For example: **мой** алавíк, **наш** край.

b) **Твой, твая́, тваё** (your sing.) and **ваш(ы), ва́ша(я), ва́ша(е)** (your pl.) **indicating possession** by the **second person.** For example: **твая́ кні́га, ваш дом.**

c) **Ягоны, ягоная, ягонае** (his, its), **éйны, éйная, éйнае** (her) and **іхны, іхная, іхнае** (their) — indicating **possession** by the **third** person. For example: **ягонае áўта** — his car; **éйная** пра́ца — her work; **іхны** дом — their house.

d) **Свой, свая́, сваё** (one's own) can indicate possession by any of the three persons in the singular or plural. For example:

Ты лю́біш **свайго** бра́та, **і мы** лю́бім **свайго бра́та.**
You love your (own) brother and we love our (own) brother.

2. Use of **свой.**

a) The use of **"свой"** is **optional** for the **first** and **second** person, singular and plural. Other possessives (like **мой, наш, твой** or **ваш**) may replace **"свой"** without changing the meaning of the sentence. For example:

Ты дагляда́еш **свой** гарод. } = You take care of your garden.
or Ты дагляда́еш **твой** гарод. }
Мы дагляда́ем **свой** гарод. } = We take care of our garden.
or Мы дагляда́ем **наш** гарод. }

b) For the **third person "свой" must** be used when the object is possessed by the subject **of the sentence,** and the object of possession is expressed in the **oblique case** (other than the nominative); otherwise **"ягоны, е́йны** or **і́хны"** must be used correspondingly. For example:

1" Але́сь лю́біць **сваю́** сястру́. Alex loves **his (own)** sister..
Але́сь лю́біць **ягоную** сястру́. Alex loves **his (someone else's)** sister.

"Ягоную" in the second example indicates that the object in the oblique case **does not belong** to the **subject** of the sentence.

2" Кастуо́сь гаварыў пра **свайго** ся́бру. Kastuś spoke about **his** friend.
Кастуо́сь і **ягоны** ся́бра шмат чыта́юць. Kastuś and **his** friend read a great deal.

In the second sentence, **"ягоны"** must be used because the object of possession, **"ся́бра"**, is in the **nominative.**

3" Ка́ля **і́хнага** дому плыве́ рэчка. Near their house there is a river. **"І́хнага"** is required because the possessor is not the subject of the sentence.

3. There is one more possessive pronoun — **"усі́хны, усі́хная, усі́хнае"**, which means "everybody's". For example:

"Тваё шча́сьце — на́шае **усі́хнае** шча́сьце" – сказа́ў ба́цька да дачкі́.
"Your happiness is the happiness of all of us"—the father said to his daughter.

4. Study the declension of the pronoun **"мой, мая́, маё"** in the Byelorussian text rule 25-IV, 2 and remember:

a) **Твой, твая́, тваё; свой, свая́, сваё** and the interrogative pronoun **чый? чыя́? чыё?** (whose) **are declined** in the same manner as **"мой, мая́, маё".**

b) All these pronouns in the **genitive** and **dative singular** as well as in the **instrumental plural** have a short "i" — "й" in the masculine and neuter endings:

Gen. sing.	чыйго?	майго,	твайго,	свайго.
Dat. sing.	чыймý?	маймý,	тваймý,	сваймý.
Inst. pl.	чыймí?	маймí,	тваймí,	сваймí.

c) In the **nominative** plural **and** in the **accusative** when it is the same as the nominative, these pronouns **end in a stressed "é":**

Nom. pl. чыé? маé, твaé, свaé and усé (all) from **"увéсь, уся́, усё"** (entire, whole).

For the declension of "увéсь" look at the Byelorussian text rule 26-VI, 2a.

5. The **possessive** pronouns яго́нае, **е́йны, на́шы, ва́шы, і́хны** and **усі́хны** (everybody's) follow the declension of the adjectives with hard stems and unstressed endings such as "чорны". See rule 16-1, б 2. **For example:**

Мы ба́чылі яго́ з яго́наю жо́нкай.	We saw him with his wife.
Мы былі́ ў е́йнае ма́ці.	We were at her mother's.
Я́нка е́здзіў на на́шую фе́рму з ва́шым дзя́дзькам.	John went to our farm with your uncle.
На і́хнай ву́ліцы шмат дрэ́ваў.	There are many trees on their street.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 265. а) Фанэты́чнае. Наста́ўнік уго́лас чыта́е з табліцы § 25-I, 1 па адным **колькасным ды пара́дкавым** ліче́бніку, а ву́чні паўтара́юць.

б) Гле́дзячы на табліцу 25-I, 1, напішэце словамі такія лікі:

207	1,001	3,892	7,973	7,687
21-шы	43-ці	32-гі	765-ты	19,290,006-ты

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 266 а) Прачыта́йце, а тады́ перапішэце ска́зы. Падчыркне́це **лі-чэ́бнікі** ды зьве́рху абазна́чце **колькасныя** літарай **"к"**, а **пара́дкавыя** — літарай **"п".** Лікі пішэце словамі.

1. Плошча возера На́рач большая за 80 квадра́тных кілямэтраў, а найбольшая ягоная глыбіня́ — 24 мэтры, тымча́сам як возера Даўгое ў Глыбоцкім раёне з плошчай усяго 2 квадра́тныя кілямэтры ма́е глыбіню́ 50 мэтраў. **2.** Маёй сястры пайшоў 14-ты год. **3.** Усе́ рэкі Белару́сі нале́жаць да 2 вадазбораў, або басэйнаў: Чарнаморскага й Балты́цкага. **4.** Агу́льная даўжыня́ ўсіх рэкаў Белару́сі каля́ 90,000 кілямэтраў. **5.** Уначы выпаў пе́ршы чы́сьценькі сьняжок. **6.** У на́шай кля́се 40 ву́чняў. **7.** Мы ву́чымся ў 5-ай кля́се. **8.** Сьветлагорску, аднаму́ з наймаладзе́йшых бела́ру́скіх гарадоў, нядаўна скончылася 15 гадоў, і ўжо ён ма́е каля́ 50,000 жы-хароў.

б) Перапішэце ска́зы, ста́вячы ў **патрэбным склоне лічэбнікі,** што стаяць у ду́жках. (Гл. § 25-II, 1, 2, 3)

1. Пад (два) разложыстымі дуба́мі мы зрабі́лі маёўку.
2. Жыта густою сьцяной абступа́ла дарожку з (абодва) бако́ў.
3. У Белару́сі нали́чваецца больш за (дзе́сяць тысячаў) вазёраў.
4. Вярблю́д можа вы́піць адра́зу каля́ (дзьве́сьце пя́ць дзесят) літраў вады.
5. Параплáў зь (пяцьсот) экскурса́нтамі адыйшоў ад пры́стані.
6. Адно а́ўта, праéхаўшы (ты́сяча) кілямэтраў, зужыва́е гэтулькі кісларо́ду, колькі трэба (адзін) чалаве́ку на цэлы год.
7. Адна́ тона каме́ннага вуга́льля, калі́ згара́е, зужыва́е гэтулькі кісларо́ду, колькі ста́ла-б на цэлы год для (дзе́сяць) чалаве́кау.
8. Аднаўля́юць кісларо́д у паве́тры дрэвы — лес. Штагадзі́ны (адзін) гэкта́р ле́су ачышча́е таку́ю колькасьць паве́тра, яка́я патрабу́ецца для (дзьве́сьце) чалаве́кау.

Слоўнік (Vocabulary)

а) **плошча,-ы** (f.) area
квадра́тны кілямэтар (m.) square kilometre
вадазбор або **рэчны басэйн, -у** (m.) basin
Чарнаморскі, -ая, -ае Black Sea (adj.)

б) **разложысты, -ая, -ае** branchy
абступа́ць (I); абступа́е, -юць to surround
налі́чваецца 10000 вазёраў 10000 lakes can be counted
вярблю́д, -а́ (m.) camel
літар, літра (m.) litre
кісларо́д, -у (m.) oxygen

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 267. а) Перапішэце, **лі́кі** пішучы **словамі.**

ХТО КОЛЬКІ ЖЫВЕ́

Кіт жыве́ 50 гадоў, слонь — 70, крумка́ч — 140. Куры́ца можа пражы́ць 20 гадоў, гусь — 80.

Доўга жыву́ць ры́бы: шчупа́к - 270 гадоў, карп — 150, сом — 100 гадоў.

А як доўга жыве́ чалаве́к?

Із статы́сячных аблічэньняў вынikáе, што лю́дзі цяпе́р жыву́ць у сярэднім 65 гадоў.

б) Прачыта́йце, а тады перапішэце ска́зы, **назоўнікі** ў ду́жках **ста́вячы ў вадпаве́днай форме.** *Лікі пішэце словамі.*

1. У на́шай школе 1734 (ву́чань), у гэтым лі́ку 891 (дзяўчы́на).
2. Стыпэндыі далі́ 356 (студэнт), а пазы́ку — 407.
3. На ста́нцыі спыні́ўся тава́рны цягні́к з 74 (вагон).
4. Школа атрыма́ла 2542 (новы падру́чнік) ды 5698 (сшыто́к).
5. У горадзе пабудава́лі 93 (новы будынак).
6. З 400 (ву́чань) толькі 10 засталося на другі́ год, а 15 перайшлі́ з папра́ўкамі.
7. На за́куп кні́гаў вы́далі 5680 (даля́р).

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 28. [illegible] паўтара́йце ўголас за наста́ўнікам.

Адз. лік	Па́рны лік	Мн. лік	Адз. лік	Па́рны лік	Мн. лік
нага́	дзьве нагі́	ногі	каза́	чаты́ры казы́	козы
рука́	дзьве рукі́	ру́кі	косьць	тры касьці́	косьці
галава́	тры галавы́	галовы	дачка́	дзьве́ дачкі́	дочкі
сястра́	чаты́ры сястры́	сёстры	вядро	два вядры́	вёдры
сьцяна́	чатыры сьцяны	сьце́ны	вакно	тры вакны́	вокны
гара́	тры гары́	горы	ву́ха	два ву́хі	ву́шы
сасна́	тры сасны́	сосны	вока	два вокі	вочы
каса́	дзьве касы́	косы	пяро	чаты́ры пяры́	пёры

б) Перапішэце ска́зы. Над падкрэ́сленымі назоўнікамі **азна́чце лік** аднэй лі́тарай. Калі́ **множны лік** — лі́тарай **м, калі́ па́рны — п.**

1. У мяне́ тры **сястры́.** Га́ля, Воля ды Алёна — маé **сёстры.**
2. Глядзі́ на гэтыя дзьве **гары́,** якія высокія **горы.**
3. Абу́й чаравікі на абе́дзьве **нагі́.** У цябе́ вялікія **ногі.**
4. Ці вы памаля́ва́лі **сьце́ны?** Ня ўсе, тры **сьцяны́** памаля́ва́ныя, а чацьве́ртая не **пача́тая.**
5. Ён глухі́ на абодвы **ву́хі.** Вочы завя́жаш, а **вушэй** не заложыш.
6. Што дзьве **галавы́** — то не адна́ галава́. **Галовы** ўгару́, ня тра́ньце надзе́і!
7. Падыме́це абе́дзьве **рукі́** ўгару́! У няўме́кі **ру́кі** кале́кі.

в) Перапішэце ска́зы, **назоўнікі** ў ду́жках ста́вячы адпаве́дна ў **па́рным ці множным лі́ку.** Пе́рад тым прачыта́йце ўва́жна прыклады з **практыкаваньня 268 а.**

1. Ма́ма купі́ла чаты́ры цяля́чыя (нага́) на квашані́ну.
2. Дзе́ці, памы́йце твар, (рука́), (нага́).
3. Збанок ма́е не адно, а два (ву́ха).
4. Ніна запляла́ валасы́ ў дзьве (каса́). У яе́ яшчэ зусі́м кароценькія (каса́).
5. Яна́ доўга хадзі́ла ў шпіта́ль лячы́ць (вока), паку́ль не вы́лечыла абодва (вока).
6. Дзе на́шыя (пяро), я тры (пяро) не́дзе згубі́ла.
7. Прадава́лі (вядро) па зьні́жаных цэнах, я купі́ла два пля́стыкавыя (вядро).
8. Адку́ль тут узяліся (косьць), на траве́ ён знайшоў дзьве (косьць).
9. Памы́ю яшчэ два (вакно), і ўсе (вакно) бу́дуць чы́стыя.
10. У ма́ці чатыры (дачка́), ды не адны́я (дачка́) у яе́. Яна́ ма́е й двух сыноў.

Слоўнік (Vocabulary)

а) **каса́ (з валасоў)** braid, plait
б) **памалява́ць (I)** (pf. of **малява́ць, I**) to paint
глухі́, -а́я, -ое deaf
залажы́ць (II); (pf. of **закладаць;** fut. **залажу́, заложыш**) **ву́шы** to stuff, to cover one's ears
надзе́я, -і (f.) hope
няўме́ка, -і (m.) and (f.) clumsy
кале́ка, -і (m.) and (f.) cripple
в) **квашані́на, -ы** (f.) meat in jelly
збанок, збанка́ (m.) pitcher
заплясьці валасы́ to braid one's hair
зьні́жаныя цэны (pl.) reduced prices

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 269. а) Ву́снае. Палаві́на кля́сы чыта́е ўголас **займе́ньнікі** ў назоўным склоне, мужчы́нскага ды ніякага роду, а тады́ друга́я палаві́на гэты-ж склон для жаноцкага роду, і г. д. да канца́.

Адзіночны лік

	Мужчы́нскі (ніякі) род				**Жаноцкі род**			
Н.	Чый? Чыё?	мой (маё)	твой (тваё)	свой (сваё)	Чыя́?	мая́	твая́	свая́
Р.	Чыйго?	майго	тваёго	свайго	Чыя́?	мая́	твая́	свая́
Д.	Чыйму́?	майму́	тваёму́	свайму́	Чыёй?	маёй	тваёй	сваёй
В.		як Н. або Р.			Чыю́?	маю́	тваю́	сваю́
Т.	Чыім?	маім	тваім	сваім	Чыёю?	маёю	тваёю	сваёю
М.	У чыім?	у маім	тваім	сваім	У чыёй?	у маёй	тваёй	сваёй

Множны лік (для ўсіх родаў)

Н.	Чыé?	маé	твaé	свaé	В.	Чыé? або чыіх?	як Н. або Р.	
Р.	Чыіх?	маіх	твaіх	свaіх	Т.	Чыймі?	**маймі**	**твaймі** свaймі
Д.	Чыім?	маім	твaім	свaім	М.	У чыіх?	у маіх	у твaіх у свaіх

б) Прачытáйце скáзы ўголас, а тадú перапішэце ды падчыркнéце **ўсе займéньнікі,** ды толькі **прыналéжныя дзьвюмá рыскамі.**

1. Мы пазнаёміліся з вáшымі сынáмі.
2. Іхныя сёстры сябравáлі, [illegible] ў адну́ школу хадзілі.
3. Бацькі заўсёды дýмаюць пра сваіх дзяцéй.
4. Я ня знáю твайго брáта, пазнаём мянé зь ім.
5. Яна заўсёды гаворыць [illegible] Ня толькі пра свайго, янá гаворыць і пра твайго, і пра майго.
6. А две вáшы дачкí [illegible] горад, кудú éйнага мýжа перавялі.
7. Ці янú выбраліся зусім? Алé, [illegible] ерабráліся з усёй сваёй мэбляю. Там янú бýдуць жыць на кватэры ў маé сястрú.
8. Калі вы прыéдзеце навéдаць сваіх былúх сусéдзяў?
9. Мой муж і дзéці ўжо былі ў іхным новым доме.
10. Сын мой, а розум у яго свой.

в) Прачытáйце скáзы, **устаўля́ючы** замíж кропак адпавéдны прыналéжны займéньнік **"свой"** ці **"ягоны, éйны"**, або выбірáючы адпавéдны там, дзе ў дýжках стаяць два.

1. Вáшая настáўніца й (éйная, свая́) сястрá вéльмі падобныя адна́ да аднаé.
2. Мой брат жывé ў Мантрэáлі. Я яшчэ ня бáчыў . . . кватэры.
3. Я чáста пішý (мой, свой) брáту, чáсам па два лісты пасьля́ . . . аднаго.
4. Мáці просіць дачкý, каб янá заўсёды брáла (сваё, éйнае), а ня (сваё éйнае) áўта.
5. У іх цяпéр . . . дом і . . . áўта.
6. Я́нка даглядáе . . . гарод. У . . . гародзе шмат прыгожых квéтак.
7. На . . . вýліцы шмат дрэваў, а на . . . ніводнага. Мы вéльмі лю́бім . . . вýліцу.
8. Ён і . . . сястрá Гáля прыéхалі да нас у госьці. Ён ня нáдта лю́біць éзьдзіць рáзам з . . . сястрою.

г) Скáзы з пýнкту "б)" перакладзéце ў англéльскую мову.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 270. а) Прачыта́йце ска́зы ды растлума́чце, чаму́ ў ска́зах у ле́вым слупку́ трэба ўжыць займе́ньнік **“свой”**, а ў другім слупку́ **“мой, твой, наш...”**. Перапішэце ска́зы.

1. Я́нка із **сваёй** сястрой ня былі́ ў школе.	Я́нка й **ягоная** сястра́ ня былі́ ў школе.
2. Казю́к лю́біць **сваю́** сястру́.	Казю́к лю́біць **ягоную** сястру́.
3. Я із **сваі́м** та́там е́зьдзіла ў Нью-Ёрк.	Мой та́та й я е́зьдзілі ў Нью-Ёрк.
4. Даглядáй **сваé** кве́ткі, каб добра раслі́.	Даглядáй, каб **твае́** кве́ткі добра раслі́.
5. Навокал **свайго** гароду мы пасадзі́лі жываплот.	Навокал **на́шага** гароду расьцé жываплот.

б) Чыта́йце гу́тарку па ролях.

ДОМА ЎВЕ́ЧАРЫ

Ма́ма: Ю́рка, гэта твае́ кні́гі на сталé?
Ю́рка: Не! Я сваé забра́ў, гэта е́йныя.
Ма́ма: Чыé — е́йныя?
Ю́рка: Га́ньніны.
Га́нна: І я сваé забра́ла!
Ма́ма: Дык што-ж, выглядáе, маé, ці твае́ мо, та́та?
Ю́рка: Я не магу́ знайсьці сваé геагра́фіі, ой, дзе-ж яна́?!
Ма́ма: А я ду́маю, яна́ тут, на сталé.
Ю́рка: Ня можа быць. (Глядзіць) А пра́ўда... (бярэ адну́ кні́гу, а тады́ другу́ю).
Ма́ма: А яку́ю гэта яшчэ кні́гу ты ўзяў?
Ю́рка: Гэта мая́ а́льгебра. Га́нна, і твае́ францу́скія апавяда́ньні тут.
Ма́ма: Ну вось і добра, што ўсе гаспадары знайшліся.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 271. а) Прачыта́йце.

ЦЯГНІКІ́

Два цягнікі тава́рныя —
Па се́мдзесят вагона́ў —
у ле́тні дзень сустрэ́ліся
на ціхім перагоне.

Сустрэ́чныя, віта́льныя
далі́ гудкі́ здалёк...
— Куды́ ты так сьпяша́ешся?
— А ты куды́, браток?

— Вязу́ ў сяло́ я з гораду
камба́йны, трактары́,
аўтамаши́ны, се́ялкі —
заводзкія дары́.

– А я зь сяла́ для гораду
вязу́ ня менш дароў —
палёў шырокіх золата
і золата садоў.

І цягнікі тава́рныя —
дарог працаўнікі -
яшчэ хутчэй пае́халі
ў розныя бакі.

І. Мурае́йка

Слоўнік (Vocabulary)

таварны цягні́к (m.) freight train, goods train
перагон, -у (m.) span (distance between two stations)
віта́льны гудок (m.) whistle of greeting
се́ялка, -і (f.) seeding-machine
дар, -у (m.) gift
ве́зьці (I), вязу́, -е́ш, -у́ць (actual form) to convey, to take by conveyance
працаўні́к, -а́ (m.) worker, toiler

б) Адкажэце на пыта́ньні сьпяршы́ ву́сна, а тады́ запішэце адка́зы.

1. Якой вялічыні былі абодва тава́рныя цягнікі?
2. У якія два розныя бакі е́халі цягнікі?
3. Што вёз цягні́к, які́ е́хаў з гораду ў вёску?
4. Што вёз цягні́к, які́ е́хаў зь вёскі, ці як тут ска́зана, зь сяла́ ў горад?
5. Напішэце, што зна́чыць вы́раз "золата палёў" (пералічэце ўсё, што выростае на палёх).
6. Што зна́чыць "золата садоў"?
7. Чаму́ збажына́, бу́льба, гародніна ды садовіна заве́цца "золатам"?

КРУГ 26

НА КРЫЗЕ

На канцы́ вёскі быў мост праз раку́ Сьві́слач. Ля гэтага мосту кали́сьці стая́ў вадзяны́ млын. А́ле цяпе́р ад яго засталіся адны толькі слупы́.

Мікі́тка часьце́й за і́ншых праводзіў час ля мосту. На́вет цяпе́р уве́сну, у са́мы ледаход, ён цэлыя дні ба́віўся там.

— Што ты сабе́ ду́маеш? — каза́ла яму́ ма́ці. — Ты праз гэтыя кры́гі ў ваду́ тра́піш.

— Не, ня тра́плю! — упэ́ўнена адка́зваў Мікі́тка.

Кали́ лёд ішоў гу́ста, кали́ кры́гі ле́зьлі адна́ на адну́, трашчэ́лі й крышы́ліся, Мікі́тка ня мог узя́ць у гэтай спра́ве ніякага ўдзе́лу. Ён мог толькі зь ціка́васьцяй наглядаць гэты рух. А́ле неўзаба́ве лёд парадзе́ў, кры́гі паплылі́ вольна, лёгка па воднай прасторы. А ў ці́хай за́вадзі за́між лама́чча пачалі́ затры́мвацца кры́гі. Хіба́ можна было ня штурхну́ць іх у струме́нь? З кры́гамі мець спра́ву куды цікаве́й, як зь не́йкім там сьмяцьцём. Мікі́тка, стоячы на бе́разе, ве́льмі стара́нна рэгулява́ў рух кры́гаў. Як толькі спы́ніцца яка́я ў за́вадзі, ён за́раз і вы́ганіць яе́ адту́ль кіём.

А́ле вось спад мосту вы́плыла вялі́кая, грубая́ кры́га, праплыла́ каля́ са́мае за́вадзі й прыпыні́лася, паду́мала, паду́мала трохі й пачала́ ці́хенька заварочвацца ў за́вадзь, да бе́рагу, і нарэшце так ёмка прыстасава́лася, што можна было паду́маць, бы́ццам яна́ ўсю зіму́ тут жыла́.

Кры́га закры́ла сабо́й усю́ за́вадзь. Адштурхну́ць яе́ Мікі́тка ня меў сі́лы. Дый не адштурхва́ць, а узьле́зьці на яе́ захаце́лася яму́. Асьцярожненька сту́кнуў ён па краі адной нагой, другой, — а яна́ на́вет не варухну́лася. Тады́ Мікі́тка ступі́ў на яе́ й адчу́ў сябе́ на ёй так спакойна, як і на бе́разе. І гэтак-жа, як зь бе́рагу, стаў рэгулява́ць рух і́ншых кры́гаў.

А калі́ ён падця́гваў да сябе́ кры́гу, то гэтым са́мым адця́гваў ад бе́рагу й ту́ю, на якой сам стая́ў. Патрошку кры́га пачала́ адсо́ўвацца ад бе́рагу. А́ле Мікі́тка так захапі́ўся сваёй спра́вай, што зусім гэтага й не заўва́жыў. А калі́ заўва́жыў, то яго-ная кры́га ўжо больш як на мэтар ад'е́хала ад бе́рагу. Закрыча́ў Мікі́тка, пачаў кідацца тады́, сюды́, а́ле дарэмна. Кры́гу падхапі́ла плы́ня й пане́сла.

Пачу́ць Мікі́тку зь вёскі ніхто ня мог, бо ха́ты былі́ ня так бліз́ка, і не́сла яго зусім у і́ншы бок. Заставáлася адна́ надзе́я, што пабáчыць і пачу́е яго хто-не́будзь у полі. А хто ў такое разводзьдзе бу́дзе хадзіць па полі, воддаль ад дарогі й ха́таў?

Спача́тку Мікі́тка доўга крыча́ў і пла́каў, а потым пабáчыў, што плач ямý ніяк дапамагчы́ ня можа, і сьціши́ўся, тым больш, што стра́ху пакýль што ніякага ня было. Кры́га была́ вялі́кая, грубáя й зусім лёгка трымáла на сабе́ Мікі́тку.

Вазіла яна́ свайго пасажы́ра ня толькі па рацэ, а́ле й па сенажа́ці, і па балоце, па але́шніку. Вось тут ён уле́тку за матыля́мі ганя́ўся, там сярод кустоў знайшоў пту-шы́нае гняздо, а цяпе́р ён пла́вае над усёй гэтай мясцовасьцяй, як па моры.

Але нядоўга цягну́лася такое шчáсьце. Кры́га зачапі́лася за але́шыну й прыпы-ні́лася. А ў гэтую хвіліну вецер павя́ваў. Калі ён падня́ўся, дык ад ягонае кры́гі засталáся толькі палавіна. Гэтая палавіна была́ таксама́ даво́лі вялі́кай, але́ ўжо ня так спакойна й роўна, як ране́й. Ад ка́жнага ру́ху хлопчыка яна́ хіталася й гатовая была́ перавярну́цца. Мікі́тка ўжо ба-я́ўся стаяць, сеў на кале́ні і ўчапі́ўся рукáмі ад стра́ху. Ізноў пацяклі́ ў яго сьлёзы, ізноў пача́ў ён крыча́ць і йзноў ніякага адка́зу

Ве́ска засталáся дзесьці ззаду. З пра́вага боку йшлі шырокія палі́ зь бе́лымі пля́-мамі сьне́гу, зьле́ва — бясконцая гладзь палавы́, за які́мі пачына́ўся лес. Наўда́чу ці мог тут дзе быць чалаве́к.

II.

Адна́к адзі́н чалаве́к знайшоўся. Самалёты тут штадня́ рабі́лі практыкава́льныя палёты. Звыча́йна на іх ужо Мікі́тка й не зьвярта́ў ува́гі, а́ле цяпе́р у бядзе́ ён замаха́ў рукáмі й празь сьлёзы кры́кнуў:

— Дзя́дзечка, памажы́!

Ве́дама, Мікі́тка добра разуме́ў, што лётнік ня толькі пачу́ць яго ня можа, а́ле наўда́чу ці пабáчыць. А́ле ў таку́ю хвіліну ён нічога ня ду́маў, а крыча́ў ад стра́ху.

Лётнік праляце́ў мі́ма досыць нізка. За хвіліну ён вярну́ўся й праляце́ў яшчэ ніжэй. Потым паляце́ў у вёску, ды як загудзіць над са́мымі ха́тамі — ледзь стрэхаў не пазрыва́ў. Лю́дзі павыскоквалі з ха́таў, глядзя́ць, дзівяцца. А самалёт паляце́ў на-за́д і пача́ў кружы́цца над Мікі́ткавай галавою. Сотні вачэй сьлі́ка-ва́ліся ў гэты бок, а́ле зь вёскі ніхто ня мог пабáчыць хлопчыка на кры́зе.

Тады́ самалёт ізноў паляце́ў да вёскі, ізноў праляце́ў над стрэхамі ха́таў. І тут лю́дзі пабáчылі, што вы́сунуў руку́ й махну́ў ёю.

— Глядзе́це, не́шта вы́кінуў! — закрыча́лі лю́дзі. — Бяжэце, лаве́це!

На зямлю́ ляце́ла не́шта маленькае, чорнае.

Дзе́ці мі́гам злавілі яго. Гэта была́ рукавіца, а ў ёй запіска: “Хлопчык на крызе”.

Самалёт тымча́сам ізноў пача́ў кружы́цца над тым ме́сцам, дзе плыў Мікі́тка, а потым паляце́ў дале́й.

Паку́ль самалёт лётаў вакол яго, хлопчык меў надзе́ю, што лётнік яго паба́чыў і хоча дапамагчы. А калі́ самалёт паляце́ў, дык Мікі́тка адчу́ў такі́ страх, такое гора, што крык мімаволі вы́рваўся зь ягоных грудзе́й. За гэты час ад ягонай кры́гі адарва́ўся яшчэ адзі́н кава́лак, і цяпе́р лядзі́на хіста́лася ад ка́жнага ру́ху хлопчыка ды магла́ перакулі́цца ка́жнае хвілі́ны. Мікі́тка сядзе́ў нярухома й ад гэтага зусі́м зьмерз. Калі́ яго яшчэ штурхане́ яка́я кры́га, ён перавёрнецца й пойдзе на дно.

Вось напе́радзе, чапля́ючыся за кусты́, павольна ру́хаецца вялі́зная кры́га. Мікі́тка яе́ здаганя́е, вось-вось сту́кнецца аб яе́. А тады́... Ён на момант на́вет заплю́шчыў вочы.

Але́ Мікі́тка не захаце́ў спакойна сядзе́ць і чака́ць бяды. Калі́ крыгі збліз́іліся, ён узя́ў дый скокнуў на вялі́кую кры́гу. Край е́йны аблама́ўся пад ягонымі нага́мі, і ён увалі́ўся ў ваду́.

Рука́мі ён затрыма́ўся за кры́гу, толькі ўзьле́зьці на яе́ ніяк ня мог: то сасьлізьне́ зь яе́, то адкрышыцца кава́лак лёду. А холад пача́ў ужо сьціска́ць ягонае це́ла.

У гэты момант падасьпе́ў зь вёскі човен і вы́ратаваў Мікі́тку.

Паводля **Я́нкі Ма́ўра**

УВА́ГА. Пыта́ньні да апавяда́ньня "На кры́зе" гл. практыкава́ньне **272.**

Слоўнік (Vocabulary)

слуп, -а́ (m.) pole
за́вадзь, -і (f.) narrow inlet of a river or sea apart from the main current
ледаход, -у (m.) the drifting of ice
ба́віцца (II); ба́ўлюся, ба́вішся, -яцца to stay, to spend time
кры́га, -і (f.) drifting ice floe
крышы́цца (II); past **крышы́ўся, -лася, -ліся** to crush, to split
узя́ць (I) (pf. of **браць, I**) **удзе́л у . . .** to take part in . . .
вольна (adv.) slowly
штурхну́ць or штурхану́ць (I); (pf. of **што́ркаць, I**) to push, to shove
струме́нь, -я (m.) current, stream
мець спра́ву з to deal with
рэгулява́ць (I) (рэгулю́ю, -еш, -юць) рух to control traffic
вы́гнаць (II) (pf. of **выганя́ць, I**) **вы́ганю, -і́ш, -яць** to drive out
заварочвацца (I); заварочваюся, -ешся, -юцца to turn
ёмка (adv.) (in this case) comfortably,
прыстасава́цца (I) (pf.) past **прыстасава́ўся, -лася, -ліся** to adjust, to accommodate oneself to . . .
адштурхну́ць (I) (pf. of **адшто́ркваць, I**) to push away
узьле́зьці (I) (pf. of **узла́зіць, II**) to climb on
варухну́цца (I) (pf.) past **варухну́ўся, -лася, -ліся** to stir, to move
спра́ва, -ы (f.) business, (in this case) what he was doing
дарэмна (adv.) in vain
пане́сьці (I) (pf. of **не́сьці, I**) past **панёс, пане́сла** to carry off
разводзьдзе, -я (n.) high water, flood
воддаль far from, far off
пасажы́р, -а (m) passenger
але́шнік, -а (m.) alder grove

за матылямі ганяўся (he) chased butterflies
зачапіцца, (II) (pf.); past **зачапіўся, -лася, -ліся** to catch on
паляцець носам to fall down
гойдацца (I); гойдаюся, -ешся, -юцца to swing, to rock, to reel
пляма, -ы (f.) spot
поплаў, поплаву (m.) pasture
заліты поплаў flood-lands
наўдачу (adv.) hardly

II.

палёт, -у (m.) flight
дзядзечка (dim. of **дзядзька**) (m.) 1. uncle 2. polite form of addressing any male adult
ведама of course, certainly
міма by
пазрываць (I), (pf.) past **пазрываў, -ла, -лі** to tear away
павыскокваць з хатаў to run out of the houses
дзівіцца (II); дзіўлюся, дзівішся, -яцца to wonder
сотня (noun form of **сто**) one hundred
выкінуць (I) (pf.) past **выкінуў, -ла, -лі** to throw out
лавіць (I); лаўлю, ловіш, -яць to catch
запіска, -і (f.) note
гора, -а (n.) misfortune, grief
грудзі, -ей (pl. only) breast, chest
лядзіна, -ы (f.) block of ice
хістацца (I); хістаюся, -ешся, -юцца to be unstable

26 — I COLLECTIVE NUMERALS / ЗБОРНЫЯ ЛІЧЭБНІКІ: абодва, абедзьве, абое ды двое, трое, чацьвёра, пяцёра...

Сярод **колькасных** лічэбнікаў выдзяляецца асобная група так званых **зборных** лічэбнікаў, якія абазначаюць **сукупнасьць** людзей ці аднолькавых прадметаў як адно цэлае; прыкладам: **двое, трое, пяцёра, дзевяцёра...** ды блізкія да іх **абодва, абедзьве, абое.**

1 **Абодва** ўжываецца на абазначаньне **толькі мужчынскага й ніякага** роду: **абодва** браты, **абодва** вакны.

Абедзьве — для **жаноцкага** роду: **абедзьве** сястры, **абедзьве** нагі.

Абое — калі роды памяшаныя: **абое,** і **Янка** і **Галя,** пайшлі ў кіно.
Як скланяюцца **абодва, абедзьве** гл. § 23-III, 2.

2. а) **Зборныя** лічэбнікі **двое, трое, чацьвёра, пяцёра, васьмёра . . .** звычайна **ўжываюцца** з **ажыўленымі** назоўнікамі найчасьцей **ніякага** ды **агульнага роду.** Прыкладам: **трое** куранят, **пяцёра** дзяцей, **шасьцёра** людзей (гл. § 23-V б/1, 2.).

З назоўнікамі **мужчынскага** роду таксама можна ўжываць форму **двое, . . . пяцёра,** але часьцей ужываецца форма **"двух, трох, пяцёх . . . ".**

Прыкладам: **трох** сыноў, **двух** братоў.
У мяне **трох** братоў і **дзьве** сястры, усіх нас **шасьцёра.**

б) Зборныя лічэбнікі **двое, трое** . . . ужываюцца й зь **неажыўленьмі** назоўнікамі, але звычайна толькі тымі, **што маюць адно множны лік**. Прыкладам:

двое са́няў, **трое** дзьвярэй, **чацьвёра** нажы́цаў.

3. а) Скланеньне **абое, двое, трое, чацьвёра . . .**

Н.	абое	двое	трое	чацьвёра
Р.	абаіх, абайга́	дваіх, двайга́	траіх, трайга́	чацьвярох
Д.	абаім	дваім	траім	чацьвяром
В.		як назоўны або́ родны		
Т.	абайма́	двайма́	трайма́	чацьвярма́
М.	абаіх	дваіх	траіх	чацьвярох

б) Таксама, як **чацьвёра**, скланяюцца **пяцёра** й далейшыя, хоць часта яны зусім **не зьмяняюцца.**

4. **Пасьля** зборных лічэбнікаў **двое, трое, чацьвёра** й далейшых у назоўным ці аднолькавым зь ім вінавальным склоне **назоўнік** стаіць у **родным** склоне **множнага ліку.**

Прыкладам: Прые́халі **двое** (або **двух**) новых наста́ўнікаў.
Дзесяцёра ву́чняў пайшлі́ на экску́рсію.
Зрабі́лі **трое** новых дзьвярэ**й.**

У іншых склонах зборныя лічэбнікі, так як і колькасныя, **згаджаюцца** ў склоне з **назоўнікам.** Прыкладам:

Купілі падару́нкі **дваім** дзе́цям, а **траім** яшчэ не.
Яны прые́халі на вака́цыі з **чацьвярма́** дзяцьмі́, а іхныя суседзі з **трайма́.**

***

1. **Абодва, абе́дзьве, абое** (both).

"Абодва" is used for **masculine** and **neuter** nouns, e.g.:
абодва браты́, вакны́* — both brothers, windows

"Абе́дзьве" for **feminine** nouns, e.g.:
абе́дзьве сястры́,* **нагі́*** — both sisters, legs

* Note that after **"абодва"** and **"абе́дзьве"** the **dual** form is used with **neuter** and **feminine** nouns. (For dual forms see **§ 25-III, 2** and практыкава́ньне **268.**)

"Абое" is used for nouns of mixed gender, e.g.: "a man and a woman", "a woman and a child": І брат і сястра́, **абое** прыня́тыя на ўнівэрсыто́т. (The brother and sister were both accepted at university). Ма́ці й дзіцё,**абое** чу́юцца добра. (The mother and child are both feeling well.)

For the declension of **"абодва, абе́дзьве"** look up the Byelorussian text **§ 23-III, 2.**

2. The collective numerals **двое** (two), **трое** (three), **чацьвёра** (four), **пяцёра** (five) and onwards are used:

   a) With **animate** nouns primarily of **neuter** and **mixed** gender. For example: **трое** ка-цяня́таў (кураня́таў, дзяцёй); **дзесяцёра** людзе́й.

   With **masculine** nouns instead of "**двое, трое**", and so on, the form "**двух, трох... дзесяцёх**" is most often used, e.g.: **двух** братоў.

   b) With those **inanimate** nouns which have a **plural form only.**

   For example: **чацьвёра** дзьвярэй, **двое** нажні́цаў (са́нкаў).

Note that collective numerals from five onwards are formed by adding "**-ёра**" to the ordinary numeral instead of "**ь**":

пяцёра, шасьцёра, сямёра, васьмёра, дзевяцёра . . . пятнаццацёра.

3. Study the declension of **абое, двое, трое, чацьвёра** in the Byelorussian text § 26-I, 3 and note:

   a) **абое, двое, трое** are identically declined;

   b) the remaining collectives from **пяцёра** onwards, are declined like **чацьвёра**, although they can be left undeclined.

4. After the collective numerals **двое, трое, чацьвёра, пяцёра** and onwards, when they themselves are in the **nominative**, or in an **accusative** identical in form with the nominative, the **noun in the genitive** plural is used. For example:

прыйшло **трое (or трох)** сяброў, накармі́лі **чацьвёра** кураня́т.

In other cases, collective numerals agree with the noun they qualify. For example:

Мы купі́лі падару́нкі траім дзе́цям, а дваім яшчэ не.	We bought gifts for three of the children, but we did not for the other two.
Яны́ прые́халі на вака́цыі з чацьвярма́ дзе́цьмі, а і́хныя суседзі з трайма́	They came on vacation with four children, and their neighbours came with three.

26 — II AGREEMENT of NUMERALS with VERBS
ЗГОДА ДЗЕЯСЛОВА ЗЬ ЛІЧЭБНІКАМ

а) Калі **лічэбнік** або **слова,** што абазначае колькасьць (як прыкл. **колькі, шмат, ма-ла...**) — **дзейнік** у сказе, дык **дзеяслоў** (выка́зьнік) **можа быць у вадзіночным ліку і ў множным.** Прыкладам:.

Пяць кні́гаў **ляжы́ць** (або **ляжа́ць**) на стале́.
Чацьвёра хлопцаў **ідзе́** (або **йду́ць**) дарогай.
Колькі дзяўча́таў **выконвае** (або **выконваюць**) тут усю́ работу.
Шмат жанчы́наў **працу́е** (або **працу́юць**) у канцыля́рыях.

(**Дзеяслоў у вадзіночным** ліку **падчыркваe дзеяньне, а** дзеяслоў у **множным ліку** падчыркваe **дзейнік**).

5) У **прошлым часе,** калі дзеяслоў ужываецца ў **вадзіночным ліку,** ён **заўсёды** стаіць у **ніякім родзе.** Прыкладам:

Пяць кнíгаў ляжа́лі на сталé; але — **пяць** кнíгаў **ляжа́ла ...**
Трох хлопцаў ішлí дарогай; але — **трох** хлопцаў **ішло** дарогай.

**
*

a) **When the subject is a numeral** or a word expressing quantity (such as колькі, шмат, ма́ла), **the verb may take either the singular or the plural** form. For example:

Пяць кнíгаў **ляжы́ць** (or **ляжа́ць**) на сталé.	Five books **are lying** on the table.
Чацьвёра (**чатырох**) хлопцаў **ідзé** (or **ідýць**) дарогай.	Four boys **are walking** on the road.
Шмат жанчы́наў **працýе** (or **працýюць**) у канцыля́рыях.	Many women **work** in the office.

b) **In the past tense,** if the **singular** is used, **the verb must be in the neuter.** For example:

Тут **ляжа́лі пяць** кнíгаў. But: Тут **ляжа́ла пяць** кнíгаў.
Пайшлí трое (**трох**) хлопцаў. But: **Пайшло трох** хлопцаў.

26 — III NUMERALS—FRACTIONS / ДРОБАВЫЯ ЛІЧЭБНІКІ

1. a) 1½ **паўтара́** (m. and n.), **паўтары́** (f.) (one and a half)
2½ **паўтраця́** (m. and n.), **паўтраці́** (f.) (two and a half)
3½ **паўчварта́, паўчварты́**
4½ **паўпята́, паўпяты́**
5½ **паўшаста́, паўшасты́**
6½ **паўсяма́, паўсямы́**
7½ **паўвасьма́, паўвасьмы́**
8½ **паўдзевята́, паўдзевяты́**
9½ **паўдзесята́, паўдзесяты́**

Прыклады: **паўтара́** даля́ра, **паўтара́** вядра́, **паўтары́** бочкі; **паўтраця́** мэтра, **паўтраці́** мілі.

б) **Назоўнік** пасьля **дробавага** лічэбніка з **“паў-”** заўсёды стаіць у **родным склоне адзіночнага ліку.**

в) **Дробавыя** лічэбнікі, зложаныя з **“паў-” не зьмяняюцца.**

2. а) 1/5 — адна́ пя́**тая**, 1/2 — адна́ друга́**я** або палавіна.
2/3 — дзьве трэ́йці**я** (або траці́ны), 3/4 — тры чацьве́р**тыя** (або чве́рці)
3/7 — тры сём**ыя**, 5/6 — пяць шост**ых**, 0.6 — шэсьць дзяся́т**ых**,
0.25 — два́ццаць пяць сот**ых**, 5 4/7 — пяць цэлых чаты́ры сёмыя,
2.6 — два цэлыя шэсьць дзяся́тых

“адна́ пя́тая” разумеецца “адна́ пя́тая **ча́стка”,** і гэтак усе дробы, **таму** калі ў дробе **ў лічніку** (numerator) стаіць **адзі́н** або **два**, яны мусяць мець **форму жаноцкага** роду. **Дробавыя** лічэбнікі ў **лі́чніку** (numerator) маюць **колькасны лічэбнік,** у **назоўніку** (denominator) — **пара́дкавы лічэбнік.**

б) **Назоўнік, ужыты з дробам,** стаіць у **родным склоне** (адз. ліку або множнага). Прыкладам:

адна́ пя́тая кілямэтра, чве́рць гадзі́ны,
дзьве трэйція кні́гі або кні́гаў,
адна́ трэйцяя ву́чняў, прадалі 4/5 сьвіне́й.

в) **Скане́ньне дробаў.**

Н.	адна́ пя́тая	дзьве трэйція	пяць дзяся́тых
Р.	аднэ́й(ае́) пя́тай(ае)	дзьвёх(ю́х) трэйціх	пяцёх дзяся́тых
Д.	аднэ́й пя́тай	дзьвём(ю́м) трэйцім	пяцём дзяся́тым
В.	адну́ пя́тую	дзьве трэйція	пяць дзяся́тых
Т.	аднэ́й пя́тай	дзьвёма(юма́) трэйцімі	пяцьма́ дзяся́тымі
М.	у аднэ́й пя́тай	у дзьвёх(ю́х) трэйціх	у пяцёх дзяся́тых

Лічнік дробу скланяецца паводля скланеньня **колькасных** лічэбнікаў, а **назоўнік** паводля скланеньня **пара́дкавых** лічэбнікаў.

**
*

1. a) Study paragraph **26-III, 1a** in the Byelorussian text.

   b) **Nouns** following fractions such as **“паўтара́”** (m. or n.), **“паўтары́”** (f.) — 1½; **“паўтраця́”** (m. or n.), **“паўтраці́”** (f.) — 2½ are always used in the **genitive singular. For example:**

паўтара́ даля́ра	1½ dollars	паўтраця́ кілямэтра	2½ kilometres
паўтара́ вядра́	1½ pails	паўтраці́ мі́лі	2½ miles
паўтары́ бочкі	1½ barrels		

   c) Fractions such as **паўтара́, паўтары́; паўтраця́, паўтраці́ . . . are not declined. For example:**

Яна́ пашы́ла суке́нку з **паўтраця́** мэтра матэры́і.
She made a dress from 2½ meters of material.

2. a) In **fractions** such as 2/3, 5/6, 0.6 . . . **the numerator is expressed by a cardinal numeral** and the **denominator** by **an ordinal** numeral. For example:

2/3 дзьве трэйція
0.6 шэсьць дзяся́тых
5/6 пяць шостых
0.07 сем сотых

b) **Nouns following fractions** such as **2/3, 1/6 . . .** are used in the **genitive singular or plural. For example:**

дзьве трэйція кнігі; адна́ чацьве́ртая наста́ўнікаў.

c) For the **declension** of fractions look up the **Byelorussian** text **2в** and note that **both the numerator** and **denominator are declined** according to the rules of declension of the cardinal and the ordinal numerrals respectively. For example:

Ён не прачыта́ў яшчэ дзьвёх трэйціх кнігі.
З трыма́ чацьве́ртымі кля́сы.

26 — IV LEAVING OUT THE "Ь" BEFORE THE SUFFIX "-ЧЫК"
ВЫПАДА́ННЕ "Ь" ПЕ́РАД СУ́ФІКСАМ "-ЧЫК"

ка́мень	—	каме́нчык	прамень	—	праме́нчык
струме́нь	—	струме́нчык	раме́нь	—	раме́нчык
карэнь	—	карэнчык			

26 — V IMPERSONAL VERBS ENDING in -цца, -ся / БЕЗАСАБОВЫЯ ДЗЕЯСЛОВЫ на -цца, -ся } здае́цца, здалося

а) Мне хоча**цца** піць. Мікітку захаце́ла**ся** ўзьле́зьці на кры́гу.
Ім добра жыве́**цца.** Яму́ прысьні**лася**, што ён лётаў.

б) **Безасабовыя** дзеясловы на **-цца, -ся** ўжываюцца ў **трэйцяй асобе адзіночнага ліку** ўва **ўсіх часох** як незакончанага так і закончанага трываньня. У **прошлым часе яны** прымаюць форму **ніякага роду.** Прыкл.:

Незакончанае тр. — здае́**цца,** здава́**лася,** бу́дзе здава́**цца**
Закончанае тр. — здало**ся,** зда́**сца**

***

a) **Impersonal verbs** ending in **-цца, -ся** express action which takes place without personal volition or control. For example: мне хочацца **спаць.** I feel like sleeping.

b) **Impersonal** verbs are **used** in the **third person singular** in **all tenses** and in **both aspects.** In the **past tense** they take the **neuter ending. For example:**

	IMPERFECTIVE		PERFECTIVE
infinitive:	здава́цца	to seem, to appear	зда́цца to seem, to appear (once)
present:	мне здае́цца	it seems to me	none
past:	мне здава́лася	it seemed to me	мне здалося
future:	мне бу́дзе здава́цца	it will seem to me	мне зда́сца

26 — VI THE DEFINITE ADJECTIVE-PRONOUNS АЗНАЧА́ЛЬНЫЯ ЗАЙМЁНЬНІКІ } Увéсь, сам, сáмы

1. а) **Увéсь, уся́, усё** — entire, whole; **усé** (pl.) — 1. all, 2. everybody
усё — everything

б) **Сам** — myself, yourself or himself, e.g.: Ты сам гэта зрабíў. You did it yourself.
Самá — myself, yourself or herself e.g.: Гáнна зрабíла самá. Hanna did it herself.
Само — itself; **сáмі** (pl.) — ourselves, yourselves, themselves, e.g.: Мы зрабíлі гэта сáмі. We did it ourselves.

в) **Сáмы, сáмая, сáмае; сáмыя** (pl.) — most, very, same, e.g.:

Той **сáмы** хлапéц. The **same** boy.
Сáмы прыгожы. **Most** beautiful.

2. **Склане́ньне:**

а)

	Адзіночны лік			Множны лік	
Н.	увéсь	усё	уся́	усé	
Р.	усяго		усяé(ёй)	усíх	
Д.	усямý		усёй	усім	
В.	як **Н.** або **Р.**	усё	усю́	як **Н.** або **Р.**	
Т.	усíм		усёю(ёй)	усíмі	
М.	усíм		усёй	пры ўсíх	

б)

	Адзіночны лік			Множны лік
Н.	я сам	янá самá	яно само	янú сáмі
Р.	мянé самога	яé самой (самое)	яго самога	іх самíх
Д.	мне самому	ёй самой	ямý самому	ім самíм
В.	мянé самога	яé самýю	яго самога	іх самíх
Т.	мною самы́м	ёю самою(ой)	ім самы́м	íмі самíмі
М.	пры мне самы́м	ёй самой	ім самы́м	іх самíх

в)

	Адзіночны лік			Множны лік
Н.	гэты сáмы	гэтая сáмая	гэтае сáмае	гэтыя сáмыя
Р.	гэтага сáмага	гэтае(ай) сáмае(ай)	гэтага сáмага	гэтых сáмых
Д.	гэтаму сáмаму	гэтай сáмай	гэтаму сáмаму	гэтым сáмым
	... ...	... ...	... ...	... ...

УВÁГА 1. Займеньнік **"сáмы, сáмая, сáмае"** скланяецца так, як **"гэты".**
УВÁГА 2. Сам, самá, само ды **сáмы, сáмая, сáмае** розьняцца націскам: у першым займеньніку націск падае на канчатак, а ў другім на першы склад, таму ёсьць розьніца ў некаторых канчатках адзіночнага ліку.

26 — VII REFLEXIVE PRONOUN сябé (myself, yourself...) ЗВАРОТНЫ ЗАЙМЁНЬНІК сябé

а) Займеньнік **"сябé" ўжываецца для абодвух лікаў, усіх родаў і асобаў.** Прыкл.:

Янá шкадавáла Алéга, а **сябé** анí. **Вы** сáмі **сабé** дадалí работы.

б) **Скланeньне:** Н. —, Р. **сябе́**, Д. **сабе́**, В. **сябе́**, Т. **сабою(й)**, М. на **сабе́**.

***

a) The forms of **"сябе́"** shown above in the Byelorussian text "б)" are used in **the singular** and **plural for all genders and persons.**

b) The reflexive pronoun **"сябе́"** is often used with the pronoun **сам, сама́ само,** e.g.:

Вы са́мі **сабе́** дадалі́ работы.	You gave yourself more work.
Ты сам **сябе́** ня зна́еш.	You do not know yourself.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 272. а) Прачыта́йце **І-ую ча́стку** апавяда́ньня **"На кры́зе"** ды адкажэце на гэтыя пыта́ньні.

1. Як зва́лася рака́, што плыла́ недалёка ад Мікі́ткавае вёскі?
2. Яка́я была́ пара́ году?
3. Што Мікі́тка рабіў ля рэчкі таго дня, што апі́саны ў вапавяда́ньні?
4. Чаму́ вялі́кая кры́га, яка́я сьпярша́ ляжа́ла спакойна, калі́ Мікі́тка ўзьлез на яе́, ру́хнула з за́вадзі й паплыла́?
5. Дзе вазі́ла кры́га Мікі́тку?

б) Прачыта́йце **ІІ-ую ча́стку** й адкажэце на пыта́ньні.

1. Што рабіў Мікі́тка, калі́ паба́чыў самалёт?
2. Ці лётнік заўва́жыў хлопца, з чаго гэта відаць?
3. Ці лю́дзі ў вёсцы адра́зу зразуме́лі, што ім лётнік хаце́ў сказа́ць? Як ён ім усё-ж перада́ў ве́стку?
4. Што можна сказа́ць пра хара́ктар Мікі́ткі, мяркуючы па тым, як ён трыма́ўся на кры́зе, паку́ль прыйшоў парату́нак?
5. Як заве́цца а́ўтар, што напіса́ў апавяда́ньне **"На кры́зе"**?

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 273. а) Прачыта́йце ска́зы, **устаўля́ючы** паводля ўзору **абодва, абе́дзьве** або **абое** ў вадпаве́дным склоне.

УЗОР. І Я́нка й Стасю́к, **абодва** спра́ўна е́зьдзяць а́ўтам.
Абе́дзьве маé сястры́ ўжо закончылі школу.

1. І Я́нка й Стасю́к, . . . спра́ўна е́зьдзяць а́ўтам.
2. . . . маé сястры́ ўжо закончылі школу.

3. І брат і сястрá ... мáюць сьвéтлыя валасы́ й сінія вочы.
4. Хто кіравáў áўта, бáцька ці сын? ... на зьмéну.
5. Да брáта прыйшлá сяброўка, мáма іх ... пачаставáла марозівам.
6. Мікíтка моцна трымáўся ... рукáмі за кры́гу.
7. Калí хочаш перайсьцí вýліцу, пéрад тым увáжна паглядзí ў ... бакí, ці ня йдзе блíзка áўта.
8. У ягоных бацькоў нарадзíны ў ... таго сáмага дня.

б) **Фанэты́чнае.** Уголас паўтарáйце за настáўнікам.

Двух братоў	Двое варотаў
Шасьцёра вýчняў	Шасьцёра дзьвярэй
Пяцёра дзяцéй	Трое сáняў
Дзесяцёра экскурсáнтаў	Чацьвёра нажнíцаў
Трое кацянáтаў	

в) Перапíшыце сьлéдам. У падручнúках **лічэбніках і назоўніках** аднэй лíтарай угары **абазнáчце склоны.**

1. **У двух братоў** аднолькавыя польты.
2. **Шасьцяром вýчням** настáўнік пастáвіў "выдáтна".
3. Цяжка ім жывéцца з **чацьвярмá дзéцьмі.**
4. Курúца водзіць **сямёра куранятáў** і **трое качанятáў.**
5. Я згубíла **двое нажнíцаў** і не магý нідзé іх знайсьцí.
6. Сталя́р атрымáў закáз на **пяцёра дзьвярэй** ды **двое санéй.**
7. У мянé два братúы й дзьве сястрúы, рáзам **пяцёра дзяцéй.**

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 274. а) **Фанэты́чнае.** Настáўнік чытáе ўголас сказ зь **дзеясловам у вадзíночным лíку,** і адзíн рад паўтарáе за ім, а тады́ другí рад, áле зь дзеясловам **у множным лíку.**

1. На сталé ляжы́ць (або ляжáць) пяць алавíкоў.
2. Вы́ліцай ідзé (або йдуць) чацьвёра хлапцоў.
3. У кошыку сьпíць (або сьпяць) трое кацяня́ткаў.
4. Колькі дзяўчáтаў прыбірáе (або прыбірáюць) кля́су.
5. Шмат студэнтаў узíмку вы́чыцца (або вы́чацца), а ўлéтку працуе (або працуюць).

б) Напíшэце гэтыя скáзы ў прошлым чáсе.

УЗОР. 1. На сталé ляжáла пяць алавíкоў. Або: на сталé ляжáлі пяць алавíкоў.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 275. а) Перапішэце табліцу **дробавых лічэбнікаў з паў-** (пра́віла 26-III 1а).

б) Перапішэце пры́клады, усе́ **лічэбнікі** пішэце **словамі**, а назоўнікі з дзе́жак у вадпаве́днай форме, як пака́звае ўзор: 1. паўтара́ мэтра ды адзін мэтар бу́дзе паўтраця́ мэтра.

1. 1½ мэтра ды 1 мэтар бу́дзе 2½ (мэтар)
2. 3½ мілі ды 2 мілі бу́дзе 5½ (міля)
3. 3½ даля́ра ды 4½ даля́ра бу́дзе 8 (даля́р)
4. 6½ вядра́ ды 2 вядры́ бу́дзе 8½ (вядро)

в) Перапішэце ска́зы, **лічэбнікі** напішэце словамі.

1. Мы ве́рнемся за 2½ гадзіны.
2. У гэтым доме мы жывём ужо 3½ году.
3. Прае́дзем яшчэ 5½ кілямэтра, і пачне́цца лес.
4. Ён пайшоў у горад з 1½ даля́рамі ў кішані.
5. За 4½ даля́ра ма́ма купі́ла мне ша́пку й ша́лік.
6. Міха́сь хаце́ў пазы́чыць 2½ даля́ра, а́ле ніхто з нас ня меў.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 276. Перапішэце **прыклады склада́ньня** ды **адыйма́ньня**, усе́ лічэбнікі пішэце словамі.

1. **УЗОР** на **склада́ньне:** адна́ пя́тая ды тры пя́тыя бу́дзе чаты́ры пя́тыя.

1/5 ды 3/5 бу́дзе 4/5
2/7 ды 4/7 бу́дзе 6/7
1 3/8 ды 5/8 бу́дзе 2

0.6 ды 0.3 бу́дзе 0.9
0.15 ды 0.27 бу́дзе 0.42
0.2 ды 0.5 бу́дзе 0.7

2. **УЗОР** на **адыйма́ньне:** ад чатырох пя́тых адня́ць адну́ пя́тую бу́дзе тры пя́тыя.

Ад 4/5 адня́ць 1/5 бу́дзе 3/5
Ад 4/7 адня́ць 3/7 бу́дзе 1/7
Ад 0.8 адня́ць 0.3 бу́дзе 0.5

Ад 0.85 адня́ць 0.23 бу́дзе 0.62
Ад 7/8 адня́ць 3/8 бу́дзе 4/8, або 1/2
Ад 5/9 адня́ць 2/9 бу́дзе 3/9, або 1/3

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 277. а) Перапішэце ска́зы ды падчыркне́це **безасабовыя** дзеясловы.

1. Ле́та так ху́тка мінула́, што здае́цца, зусім яго ня было.
2. Яму́ нездаровіцца ўжо ад даўжэйшага ча́су.
3. Чацьве́ртая гадзі́на, а ўжо зьмяркае́цца.
4. Здае́цца, што каза́ сьмяе́цца.
5. Дзіця́ці не́шта ня сьпіцца.

б) Прачыта́йце ска́зы ды напішэце іх у **прошлым ча́се незакончанага** й **закончанага трыва́ньня.**

1. Мне здае́цца, што бу́дзе пагода.
2. Малады́м вясёла жыве́цца
3. На дождж усім ім хочацца спаць.
4. Нічога само ў ру́кі не дае́цца, трэба цяжка **працава́ць.**
5. Ён толькі засьне́, і ўжо не́шта яму́ сьні́цца.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 278. а) Перапішэце ска́зы ды падчыркне́це **канча́ткі ў займе́ньніках.** б) Перакладзе́це гэтыя ска́зы зь белару́скае ў анге́льскую мову.

1. Дзеці прыйшлі́ прывіта́ць наста́ўніцу з днём нарадзі́наў, а́ле яе́ самое ня было дома. 2. Мы дайшлі́ да са́мае рэчкі. 3. Ён са́мы ле́пшы ву́чань у школе. 4. Нас сустрэ́ў сам гаспада́р. 5. Мы былі́ ў таго са́мага хлапца́, зь яки́м учора пазнаёміліся. 6. На экску́рсію пае́хала ўся кля́са. 7. На зье́зьдзе была́ моладзь з усіх правінцыяў Кана́ды. 8. У́весь прыбы́так зь вечары́ны яны́ аддалі́ на за́куп кні́гаў у бібліятэку.

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 279. а) Перапішэце ска́зы, падчыркне́це **зваротныя займе́ньнікі.**

Я зрабі́ў сабе́ пали́цу на кні́гі. Яны́ ма́ла гавары́лі пра сябе́. Ву́чні паба́чылі сябе́ на фатазды́мку, а Я́нка не пазна́ў сам сябе́. Хто позна ходзіць, сам сабе́ шкодзіць.

б) Перапішэце прыказкі, за́між кропак уста́ўце займе́ньнік **сябе́** ў патрэбным склоне.

1. Ня той моцны, хто стры́мвае коняй, а той, хто стры́мвае .... 2. Кінь за ...., знойдзеш пе́рад .... 3. Не хвалі́ ..., няха́й лю́дзі пахва́ляць. 4. Хто дрэнна робіць, той сам ... шкодзіць. 5. Хто толькі сам ... лю́біць, таго ніхто ня лю́біць. 6. Ня той напе́радзе, хто абагна́ў, а той напе́радзе, хто за ... і́ншых цягне.

КРУГ 27

ФРАНЬЦІШАК БАГУШЭВІЧ І ЯГОНЫ ЧАСЫ

I

Francishak Bahushevich, one of the classic poets of Byelorussian literature

Беларýскі паэт і вялíкі нацыянáльны дзéяч Франьцішак Багушэвіч нарадзіўся ў 1840* годзе ў сям'і дробнага шляхціца Казімера Багушэвіча ў хвальвáрку Сьвірáны на Ашмяншчыне. Ягоныя дзіцячыя гады прайшлі ў Кушлянах, дзе дагэтуль як музэй захаваўся Багушэвічаў дом.

Цёмныя й неспакойныя тады былі гады ў Беларýсі. Край наш быў у маскоўскай няволі.

Зачыненыя былі ня толькі абодва ўнівэрсытэты, у Полацку ў 1820* годзе, а пасьля ў Вільні ў 1832* годзе, áле і ўсе іншыя беларýскія школы. Забаронена было друкавáць беларýскія кнігі ці газэты.

Якрáз у годзе, калі нарадзіўся паэт, у 1840 годзе выйшла забарона карыстáцца ў судох Літоўскім Статýтам — гэта знáчыць беларýскім поўным зборам законаў, які на працягý трох стагодзьдзяў абавязаваў на ўсёй прасторы Вялíкага Княства Літоўскага. Нáвет гістарычны назоў нáшае Бáцькаўшчыны - Літвá - быў замéнены спачáтку на "Беларýсь", а тады проста на "Паўночна-Заходні Край". Адначáсна Масквá пачалá сьвéдама тарнавáць назоў Літвá толькі да бáлцкае Жамойці, якáя ранéй уваходзіла ў нáшую дзяржáву - Вялíкае Княства Літоўскае — толькі як правінцыя. У выніку гэтага з чáсам назоў Літвá (Lithuania) замацавáўся за гістарычнай Жамойцяй, а назоў Беларýсь за нáшай Бáцькаўшчынай.

---

* For Dates / Дáты — see § 28-I, 1b.

Эканамічны стан Беларусі таксама страшэнна абнізіўся. Ад гарадоў адабраныя былі правы на самаўрад ды на мяшчанаў накладзеныя вялікія падаткі, а сялянства гібела ў прыгоне, які пад Расеяй стаўся яшчэ цяжэйшы. Ранейшы селянін меў два вольныя дні на тыдзень на працу для сябе, Расейцы гэта скасавалі. Да таго-ж расейскія паны цераз за грошы пазычалі ў Расею беларускіх сялянаў як нявольнікаў на цяжкія працы, як будаванье чыгунак, капаньне каналаў ды падобнае.

Франьцішак Багушэвіч рос сярод сялянаў і вельмі любіў гэтых простых людзей, калі з такім болем і спачуваньнем пасьля напісаў пра іх:

... Пераеўся хлеб да крышкі,
Бульбы толькі як пасеяць,
І прыварку ані лыжкі,
І скаціна — хоць разьвеяць;
Ні саломкі, ні то сена,
Хоць-бы на раз для скаціны;
А тут дроў ані палена,
А тут яшчэ нарадзіны!

З паэмы "Кепска будзе!"

Вучыцца бацька вайшоў свайго сына Франьцішка ў Віленскую Гімназію. У тую гімназію, якая мясцілася ў старадаўніх мурох былога Віленскага Ўнівэрсытэту, зачыненага царскім урадам, дзе зь якое неўзабаве павыходзіла шмат ня толькі ўдзельнікаў, але й кіраўнікоў паўстаньня Кастуся Каліноўскага супраць Расеі, што ў 1863 годзе разгарэлася па ўсёй Беларусі.

У 1861 годзе Багушэвіч паехаў у тагачасную сталіцу Расеі Пецярбург ды залічыўся на ўнівэрсытэт на фізычна-матэматычны факультэт. Але за дзейны ўдзел у студэнцкіх хваляваньнях на другім годзе навукі яго выключылі з унівэрсытэту, і паэт ізноў вярнуўся на Бацькаўшчыну, дзе ўжо зьвінелі паўстанскія шаблі й косы.

II

Багушэвіч выступіў на плошчы ў мястэчку Жупранах з палкай прамовай-заклікам, а тады й сам пайшоў у лес, далучыўся да паўстанскіх аддзелаў. У ваднэй із сутычак з расейскімі войскамі ён быў цяжка ранены й толькі цудам выратаваўся ад сьмерці. Яго падабраў на полі бою незнаёмы селянін, перавязаў рану, даў прытулак.

Каб ня трапіць у Сібір на катаргу, ато й проста на шыбеніцу, як гэта сталася з галоўным правадыром паўстаньня Кастусём Каліноўскім, павешаным у Вільні ў 1864 годзе, або з паэтавымі сябрамі зь гімназіі Ігнатам Здановічам, таксама павешаным у Вільні, Цітам Далеўскім, які быў расстраляны, ды з шмат, шмат кім іншым, паэт-паўстанец на даўгія гады мусіў пакінуць Беларусь. Ён перабраўся на Ўкраіну, скончыў там Нежынскі юрыдычны ліцэй ды працаваў за судовага сьледчага ў Канатопе.

А галоўнае, войстра перажываючы трагедыю няволі й бяспраўя беларускага народу, пачаў пісаць пабеларуску ды друкаваць пад рознымі мянушкамі, аднэй зь іх

была́ "Маце́й Бурачок". За ягоным жыццём былі́ выдрукаваныя два зборнікі ягоных ве́ршаў: "Ду́дка Белару́ская" ў 1891 годзе ў Кра́каве, тады́ пад А́ўстрыяй, ды "Смык Белару́скі" ў 1894 г. у Познані пад Не́мцамі.

У прадмове да зборніка "Ду́дка Белару́ская" Багушэвіч пісáў: "Мова на́шая така́я-ж лю́дзкая й па́нская, як і францу́ская, альбо нямецкая, альбо й і́ншая яка́я. Чыта́ў я цімáла стары́х папе́раў па дзьве́сьце, тры́ста гадоў таму́ пі́саных у на́шай зямлі́ і пі́саных вялі́кімі пана́мі, а на́шай мовай чысьцю́сенькай, я́к-бы вот цяпе́р пісáлася.

. . . На́шая мова для нас сьвятáя, бо яна́ нам ад Бога да́ная, як і другі́м добрым людцом.

. . . Яно добра, а на́вет трэба знаць суседзкую мову, а́ле найпе́рш трэба знаць сваю́.

. . . Шмат было́ такі́х народаў, што стра́цілі найпе́рш мову сваю́..., а потым і зусі́м заме́рлі. Не пакіда́йце-ж мовы на́шай белару́скай, каб ня ўме́рлі!

. . . Можа хто спыта́е: дзе-ж Белару́сь? Там, бра́тцы, яна́, дзе на́ша мова жыве́ць: яна́ ад Ві́льні да Мазыра, ад Ві́цебска за малы́м не да Чарні́гава, дзе Гродна, Менск, Магілéў, Ві́льня й шмат мястэчкаў і вёсак..."

І падпісáў: Маце́й Бурачок.

Пасьля́ дзесяцёх гадоў Багушэвіч вярну́ўся ў Белару́сь і асялі́ўся ў Ві́льні, яка́я як сталі́ца і ў няволі заста́лася цэнтрам белару́скага грама́дзкага й культу́рнага жыцьця́. Тут Багушэвіч стаў працава́ць адвака́там. Бяз уся́кае пла́ты бра́ўся ён бараніць у судзе́ інтарэсы простых сяля́наў. Лю́басна зва́лі яго сучáсьнікі мужы́цкім адвака́там.

Незадоўга да сьме́рці ў 1897 годзе Багушэвіч перабра́ўся ў родныя Кушля́ны, недалёка ад якіх на Жупра́нскіх могілках ён і быў пахава́ны ў 1900 годзе.

Паэт памёр, а творы ягоныя жылі́, пашыра́ліся нат сярод няпісьменнага люду. Перадава́ныя з ву́снаў у ву́сны, яны́ ста́ліся як-бы ву́снай народнай творчасьцяй. За гэтыя творы, за тое, што

"ў сэрцы збудзі́ў ты надзе́ю..."

як пісáў пра яго сучáсьнік ягоны, другі́ белару́скі паэт Ада́м Гурыновіч, Белару́сы завýць Франьці́шка Багушэвіча ба́цькам белару́скага адраджэньня.

Слоўнік (Vocabulary)

дзе́яч, -а (m.) cultural or public worker
шля́хціц, -а (m.) nobleman
няволя, -і (f.) bondage
друкава́ць (I) to print
забараня́ць (I) to forbid
Літоўскі Стату́т Lithuanian Statute (the law code of the Grand Duchy of Lithuania)

суд, -у (m.) law-court
сьве́дама (adv.) deliberately
тарнава́ць (I); тарну́ю, -еш, -юць to refer
замацава́цца (I) pf. (за + instr.) (in this case) to be associated (with)
абні́зіцца (II) pf. to go down
адабра́ць (I) pf. to take away
правы́ на самаўра́д rights to self-government
прыгон, -у (m.) serfdom
скасава́ць (I), pf. past **скасава́ў, -ла, -лі** to abolish
капа́ць кана́л to dig a canal
перае́сьціся, (irr.) past **перае́ўся, -лася** to be eaten up
скаці́на, -ы (f.) cattle
палёна, -а (n.) log
удзе́льнік, -а (m.) participant
разгарэлася паўста́ньне an uprising broke out
факультэт, -у (m.) faculty, department
дзе́йны, -ая, -ае active
ша́бля, -і (f.) sabre
выступа́ць з прамовай to make a speech
аддзе́л паўста́нцаў squad of rebels
суты́чка, -і (f.) battle, encounter
цуд, -у (m.) miracle
сьмерць, -і (f.) death
поле бою battlefield
ра́на, -ы (f.) wound
перавяза́ць ра́ну to dress a wound
прыту́лак, прыту́лку (m.) shelter, refuge
ка́тарга, -і (f.) hard labour, penal servitude
шы́бені́ца, -ы (f.) gallows
юрыды́чны ліцэй, -ю Lyceum of Law
судовы сьле́дчы (-ага) judicial investigator
мяну́шка, -і (f.) pen name, nickname
зборнік ве́ршаў collected poems
"Ду́дка Белару́ская" "Byelorussian Pipe"
"Смык Белару́скі" "Byelorussian Bow"
Кра́каў (m.), **Познань** (m.) Krakow, Poznan (Polish cities)
твор, -у works (in this case) poems
прадмова, -ы (f.) preface, foreword
ці́ма́ла (adv.) many, a great deal
чысьцю́сенькі ,-ая, -ае purest
вот (=вось) цяпе́р right now, at this time
сьвяты́, -а́я, -ое sacred
на́йперш (adv.) at first
заме́рці (I) (pf. of **замі́ра́ць**) to decline
грама́дзкае й культу́рнае жыцьцё (n.) public and cultural life
адвака́т, -а (m.) solicitor, lawyer
барані́ць (II) інтарэсы to defend interests (title rights)
лю́басна (adv.) affectionately
сучасьні́к, -а (m.) contemporary
мужы́цкі peasant (adj.)
пахава́ны, -ая, -ае buried
паме́рці (I) (pf. of **памі́ра́ць, I**) to die
люд, -у (m.) people, folk
народная творчасьць (f.) folklore
адраджэньне, -я 1. revival, 2. renascence

27 — 26Ф SPELLING OF FOREIGN WORDS
ПРА́ВАПІС ІНШАМОЎНЫХ СЛОВАЎ

а) Пра́вапіс галосных

1. **Іншамоўнае "е"** пішацца ў словах празь **"е" толькі пасьля** зычных **"л, г, к"**, прыкладам:

тэлефон, дэлега́т, а́льгебра, геамэтрыя, буке́т, ля́гер,
як у словах зьбеларушчаных: тале́рка, шма́лец, колер, банке́т, анге́льскі.

На **пачатку-ж** слова й **пасьля іншых зычных** пішацца **"э"**, прыкл.:

этыка, экспэрымэ́нт, экспэдыцыя экза́мен, фанэтыка, сэнса́цыя, сэа́нс, сэмэ́стар, сэзо́н, тэа́тар, рэспу́бліка, хэ́мія,

як і ў словах зьбеларушчаных: імпэт, пэрла, фэст, хвэбра.

2. **Ненаціcьненае "э(е)"** ў іншамоўных словах на пісьме захоўваецца, як відаць з паданых прыкладаў, але ў некаторых даўнозапазычаных **"э"** пераходзіць у **"а"**, прыкл.: рамонт, літара, літаратýра, сакратáр, гáндаль, матар'ял.

3. **Іншамоўнае "і"** пасьля зацьвярдзелых зычных і пасьля зубных **"д, т, з, с"** перадаецца празь літару **"ы"**, прыкл.:

рэжы́м, жыра́фа, на́цыя, канстытýцыя, палíцыя, гíсторыя, дырэктар, тып, тыра́н, фíзыка, універсытэ́т, як і ў словах, што ўжо даўно зьбеларусíліся: Сымон, магазы́н, разы́нка, але: Сібíр, сібе́рны, тýзін.

Пасьля-ж іншых зычных пішацца **"і"**: міністар, капітáл, архíў.

УВА́ГА 1. Але ў словах на **ія, ійны "і"** захоўваецца і пасьля **"з, с"**, прыкл.:
ія: паэзія, фантáзія, гімнáзія, камíсія, місіянéр.
ійны: дывізíйны, камісíйны ды гэтак-жа гімназíсты, гімназíстка.

УВА́ГА 2. Пасьля **"з, с, д(дз), т(ц)"** пішацца "і" таксама ў суфіксах "ір" ды **"ік"**, прыкл.: касíр, білéцік, экспэрымэ́ньцік, эпізодзік.

4. **Французскае "u"** перадаецца празь **"ю"**, а пасьля зацьвярдзелых ды **"д, т"** праз **"у"**, прыкл.: бюро, бюджэт, бюст, мэню́, сюжэт, Гюго,
але: увэртýра, журы́, брашýра . . .

Нямецкае "ü" пасьля губных **(б, п, м, в, ф)** перадаецца празь **"ю"**, а пасьля ўсіх іншых — празь **"і (ы)"**: Мю́лер (Müller), але Бры́кнэр (Brückner).

5. **Прыстаўное "в"** перад **"у"** ў іншамоўных словах **ня пішацца,** прыкл.:
універсытэт, Ура́н, універса́льны, ýрна . . . за выняткам словаў, даўно зьбеларушчаных, як вýнія, вуніят.

б) **Правапіс** злучэньняў **іа, іе, іо, іu**
У злучэньнях гэтых першы гук пішацца **"і"**, а пасьля зацьвярдзелых ды **"д, т"** — **"ы"**, іншыя-ж гукі пішуцца празь **"я, е, ё, ю".** Гэтак:
іа = **ія** — **ыя**: генія́льны, спэцыя́льны, ініцыятыва, па́ртыя;
іе = **іе** — **ые**: кліе́нт, гігіе́на, пíетызм, дые́та, аўдые́нцыя;
іо пад націскам перадаецца празь **іё** — **ыё**, прыкл.: біёляг, патрыёта, ідыёт;

а **не пад націскам** празь **ія** — **ыя**, прыкл.: сацыялёгія, бібліятэка, фізіялёгія, нацыяна́льны, пэры́яд;

іu = **ію** — **ыю**: канцы́ліюм, калёквіюм, прэзы́дыюм, але трыýмф.

Пасьля іншых галосных (не **і, ы**) іншамоўныя **"а, о, е"** заўсёды пішуцца праз **"а, о, э"**, прыкл.: рэа́кцыя, актуа́льны, кака́о, паэта, тэа́тар, ідэа́льны (але: ідэялёгія — ад ідэя).

в) Правапіс дыфтонгаў і злучэньняў галосных:

Дыфтонгі "au", "ou" заўсёды перадаюцца праз **"аў", "оў"**, прыкл.:
а́ўтар, **аў**дые́нцыя, **аў**дыторыя, Шапэнга́**ў**эр.

Лацінскае злучэньне "eu" = эў — еў, прыкл.:
нэ**ў**тра́льны, нэ**ў**растэнія, фэ**ў**далізм, ле**ў**кой.

Нямецкія: eu (öu) = ой (ей), прыкл.: Ф**ой**ербах, **лейт**эна́нт,
а **"ei" = ай яй,** як у райнва́**йн**, ля**йт**-маты́ў.

г) **Пра́вапіс зы́чных**

1. Іншамоўнае "л" перадаецца на **пачатку** і **ў сярэдзіне** слова **мякка,** прыкл.:

лябараторыя, лямпа, ляўкалёр, баля́да, балён, парлямэнт, філялёгія, рэгуляваць, інтэлігенцыя, дыплём,

як у зьбеларускай мове: ля́мпа, кля́мка, пляц, акуля́ры.

2. На канцы слова "л" перадаецца або мякка, або цьвёрда, залежна ад вымаўленьня:

мужч. род:	**ль:**	мэта́**ль**, сты**ль**, цы́ркуль, мэда́**ль** . . .
	л:	артыкў**л**, ідэа́**л**, капіта́**л**, пэрсана́**л**, адміра́**л** . . .
жан. род:	**ль:**	дэта́**ль**; **ля:** за́**ля**, карусэ**ля**, ро**ля** . . .
	ла:	фа́бу**ла**, формула, кані́ку**лы** (мн. лік) . . .

3. Злучэньне **"лё"** пішацца толькі пад націскам, не пад націскам пішацца **"ля,** прыкл.: **заалёгія, біялёгія, дыплём, балён, лёгіка,**

але: ляя́льны, лягі́чны, філязо́фія, дыплямат, філялёгія . . .

4. Лацінскае **ph** ды іншамоўнае **f = ф**, а **th = т**, прыклады:
ф: **ф**акт, **ф**орма, **ф**ронт, **ф**ілязофія, тэлегра́**ф**, рэльє́**ф**
т: тэа́**т**ар, катэдра, каталіk, артагра́фія, лягары́**тм**, арытмэ́тыка, Атэны,
як: Тама́ш, Тодар, Ага́та.

Але калі запазычанае слова ўжываецца ў нашай мове даўно й зьбеларусілася, дык гук **"ф"** замяняецца гукамі **"п, х** або **хв",** прыкл.:

Піліп, Язэп, Апана́с; **Хв**е́дар, **хв**а́рба, **хв**а́брыка; **х**у́тра, **Х**ама́, **х**унт (вага́),
але — **ф**унт стэрлінгаў.

5. Падвойныя зычныя ў іншамоўных словах ня пішуцца, прыкл.:

апара́т, бруто, нэто, ідылія, камісія, тэрыторыя,

але ў некаторых словах падвойныя зычныя захоўваюцца, прыкл.:

ма́**нн**а, ва́**нн**а, Мадо**нн**а, Бу́**дд**а, Мэ**кк**а.

д) **Правапіс суфіксаў**

1. Лацінскае злучэньне **“тр”, “др”** на канцы слова разьбіваюцца праз **“а” (тар, дар)**, як і ў шмат якіх іншых мовах, прыкл.:

тар — мініс**тар**, сэмэс**тар**, лі**тар**, мэ**тар**, тэа́**тар**, дыя́мэ**тар**, ма́йс**тар** (і — ма́йстра).
дар — Алякса́н**дар**, цылі́н**дар**, ка́**дар**.

2. Суфікс **“ір”** у іншамоўных дзеясловах ды вытвараных ад іх словах **ня ўжываецца**, прыкл.:

рэгулява́ць (а не рэгулі́раваць), ды рэгулява́ньне;
фатаграфава́ць — фатаграфава́ньне, гэтак-жа: сымулява́ць, калькулява́ць, спэкулява́ць.

е) Апостраф (’) і разьдзяля́льны мяккі знак (ь)

1. **Мяккі знак** у іншамоўных словах пішацца **пасьля** мяккіх **“л”, “н” перад ётаванымі** галоснымі, прыкл.: рэль’е́ф, Уі́льям, біль’я́рд, каньюнкту́ра, канья́к, Нью́тан, Нью-Ёрк.

УВА́ГА. Словы: мэдальён, батальён, павільён пішуцца празь **“льл”**.

2. У іншых выпадках ставіцца апостраф (’), прыкл.: ад’ютан́т, аб’е́кт, кур’е́р, бар’е́р, Т’е́р і іншыя.

***

a) **Vowels in foreign words.**

1. **е = э.** A foreign **“е”** in Byelorussian words is written with **“э”**, e.g.:

этыка, фанэтыка, сэзо́н, хэмія

except after **“л, г, к”** where **“е”** is written with **“е”**, e.g.:

тэлефон, дэлега́т, а́льгебра, ля́гер, букет́ . . .

2. The unstressed **“э(е)”** does not change to **“а(я)”** except in those words which have been used in Byelorussian for a long time and have taken a fully Byelorussian form,

e.g.: сакрата́р, лі́тара, літарату́ра, рамонт, га́ндаль, дакляра́цыя, матар’я́л.

3. **і = і**, e.g.: міні́стар, капіта́л, архіў, гісторыя. However, after the hardened consonants and **“д, т, з, с”**

і = ы, e.g.: на́цыя, рэжы́м, фізыка, сыстэма, сымэтрыя, дырэктар, тып.

Exceptions include **“Сібір”** and **“ту́зін”** as well as all words ending in **“ія”** and **“ійны”** which also retain **“і”** after **“з, с”**, e.g.: паэзія, гімна́зія, камісія, дывізійны, гімназісты, камісійны.

4. The French "u" = **ю**, e.g.: бюро, мэню́, Гюго́, but after hardened consonants and "д, т" **u** = **у**, e.g.: брашу́ра, увэрту́ра.

   The German "ü" = **ю** after **п, б, м, ф, в**, e.g.: Мю́ллер (Müller)
   and after all other consonants **ü** = **і** or **ы**, e.g.: Бры́кнэр (Brückner).

5. There is no prothetic "в" before the initial "**у**", e.g.: **універсыте́т.** Exceptions exist in some words of long-standing use in Byelorussian, e.g.: ву́нія, вуня́т.

b) **Ia, ie, io, iy** in foreign words.

Ia = **ія** or **ыя**, e.g.: геня́льны, спэцыя́льны, **дыяле́кт**
ie = **ie** or **ые**, e.g.: кліе́нт, гігіе́на, **дые́та, арыента́цыя**
io = **іё** or **ыё** (when stressed), e.g.: патрыёта, **ідыёт**
ія or **ыя** (when unstressed), e.g.: **бібліятэка, на́цыя**
iu = **ію** or **ыю**: кансы́ліюм, прэзы́дыюм, but **трыу́мф.**

After vowels other than "і" or "ы" the foreign **a, o, e are always written with а, о, э,**
e.g.: рэ́акцыя, ка[illegible], [illegible], како́, дуэт, паэта, ідэа́льны but ідэялёгія (from ідэя).

c) **Au, ou** and other vowel groups.

1. **Au** = **аў**; **ou** - **оў**, e.g.: а́ўтар, аўдыторыя, Шапэнга́ўэр . . .
2. The Latin **eu** = **эў** — **еў**, e.g.: нэўтра́льны, **нэў**ралёгія, **леў**кой . . .
   and the German **eu (öu)** — **ой (ей)**, e.g.: **Фой**ербах, **лей**тэна́нт
   ei = **ай (яй)**, e.g.: рака́ **Райн**, **ляйт**-маты́ў.

d) Consonants in foreign words.

1. "l" at **the beginning and** in the **middle** of a word is **always soft**, e.g.:
   лёгіка, **лябараторыя**, фальклёр, інтэліге́нт.

2. At **the end of a word**, in some cases "l" **is soft and in others hard:**

   soft, e.g.: **стыль**, мэда́**ль**, за́**ля**, ро**ля**, карусэ**ля**.
   hard, e.g.: артыку́**л**, капіта́**л**, форму**ла**, кані́куы**лы**.

3. The Latin "**ph**" or foreign "**f**" = **ф**; and "**th**" = **т**, e.g.:

   ф: **ф**акт, **ф**ронт, **ф**ілязофія.
   т: **т**эа́тар, **т**катэдра, **т**арытмэтыка, па́**т**ос, А**т**эны.

NOTE. "**Ф**" occurs in recent foreign loan-words only, as in **ф**акт, **ф**ронт. However in some foreign loan-words of long-standing use in Byelorussian, "**ф**" has been replaced by "**п, х** or **хв**", e.g.: **П**іліп, Язэ**п**, А**п**ана́с; **Хв**е́дар, **хв**а́брыка, **хв**а́рба; **х**унт (weight) but **ф**унт (=20 shillings) (cf. а**хв**я́ра, **хв**а́ля).

4. Double consonants are written in: ма́нна, ва́нна, Мадонна, Бу́дда, Мэкка. All other foreign words with double consonants are written with one consonant in Byelorussian, e.g.: апара́т, апэты́т, бру́то, нэ́то, камітэт.

e) **The Apostrophe (') and the separating soft sign (ь).**

1. The **separating soft sign** is used **after** the soft **"л" and "н" before jotated** vowels, e.g.: рэльёф, Уільям, Нью-Ёрк.

   NOTE. The words мэдальён, батальён, павільён are written with a double **"ль".**

2. **After other consonants** the **apostrophe** is used, e.g.: ад'ютант, аб'ект, кур'ер, бар'ер, Т'ер.

27 — I THE MULTIPLICATION TABLE IN BYELORUSSIAN
ТАБЛІЦА МНОЖАНЬНЯ ПАБЕЛАРУСКУ

2 times	2, 3 . . .	—	**двойчы**	2, 3 . . .	7 times	2, 3 . . .	—	**сямá**	2, 3 . . .
3 times	"	—	**тройчы**	"	8 times	"	—	**васьмá**	"
4 times	"	—	**чатырмá**	"	9 times	"	—	**дзевяцьмá**	"
5 times	"	—	**пяцьмá**	"	10 times	"	—	**дзесяцьмá**	"
6 times	"	—	**шасьцьмá**	"					

For example: 2 times 5 = 10 — **Двойчы** пяць — дзéсяць.
6 times 7 = 42 — **Шасьцьмá** сем —сорак два.
and 21 times 12 . . . — Двáццаць адзін **памножанае** на дванáццаць . . .

27 — II INDEFINITE PRONOUNS / НЕАЗНАЧÁЛЬНЫЯ ЗАЙМЁНЬНІКІ

1. **Нéхта (=хтосьці, хтось)** someone, somebody, anyone, anybody
   Нéшта (=штосьці, штось) something, anything
   Нéйкі (=якісьці, якісь) some
   Нéчый (нéчы), (=чы́йсьці, чыйсь) somebody's
   Некаторы, некаторая, некаторае some; **які-нéбудзь** any
   Хто-нéбудзь somebody, anybody; **што-нéбудзь** something, anything.

   Неазначальныя займеньнікі з прыстаўкай **"не"**, за выняткам **"некаторы"**, маюць націск на **"не"**.

2. Скланеньне

   а) Н. **Нéхта, нéшта**, Р. нéкага, нéчага, Д. нéкаму, нéчаму, В. нéкага, нéшта, Т. нéкім, нéчым, М. пры нéкім на нéчым

   Н. **хто**сьці, Р. В. **каго**сьці, Д. **каму́**сьці, Т. М. **кім**сьці
   Н. В. **што**сьці, Р. **чаго**сьці, Д. **чаму́**сьці, Т. М. **чым**сьці

   Як займеньнікі "**хто**сьці", "**што**сьці", скланяюцца і "**хто**сь, **што**сь".

Заўважце, што гэтыя займеньнікі, як і **"не́хта", "не́шта"**, ужываюцца **толькі ў вадзіночным ліку.**

б) **Адзіночны лік**

	Н.	Р.	Д.	В.	Т.	М.
м. род:	**не́йкі,**					
н. род:	**не́йкае,**	**не́йкага,**	**не́йкаму,**	**не́йк-і (-ага)** **не́йкае,**	**не́йкім,**	**у не́йкім**
ж. род:	**не́йкая,**	**не́йкае,**	**не́йкай,**	**не́йкую,**	**не́йкай,**	**у не́йкай**

Множны лік

	Н.	Р.	Д.	Т.	М.
Для трох родаў:	**не́йкія,**	**не́йкіх,**	**не́йкім,**	**не́йкімі,**	**у не́йкіх**

УВАГА. Займеньнік "**не́йкі, не́йкая, не́йкае**" скланяецца, як прыметнік **"высокі"** (аснова на "к", і канчатак не пад націскам).

в) **Адзіночны лік**

м. род:	**які́сьці,**				
н. род:	**якоесьці,**	**якога́сьці,**	**якомусьці,**	як Н. або Р. **які́мсьці,**	**у які́мсьці**
ж. род:	**яка́ясьці,**	**якоесьці,**	**якойсьці,**	**яку́юсьці,**	**якойсьці** **у якойсьці,**

Множны лік

Для трох родаў:	**які́ясьці,**	**які́хсьці,**	**які́мсьці,**	**які́місьці,** **у які́хсьці**

Гэтак-жа скланяецца й **"які́сь, яка́ясь, якоесь".**

г) **"Не́чый (не́чы), не́чыя, не́чые"** ды **"некаторы, некаторая, некаторае"** скланяюцца, як прыметнік **"шэры"** (зацьвярдзелая аснова й канчатак не пад націскам).

г) Н.	хто-не́будзь	што-не́будзь	які-не́будзь	чый-не́будзь
Р.	каго-не́будзь	чаго-не́будзь	якога-не́будзь . . .	чыйго-не́будзь . . .
Д.	каму́-не́будзь . .	чаму́-не́будзь . . .		

***

a) All indefinite pronouns with the prefix **"не"**, except the pronoun **некаторы, некаторая, некаторае,** have the stress on this prefix. For example: **не́хта, не́шта, не́йкі, не́чый.**

b) Study the declension of the indefinite pronouns in the Byelorussian text and notice that the indefinite pronouns with the particles **-сьці, -сь** and **-не́будзь** are declined like the corresponding interrogative pronouns, the particles remaining unchanged.

27 — III NEGATIVE PRONOUNS / АДМОЎНЫЯ ЗАЙМЁНЬНІКІ

1. **Ніхто** (nobody), **нішто** (nothing); **ніякі, ніякая, ніякае** (none); **нічы́й, нічыя́, нічыё** (nobody's).

2. Скланёньне.

а) Ніхто,	нікога,	нікому,	нікога,	нікім,	аб нікім (або ні аб кім).
Нішто,	нічога,	нічому,	нічога,	нічым,	у нічы́м (або ні ў чым).

б) муж. ніякі,	ніякага,	ніякаму,	ніякім,	у ніякім (або ні ў якім.)
н. ніякае,				
ж. ніякая,	ніякае,	ніякай,	ніякай,	у ніякай (або ні ў якай.)

в) Калі адмоўны займеньнік ужываецца з прыйменьнікам, дык прыйменьнік звычайна ставіцца перад займеньнікам, прыкл.: у **нікога**, зь **нікім**, у **нічым**, у **ніякім**... Дапушчаецца аднак таксама прыйменьнік ставіць **паміж** часьцінкай "**ні**" і рэштай займеньніка. Гэткія выразы пішуцца ў тры словы, прыкл.: **ні** ў **нікога**, **ні** ў **чым**, **ні** ў **якім**.

УВАГА. Падобных выразаў ня бывае з адмоўем "**не**". Заміж "**не**" трэба ўжываць слова "**нямá**", прыкл.: **нямá** ў каго, **нямá** ў чым...

***

a) When a negative pronoun is used with a preposition, the preposition usually precedes the pronoun, e.g.:

у **нікога**, зь **нікім**, у **нічы́м**, у **ніякім**,

or it can stand between the particle "**ні**"and the rest of the pronoun. These expressions are written with three words, e.g.:

ні ў кога, **ні** зь кім, **ні** ў чым, **ні** ў якім.

b) There are not any expressions of this kind with the particle "**не**". Instead of "**не**" the word "**нямá**" has to be used, e.g.: **нямá** зь кім, **нямá** ў чым.

27 — IV THREE MOODS OF VERBS: INDICATIVE, IMPERATIVE AND CONDITIONAL
АБВЁСНЫ, ЗАГАДНЫ І ЎМОЎНЫ лад дзеясловаў

Беларускія дзеясловы маюць тры лады: **абвёсны, загáдны** ды **ўмоўны.**

1. Дзеясловы **абвёснага** ладу выражаюць дзеяньні, якія **ў запраўднасьці адбыліся, адбываюцца** або **будуць адбывацца,** прыкл.:

вýчні **пісáлі**, вýчні **пішуць**, вýчні **бýдуць пісáць.**

2. Дзеясловы **загáднага** ладу выражаюць **просьбу, зáклік** або **загáд,** прыкл.: **Калí** лáска, **пішэце! Няхáй** вýчні **пíшуць! Пішэце** чы́ста!

3. Дзеясловы **ўмоўнага** ладу выражаюць дзеяньні:

а) якія магчымыя толькі пры пэўных абставінах, або дзеяньні пра якія толькі мяркуецца, прыкл.:

Ён пісаў-**бы** лісты́ чáста, **калí-б** ён меў час.

б) ці дзеяньні, пажаданыя таму, хто гаворыць, прыкл.:

Пісáла-б ты да нас хаця́ раз у ты́дзень.

27 — V CONDITIONAL MOOD. CONDITIONAL SENTENCES
УМОЎНЫ ЛАД. СКАЗЫ ЎМОВЫ

1. Утварэньне.

а) **Умоўны лад** дзеясловаў **утвараецца** даданьнем **часьцінкі бы** (а пасьля галосных б) да формы прошлага часу. Дзеясловы ўмоўнага ладу зьмяняюцца толькі ў родзе й ліку, але маюць адну форму для ўсіх часоў. На час у сказе паказваюць іншыя словы, прыкладам:

Я (ты, ён) сёньня пайшоў-**бы**; я (ты, янá) пайшлá-**б**
Я (ты, ён) учора пайшоў-**бы**; **мы (вы, яны́)** ўчора пайшлí-**б**
" заўтра " ; яны́ заўтра пайшлí-**б**

б) Часьцінка **бы (б)** у сказе можа стаяць ня пры дзеяслове, а пры іншым слове, а ў даданых сказах із злучнікам **"каб"** зусім выпушчаецца, прыкл.:

Я шмат чытáў-**бы**, калí-**б** меў час (або **каб** меў час)
я шмат-**бы чытáў**, калí-**б** меў час (або **каб** меў час)
я-б шмат чытáў, " " " " " "

2. Ужываньне.

I. **Умоўны** лад ужываецца ў **сказах умовы.**
Умовы бываюць **рэáльныя й нерэáльныя.**

а) Калі сказ выражае **рэальную** ўмову, гэта значыць факт, які запраўды можа адбыцца, дзеяслоў ставім у **вабвесным ладзе**, адпаведна цяперашняга, прошлага ці будучага часу:

Калí ты працýеш, (дык) ты добра зарабля́еш.
Калí ты працавáў, (дык) ты добра зарабля́ў.
Калí ты бýдзеш працавáць, (дык) ты бýдзеш добра зарабля́ць.

У другім сказе можна абыходзіцца і бяз злучніка **"дык"**, а калі гэты сказ стаіць на першым месцы, **"дык"** ніколі ня ўжываецца, прыкл.:

Ты добра зарабля́еш, калі́ ты працу́еш.

б) Калі-ж у сказе **нерэальная** ўмова, толькі дапушчэньне, супярэчнае рэчаіснаму факту, дзеяслоў ставім у **ўмоўным ладзе**, прыкл.:

Калі́-**б** у мяне́ былі́ грошы, я шмат падарожнічаў-**бы**.

II. **Умоўны** лад ужываецца таксама ў сказах, якія выражаюць проста **пажада́ньне, прапанову** ці **просьбу,** прыкладам: Ён хаце́ў-**бы** вас ба́чыць. Пайшлі́-**б** прайсьці-ся, а́ле позна ўжо. Зайшлі́-**б** уве́чары да нас.

***

1. **Formation** of the **conditional** mood.

a) In Byelorussian the conditional mood has one form for the present, past or future tense. It is formed by using the particle **"бы"** ("б" after vowels) with the past tense of the imperfective or perfective verbs.

SINGULAR

Я (ты, ён) чыта́ў-**бы**	I should (would) read,
Я (ты, яна́) чыта́ла-**б**	or I should (would) have read.
яно чыта́ла-**б**	

PLURAL

Мы (вы, яны́) чыта́лі-**б**	We should (would) read, or We should (would) have read.

b) The actual tense of the conditional mood is indicated by the context, e.g.:

PRESENT: Калі-**б** ён меў час, ён **сёньня** да вас прыйшоў-**бы**.	If he had time, he would come to see you today.
PAST: Калі-**б** ён меў час, ён **учора** да вас прыйшоў-**бы**.	If he had had time, he would have come to see you yesterday.
FUTURE: Калі-**б** ён меў час, ён **за́ўтра** да вас прыйшоў-**бы**.	If he would have time, he would come to see you tomorrow.

2. **Uses** of the **conditional** mood.

I. **Conditional** sentences.

a) **Conditional** sentences usually consist of **two clauses:** the **subordinate** clause which states the **condition**; and the **main** clause which states the **result** of the given **condition.**

The **condition** is introduced by **"калí"** (if) or **"каб"** (if), and the **result** sometimes by**"дык"** (then), e.g.:

Калí ён здаровы, (**дык**) ён можа працава́ць.	If he is well, he can work.
Каб ён ве́даў, ён ня прыйшоў-**бы** (**or ён-бы** ня прыйшоў).	If he knew, he would not come.

There are two types of conditions: **real** and **unreal.**

b) When a sentence states a **real condition** expressing a fact which can actually take place in the present, past or future, regular **indicative** tenses are used, e.g.:

Калí ты пра[illegible] (дык) ты шмат зараб[illegible]	**If you work, you earn much.**
Калí ён пра[illegible]ў, (дык) ён шмат [illegible]	**If he worked, he earned much.**
Калі [illegible] (дык) ен бу́дзе шмат зарабля́ць.	If he will work, he will be earning much.

NOTE 1. "Дык" in the second clause may be omitted.
NOTE 2. "Дык" is always omitted if the conditional sentence begins with the main (result) clause, e.g.: Ты шмат зарабля́еш, калí ты працу́еш.

c) The Conditional mood is used:

I. When a sentence states the **unreal condition** which expresses a supposition contrary to actual fact. To express an unreal condition in any tense, **"калí-б"** and the verb in the **past** tense are used in the **subordinate** clause, and the **conditional mood in the main clause, e.g.:**

Калí-б у мяне́ **былí** грошы, я шмат падарожнічаў-**бы** (**or** я шмат-**бы** падарожнічаў, **or я-б** шмат падарожнічаў).

If I had money, I would travel a great deal.
The particle "бы (б)" in the main clause may be joined to any word, not only to the verb, as shown in the examples above.

II. In sentences conveying desire, suggestion or request, e.g.:

Мы пайшлí-**б** прайсьцíся, а́ле позна ўжо.	We would like to go for a walk, but it is late already.
Ён ве́льмі хаце́ў-**бы вас** ба́чыць.	He **would like** to see you very much.
Зайшлí-**б** уве́чары да нас.	You **ought** to drop in on us this evening.

27 — VI THE PARTICLES / ЧАСЬЦІ́НКІ: не(ня), ні

I. Часьцінка **не(ня)** з рознымі часьцінамі мовы пішацца зьліта й асобна.

а) **Не(ня)** пішацца **зьліта:**

1. Калі слова бязь **не(ня)** ня ўжываецца, прыкл.: **незабу́дка, небара́ка, недасол, ненавідзець, нездаровіцца.**

2. Калі **не(ня)** з назоўнікам, прыметнікам ці прыслоўем **утварае новае слова,** якое можна замяніць словам, блізкім у значаньні, але бязь **"не"**, прыкл.:

нездароўе — хвароба	**ня**годны — благі́	**недалёка** — бліска
не́прыяцель — вораг	**ня**высокі — нізкі	**неспадзява́на** — ра́птам.

3. З **поўнымі дзеяпрыметнікамі,** якія **ня маюць** пры сабе **паясьняльных словаў,** прыкл.:

нясьпі́саныя сшыткі, **незаве́шаныя** вокны, але нічым **не** заве́шаныя вокны.

4. У **неазначальных займенньніках і прыслоўях,** прыкл.:

не́хта, **не́**шта, **не́**які(**не́**йкі), **не́**дзе, **не́**куды, **не́**калі, **не́**як

б) **Не(ня)** пішацца **асобна:**

1. Ад **дзеясловаў, дзеяпрыслоўяў** і **кароткіх дзеяпрыметнікаў,** прыкл.: **ня** чыта́ў, **ня** сьпіцца; **не** гаворачы, **ня** скончана.

2. Ад **назоўнікаў, прыметнікаў, дзеяпрыметнікаў** і **прыслоўяў,** калі **ў сказе** ёсьць або разумеецца **супрацьстаўленьне** таму, што выражана словам зь **"не"**, прыкл.: **ня** прыяцель, а вораг; **не** далёкі, а блізкі; **ня** высока, а нізка; **не** прачы́тана, а праглéджана толькі.

II. Часьцінка **"ні" заўсёды** пішацца **асобна, за выняткам** у вадмоўных займенньніках ды прыслоўях, прыкл.: **ніхто, ніякі; нідзе́, ніколі.**

Часьцінка **"ні"** ўжываецца ў гэткіх выпадках:

1. Калі выражаецца поўнае адмаўленьне, прыкл.: **ніхто, нідзе́, ні** ра́зу; **ні** грозьбаю, **ні** просьбаю; **ні** е́сьці, **ні** пі́ці.

   У такіх выпадках для памацненьня **"ні"** кажуць **"а́ні"**, прыкл.; **а́ні** е́сьці, **а́ні** пі́ці; **а́ні** вокам не змаргну́ў.

2. **Заміж злучніка "і"** пры пералічэньні **пасьля выказьніка з** адмоўем **"не"** ці **пасьля** словаў **нямá, не́льга,** прыкл.: **ня** прыйшоў **ні** Язэп, **ні** Сьцяпа́н; **нямá ні** кроплі вады; **не́льга** тра́ціць **ні** часі́нкі; **не́льга ні** прайсьці, **ні** праéхаць.

3. **Калі** ў сказе **колькі адмоўяў,** дык **пры выказьніку** пішацца **не(ня),** а **пры іншых** словах **ні,** прыкл.: **ні** гля́нуць **не** далі́; работа **ня** спыня́лася **ні** на часі́нку.

4. Часьцінка **"ні"** ўжываецца для ўзмоцненьня сьцьвярджальнага значаньня выказьніка. Такія сказы пачынаюцца выразамі: куды́ **ні**, як **ні**, за што **ні**, каго **ні** ды падобнымі, пры́кл.:

куды́ **ні** глянь — усю́ды лю́дзі; каго **ні** спыта́й — ніхто ня ве́дае;
дзе **ні былі́**, усю́ды нас гасьці́нна прыма́лі.

УВА́ГА. Часам сустракаюцца выказьнікі з падвойным адмаўленьнем, але маюць сьцьвярджальны сэнс, прыкл.:

Не магу́ **не** сказа́ць (г. зн. му́шу сказа́ць), **не́льга ня** це́шыцца.

***

I. a) The particle "не(ня)" is written together:

1. With words which don't exist without **"не(ня)"**, e.g.:

няна́вісьць, небара́ка, ненавідзець.

2. When "не(ня)" with nouns, adjectives or adverbs **form new words, e.g.:**

няшчасьцe — бяда́ (misfortune), **нялёгка — цяжка (hard),**
не́прыяцель — вораг (enemy).

3. With the long form of the **participles** when they stand by themselves and in **indefinite pronouns and adverbs, e.g.:**

незаве́шанае вакно but **нічы́м не** заве́шанае вакно;
не́хта, не́шта, некаторы, не́дзе, не́калі

b) **"Не(ня)" is written separately:**

1. With **verbs, verbal adverbs** and with **short participles**, e.g.:

ня чыта́ў, **не** зрабі́ўшы, **не** прачытаны.

2. With **nouns, adjectives** and **adverbs** when "не" is used for negation. Such words with **"не"** are usually **followed by a contrasting word** preceded by "а", e.g.:

ня пры́яцель, **а** вораг; **ня** лёгка, **а** цяжка.

II. a) The particle **"ні" is always written separately except in** negative pronouns and adverbs, e.g.: **ніхто, нідзе́, ніколі.**

b) **"Ні"** is used: 1. for emphasizing negation or instead of an **"і"** after the negative predicate or after the words **нямá, не́льга,** e.g.: **Ня** ўме́е **ні** піса́ць, **ні** чыта́ць. **Нямá ні** алавіка́, **ні** пяра́.

2. When there are several negations in the sentence, the particle **"не"** is used with the predicate and the particle **"ні"** is used with other words, e.g.:

Работа **ня** спыня́лася **ні** на часі́ну. Work didn't stop for a minute.
Ні гля́нуць **не** далі́. They didn't even let us look once.

3. **For emphasizing the affirmative predicate in expressions starting with:** куды́ **ні**, як **ні**, за што **ні**, каго **ні**, **e.g.:**

Куды́ **ні** глянь — усю́ды лю́дзі. Anywhere you look, there are people.
Каго **ні** спыта́й — ніхто **ня** ве́дае. Whomever you ask, they do not know.

NOTE. A double negation is sometimes used to express a confirmation, e.g.:

Я **ня** мог **не** сказа́ць (я павінен быў сказа́ць). I had to tell.
With both verbs **"не"** is used.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 280. а) Паўтара́йце за наста́ўнікам ці прачыта́йце ўго́лас слова́.
Запамята́йце, як яны́ пішуцца. (Гл. пра́вілa 27-26Ф, а, 1.)

1.	тэлефо́н	а́льгебра	ко́лер	2. сэнса́цыя	хэмія
	дэлега́т	геамэтрыя	фанэтыка	сэзо́н	рэспу́бліка
	буке́т	тале́рка	экспэрыме́нт	тэа́тар	кілішак
	ля́гер	шма́лец	экспэды́цыя	сэа́нс	кірма́ш

б) Перапішэце ска́зы із словамі з "2" пу́нкту.

Адкры́цьці экспэды́цыі на поўнач былі вялікай сэнса́цыяй. Сымон з ба́цькам за́ўтра е́дуць на рыбу. За́ўтра адчыне́ньне сэзону. У на́шым горадзе пабудава́лі новы тэа́тар. Фільм быў такі ціка́вы, што мы сядзе́лі два сэа́нсы. Экза́мен з хэміі ўсёй кля́се пайшоў ве́льмі добра. Скарот БНР зна́чыць Белару́ская Народная Рэспу́бліка. Зося, мы́ючы судзьдзё, пабіла кілішак. Усім дзе́цям падаба́лася пе́сьня "Ба́ба Е́ўка, дзед Тама́ш паехалі на кірма́ш".

в) Укладзе́це ска́зы, ужыва́ючы словы з пункту "1".

г) Перапішэце ска́зы, замі́ж кропак устаўля́ючы адпаве́дныя словы з пра́вага слупка́.

1. Моладзь на сходзе вы́брала новага старшыню́, засту́пніка старшыні й ска́рбніка, а ... заста́ўся той са́мы. — **рамонт**
2. ... "г" у белару́скай мове рэдка ўжыва́ецца. — **літара**
3. Уле́тку ў школе зрабілі .... — **літарату́ра**
4. ... разьвіва́ецца найле́пш у тых краёх, што ма́юць доступ да мора. — **сакрата́р**

5. Ігна́т пі́ша пра́цу на тэму лясное гаспада́ркі ў Белару́сі, цяпер ён зьбіра́е . . . . **га́ндаль**
6. На ле́кцыі белару́скае . . . кля́са разгляда́е твор Іва́на Ме́лежа "Лю́дзі на балоце". **матар'я́л**

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 281. а) Прачыта́йце ўго́лас ды запа́мятайце напіса́ньне гэтых слова́ў іншамо́ўнага паходжаньня (пра́вілa 27-26Ф 3.)

1. і [illegible] ы (пасьля зацвярдзе́лых ды зьи́чных **д, т, з, с**)

рэжы́м	канстыту́цыя	гісторыя	дырэктар	фізыка
рэжысэ́р	на́цыя	тып	дыктоўка	сыстэма
жыра́фа	паліцыя	тыра́н	універсыте́т	сымэтрыя

2. **і = і** (пасьля́ ўсіх іншых зы́чных, пасьля́ **з, с у канчатках ія, ійны** ды ў "ту́зін", "Сібір").

міні́стар	паэзія	камісія	гімназісты
капіта́л	гімна́зія	місія	ту́зін
архіў	фанта́зія	дывізійны	Сібір

б) Перапішэце ска́зы, а тады́ перакладзе́це іх у англе́льскую мову.

1. Ка́жны рэжысэ́р ста́віць п'е́су пасво́йму.
2. У Кана́дзе й Задзіно́чаных Шта́тах капіталісты́чны лад, або рэжым, а ў Саве́цкім Саю́зе — камуні́стычны. 3. У заалягі́чным па́рку мы ба́чылі жыра́фу.
4. Кана́дзкую, як і амэрыка́нскую, на́цыю ўтвары́лі лю́дзі шмат якіх этні́чных гру́паў. 5. Мой брат ціка́віцца гісторыяй. 6. Уважа́й, зза́ду е́дзе паліцыя́нт.
7. Асноўны закон дзяржа́вы заве́цца канстыту́цыяй. 8. Гімна́зіі калісь былі́ трох ты́паў: гуманісты́чнага, фізы́чна-матэматы́чнага й клясы́чнага.

в) Адкажэце пісьмова на пыта́ньні.

1. Як прозьвішча дырэктара ва́шае школы? 2. Ці вы пі́шаце дыктоўкі?
3. Ці ціка́віць вас фі́зыка? 4. Ці ёсьць у ва́шым горадзе ўнівэрсыте́т?
5. Як заве́цца міні́стар заме́жных спра́ваў? 6. Ці вы лю́біце чыта́ць ве́ршы-паэзію?
7. Ці вялі́кі архіў у ва́шай арганіза́цыі? 8. Адзін ту́зін я́йкаў, колькі гэта я́йкаў?
9. Дзе знаходзіцца Сібір? Якія яшчэ краі́ ўваходзяць у Арктыку?

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 282. а) Паўтара́йце ўголас за наста́ўнікам. Дома перапішэце ды запа́мятайце напіса́ньне гэтых словаў.

ia = ія (ыя): геній́а́льны, спэцыя́льны, ініцы́ятыва, па́ртыя
ie = іе (ые): кліе́нт, гігіе́на, аўдые́нцыя, дые́та
iu = ію (ыю): канцы́лію́м, калёквію́м, ра́дыюс, прэзы́дыюм, аква́рыюм, ната́рыюс, а́ле трыу́мф
io, калі пад націскам, = **іё (ыё)**: бі́ёляг, патрыёта, ідыёт, аксыёма
io, калі не пад націскам = **ія (ыя)**: бібліятэка, біялёгія, мэліяра́цыя, фізіялёгія, сацыялёгія, рацыяна́льны, нацыяна́льны, пэры́яд.

б) Карыста́ючыся адвольна вы́бранымі словамі з пу́нкту "а)", укладзе́це 15 ска́заў.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 283. Перапішэце ска́зы, заміж кропак устаўля́ючы адпаве́дныя словы з пра́вых слупкоў.

а)
1. Калі́ мы былі́ ў Ата́ве, мы зьве́далі будынак . . . .
2. На скрыжава́ньні ву́ліцаў паліцыя́нт . . . рух, бо папсава́ўся сьветлафор.
3. Мой ся́бра працу́е ў шпіта́льнай . . . .
4. На пісьмовым стале́ стаіць прыгожая новая . . . .
5. Ле́кар прыпіса́ў мне . . . .
6. Хлопцы гуля́юць у мя́чык на спартовым . . . .
7. Я бу́ду вывуча́ць рама́нскую . . . ды . . .

лёгіка
ля́мпа
філялёгія
лябараторыя
парля́мэнт
рэгулява́ць
пляц
акуля́ры

б)
1. Гэты журналі́сты заўсёды пі́ша ціка́выя . . . .
2. Золата й серабро - высакародныя . . . .
3. Ба́цька завёў дзяцёй на . . . .
4. Ву́чні рыхту́юць п'е́су, ужо падзялілі . . . .
5. Ён уме́е пла́ваць рознымі . . . .
6. Фільм, што мы ўчора глядзе́лі, зусім ня меў . . . .
7. У ча́се ле́тніх . . . яны́ пае́дуць у Лёндан, наве́даюць там Белару́скую Бібліятэку ды Музэй.

мэта́ль
стыль
артыку́л
карусэля
роля
фа́була
канікулы

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 284. Перапішэце пры́клады множаньня словамі. (Глядзе́це табліцу § 27-I.)

УЗОР: Двойчы пяць — дзе́сяць.

а)	2 . 5 = 10	3 . 9 = 27		б)	5 . 8 = 40	7 . 7 = 49
	2 . 9 = 18	4 . 5 = 20			5 . 7 = 35	7 . 8 = 56
	3 . 4 = 12	4 . 6 = 24			6 . 8 = 48	8 . 9 = 72
	3 . 7 = 21	5 . 5 = 25			6 . 7 = 42	9 . 9 = 81

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 285. а) Прачыта́йце ска́зы. Вы́пішце ў слупок **неазнача́льныя займе́ньнікі,** абазна́чце склон.

1. Сымон раска́зваў сваім сябром не́шта **ціка́вае.**
2. Чува́ць было, як не́хта йшоў па сходах.
3. Абы-каму́ гэтую спра́ву даручы́ць не́льга.
4. У не́ся[illegible] [illegible] галасы. Не́кага голасна **паклі́калі.**
5. Дык раскажы́ што-не́будзь **ціка́вае** пра **сваё падарожжа.**

б) Перапішэце ска́зы, дзе можна, **неазнача́льны займе́ньнік** замяня́ючы і**ншым з тым са́мым зна́чаньнем.**

УЗОР: Сымон раска́зваў сваім сябром штосьці **ціка́вае.**

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 286. Прачыта́йце ска́зы, устаўля́ючы ў вадпаве́днай форме неазнача́льныя займе́ньнікі: **не́хта, не́йкі, некаторы,** а тады запішэце ска́зы.

1. ... кліка́ў на дапамогу. 2. ... зробіць гэта. 3. ... ска́ўты сядзе́лі ка́ля вогнішча, а ... пайшлі́ да ракі. 4. Прыду́майце ... **ціка́вую** гульню́. 5. У ... ву́чняў зада́ча ня выходзіла. 6. Ён пайшоў да ....

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 287. а) Перапішэце ска́зы, вы́пішце займе́ньнікі, ды напішэце, **якія гэта займе́ньнікі.**

1. Само нішто ня прыходзіць у ру́кі.
2. За на́мі ўсьлед сіга́е, а́ле нам ні ў чым не дапамага́е (сьцень).
3. У пакоі нікога ня было.
4. Народ не сагне́ш, не пакорыш нічы́м, ніяки́м прыму́сам, ні зьдзе́кам.

5. Ён ішоў, ні аб чым ня ду́маючы, ні на вошта не зьвярта́ючы ўва́гі.
6. Ні ў кога нямá такога прыгожага са́ду, як мой дзядзю́ля ма́е.

б) Прачыта́йце ска́зы, а тады́ перапішэце, ста́вячы прыназоўнікі пе́рад **адмоўнай** часьці́нкай **"ні".**

УЗОР. 1. Учора я ў нікога ня быў.

1. Учора я ні ў кога ня быў. 2. На ме́сьце я ні зь кім ня ба́чыўся, ні аб чым не гаварыў. 3. Падарозе мы ні ў кога ня спыня́ліся. 4. Ну́дны чалаве́к, зь ім ні аб чым не пагаворыш. 5. З рыбалкі на́шыя рыбакі́ вярну́ліся ні з чым. 6. У гэтым возеры така́я студзёная вада́, як ні ў я́кім іншым.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 288. Фанэты́чнае. Наста́ўнік чыта́е ўголас па ска́зе з займе́ньнікам **"увесь"**, а ву́чні паўтара́юць, толькі займе́ньнік **"уве́сь"** адпаве́дна заме́ньваюць адмоўным займе́ньнікам. (**ніхто** або **нішто**)

УЗОР. Наста́ўнік: Ся́бра **ўсё** забы́ўся. **Ву́чань:** Ся́бра **нічога** не забы́ўся.

1. Хлапцы́ ўсё расказа́лі.
2. Сусе́д усіх тут зна́е.
3. Дзед Мароз усім даў падару́нкі.
4. Сёньня для ўсіх сьвя́та. (нямá сьвя́та)
5. Усе́ спазьні́ліся.
6. У яго ўва ўсім пара́дак. (ні ў чым нямá . . .).

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 289. а) Ад да́дзеных дзеясловаў утварэце дзеясловы **ўмоўнага ла́ду** адзіночнага ды множнага ліку.

УЗОР. вучы́ў — вучы́ў-бы, вучы́ла-б, вучы́лі-б.

Гаварыў, нёс, сьпява́ў, напіса́ла, рысава́ла, схадзіла, прыйшла́.

б) Ад да́дзеных неазнача́льнікаў утварэце дзеясловы ўсіх трох ладоў.

УЗОР. Напіса́ць - напішаш, напішы́, напіса́ў-бы.

Прынесьці, зрабіць, прачыта́ць, мы́цца, здаганя́ць, закрана́ць, будава́ць, пыта́цца, ве́даць.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 290. Навучыцца чыта́ць верш зь інтана́цыяй, а тады́ напа́мяць.

КАБ Я КНЯ́ЗЕМ БЫЎ . . .

Каб я кня́зем быў ўлада́рным
Гэтых ніў і хат, —
Быў-бы кня́зем гаспада́рным,
Вёў-бы добры лад;
На паса́дным ме́сцы-б се́лі
Пра́ва і закон.
Пра́ўду ве́чную ўсе-б ме́лі —
Вечавы́ свої
Не цягну́ў-бы
Кры́ўдай
Кожны сам

Каб я сон
Пла́ваў над зямлёй,
Быў-бы сонейкам вячы́стым
Ле́там і зімой.
Не лажы́ўся-б на разлогі
Непрагля́дны цень,
Асьвятля́ў-бы ўсе дарогі
Ў ночы і у дзень.

Гадава́ў-бы ў ве́чным цьве́це
Поле і лугі,
Распаліў-бы ўсе на сьве́це
Пу́ты-ланцугі.
Каб я пту́шкай быў крыла́тай,
Пець і лётаць мог,
Быў-бы пту́шкай не заклята́й,
Па расе́ ня сох,
Груганом-бы я ня кру́мкаў,
Не наводзіў сьлёз,
А на кры́льлях на́шу ду́мку
Да Бога-б панёс.
Кры́ўду — ве́дзьму на́шых ме́жаў
Беднату́ і цьму,
Ўсё-б па пра́ўдзе, як нале́жа,
Вы́лічыў яму́ . . .

Я́нка Купа́ла

Слоўнік (Vocabulary)

князь, -я (m.) prince
улада́рны, -ая, -ае sovereign
гаспада́рны, -ая, -ае thrifty
лад, -у (m.) order, concord
паса́днае ме́сца throne
пра́ва, -а (n.) right
закон, -у (m.) law
ве́чны, -ая, -ае eternal, everlasting
ве́ча, -а (n.) vyecha (popular assembly)
вечавы́ звон bell announcing the vyecha
падда́ны, -ага (m.) subject
кры́ўда, -ы (f.) offence, injury, wrong
малаці́ць (II); малачу́, малоціш, -яць to thrash
цэп, -а (m.) flail
вячы́сты, -ая, -ае everlasting
разлог, -у (m.) wide space of land
непрагля́дны цень impenetrable darkness
гадава́ць (I); гаду́ю, -еш to grow, to keep up
ланцу́г, -а́ (m.) chain
пу́ты-ланцугі́ (pl.) chains, fetters
крыла́ты, -ая, -ае winged
заклята́ны, -ая, -ае cursed
груга́н, -а́ (m.) raven
кру́мкаць (I); кру́мкае, -юць to croak
ве́дзьма, -ы (f.) witch
беднота́, -ы́ (f.) poverty
цьма, -ы (f.) darkness; ignorance
як нале́жа as it is due to
вы́лічыць (II) (pf. of **вылічы́ць, I**) fut. **вы́лічу, -ыш, -ыць** to name, to tell all, to list

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 291. а) Прачыта́йце па ска́зе ўголас ды азна́чце **ўмову** (рэа́льная ці нерэа́льная) ды час.

1. Калі́ ён гэта бу́дзе ве́даць, ён не прада́сьць дому.
2. Яны́ не працава́лі-б міну́лага ле́та, калі́-б я не памог ім даста́ць пра́цу.
3. Мы вас сустрэнем на ста́нцыі, калі́ вы ска́жаце нам, калі́ вы прые́дзеце.
4. Яны́ ўчора пайшлі́-б на канцэрт, калі́-б можна было даста́ць таньне́йшыя біле́ты.
5. Калі́-б у суботу было добрае надвор'е, дык мы пае́халі-б на Ты́сячу Абтокаў.
6. Калі́ за́ўтра бу́дзе дождж, дык я не пае́ду на ме́ста.
7. Калі́-б Я́нка Купа́ла ня любіў гэтак Белару́сь, не цярпе́ў гэтак за паку́ты белару́скага народу, ягоная паэзія ня была́-б така́я магу́тная.

б) Перапішэце па ска́зе, ды **перакладзе́це** іх у **анге́льскую мову.**

1. Яны́ ня чыта́лі-б гэтае кнігі. 2. Я быў-бы ве́льмі ра́ды іх ба́чыць. 3. Ты-б больш вучы́лася. 4. Было-б менш не́навісьці на сьве́це, і жыцьцё было-б куды́ лягчэйшае. 5. Мы-б вам піса́лі, а́ле ў нас ня было ва́шага а́дрысу. 6. Калі́-б яна́ ве́дала, што рабіць! (I wish). 7. Мець-бы волю — здабу́дзем долю. 8. Не сядзе́лі-б вы так шмат пры тэлевізары!

в) Прачыта́йце ска́зы. Перапішэце іх, **галоўныя** ска́зы ста́вячы на **пе́ршым** ме́сцы. (Глядзе́це пра́вілa 27-V, 2b, NOTE 2.)

1. Калі́ даста́нем біле́ты, дык мы пойдзем за́ўтра на футбольны мэч. 2. Калі́-б далі ямў добрую цану́, дык ён прада́ў-бы свой дом. 3. Калі́-б ты не напіса́ў, дык мы нічога ня ве́далі-б, што ты быў у Пары́жы. 4. Каб ён менш гаварыў, дык лю́дзі больш яго паважа́лі-б. 5. Каб вы прыйшлі́ крыху́ пазьне́й, дык нас ужо ня было-б дома. 6. Каб мы ме́лі ваш а́дрыс, дык мы вас паве́дамілі-б.

г) Запісаныя ска́зы з пу́нкту "в" перакладзе́це ў **анге́льскую** мову.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 292. а) Перапішэце ска́зы, пішучы часьцінкі **"не(ня), ні"**, дзе трэба, зьлі́та, а дзе — асобна.

1. На зямлі́ ляжа́лі **(не, ня)** выра́зныя сьце́ні. 2. **(Ні)** дзе **(не, ня)** было так шмат баравікоў, як у мікуліцкіх баравінах (К-с). 3. Пазна́ць **(не, ня)** тру́дна чалаве́ка па ўсіх паводзінах яго — ці ён гульта́й, ці **(не, ня)** дарэка, ці **(не, ня)** стае́ ямў чаго. (К-с). 4. Не́йкая ночная пту́шка **(не, ня)** магла́ супакоіцца. 5. Калі́ мы вы́йшлі

на (**не, ня**) вялікую сьцéжку, на ёй (**ні**) кога (**не, ня**) было. 6. Сымон сядзéў (**не, ня**) рухома, (**не, ня**) зводзячы вачэй з агню́. 7. З усіх бакоў (**ні**) чога (**не, ня**) было відáць, апрачá сьнéгу. 8. (**Не, ня**) прачытáныя брáтам газэты ляжáлі на сталé.

б) Прачытáйце перш скáзы, а тады́ перапішэце, устаўля́ючы адпавéдна **"не(ня)"** ці **"ні"**.

1. Малады́ й асьцярожны за рулём шафёр сядзíць, і каго (**не, ні**) стрэне, кáжны азірнéцца, паглядзíць. 2. А дождж усё мацнéў. За ягонай густой заслонай (**не, ня, ні**) было відáць ужо (**не, ня, ні**) сасоньніку, (**не, ня, ні**) дубоў кáля рэчкі, (**не, ня, ні**) вёскі. 3. Куды́ (**не, ня, ні**) заходзíліся калядні́кі, усю́ды іх шчы́ра прымáлі. 4. Каго мы (**не, ня, ні**) пыта́лі, ніхто (**не, ня, ні**) чуў пра такýю вёску. 5. У каго мы толькі (**не, ня, ні**) былі, што мы толькі (**не, ня, ні**) чýлі. 6. Ён (**не,ня,ні**) мог (**не, ня, ні**) прамóвіць ані́ слова. 7. Нéльга было (**не, ня, ні**) сказáць.

КРУГ 28

СІНЯЯ-СІНЯЯ...

(Паводля апавяда́ньня "Сіняя-Сіняя" Ўладзімера Караткéвіча)

I

— Адхалíб, піць.

— Пачака́й Джаміля, — сказа́ў ён шорхлым голасам. — Пацярпí. Дам, калí бу́дзе зусім дрэнна.

Ён адчу́ў роспач. Нічога ня было. Быў толькі бордж, ушчэнт разбу́раны два гады́ таму́. Была́ распа́леная патэльня, дзяўчы́нка й ён.

І тут, пад мура́мі борджа, ён павінен быў скончыць сваé днí. Пятрок Ясюкéвіч. Былы́ Белару́с, былы́ гімназісты Віленскае гімна́зіі, былы́ студэнт, былы́ паўста́нец, былы́ вандроўнік, былы́ ўдзéльнік ґеаґрафічнае экспэды́цыі Каміля дэ ля Брыса́ка.

Былы́ чалавéк.

Бо тут ляжа́ў жывы́ труп. Труп без радзімы, бязь éжы, без вады́...

Павінен быў падыйсьцí караван. Можа за́ўтра, а можа й пасьлязáўтра. Але яшчэ два днí ён ня вы́трывае. Яму́ пя́цьдзесят два гады́. За гэтыя два днí ён пастарэў на пятнáццаць. Так ýва ўся́кім ра́зе, яму́ здава́лася. Вочы былí каламу́тныя й чырвоныя ад неймавéрнай сьпёкі й сьляпу́чага сьвятла́. А калíсьцí былí чы́стыя, як раса́ на валошках.

"У гімна́зіі дзяўчы́нкай дражнілí", — успамінáў ён з абыя́кавай усьмéшкай. Што-б яны́ цяпéр сказа́лí, былы́я сябры́?

Зьбітыя чаравікі, падзёртыя нагавіцы, бéлая на лапáтках і пад пáхамі кашýля, запа́леныя сонцам ру́кі й гру́дзі, бяля́вая па́расьць на шчоках, збле́таныя ад пы́лу

кох. Загі́нуў шэйх ізь сям'ёю і ўсе ўдзе́льнікі экспэды́цыі. Загі́нулі ад дзі́даў і сма́гі... Учора загі́нуў Брыса́к. Напэ́ўна, не дажы́ву да ра́ніцы. Малю́ як аб апошняй літасьці: дзіця́, ма́быць, пагоняць у ра́бства, і, напэ́ўна, на паўдня́. Вы́купце! Мая́ пэньсія за год — у Гадамэсе. Малю́ вас!.. Гэта апошні мой за́піс".

Ён загарну́ў кні́жку ў бру́дную насоўку, прысы́паў пяском ля са́мае сьце́нкі, а на сьце́нцы надра́паў во́йстрым ка́менем крыж. Калі́ бу́дуць агляда́ць ме́сца апошняе бі́твы — здагада́юцца, ма́быць, што калі́ крыж, то пад ім павінна быць не́шта паха-ва́на. Та́ргві не здагада́юцца: яны́ не хава́юць пад кры́жам.

— Што ты робіш, адхалі́б?

— Не зварача́й ува́гі, — сказа́ў ён паара́бску. — І нікому не кажы́ пра гэта. Тут наш парату́нак. Што-б ні зда́рылася, тут наш парату́нак.

— Амуле́т?

— Амуле́т.

Дзяўчы́нка [illegible] до́ўгіх загну́тых ве́ек вільготна й су́мна, чор-нымі дзівоснымі вачы́ма.

"Тыповы бэрбэрскі твар", — паду́маў Пятрок...

Дзіўна, што адны́ бэрбэры рэжуць другіх.

Урэшце, што дзіўнога. Хіба́ на ягонай радзі́ме ня было таго са́мага? Што рабі́лі з мужыка́мі? А што з [illegible]? Загі́нуў Мацке́віч, загі́нуў Пацябня́, Кастусь Калі-ноўскага пове́сілі, Заторскі [illegible] невядома дзе й можа загі́нуў...

Паршы́вая зямля́! Каты́ й рабы́!

— У цябе́ дрэнныя ду́мкі, адхалі́б? — дзяўчы́нка смакта́ла кара́лі.

— Сяда́й да му́ру, нямы́тыя вочкі, —страшны́м агрубе́лым голасам сказа́ў ён, — тут яшчэ ла́пічак це́ню.

— Чаму́ нямы́тыя?

— Дык чорныя-ж.

У яго, Петрака́, ніколі ня было ні жонкі, ні дзяцей. Лёс судзі́ў яму́ адзін дзень пабы́ць ба́цькам.

Сма́га зрабі́лася нясьце́рпнай. Ад усяўла́днага сьвятла́, ад зьнішча́льнае гарачыні распу́хла й ста́ла бронзавай ску́ра. Засьвярбе́лі сьпіна́, ка́рак, ру́кі, бакі́. Ён ве́даў, гэта вы́сыпала на іх сьпякотная восыпка...

— Хочаш піць, маленькая?

Узьняла́ даўгія загну́тыя ве́і.

— Хачу́, адхалі́б.

Глыта́е, закі́нуўшы галаву́. Ён прымуша́е сябе́ глядзе́ць убок.

— А ты, адхалі́б?

— Не хачу́.

— А што бу́дуць піць ба́цька з ма́ці, калі́ прыйду́ць?

— Я-ж табе́ сказа́ў — адпачну́ць і прынясу́ць вады́.

— А та́ргві?

Ба́цька прывядзе́ людзе́й... Ты сядзь у мой цень.

Дзяўчы́нка перапаўзла́ ў цень ад ягонага вялізнага це́ла й прыціхла.

II.

Туарэгаў ня трэба было вінава́ціць...

Яны́ вольны народ, а іх гоняць у ярмо, каб былі, як Нэгры ў Старой Біскры, як апаты́чныя й вя́лыя ма́ўры Сэты́фу й Туні́су, якіх гэтулькі ганя́лі, што ім ужо ўсё адно.

"Як лю́дзям на маёй радзі́ме..."

Ах, як тады́ зьзяў Дняпро, калі́ яго ама́ль няпрытомнага, выносілі з кола ворагаў адпу́шчаныя камандзе́рам палонныя. Звыча́йныя хлопцы аднекуль...

Усё адно, така́я сма́га... Застрэліцца-б... Не́льга... Побач гэты камячок...

Адзі́н дзень трэба пратрыма́цца. А ра́птам здарыцца дзі́ва?..

Іх прыці́снулі тады́ да Доўгае Кру́чы. І гарма́ты раўлі́, вырыва́ючы мя́са, вырыва́ючы людзе́й, се́ючы змрок. А лю́дзі сы́палі́ся із стромы, па́далі ў ваду́ Дняпра́, у сі́ня-зялёнае прадоньне. Вада́ не́сла тру́пы й жывы́х. А гарма́ты раўлі́...

Не, ён ня пойдзе адсю́ль. Таму́, што ён чалаве́к без радзі́мы.

— Адхаліб, — нясьме́ла папыта́лася дзяўчы́нка, – ты адку́ль?

Таню́ткія, як пру́цікі, бронзава-чырвоныя ад сонца ру́кі сьці́снулі пля́шку з рэштай вады́.

— Ты ле́пей папі́, — пара́іў ён.

— Дзя́куй, адхаліб, — сказа́ла дзяўчы́нка, праглыну́ўшы ўсё, што заставалася на дне. — Ты раскажы́ мне, адку́ль ты. Дзе ляжы́ць твая́ зямля́? Мне трохі су́мна.

— Ды што табе́ сказа́ць? Мая́ зямля́ далёка адсю́ль. Яна́ няпрыгожая й ве́льмі бе́дная...

— А яка́я яна́, твая́ зямля́?

— Я-ж кажу́: каме́ньне, каме́нчыкі, камяні́скі, камяні́. І яшчэ балоты. Вялі́кія балоты.

— І вада́ горкая, як у Та́йбэ?

— Не, вада́ салодкая. Та́йбэ мале́нькае, а на́шы балоты ця́гнуцца ледзь ня сто гама́даў за на́мі.

— О-о! — прыкла́ла яна́ да шчокаў далонькі. — Як-жа вам пашанцава́ла! І колькі-ж гэта вярблю́даў можна зь іх напаіць?!

— Гм, ты́сячы ты́сячаў, і яны́ ніколі ня вы́п'юць.

Яна́ глядзе́ла на яго недаве́рліва, і ён папра́віўся:

— Ну, можа і менш.

— Якія вы шчасьлівыя. Падýмаць толькі, колькі-ж гэта балотаў! І лю́дзі зь іх п'юць?

— Не, лю́дзі гэтым грэбуюць. Лю́дзі п'юць з крыніцаў.

— І доўга трэба йсьці ад аднэй да другой?

— Найбольш гадзіну. Ча́сам толькі не́калькі крокаў.

— А між імі пясок?

— Не, між імі трава́... Як у аа́зісе ля са́мае сту́дні.

— І зна́чыцца, уся́ твая́ зямля́, адхаліб, зялёная?

Яму́ не хаце́лася гавары́ць пра так зва́ную "сваю́ зямлю́", але так дзяўчы́нка ле́пей забыва́лася пра сма́гу І таму ён гаварыў.

— Зялёная. А калі з узгоркаў, то на́вет сіняя.

— Сіняя? — захоплена пыта́лася яна́. – Сіняя-сіняя?..

— Сіняя-сіняя, — сказаў ён.

Не каза́ць-жа дзяўчы́нцы, што гэтую сінюю зямлю́ залілі крывёю, вы́палілі. Што яна́ чырвоная й чорная.

— А вярблю́ды? — пыта́лася яна́.

— У нас заміж іх коні.

— А фінікі?

— У нас заміж іх я́блыкі.

— Гэта ле́пей, — сказа́ла яна́. — Ад фінікаў хочацца піць. А я́блыкі сакаўныя.

Ясюке́віч даўно ўжо, зь вялікай трывогай, чуў не́дзе далёка, а потым бліжэй і бліжэй не́йкія дзіўны́я гу́кі, сьпяву́чыя.

Што гэта было?

І ра́птам ён із жа́хам, ад якога ўпа́ла сэрца, зразуме́ў. Сьпява́лі пяскі. Сьпява́ла сваю́ пе́сьню, лятучы на кры́лах пяшча́нае навальніцы, сьмерць.

Закуры́лася верхаві́на дзю́ны. А потым і іншыя...

"Сьмерць, — падýмаў ён і не адчýў ніякага болю. — Хутчэй-бы!" Ён зірнýў на дзяўчы́нку й паба́чыў чорнае вока.

— Сіняя-сіняя? — з ра́дасным недаве́рам папыта́лася яна́.

— Сіняя-сіняя...

— І балоты сінія? — папыта́лася дзяўчынка.

— І балоты сінія. Захýтай галаву́. — Яна́ захýтала.

— І вада́ сіняя?

— І вада́.

Слоўнік (Vocabulary)

шорхлы, -ая, -ае hoarse
пацярпе́ць (II) (pf.) fut. **пацярплю́, -пі́ш, -яць** to be patient
роспач, -ы (f.) despair
бордж, -у (m.) an area in the desert enclosed by a stonewall containing a spring and shelter for men and camels
паві́нен (паві́нна) one ought to...
былы́, -а́я, -ое former, past
труп, -а (m.) corpse
караван, -у (m.) caravan
у́ва ўся́кім ра́зе in any case
каламу́тны, -ая, -ае dull
дражні́ць (II); дражню́, -і́ш, -яць to name, to tease
па́расьць, -і (f.) hair, beard
пад па́хамі under arms
зблы́таныя валасы́ entangled hair
набрыня́лыя павёкі swollen eyelids
запісна́я кні́жка (f.) note book
а́ркуш, -у (m.) sheet, leaf
туарэгі (pl.) Arab tribe
шэйх, -а (m.) sheik(h)
дажы́ць (I) (pf.) fut. **дажыву́, -ёш, -у́ць** to survive
ра́бства, -а (n.) slavery
вёйка, -і (f.) eyelash
мужы́к, -а (m.) peasant
дзівосны, -ая, -ае wonderful, lovely
смакта́ць (I); смакчу́, смокчаш, -уць to suck
агрубе́лы, -ая, -ае coarse, hoarse
ля́пі́чак, ля́пі́чку (m) little patch
сма́га, -і (f.) thirst
нясьцёрпны, -ая, -ае unbearable, intolerable
зьні́шча́льны, -ая, -ае destroying
высыпала восыпка a rash broke out
та́ргві "Tuarehi" in the Arab language

II

вя́лы, -ая, -ае inert, dull, sluggish
пратрыма́цца (I); пратрыма́юся, -ешся, -юцца to hold out, to stand
сы́пацца (I); сы́пецца, -юцца to fall, to pour
прадоньне, -я (n.) abyss, gulf
камяні́ска, -а (n.) huge stone
прыкла́сьці (I) (pf.) fut. **прыкладу́, -дзе́ш, -у́ць** to put, to hold to
недаве́рліва (adv.) distrustfully, with distrust
грэбаваць (I); грэбую, -еш, -юць to abhor, to loathe
сту́дня, -і (f.) well
узгорак, узгорку (m.) small hill
фі́нік, -а (m.) date
сакаўны́, -а́я, -ое juicy
трывога, -і (f.) uneasiness
жах, -у (m.) horror
навальні́ца, -ы (f.) storm
дзю́на, -ы (f.) dune
верхаві́на, -ы (f.) top, peak

28 — I TRANSITIVE AND INTRANSITIVE VERBS ПЕРАХОДНЫЯ И НЕПЕРАХОДНЫЯ ДЗЕЯСЛОВЫ

Дзеясловы падзяляюцца на **пераходныя й непераходныя.**

1. **Пераходныя** дзеясловы гэта тыя, што абазначаюць дзеяньне, якое беспасярэдня пераходзіць на які-небудзь прадмет (асобу ці рэч). Назоўнік, які абазначае назоў гэтага прадмету, стаіць у **вінавальным** склоне **без прыназоўніка,** прыкл.:

Янка сустрака́е (каго?) ма́му.
Майстры́ будуюць (што?) дом.

УВА́ГА. Пасьля пераходных дзеясловаў назоўнік **заміж у вінавальным** можа стаяць і ў **родным** склоне:

а) **калі дзеяньне абыймае толькі частку прадмету,** прыкл.:
прынёс вады́; купіў хлеба, цукру; вы́піў малака́;
б) калі дзеяслоў ужываецца з адмоўем **не,** прыкл.:
ня скончыў работы, ня ма́ю ча́су.

2. У́се іншыя дзеясловы - **непераходныя,** прыкл.: іду́, сплю, хаджу́, сьмяю́ся . . . Нельга сказаць "іду́ каго, ці што."

**
*

A verb that carries [illegible] into an object is called a **transitive verb, e.g.:**

Янка **сустрака́е** ма́му.	**John is meeting his mother.**
Ён зрабіў човен.	**He built a boat.**

A verb that is [illegible] carry the action over is called an **intransitive verb, e.g.:**

Хлопец шпа́рка **бег.**	**The boy ran quickly.**

28 — II THE ACTIVE AND PASSIVE VOICE OF VERBS ДЗЕ́ЙНЫ (НЕЗАЛЕ́ЖНЫ) І ЗАЛЕ́ЖНЫ СТАН ДЗЕЯСЛОВАЎ

Формы **розных станаў** могуць прымаць **толькі пераходныя** дзеясловы.

I. **Дзе́йны або незале́жны** стан паказвае, што **прадмет** (асоба ці рэч) **сам выконвае дзе́яньне** й ягонае дзеяньне пераходзіць на **іншы** прадмет, назоў якога выражаецца **вінавальным** склонам без прыназоўніка, прыкл.:

Майстры́ **буду́юць** дом.
Пісьме́ньнік **напіса́ў** кні́гу.

II. а) **Залежны стан** паказвае, што **прадмет падлягае** дзеяньню **іншага прадмету.** Назоў гэтага іншага прадмету выражаецца **творным** склонам, прыкл.:

Дом **буду́ецца** майстра́мі.
Кні́га **напісаная** пісьме́ньнікам.

б) Два способы выражэньня залежнага стану:

1. **3-яй асобай зваротнага** дзеяслова, утворанага ад **пераходнага** дзеяслова даданьнем часьцінкі **ся (-ца, -цца)** з залежным значаньнем (гэта значыць, калі дзейнік падпадае **чужому** дзеяньню), прыкл.:

Цяп. час: Дом **буду́ецца** майстра́мі. Кні́га пішацца пісьме́ньнікам.
Прошлы час: Дом **будава́ўся** майстра́мі.
Бу́дучы час: Дом **бу́дзе будава́цца** майстра́мі.

2. **Дзеяпрыметнікам залежнага стану** (гл. правіла 28-III, I, 2 в) зь дзеясловам **"быць"** у вадпаведнай форме, прыкл.:

Цяперашні час: Дом **пабудава́ны** майстра́мі.
Кні́га **напі́саная** пісьме́ньнікам.
Прошлы час: Кні́га **была́ напі́саная** пісьме́ньнікам.
Бу́дучы час: Кні́га **бу́дзе напі́саная** пісьме́ньнікам.

УВА́ГА. У беларускай мове ёсьць яшчэ трэйці стан — **зваротна-сярэдні.** Гэтак завецца **зваротная форма** ад **пераходных дзеясловаў,** якая паказвае:

1. Што дзеяньне ськіраванае **не на іншы** прадмет, а на **самога выканальніка** дзеяньня, прыкл.:

Хлопчык **памы́ўся** й **апрану́ўся.**

2. Што дзейнік падлягае дзеяньню, **але ня чужому а свайму** собскаму, як у **ўзаемна-зваротных** дзеясловах, прыкл.:

Сябры **абняліся** й **пацалава́ліся.**
Дзе́ці **падзяліліся** кве́ткамі.

3. Або што дзеяньне замыкаецца ў сам**ы́**м выканальніку, прыкл.:

Канча́лася ле́та.

в) **Залежнага стану нельга** тварыць ад гэткіх дзеясловаў:

1. Ад усіх **непераходных** дзеясловаў, прыкл.: **хадзіць, ляжа́ць, спаць.**
2. Ад **зваротных** дзеясловаў, утвораных ад **непераходных** дзеясловаў, прыкл.: **сіне́цца, зелане́цца.**
3. Ад **зваротных** дзеясловаў, якія й бываюць **толькі ў зваротнай** форме, прыкл.: **сьмяя́цца, сьпяша́цца, стара́цца, спадзява́цца.**
4. Ад **зваротных безасабовых** дзеясловаў, утвораных ад асабовых дзеясловаў, прыкл.: **падаба́ецца, хочацца, хаце́лася, даводзілася.**

***

All **transitive** verbs can take the form of the **active voice** or the **passive voice.**

I. The **active** voice of the verb shows that the **person** or **object** is **performing** an **action** which is **carried** over **into an object** expressed in the **accusative** case **without a preposition**, e.g.:

Майстры **будую́ць** дом. — Skilled workmen are building the house.
Пісьме́ньнік **напіса́ў** кні́гу. — The writer wrote a book.

II. a) The **passive** voice of the verb shows that the subject does not perform an action, but is itself subjected to the action of another person or object which must be expressed in the instrumental case, e.g.:

Дом **будуецца** майстрáмі.	The house is being built by skilled workmen.
Дамы **будуюцца** майстрáмі.	The houses are being built by skilled workmen.
Кніга **напісаная** пісьмéньнікам.	The book is written by a writer.

b) The passive voice is expressed as follows:

1. Either by the third person (singular or plural) of a reflexive verb formed from a transitive verb, e.g.:

Pres. Дом будуецца майстрáмі.	The house is being built by skilled workmen.
Past Дом будаваўся майстрáмі.	The house was being built by skilled workmen.
Fut. Дом будзе будавáцца майстрáмі.	The house will be built by skilled workmen.

2. Or by the past participle passive (of either aspect) with the verb **"быць"** (to be expressed or implied, e.g.:

Pres. Кніга напісаная пісьмéньнікам.	The book (is) written by a writer.
Past Кніга была напісаная пісьмéньнікам.	The book was written by a writer.
Fut. Кніга будзе напісаная пісьмéньнікам.	The book will be written by a writer.

* The present tense of **"быць"** — **"ёсьць"** is understood.

NOTE. In the Byelorussian language, besides the active and passive voices, there is a third voice — the **reflexive-medium** voice. This voice is **expressed** by a **reflexive** verb which is formed **from the transitive** verb and denotes action "reflexed" and concentrated on the subject itself, e.g.:

1. Хлопец **памыўся** й **апрануўся**.	The boy washed and dressed himself.
2. Сябры **абняліся** й **пацалаваліся**.	The friends embraced and kissed each other.
3. **Канчáлася** лéта.	Summer was ending.

c) Note the verbs which **never take** the form of any voices:

1. all **intransitive** verbs such as: **хадзíць, ляжáць, спаць...**
2. the **reflexive** verbs formed from **intransitive** verbs, e.g.: **сінéцца, зелянéцца...**
3. the **reflexive** verbs which have **only** the **reflexive** form, e.g.: **сьмяяцца, сьпяшáцца, старáцца, спадзявáцца...**
4. the **reflexive impersonal** verbs formed from personal verbs, e.g.: **падабáецца, хацéлася, даводзілася...**

28 — III PARTICIPLES / ДЗЕЯПРЫМЕ́ТНІКІ

Дзеяпрыметнікі — гэта **прыметнікі, утвораныя ад дзеясловаў.** Ад звычайных прыметнікаў яны розьняцца тым, што **апрача асаблівасьцяў прыметніка** (зьмяняюцца ў родах, ліках і склонах) **маюць яшчэ і асаблівасьці дзеяслова** — паказваюць на час, трыванье й стан. Прыкл.:

	ДЗЕ́ЙНЫ СТАН	ЗАЛЕ́ЖНЫ СТАН
Цяп. час:	міна́**ючы** (які?) год	———
	ідзу́**чы** год	
	хвалю́**ючая** ве́стка	
Пр. час:	мінў**лы** год	Нез. тр.: абміна́**ны** горад
	прошл**ы** час	пі́са**ны** ліст
		Зак. тр.: абмі́**нуты** горад
		напі́са**ны** ліст

УВА́ГА. Дзеяпрыметнікі, як і дзеясловы, могуць мець пры сабе ў сказе залежныя словы. Прыкл.: школа, пабудава́ная на ўзгорку, так як: будава́ць на ўзгорку

Дзеяпрыметнік разам з залежнымі ад яго словамі завецца **дзеяпрыме́тным словазлучэньнем.**

Калі **дзеяпрыметнае** словазлучэньне стаіць **пасьля назоўніка,** да якога яно датычыць, дык аддзяляецца коскамі, прыкл.:

Школа, пабудава́ная на ўзгорку, відаць здалёку, **але** —
Пабудава́ная на ўзгорку школа відаць здалёку.

I. Утварэньне **дзеяпрыме́тнікаў.**

1. **У цяперашнім часе** дзеяпрыметнікі ў беларускай мове бываюць **толькі дзейнага** стану.

Дзеяпрыметнікі гэтыя творацца **ад 3-яй асобы мн. ліку цяперашняга часу** дзеяслова заменаю канцавога **"ць"** адпаведна да трох родаў на **-чы, -чая** або **-чае,** прыкл.: ідў**ць** — ідў**чы, -чая, -чае;** пяю́**ць** — пяю́**чы, -ая, -ае.**

Дзеяпрыметнікі цяперашняга часу ўжыва́юцца **рэдка,** бо **толькі** як азначэньні **без залежных словаў,** прыкл.:

ідў**чы** (бягў**чы**) год, хвалю́**ючая ве́стка**, але ня можна сказаць: "ідў**чы** за гэтым", толькі — "які (што) йдзе за гэтым".

2. У **прошлым часе** дзеяпрыметнікі бываюць **дзейнага** й **залежнага** стану.

а) Дзеяпрыметнікі **дзейнага** стану творацца ад **неазначальнай формы** дзеясловаў **закончанага** трыванья заменаю канцавога **-ць** на **-л-** ды даданьнем адпаведна прыметнікавых родавых канчаткаў, прыкл.:

мінў**ць** — мінў**лы**, мінў**лая**, мінў**лае**; адубе́**ць** — адубе́**лы**;
зазелянне́**ць** — зазелянне́**лы**; зьбялне́**лы**, шчарне́**лы**.

Гэтая форма **таксама рэдкая,** ня ўсе дзеясловы яе маюць.

б) **Найбольш ужываныя** ў беларускай мове дзеяпрыметнікі **прошлага** часу **залежнага** стану. Творацца яны **ад неазначальнае** формы ўсіх **пераходных дзеясловаў** пры дапамозе суфіксу **"-н-"*** або **"-т-"** даданага заміж канцавога **-ць** ды пры дапамозе прыметнікавых родавых канчаткаў, прыкл.:

чыта́ць	—	чыта́ны, -ая, -ае;	**мыць**	—	мы́ты (памы́ты)
купля́ць	—	купля́ны, -ая, -ае;	**біць**	—	бі́ты, -ая, -ае
купі́ць	—	ку́плены, -ая, -ае;	**шыць**	—	шы́ты, -ая, -ае

* Няма правіла, калі ўжываецца суфікс **"-н-"**, а калі **"-т-"**, а часам магчымыя паралельныя й раўнапраўныя формы з **"-н-"**, і **"-т-"**, як прыкл.: замкнёны й за́мкнуты.

в) Дзеяпрыметнікі [illegible] з адпаведнай формай дзеяслова **"быць" выражаецца залежны стан** дзеясловаў, прыкл.:

Кніга была́ [illegible] нікім не **прачы́таная** да канца́ (Гл. §28-II, IIб,2).

[illegible]. Скланеньне **дзеяпрыме́тнікаў.**

Дзеяпры[illegible] як і прыметнікі, прыкл.:

Бягу́чы [illegible] бягу́чага году, у бягу́чым годзе.
Прачы́таная [illegible] прачы́таная кнігі, прачы́танай кнізе,
прачы́таную [illegible] прачы́танай кнігай, у прачы́таных кнігах.

***

Participles are verbal adjectives, varying in gender, and declinable; they can qualify any noun in a sentence.

Unlike normal adjectives, they also show time, aspect, and voice.

a. Formation.

1. There is only **one present** participle—the **active.**
The **present active participle** is formed from the **3rd person plural** of the **present** tense of the verb by substituting **-чы (-чая, -чае)** for the final **-ць, e.g.:**

ідýць — ідýчы (ідýчая, ідýчае)	[who (what, which) is] going
бягýць — бягýчы (бягýчая, бягýчае)	(who is) running
хвалю́ць — хвалю́чы, **-чая, -чае**	(which is) exciting

This participle is rarely used and only when it stands without other descriptive words, e.g.:

бягýчы год	the present year
хвалю́ючая навíна	the exciting news

but: навíна, якáя ўсіх хвалю́е — **news which is exciting to everybody.**

When descriptive words are present, such as "усіх" in this case, instead of the participle, the relative pronoun "які/што" with the verb in the present or past tense must be used.

2. The **past** participles have two forms—the **active** and the **passive.**

I. The past **active** participle, also not often used, is formed from the **infinitive** of the verb by substituting **-л-** for the final **-ць** and adding the adjectival endings. Thus:

мінýць (to pass) — мінýлы, мінýлая, мінýлае
пачарнéць (to become black) — пачарнéлы, -ая, -ае, e.g.:
мінýлы год (last year); пачарнéлыя лісты́ (darkened leaves)

II. a') The **past** participle **passive** is characterized by either an "-н-" or "-т-" before the adjectival ending. The suffix "-н-" is the more common, but there are no absolute rules as to when "-т-" is used, e.g.:

чытáць - чытáны, чытáная, чытáнае	read
купля́ць (imperf.) — купля́ны, -ая, -ае купíць (pf.) — кýплены, -ая, -ае	bought
зрабíць — зроблены, -ая, -ае	made
мыць — мы́ты, мы́тая, мы́тае	washed
but: шыць — шы́ты, шы́тая, шы́тае	sewn/sewed
бíць — бíты, бíтая, бíтае	beaten

This participle is formed from transitive verbs of either aspect, though perfective forms are more common.

b') The **past passive** participle is used with the verb "быць" (=to be), to express the passive voice. (See § 28-II, II b, 2.)

b. **Declension.**

All participles are declined as hard adjectives, e.g.:

1. The **Present Active** Participle

	SINGULAR			PLURAL
Nom.	ідýчы	ідýчая	ідýчае	ідýчыя
Gen.	ідýчага	ідýчае	ідýчага	ідýчых
Dat.	ідýчаму	ідýчай	ідýчаму	ідýчым
Acc.	ідýчы or ідýчага	ідýчую	ідýчае	ідýчыя (ідýчых)
	. . . . .	. . . . .		. . . . .

2. The **Past Passive** Participle

Nom.	надрукава́ны	надрукава́ная	надрукава́нае	надрукава́ныя
Gen.	надрукава́нага	надрукава́нае	надрукава́нага	надрукава́ных
. . . . .	. . . . .	. . . . .	. . . . .	. . . . .
Loc.	у надрукава́ным	у надрукава́най	у надрукава́ным	у надрукава́ных

NOTE. The **participle used with descriptive words is separated by commas only** when it **follows** the noun it qualifies, e.g.:

Школу, пабудава́ную на ўзгорку, можна было ба́чыць здалёку.

The school built on the hill could be seen from a distance.

But Пабудава́ную на ўзгорку школу можна было ба́чыць здалёку.

28—IV VERBAL ADVERBS ДЗЕЯПРЫСЛОЎІ

1. **Дзеяпрыслоўі** [illegible], утвораныя ад дзеясловаў. У сказе дзеяпрыслоўі абазначаюць [illegible] ды паясьняюць выказьнік, які выражае галоўнае дзеяньне. [illegible] картáў кнігу, **разглядáючы** малю́нкі.
Параўнайце: [illegible] кнігу ды **разглядáў** малю́нкі.

2. **Дзеяпрыслоўі** [illegible] прыслоўяў і дзеясловаў:

   а) Як прыслоўі, якія [illegible] ды паясьняюць галоўны дзеяслоў, адказваюць на пытаньні **як? якім чынам? калі? чаму́?** Прыклады:

   Вýчань ішоў (**як?**) сьпяша́ючыся. Спацéў (**якім чы́нам?**) бéгаючы. Ня йдзі **далёка ў лес, (калі?)** ня вéдаючы добра дарогі.

   б) Як дзеясловы, ад якіх яны твораца, **дзеяпрыслоўі** быва́юць пераходныя й непераходныя, зваротныя й незваротныя ды закончанага або незакончанага трываньня.

3. а) Дзеяпрыслоўі **незакончанага** трываньня твораца ад дзеясловаў **незакончанага** трываньня, ад **3-яе** асобы **множнага** ліку, **цяперашняга** часу, пры чым:

   у I-ым спражэньні канчаткі **-уць (-юць)** замяняюцца на **-учы (-ючы)**;
   у II-ім спражэньні канчаткі **-аць (-яць)** замяняюцца на **-ачы (-ячы).** Прыкл.:

   I. спр. — пі́ш**уць** — пі́ш**учы**; хоч**уць** — хоч**учы**; пяю́**ць** — пяю́**чы**
   II. спр. — ляж**а́ць** — ле́ж**ачы**; лю́б**яць** — лю́б**ячы**; нос**яць** — нос**ячы**

   б) Дзеяпрыслоўі **незакончанага** трываньня паказваюць на **адначасовасьць** дзеяньня, выражанага дзеяпрыслоўем, і дзеяньня галоўнага дзеяслова, незалежна ад таго, ці галоўнае дзеяньне адбываецца ў цяперашнім, прошлым ці будучым часе. Прыкл.:

   Цяпер. ч. — Дзе́ці пяю́**ць, ідучы́** = Дзе́ці пяю́**ць** і **йду́ць**.

Прошл. ч. — Дзе́ці пяя́лі, **ідучы** = Дзе́ці пяя́лі і **йшлі**.
Буд. ч. — Дзе́ці **бу́дуць** пяя́ць, **ідучы** = Дзе́ці **бу́дуць** пяя́ць і йсьці.

4. а) Дзеяпрыслоўі **закончанага** трыванья твораца ад дзеясловаў **закончанага** трыванья **прошлага** часу (адзіночнага ліку мужчынскага роду) пры дапамозе суфіксу **"-шы"**. Прыкл.:

напіса́ў — напіса́**ўшы**
зрабіў — зрабі**ўшы**
прынёс — прынё**сшы**
пабе́г — пабе́**гшы**

б) Дзеяпрыслоўі **закончанага** трыванья **(напіса́ўшы)** выражаюць дзеяньне, **закончанае перад** цяперашнім, прошлым або будучым часам галоўнага дзеяслова. Прыкл.:

Цяпер. ч. **Напіса́ўшы** ліст, я йду на пошту. [Сьпярша́ напіса́ў (-ла), тады йду].
Прошл. ч. **Напіса́ўшы** ліст, я пайшоў на пошту.
Буд. ч. **Напіса́ўшы** ліст, я пайду́ на пошту.

5. **Дзеяпрыслоўе** можа быць у стане **дзейным і залежным.**

Дзейны стан	**Залежны стан**
Незакончанае трыванье — палохаючы	**бу́дучы** напалоха**ным, -ай, -ым**
Закончанае трыванье — напалохаўшы	**быўшы** напалоха**ным, -ай, -ым**

Прыклады: Дзейны стан — Сабака бе́гаў, палохаючы курэй.
Напалохаўшы курэй, саба́ка лёг.

Залежны стан — **Бу́дучы** напалохан**ай**, яна́ баялася ўве́чары хадзіць адна́.
Бы́ўшы напалоха**ным** у вайну́, хлопчык і пасьля́ баяўся самалётаў.

Формы **залежнага** стану ўжываюцца рэдка.

УВА́ГА. Дадатковае дзеяньне можна выразіць **дзеяпрыслоўем** толькі тады, калі яго выконвае той самы выканальнік, што й галоўнае дзеяньне, прыкл.: Я́нка працава́ў, **адпачыва́ючы.** (Я́нка працава́ў і Я́нка адпачыва́ў). Але — Я́нка працава́ў, а ся́бры **адпачыва́лі.**

6. **Дзеяпрыслоўныя словазлучэньні** заўсёды, г. зн. **незалежна** ад іхнага **месца** ў сказе **адносна дзеяслова-выказьніка, выдзяляюцца** коскамі. Прыкл.: Саба́ка падбе́г да мяне́, **памаха́ўшы** хвастом. Або – **Памаха́ўшы** хвастом, саба́ка падбе́г да мяне́.

7. **Адзіночныя** дзеяпрыслоўі ў васноўным таксама **аддзяляюцца коскамі, незалежна ад** іхнага **месца** ў сказе адносна дзеяслова-выказьніка, за выняткам толькі тых дзеяпрыслоўяў, што адказваюць на пытаньне **"як? якім чы́нам? у якім ста́не?"**, якія стаяць звычайна ў канцы сказу ды перад якімі коска ніколі ня ставіцца, прыкл.: Вы́чань ішоў (як?) **сьпяша́ючыся**. Трактары́ йшлі (як?) **грукочучы.**

Але й гэтыя дзеяпрыслоўі, калі ўжытыя два ці больш разам, трэба аддзяляць коскамі, прыкл.: Хлапцы́ слу́халі ся́бру, **зьдзіўля́ючыся** й **зайздросьцячы,** як шмат ён усяго ба́чыў.

Дзеяпрыслоўі, што адказваюць на пытаньне **"калі?",** заўсёды **аддзяляюцца** коскамі, прыкл.: **Памы́ўшыся,** (калі?) ён лёг спаць. **Сьне́даючы,** (калі?) разгавары́ліся.

***

1. A **verbal adverb** has the characteristics of **both verb** and **adverb.**

   a) Like an adverb, the verbal adverb is uninflected and modifies the main verb (i.e., it answers the question **how? when? why?**), e.g.:

   Хло́пец чыта́ў, **сядзячы** [illegible] ста́ле. — The boy was reading, (while) **sitting** at the table.

   b) Like a verb, the verbal adverb may be imperfective or perfective, transitive or intransitive, and reflexive or nonreflexive, e.g.:

   Ён ішо́ў, [illegible] — He walked, (while) reading something.
   Прачыта́ўшы, [illegible] — Having read (it), he smiled.
   Ён ішо́ў [illegible] і **ўсьміхаючыся.** — He walked toward us, waving his hand and smiling.

2. a) The **imperfective** verbal adverb is formed from the **present stem** of the **imperfective** verb by adding:

   the suffixes **-учы (ючы)** to the verbs of the **First Conjugation**
   and the suffixes **-ачы (ячы)** to the verbs of the **Second Conjugation,** e.g.:

   пі́шуць — **пішучы** (while) writing; **гавора́ць** — **гаворачы** (while) speaking.
   пяю́ць — **пяю́чы** (while) singing; **нося́ць** — **носячы** (while) carrying.

   b) The **imperfective** verbal adverb does not change, and itself does not express the tense. The main verb, however, with which the action expressed by the **imperfective** verbal adverb is always **simultaneous,** determines the tense, e.g.:

   PRESENT

   Дзе́ці пяю́ць, **ідучы́** ле́сам. — Дзе́ці пяю́ць і **йду́ць** ле́сам.

   The children are singing, (while) **walking** in the forest. — The children are singing and (are) **walking** in the forest.

   PAST

   Дзе́ці пя́лі, **ідучы́** ле́сам. — Дзе́ці пя́лі і **йшлі** ле́сам.

   The children were singing, (while they were) **walking** in the forest. — The children were singing and (were) **walking** in the forest.

FUTURE

Дзе́ці бу́дуць пяя́ць, **ідучы** ле́сам.	Дзе́ці бу́дуць пяя́ць і **йсьці** ле́сам.
The children will be singing (while they will be) **walking** in the forest	The children will be singing and (will be) walking in the forest.

3. a) The **perfective verbal adverb** is formed from the **past tense** of the **perfective verb** by adding the suffix **-шы** to the singular masculine form, e.g.:

Напіса́ў	—	напіса́**ўшы**	having written
Зрабі́ў	—	зрабі́**ўшы**	having done
Прынёс	—	прынёс**шы**	having brought
Пабе́г	—	пабе́г**шы**	having run

b) The **perfective verbal adverb** expresses action completed **before** the present, past. or future action of the main verb, e.g.:

Напіса́ўшы ліст, я **йду** на пошту.	Having written the letter, I am going to the post office.
Напіса́ўшы ліст, я **пайшо́ў** на пошту.	Having written the letter, I went to the post office.
Напіса́ўшы ліст, я **пайду́** на пошту.	Having written the letter, I shall go to the post office.

4. The **action expressed by the verbal adverb** and **the verb** it modifies **is always performed by the same subject,** e.g.:

Дзе́ці пяя́лі, **ідучы́**. (one subject — **дзе́ці**)

But in the sentence: Дзе́ці пяя́лі, калі́ мы **йшлі**. — the verbal adverb cannot be used because there are two different subjects — **дзе́ці** and **мы**.

5. **Verbal adverbs** when used **with descriptive words are always separated by commas,** e.g.:

Зрабі́ўшы ха́тняе зада́ньне, мы пайшлі ў кіно.	Having done our homework, we went to the movies.

Or: Мы пайшлі́ ў кіно, **зрабі́ўшы** ха́тняе зада́ньне.

6. **Verbal adverbs without descriptive words** excepting those which answer the question **"how?"**, and which usually stand at the end of the sentence, **are also separated by commas. For example:**

Ідучы́ (калі́?), мы пяя́лі.	While walking, we were singing.
Памы́ўшыся (калі́?), хлопчык лёг спаць.	**Having washed** himself, the little boy went to bed.
But: Яна́ гавары́ла не **хвалю́ючыся** (як?).	She talked without agitation (calmly).
Трактары́ йшлі **грукочучы** (як?).	The tractors moved noisily.

28—V THE PLUPERFECT TENSE AND THE FUTURE PERFECT TENSE
ЗАПРОШЛЫ ЧАС І ПРАДБЎДУЧЫ ЧАС

1. а) У беларускай мове ўжываецца і **запрошлы** час, якім выражаецца дзейнасьць, што здарылася перад другой дзейнасьцяй таксама **прошлага** часу, прыкл.:

Я **быў** ужо **зрабіўшы** лéкцыі, калі **прыйшоў** мой сябра.

б) **Запрошлы** час выражаецца прошлым часам ад дзеяслова **"быць"** і **дзеяпрыслоўем закончанага трыванья,** прыкл.:

Гáння былá ўжо паéхаўшы, калі я **быў** у іх.
Я быў **прачытáўшы, прынёсшы,пайшоўшы...**

2. а) **Прадбудучы** час выражаецца дзейнасьць, што станецца раней за другую будучую дзейнасьць, прыкл

Я бýду **ўстáўшы,** калі ты **прыйдзéш.**

б) Прадбудучы час утвараецца ад дзеясловам **"быць"** у будучым часе і **дзеяпрыслоўем** закончанага трыванья, прыкл.:

Янá ўжо бýдзе вярнýўшыся, калі мы да яé **паéдзем.**

***

1. a) To express an action which took place in the **past before another past** action **the pluperfect is used, e.g.:**

Янá **былá** ўжо **паéхаўшы**, калі мы **былі ў яé.** — She had already left when we came to visit her.

b) The **pluperfect** tense is formed with the **past** tense of **быць** and the **perfective verbal adverb**, e.g.:

Я **быў зрабіўшы** лéкцыі, калі **прыйшоў** мой сябра. — I had done my homework when my friend came.

2. a) The **future perfect** expresses an action which will happen in the future before another action, e.g.:

Я **бýду пайшоўшы,** калі мáма **вéрнецца** з работы. — I shall have gone when my mother will be back from work.

b) The **future perfect** is formed using the **future** tense of **быць (бýду, бýдзеш...)** with the **perfective verbal adverb.**

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 293. а) Прачыта́йце дзеясловы ды вы́пішце паводля ўзору: у пе́ршы слупок дзеясловы **непераходныя,** у другі́ **пераходныя** ды да пераходных дапішэце **дзеяпрыме́тнікі прошлага ча́су зале́жнага ста́ну.** (Глядзеце § 28-III, 2б.)

Напіса́ць, плысьці́, будава́ць, сьмяя́цца, заве́сьці, прачыта́ць, ру́хацца, апрацава́ць, падарава́ць, е́хаць, сьпяша́цца, знаходзіць, бе́гчы, пашы́ць, вы́браць, спаць, раскры́ць, хадзіць, пераплысьці́.

УЗОР.	**Непераходныя**	**Пераходныя**	**Дзеяпрыме́тнікі**
	плысьці́	напіса́ць	напі́саны, -ая, -ае

б) Укладзе́це ска́зы зь **дзеяпрыме́тнікамі** з пу́нкту а). Прыкладам: Напі́саны ліст збы́ліся зане́сьці ў паштовую скры́нку. Або: Ліст напі́саны та́там.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 294. а) Ад да́дзеных дзеясловаў паводля ўзору ўтварэце:

1. Дзеяпрыме́тнікі **цяпе́рашняга** ча́су **дзе́йнага** ста́ну.

УЗОР. **Ідзу́ць — ідзу́чы, ідзу́чая, ідзу́чае**

ідзу́ць	**надыходзяць**	**цьвітзу́ць**
бягзу́ць	**засына́юць**	**хвалю́юць**

2. Дзеяпрыме́тнікі **прошлага** ча́су **дзе́йнага** ста́ну.

УЗОР: **мінзу́ць — мінзу́лы, мінзу́лая, мінзу́лае**

мінзу́ць	**пачарне́ць**	**пажаўце́ць**	**абамле́ць**
адубе́ць	**зьбяле́ць**	**састарэць**	**ап'яне́ць**

3. Дзеяпрыме́тнікі **прошлага** ча́су **зале́жнага** ста́ну.

УЗОР: **чыта́ць — чытаны, чытаная, чытанае**

прачыта́ць	**піса́ць**	**мыць**	**кінуць**
разьбі́ць	**збудава́ць**	**наня́ць**	**забыць**
малява́ць	**раскіда́ць**	**шыць**	**схава́ць**

б) Перапішэце ска́зы, заміж кропак устаўля́ючы ў вадпаве́днай форме **дзеяпрыме́тнікі цяпе́рашняга ча́су дзе́йнага ста́ну** ад дзеясловаў з пункту "а, 1.".

1. Ён піша ў газэту пра . . . спра́вы. 2. Гэта ве́чна . . . гадзі́ньнік. 3. Мы ўжо рыхту́емся да . . . сьвя́таў. 4. Сёньня я чу́ла . . . ве́стку. 5. . . . дзіця́ ра́птам прахапі́лася й запла́кала. 6. Мы праяжджа́лі ля . . . садоў.

в) Укладзе́це ска́зы зь **дзеяпрыме́тнікамі,** утворанымі ад дзеясловаў з пу́нкту "а, 2", а тады́ з пу́нкту "а, 3".

г) Перапішэце ска́зы, ад дзеясловаў у дужках утварэце **дзеяпрыме́тнікі прошлага ча́** **су дзе́йнага ста́ну** да наступ[illegible] іх у вадпаве́днай форме.

1. (Міна́ць) год быў бага́ты на ціка́выя падзе́і.
2. (Адубе́ць) ад холаду пту́шка ска́ча па сьне́зе.
3. На ду́бе яшчэ трыма́лася крыху́ (пачарне́ць) лістоў.
4. [illegible] добра ня ба́чаць, у (пажаўце́ць) тва́ры ні кропелькі крыві.
5. (Абамле́ць) ад змучаньня ру́кі ледзь трыма́лі цяжкі паку́нак.
6. У́сім нам, (ап'яне́ць) ад па́ху чаромхі, пача́ла бале́ць галава́.
7. На (зьбяле́ць) тва́ры хлопчыка малява́ўся страх.

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 295. а) Перапішэце ска́зы, ад дзеясловаў у ду́жках **утвара́ючы дзеяпрыме́тнікі прошлага ча́су зале́жнага ста́ну** ў вадпаве́днай форме.

1. Верш, (прачыта́ць) ім, не зрабіў на нікога ўра́жаньня. 2. Ра́туша, ня́да́ўна (збудава́ць) у Тароньце, ма́е імпаза́нтную архітэкту́ру. 3. Паля́на, (абступіць) з усіх бако́ў ле́сам, мле́ла ад гарачыні. 4. Пе́рад на́мі раскі́нулася мора, (залі́ць) святлом ме́сяца. 5. Капялю́ш, (забы́ць) не́кім, ляжа́ў на ла́ўцы ў па́рку. 6. Кашу́лі, ручнікі, (вы́шыць) рука́мі, каштую́ць ве́льмі дорага.

б) Ска́зы з пу́нкту "а)" перабудуйце так,каб ня трэба было ў іх ста́віць коскі, ды запішэце новыя ска́зы. (§ 28-III, **NOTE.**)

в) Перапішэце ска́зы, дзе трэба **ўстаўля́ючы коскі**.

1. Я добра па́мятаю ка́зкі чу́тыя мною ў маленстве. 2. Мы ма́ем партрэт Скары́ны намалява́ны белару́скім мастаком Пётрам Міра́новічам. 3. Ёсьць у нас і і́ншыя намалява́ныя Міра́новічам абразы́. 4. У атрыма́най ва́мі ўчора газэце ёсьць шмат ціка́вых артыку́лаў.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 296. а) Прачыта́йце ска́зы, а тады́ напішэце іх паводля ўзору ў **зале́жным ста́не. УЗОР:** Холад бу́дзе пераможаны сонцам.

1. Сонца пераможа холад. 2. Ву́чань напіса́ў практыкава́ньне. 3. Наста́ўнік прынёс сшыткі́. 4. Га́ля прачыта́ла ціка́вае апавяда́ньне. 5. Падарожнікі вы́пілі вады́. 6. Ма́ма адчыні́ла вакно. 7. Краўчы́ха пашы́ла суке́нку. 8. Міха́сь разьвяза́ў зада́чу.

б) Перапішэце ска́зы, дзеясловы ў ду́жках заме́ньваючы на **дзеяпрыме́тнікі зале́жнага ста́ну,** дапасава́ныя да падчы́ркнутых назоўнікаў.

1. (Акрапіць) расою **поле** па́хла вогкасьцяй. 2. Не́йкае яшчэ ня (знаць) **адчува́ньне** ахапі́ла Сьцёпку. 3. Грамада́ **камяні́цаў,** (раскі́нуць) на вялі́кай прасторы, ве́льмі прыгожа спушча́лася да дали́ны Сьві́слачы. 4. Цыба́ты сітні́к зьве́шваецца над смаліста-чорнай гла́дзяй "чортавых **вакон",** (аздобіць) кру́глымі вадзяны́мі лапуха́мі. 5. Так і ляжыць Гнілое **балота,** (засла́ць) туманом. 6. Сьцёпка рабі́ў ура́жаньне спакойнага **чалаве́ка,** (упэ́ўніць) у сваіх сі́лах. (Паводля Я. Коласа).

в) Прачыта́йце ска́зы ды перабудзу́йце іх паводля ўзору, паста́ўце **дзеясловы** ў **зале́жным ста́не.**

УЗОР. Абра́з намаля́ва́ў маста́к. Абра́з намаля́ва́ны мастаком.

1. Абра́з намаля́ва́ў маста́к. 2. Сьнег заве́яў усе́ сьце́жкі. 3. Ву́чні падрыхтава́лі п'есу. 4. Га́ля разьбі́ла ку́бак. 5. Зіма́ засла́ла зямлю́ бе́ленькім пухна́тым дыва́ном. 6. Та́та скасі́ў траву́. 7. Між Вяльлёй і Сьві́слачай пабудзу́юць кана́л 60 кілямэтраў удаўжкі́. Ля Вялі́йкі паста́ві́лі на Вяльлі́ зага́ту 2.3 кілямэтра ўдаўжкі́ ды створаць вадасховішча, што сваймі́ паме́рамі ма́ла ўступіць славу́тай На́рачы. Вадасховішча гэтае бу́дуць зваць Вялі́йскае мора.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 297. Перапішэце ска́зы. Часьці́нку **не (ня) пішэце** зь дзеяпрыме́тнікамі **адпаве́дна ра́зам або асо́бна** (§ 27-VI, I а, 3).

1. Ужо цямне́ла, яны́ кінулі **(не, ня)** закончаную работу й пайшлі́ дамоў.
2. **(Не, ня)** закончаная імі работа бу́дзе рабіцца дале́й за́ўтра.
3. Няпры́емна зайсьці́ ў **(не, ня)** праве́транае паме́шканьне.
4. **(Не, ня)** прасохлая ад расы́ трава́ бліш чэла на сонцы.
5. Адэса — **(не, ня)** замярза́ючы порт на Чорным моры.

6. Ка́жны спад ці прыбы́так вады́ ў Нёмане не праходзілі **(не, ня)** заўва́жнымі для сяля́наў.
7. **(Не, ня)** дасьле́даваная нікім мясцовасьць прыця́гвала ўва́гу геолягаў.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 298. Ад дзеясловаў паводля ўзору ўтварэце:

а) Дзеяпрыслоўі **незакончанага** трыва́ньня.

УЗОР: пі́шуць — пі́шучы; ляжа́ць — ле́жачы

е́дуць	сьмяю́цца	гляджу́ць
рысу́юць	разьві́ваюцца	сядзя́ць
малю́юць	кормяць	разыходзяцца
чыта́юць	сочаць	бароняцца.

б) Дзеяпрыслоўі **закончанага** трыва́ньня.

УЗОР: сказа́ў — сказа́ўшы; папыта́ўся — папыта́ў**шыся**

прачыта́ў	атрыма́ў	памы́ўся
пасадзі́ў	зрабі́ў	усхвалява́ўся
закле́іў	сабра́ўся	сустрэ́ўся

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 299. а) Замяне́це адзін зь дзеясловаў на **дзеяпрыслоўе.** Злу́чнік **"і"** прапусьце́це, **дзеяпрыслоўныя словазлучэньні** вы́дзельце коскамі.

1. Уве́сну Пры́пяць шы́рака разьліла́ся й затапі́ла берагі́. Уве́сну Пры́пяць шы́рака разьлива́ецца й затапля́е берагі́. 2. Шахцёры йшлі з пра́цы й гу́тарылі. Шахцёры йду́ць з пра́цы й гу́тараць. 3. Саба́ка бег папе́радзе мяне́ ды пама́хваў хвастом. Саба́ка падбе́г да мяне́ ды памаха́ў хвастом.

б) Перапішэце ска́зы, замяня́ючы дзеясловы ў ду́жках на адпаве́дныя **дзеяпрыслоўі; дзеяпрыслоўныя словазлучэньні** вы́дзельце коскамі.

1. Гуля́е паводка (адбіва́ць) у сабе́ чы́стае не́ба й бліску́чае сонца.
2. (Міну́ць) лясну́ю паля́ну зу́бар выходзіць на дарогу й спыня́ецца.
3. Дзівіў́ся дзя́дзька тут нема́ла (ісьці) тунэлем да вакза́ла.
4. Танцава́лі зоркі (пазіра́ць) на бе́лую зямлю́.

Lake Narach, pearl of Byelorussia

5. Кра́скі ніжай гнуць галовы (пачу́ць) косак звон сталёвы.
6. Сьцёпка доўга стаяў (любава́цца) горадам.

в) Замяні́це **дзеясловы** ў ду́жках на **дзеяпрыслоўі** або **дзеяпрыме́тнікі.**

1. Нярухома стаяў густы́ (амярцьве́ць) лес, шчыльна (прытуліць) верхаві́ны да верхаві́наў, (перапле́сьці) галі́ны, (акрыцца) бе́лымі ша́тамі крохкай шэрані. Толькі дзесь у гушча́ры галі́наў су́ха палу́скваў мароз, (пераскокваць) з дрэва на дрэва. Дзед Тала́ш і Мартын Рыль ішлі́ не (сьпяша́цца), (выбіра́ць) найболей глухія лясны́я дарожкі й сьце́жкі, (абыходзіць) небясьпе́чныя мясьці́ны. Не́ба (засла́ць) бе́лымі воблакамі, пазіра́ла няпрыве́тна й холадна. Ня ва́білі вока сяля́нскія сядзі́бы, (параськіда́ць) па засьне́жаных прасторах палёў. Няве́тла пазіра́лі (пачарне́ць) сьце́ны ха́таў і вокны, (вы́беліць) зімоваю сьцюжай.

(Паводля Я. Коласа)

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 300. а) Прачыта́йце ска́зы. б) Вы́пішце ў слупок падчыркнутыя дзеясловы ды азна́чце, у які́м ча́се яны́ ўжы́тыя.

1. Яна́ **была́** у́жо ўсё начы́ста **перапіса́ўшы,** калі́ заўва́жыла, што прапусьці́ла цэлы абза́ц.
2. Я́нка й Га́ля, як **былі́ дамовіўшыся,** сустрэ́ліся ў Нью-Ёрку.
3. Калі́ прыйдзе́ш за́ўтра, я **бу́ду скончыўшы** чыта́ць гэтую кні́гу.
4. Тэлефану́й ра́на, мы **бу́дзем** ужо **ўста́ўшы.**
5. Ён **быў** ужо блізу́ **страціўшы** надзе́ю, калі́ чака́ны ліст нарэшце прыйшоў.

КРУГ 29

СІНЯЯ-СІНЯЯ...

(Праця́г з кру́гу 28)

III.

Ён сьхіліў галаву́. І тут ямý ра́птам не́шта сту́кнула. Вада́! Самý́м! Самý́му яшчэ нямá. Але́ ты́я за дзю́намі, напэ́ўна ле́глі, напэ́ўна захýталі галовы. Ат, чорт! Рызыкнýць апошні раз? Ста́ўка — пэ́ўная сьмерць, на якýю ямý́ наплява́ць. Вы́йгрыш — жыцьцё для дзіця́ці...

— Ляжы́ ці́ха, — сказа́ў ён. — Абяца́й мне, што ня бу́дзеш варушы́цца. У ймя́ не́ба!

— У ймя́ не́ба, — сказа́ла мала́я. Дык сіняя-сіняя?!!

— Сі́няя, — сказа́ў ён і, захапі́ўшы пля́шку, скокнуў це́раз мур.

Ніхто ня стрэліў... Пятрок дакла́дна заўва́жыў кірýнак на ручны́м компасе. Потым аддзёр рука́ў ад сарочкі й завяза́ў рот і нос. Дыхаць адра́зу ста́ла цярпі́ма. І тады ён бе́гма прыпусьціў у кірýнку да дзьвюх па́льмаў...

Ка́жнае сэкýнды чака́ючы сьпіною стрэлу, ён прывя́зваў да скуранога рамяня́, побач із скураным вядром, сваю́ пля́шку.

Мяшок паку́тліва доўга не тануў. А вакол гучэў ужо ня стогн, а рык...

Пе́ршыя глыткі́ адбі́ліся болем у горле. Але́ вада́ каці́лася ў горла, і ён піў, піў, піў, а над ім імча́лі хма́ры пяскý — самý́м піў ра́зам зь ім...

Іхны з Джамі́ляй заку́так ра́птам зьнік. Шум пяскоў напоўніў сьвет...

Ён стаў на кале́ны й папоўз. Але́ й так яго раз-пораз зьгіна́ла да зямлі́. Тады́ ён папоўз ле́жачы... Не́калькі разоў яго ссоўвала наза́д, як чарапа́ху.

Ён плазава́ў, адчува́ючы, што памі́ра́е...

Тры разы́ ве́цер зрыва́ў яго з му́ру, аж пакýль ямý́ не ўдалося перакуліцца ў яго. А там ён адшука́ў рука́мі напаўзасыпаны горбік, пакла́ў побач зь ім цёплы ўжо мяшок, а сам лёг побач... Не́шта падступа́ла павольна-павольна. Як сон. А потым бы́ццам не́хта дзьмýхнуў на сьве́чку. І стаў змрок.

...Ён ачуня́ў ра́птам, адра́зу-ж успомніўшы і небясьпе́ку, і самý́м, і стрэлы з-за дзю́наў... Была́ цішыня́. Паве́тра ачысьцілася.

Пятрок ве́даў: з пача́ткам ночы **яны́** могуць прыйсьці зноў. І ён пасьпе́шліва пача́ў пры́гаршчамі высыпа́ць пясок із свайго мале́нькага борджа. І ўрэшце адкапа́ў зь пяску́ мале́нькі запы́лены кокан. Адсу́нуў краёчак — сьпіць...

Ён доста́ў мяшочак з прыпа́самі й пералічы́ў іх. Узя́ў тры жме́ні мукі й замясі́ў іх на кроплі вады́, ра́зам із су́шаным мя́сам. Покла́ў фі́нікі. Нічога, пад'е́сьці можна, а сма́га ама́ль ня му́чыць уначы́...

— Маты́ль-маты́ль, на мукі, за гарою тры ваўкі, — сказа́ў ён, успомні́ўшы сваё мале́нства.

— Сіняя-сіняя? — прамармыта́ў маты́ль.

— Сіняя-сіняя, — бы́ццам у да́ўную гульню́ гуля́ючы, сказа́ў ён. — Еж.

Дзяўчы́нка прыпа́ла да пля́шкі.

— Ты ня пі многа, — папрасі́ў Пятрок. — Уначы́ бу́дзе холадна. — А сам падумаў, што ўначы́ бу́дзе ці не зана́дта горача.

— І тамарынд там сі́ні?

— Тамарынду там нямá, — сказа́ў ён. — А́ле там ёсьць лясы́. Не́шта накшта́лт гэтых па́льмаў, і там іх як зор на не́бе.

— А што ёсьць яшчэ?

— І яшчэ ёсьць рэкі.

— Што гэта?

— Ты ве́даеш, што такое Іхарха́р?

— Ве́даю. Шырокая суха́я лагчы́на.

— Ну вось. А там лагчына шырынёю ў тры Іхарха́ры. Толькі ня суха́я, а поўная вады́. І вада́ гэтая не стаіць. Яна́ плыве́, грукоча, цурчыць, або проста й пла́ўна ру́хаецца напе́рад. Удзе́нь на ёй гуля́е сонца. Уначы́ ў ёй адбіва́юцца зоры.

Яна́ маўча́ла, быццам абду́мваючы не́шта.

— Ты дарослы, — сказа́ла Джамі́ля, — і мне ня можна каза́ць такое дарасламу. А́ле мне здае́цца — ты хлу́сіш. Такога ня можа быць на зямлі́. Ты гэта, напэўна, каб мне было весяле́й. І яшчэ таму́, што ба́цька так доўга ня йдзе... А твая́ зямля́, напэўна, проста пясок, дзе нямá й лу́жыны. Сорам табе́ хлусіць. Лю́дзі пусты́ні ніколі ня хлу́сяць.

— Я ня хлушу́, — сказа́ў ён. — Ты-ж ба́чыла міра́ж? Гэта паве́тра прыносіць яго зь іншых краёў, дзе шмат дрэваў і вады́. Каб дзе́ці ве́рылі. Ты-ж ба́чыла? Рэкі, а над імі дрэвы.

— Гэта міра́ж, — як дарослая, сказа́ла яна́.

І тады ён стаў на кале́ны.

— Слу́хай, — сказа́ў ён. — Імём гэтага не́ба, тваім жыцьцём я прысяга́юся табе́, што ўсе маé словы — пра́ўда. Што запраўды́ ёсьць на сьве́це і балоты, і крыніцы праз ка́жны дзесяток крокаў, і рэкі, і лясы́, і така́я зямля́, што ўся сіняя.

Яна́ доўга маўча́ла. Ён чака́ў.

— Я хаце́ла-б туды́, — сказа́ла яна́. — Пэўна, гэта там і ёсьць рай Ала́ха. Чаму́-ж ты пайшоў адту́ль, адхалі́б?

— Мяне́ вы́гналі злыя ворагі.

— Я-б такога ніколі не аддала́, — ціха сказа́ла яна́.

— Таму́, што ты ве́даеш пусты́ню.

— А ты?.. Не, я не аддала́-б...

І тут гэтыя словы бы́ццам не́шта адпусьці́лі ў ім. Бы́ццам прарва́лася не́шта да́ўняе, да́ўкае, гнятўчае. І ён запла́каў. Бязгу́чна. Толькі сьлёзы каці́ліся па шчоках.

— Раскажы́, — ціха сказа́ла яна́. — І гэтыя... рэкі... зна́чыць, і яны сі́нія?

— І яны́ сі́нія, — гарта́нна сказа́ў ён. — Іх шмат. А між іх стая́ць лясы́. І лясоў такса́ма шмат. І кожны дрэ́ў бяжыць шмат ручаі́наў. А за́мест пяскоў там паплавы́, і на іх шмат розна́каляровых кве́так. А часа́мі на ўсё гэта па́дае сьнег... Ты ня ве́даеш, што гэта — сьнег. Ён падобны да бе́лае воўны зь міліёнаў мэха́ры (вярблюдоў)...

Дзяўчы́нка глядзе́ла на яго, як на таго, хто зьявіўся з ка́зкі. Абхапі́ла кале́ны ручаня́тамі, пакла́ла на іх падбародак, сьхілі́ла галаву́...

Ён расказваў, і перад забытымі вачы́ма, далёкае, жывое ўстава́ла тое, што ён тысячу разоў бачыў і адначасова нібы пазнава́ў пе́ршы раз.

Крыжы́ на ростанях, вескі ў барвяны́х кара́лях арабі́н, чырвоная шыпшы́на ля дарог, начле́жныя коні ў тума́не. Балаты́, імша́ры, балаты. Мястэчкі сярод сі́ніх лясоў, масткі над начны́мі ручаі́намі.

— Я-б хаце́ла туды.

— Ты пае́дзеш туды́, — сказа́ў ён.

— Добра, — перары́віста сказа́ла яна́.

Пятрок заху́таў яе́ й пакла́ў пад мур. Хай сабе́ пасьпі́ць. Стая́ла цішыня́.

... Ён сядзе́ў над ёю й пазіра́ў, як ясьне́е над бязьме́жнасьцю трапятка́я смуга́ чароўнага зьзя́ньня.

Не́дзе там, за пусты́няй, за морам, была́ другая́ зямля́. І ён ня мог безь яе́. Яе́ ня было́ тут, а́ле яна́ была́.

Зямля́-зямля́!..

Джаміля ду́мала, што ён зьявіўся з ка́зкі... Гэта пра́ўда... І трэба ратава́ць ка́зку, паку́ль яна́ ка́зка, а ня пустыня. Трэба бі́цца за яе́ на́вет з са́мым д'яблам і паме́рці на е́йных зялёных лугох, прыгажэйшых за ўсё на зямлі́.

Вярта́ньне. Толькі вярта́ньне. Няха́й там нікога нама́. Каму́сьці трэба пача́ць.

Ён вытрывае тут і два, і тры дні. Ён вытрывае тут... колькі спатрэбі́цца. Ён ня можа не зрабі́ць гэтага. Таму́ што ён ня можа адда́ць у ра́бства кудысьці на Чад або ў Танжэр гэты камячок жывога це́ла, які́ вярну́ў яму́ радзіму.

Радзіму, яку́ю таксама́ не́льга адда́ць.

І на́вет калі́ заб'ю́ць, ён памрэ́ з ду́мкаю пра дзяўчы́нку і з ду́мкаю пра яе́, бага-це́йшы, чым за ўсе сямна́ццаць пусты́х год.

"Сі́няя-сі́няя...".

За градою дзю́наў пачу́лася ча́стае пля́сканьне мазолі́стых вярблю́джых ног.

Слоўнік (Vocabulary)

сту́кнуць (I) pf. past **сту́кнуў, -ла, -лі** to strike, to hit
саму́м, -у (m.) simoom
заху́таць (I) pf. past **заху́таў, -ла, -лі** to wrap, to tuck up
рызыкну́ць (I) (pf. of **рызыкава́ць, I**) to risk
ста́ўка, -і (f.) stake
выйгрыш, -у (m.) gain, prize
захапі́ць (II) pf. past **захапі́ў, -ла, -лі** to take, to grab
компас, -у (m.) compass
сарочка, -і (f.) shirt
бе́гма прыпусьці́ць to start to run
паку́тліва (adv.) agonizingly
глыток, глытка́ (m.) drink, mouthful
заку́так, заку́тку (m.) corner
ссоўваць(I); ссоўваю, -еш, -юць to move back, to push back
ачуня́ць (I) (pf. of **ачу́ньваць, I**) (in this case) to regain consciousness
кокан, -у (m.) cocoon
прысяга́цца (I); прысяга́юся, -ешся, -юцца to swear
да́ўкі ,-ая, -ае astringent
гнятучы, -ая, -ае oppressive
гарта́нна (adv.) in a hoarse voice
абхапі́ць (II), pf. past **абхапі́ў, -ла, -лі** to clench, to clasp
на ростанях at the cross-roads
барвя́ны, -ая, -ае crimson, purple
перарывіста сказа́ць to speak in a broken voice
смуга́, -і (f.) haze
зьзя́ньне, -я (n.) radiance, aureole
це́ла, -а (n.) flesh, body
радзі́ма, -ы (f.) fatherland
града́, -ы (f.) ridge, range
мазолісты, -ая, -ае toil-hardened, horny

29 — I DATES / ДА́ТЫ

1. Год / Year

a) Цяпе́р ты́сяча дзе́вяцьсот се́мдзесят **чацьве́рты год.** — Now it is 1974 (lit. the 1974th year).

The year is . . . is expressed by the **ordinal numeral** in the **nominative** + **год.**

b) **У** ты́сяча дзе́вяцьсот се́мдзесят **чацьве́ртым годзе.** — In 1974 (lit. in the 1974th year).

In the year . . . (when the year only is given) is expressed by **"у"** + the **ordinal numeral** in the locative case + **годзе.**

2. **Мéсяц і год** / Month and Year

У сакавіку́ ты́сяча дзе́вяцьсот **васямна́ццатага году.**	In March of 1918.

In the month of the year . . . is expressed by **"у"** + **the name of the month** in the **locative** case + **the ordinal numeral** in the **genitive** + **году.**

3. **Дзень і мéсяц** / Day and Month

Каторага сёньня?	**What** is the date today?
Сёньня **пя́тага** лю́тага.	Today is the **5th of February.**

The date (of the month) is . . . expressed by **the genitive masculine** of the **ordinal numeral**, agreeing with "число" or "дня" . . . which is understood.

4. **Дзень, мéсяц і год** / Day, Month, and Year

Калі́ нарадзі́ў[ся]	On what date was Janka Kupala born?
Янка Купа[ла] нарадзі́ўся **ліпеня** тысяча восемсо[т] восемдзесят **другога году.**	Janka Kupala was born **on** July 8th, 1882.

On the . . . day of the month of . . . in the year . . . is expressed by the genitive masculine of the ordinal numeral for both the month and the year + **году.**

5. **Since** . . . is expressed by "ад" with the **genitive**, e.g.:

Яны́ жыву́ць у Кана́дзе **ад** ліпеня тысяча дзе́вяцьсот сорак **дзявя́тага году.**	They have lived in Canada **since** July, 1949.

6. **From . . . to . . .** is expressed by

"ад" (+ the **ordinal numeral** in the **genitive**)
"да" (+ the **ordinal numeral** in the **genitive**), e.g.:

Турыстыя былі́ ў Мі́нску ад **пя́тага** да **дванáццатага** тра́веня.	The tourists were in Miensk from the fifth to the twelfth of May.

29 — II EXPRESSIONS OF AGE / ВЫРАЗЫ ВЁКУ

a) The subject of the English sentence must be expressed in the dative (see § 11-I, 3. c), e.g.:

Колькі **табе́** гадоў?	How old are **you**?
Мне сямна́ццаць.	I am seventeen.

Дзіця́ці адзі́н год.	**The child** is one year old.
Яму́ тры гады́.	**He** is three years old.
Ёй дзе́вяць гадоў.	**She** is nine years old.

b) The past and future tenses are expressed by **было** and **бу́дзе** respectively, e.g.:

Ігна́тку **было** тры гады́.	Ihnatka **was** three years old.
Сымону **бу́дзе** два́ццаць пяць.	Symon **will be** twenty-five.

29 — III TIME OF DAY — ON THE HOUR / ВЫРАЗЫ ЧА́СУ

The **time of the day** is expressed in Byelorussian with **ordinal numerals**, e.g.:

1. **Каторая гадзі́на цяпе́р**? або **Колькі ча́су цяпе́р**?	**What time is it now?**
а) Цяпе́р **пе́ршая** (. . . **пя́тая, двана́ццатая**) гадзі́на.	It is one (. . . five, twelve) o'clock.
б) Чверць (**або** пятна́ццаць) да **трэ́йцяе.**	A quarter (or 15 minutes) to three.
Палаві́на **трэ́йцяе**.	Two thirty.
Тры чве́рці (**або** сорак пяць часі́наў) па **другой**. Або — чверць да **трэ́йцяе.** Ці — бя́з чве́рці **трэ́йцяя**.	A quarter to three.
Пяць (мінýтаў **або** часі́наў) да чацьве́ртае.	Five minutes to four.
Пяць (мінýтаў **або** часі́наў) па чацьве́ртай.	Five minutes after four.
2. **А каторай гадзі́не?**	**At what time?**
а) А двана́ццатай дня.	At twelve o'clock noon.
А другой (... пя́тай) дня.	At 2:00 (. . . 5:00) p.m.
А шостай (... адзіна́ццатай) ве́чара.	At 6:00 (. . . 11.00) p.m.
А двана́ццатай ночы. (А поўначы.)	At midnight.
А трэ́йцяй ночы.	At 3:00 a.m.
А палаві́не пя́тай ра́ніцы.	At 4:30 a.m.
б) Чверць да (па) пя́тай ве́чара.	At a quarter to (after) 5 p.m.
Два́ццаць пяць да (па) пе́ршай дня.	At twenty-five minutes to (after) 1:00 p.m.

NOTE: For the word "minute" either **часі́на** or **мінýта** can be used.
For the word "second" either **хві́лі́на** or **сэкýнда** can be used.

29 — IV THE PAST TENSE OF THE VERB WITH THE CONJUNCTION "КАБ" ПРОШЛЫ ЧАС ДЗЕЯСЛОВА З ЗЛУЧНІКАМ "КАБ"

1. У беларускай мове ў даданых сказах **мэты** або **ўмовы**, што пачынаюцца злучнікам **"каб"**, дзеяслоў **заўсёды** стаіць у **прошлым часе** незалежна ад таго, у якім часе выражана дзейнасьць галоўнага сказу, прыкл.:

Я **паліва́ю** кве́ткі,
Я **паліва́ла** кве́ткі, — **каб** добра расьлі.
Я **бу́ду паліва́ць** кве́ткі,

Каб каза́ не скака́ла, то-б нагі не зама́ла.

2. Прошлы час з злучнікам "каб" ужываецца і пасьля дзеясловаў, што выражаюць боязь, пажада́ньне, просьбу або зага́д, прыкл.:

Баю́ся, **каб** па́чка не прапа́ла.
Ён хоча, **каб** ягоны сын быў лекарам.
Яны́ прасі́лі, **каб** вы зайшлі да іх.
Наста́ўнік сказа́ў, **каб** ву́чні ціха сядзе́лі.

3. Калі-н. у галоўным дадатковым сказах **той сам дзейнік**, пасьля **"каб"** выказьнік выражаецца **неазначальнікам,** прыкл.:

Яны́ паехалі у Лідзу, **каб** адве́даць сяброў.
Мы ся́дзем, **каб** адпачы́ць.

***

1. In subordinate clauses of **purpose** or **condition** introduced by **"каб"**, the verb is used in the **past tense,** regardless of the tense in the main clause. Thus:

Наста́ўнік **тлума́чыць** ле́кцыю, **каб** мы ўсё **зразуме́лі**.
The teacher **explains** the lesson so that we **understand** everything.

Наста́ўнік **вытлумачыў** ле́кцыю, **каб** мы ўсё **зразуме́лі**.
The teacher **explained** the lesson so that we **understood** everything.

Наста́ўнік **вы́тлумачыць** ле́кцыю, **каб** мы ўсё **зразуме́лі**.
The teacher **will explain** the lesson so that we **shall understand** everything.

Вытлумачце ле́кцыю, **каб** мы ўсё **зразуме́лі**.
Explain the lesson so that we **understand** everything.

2. After verbs expressing **desire, request,** or **command** the conjunction **"каб"** followed by a verb in the **past tense** is also used, e.g.:

Ён **хоча**, **каб** ягоны сын **быў** ле́карам.
He wants his son to be a doctor.

Наста́ўнік **сказа́ў, каб** ву́чні ціха **сядзе́лі**.
The teacher said that the students should sit quietly.

3. The **infinitive** is used in the subordinate clause **instead** of the **past** tense **when the subjects** of the main and the subordinate clauses **are the same**, e.g.:

Яны́ паéхалі ў Атáву, **каб адвéдаць** сяброў.	They went to Ottawa **to see** their friends.
Мы ся́дзем, **каб адпачы́ць**.	We shall sit down **to rest**.

29 — V PUNCTUATION MARKS IN BYELORUSSIAN
ЗНАКІ ПРЫПЫ́НКУ ПАБЕЛАРУ́СКУ

1. Period (.) **кропка** або **пункт.**
2. Exclamation mark (!) **кліч́нік.**
3. Question mark (?) **пыта́льнік.**
4. Comma (,) **коска.**
5. Semicolon (;) **кропка з коскай** або **пункт з коскай.**
6. Colon (:) **двукроп'е** або **два пу́нкты.**
7. Dash (—) **праця́жнік.**
8. Dots (. . .) **шматкроп'е** або **недака́з.**
9. Brackets ( ) **ду́жкі.**
10. Quotation marks (“ ”) **двукосьсе.**
11. Hyphen (-) **злучок**

All these punctuation marks **except commas** are used in Byelorussian **according to rules** similar to those by which they are used in English.

The use of the comma in Byelorussian **substantially differs** from that in English. Look **at rule 29-VI.**

29 — VI SOME IMPORTANT RULES FOR THE USE OF THE COMMA IN BYELORUSSIAN
ВАЖНЕ́ЙШЫЯ ВЫПА́ДКІ, КАЛІ́ ТРЭБА СТА́ВІЦЬ КОСКУ

Коска ставіцца ў сказе:

1. Паміж **аднолькавымі часьцінамі сказу** (дзе́йнікамі, выка́зьнікамі, дапаўне́ньнямі, азначэньнямі, акалічнасьцямі) —

а) Калі яны **ня зьвязаныя** ніякім **злучнікам,** прыкл.:

Муры́, дзьве халу́пы, ста́йні былі разбу́раныя.
Восень халодная, чорная, хму́рная су́нецца ціха, нячу́тна штадзе́нь.

б) Калі яны зьвязаныя злучнікамі **а, а́ле** або **ды (= а́ле)**:

Болей слу́хай, **а** мне́й гавары́! Мы пойдзем, **а́ле** ня бу́дзем ба́віцца.
Брат прые́хаў, **ды** не надоўга.

в) Калі яны зьвязаныя злучнікамі: **і, ды (=і), ні, або, ці, то... ужытымі больш, як адзін раз,** прыкл.: Ідзём сягоньня ў школу **і** я, **і** ён, **і** ты. **Або** грай, **або** грошы аддай! **То** лясок, **то** луг, **то** поле, **то** лужок зялёны. У ра́ньнюю вясну́ **ні** ў полі, **ні** ў ле́се нама́ **ні** я́гад, **ні** грыбоў.

УВА́ГА 1. Калі **"і, ні, ці"** паўтараюцца **толькі два разы** й няма далей паясьняльных словаў, **коскі можна ня ставіць**, прыкл.:

І кабáн **і** воўк — каштоўны здабы́так.
Рыгор **ці** нічога не адка́заў **ці** жартава́ў.

УВА́ГА 2. Ня ставіцца коскі таксама перад **"і, ні, ці, то"** ў такіх выразах, як:

і так **і** сяк, **і** туды́ **й** сюды́, **і** сьмех **і** грэх; **ні** жывы́ **ні** мёртвы, **ні** ры́ба **ні** мя́са, **ні** канцá **ні** кра́ю; **ці** туды́ **ці** сюды́, **то** туды́ **то** сюды́, **то** так **то** сяк, **то** ўзад **то** ўпе́рад і г. д.

Калі-ж злучнікі і й, ды, то, а таксама разлучальныя **або, ці — ужыты толькі раз, коскі** перад імі **ня ставіцца**, прыкл.:

Сымон пішa й [illegible] ці Юрка? Мары́нка рысуе розныя кра́скі **ды** малюе іх алавікáмі **або** вадзяны́мі хвáрбкамі.

УВА́ГА 3. Перад [illegible] "або", **"ці"** (тымі, заміж якіх можна ўжыць словы **"гэта зна́чыць"**) **заўсёды** ставіцца коска, прыкл.:

Рэкі нале́жаць да двух вадазбораў, **або** басэйнаў (г. зн. басэйнаў).

2. На выдзяленьне **звароткам** завецца слова, што абазначае імя асобы або назоў прадмету, да яко[illegible] зварачаюцца з мовай), прыкл.:

Хочаш пiць, **маленькая**? Гэй ты, **Нёман,** на́ша рака́!
Бу́сел, бу́сел, клёка-клёка, дзе ты жыў?

3. На выдзяленьне **пабочных словаў** і **ска́заў** (гэта значыць такіх словаў, што выражаюць у сказе нейкую пабочную ўвагу, паясьненьне), прыкл.:

Садок быў, **пра́ўда,** невялічкі. Зачыні, **калі ла́ска**, дзьве́ры.
Гэта ты, **напэўна**, каб мне было весялéй.

4. Пасьля **выклічнікаў: ох, ой, гэй, о . . .**, калі пасьля іх не стаіць клічнік, прыкл.:

О, край родны, край прыгожы!
Ого-го-го, брат! — дзя́дзька ка́жа, – цяпе́р зімá напэўна ля́жа.

УВА́ГА. Калі выклічнік цесна зьвязаны ў вымаўленьні зь іншым словам, дык коска ставіцца не пасьля выклічніка, а пасьля гэтага слова, прыкл.:

Гэй ты, сонца, гары́ ад зары́ да зары́, . . .
Ой ты, ве́цер, ня шумí . . .

5. Коска ставіцца пасьля адмоўя **"не"**, што адказвае ангельскаму **"no"**, і пацьвярджальных словаў: **так, але́** = yes, прыкл.:

Не, гэта ня ён! **Так, так,** ináчай быва́ла, не называ́ўся забы́тым мой край.
Але́, гэта было так.

6. Коскамі выдзяляюцца **прыме́тныя** й **дзеяпрыме́тныя словазлучэньні** (прыметнікі й дзеяпрыметнікі разам з паясьняльнымі словамі), калі яны стаяць пасьля назоўніка, да якога яны датычаць, прыкл.:

Паабапа́л дарогі стаіць лес, **сівы́ ад шэрані**.
Дзед, **звыча́йна ве́льмі гаваркі́**, цяпе́р маўча́ў.
Стары́я хвоі, **аброслыя мохам**, гарэлі, як сьве́чкі.

УВА́ГА. Прыметныя й дзеяпрыметныя словазлучэньні **перад** словам, да якога датычаць, аддзяляюцца коскамі толькі тады, калі можна падставіць дзеяпрыслоўі **"бу́дучы"**, ці **"бы́ўшы"**, прыкл.: **поўны новых сіл і сьве́тлых надзе́яў,** я сьме́ла йшоў напе́рад.

7. **Дзеяпрыслоўныя словазлучэньні заўсёды** выдзяляюцца коскамі:

Пабачыўшы мяне́, Га́лас завіля́ў хвастом.
Ходзіць сьвёкар па двару́, **рашчаса́ўшы бараду́**.

УВА́ГА. Адзіночныя дзеяпрыслоўі таксама выдзяляюцца коскамі, за выняткам толькі тых дзеяпрыслоўяў, што адказваюць на пытаньне **"як? яки́м чы́нам? у яки́м ста́не?"**, прыкл.: Ён ішоў **кульга́ючы** (як?). Але — **Памы́ўшыся** (калі?), хлопчык лёг спаць. (Глядзеце § 28-IV, 7).

8. Коскамі выдзяляецца **прыда́так** (пры асаблівым падчыркненьні прыдатак выдзяляецца працяжнікамі). **Прыдатак** — гэта азначэньне, выражанае звычайна назоўнікам (адным або з паясьняльнымі словамі), які стаіць у тым самым склоне, як і тое слова, да якога ён датычыць, прыкл.:

Заста́ўся адзі́н сын, **сіраты́**. Або — Заста́ўся адзі́н сын — **сіраты́**.
Васіль, **брат майго ся́бры,** ве́льмі лю́біць палява́ньне.
У яго, **Пе́трака,** ніколі ня было ні жонкі, ні дзяце́й.

УВА́ГА 1. Прыдатак, выражаны **собскім** назоўнікам (імя, прозьвішча, назоў), **выдзяляецца** коскамі **толькі** пасьля **асабовых** займеньнікаў. **Пасьля** назоўнікаў коскі перад ім ня ставіцца, прыкл.:

Яго, **Антося, любі**лі ўсе дзе́ці.

Але: Дзя́дзьку **Антося** любілі ўсе дзе́ці. Рака́ **Дняпро** ўпада́е ў Чорнае мора. Горад **Ві́цебск** стаіць на рацэ Заходняй Дзьвіне́.

УВА́ГА 2. Прыдатак, калі выражаны адным **агульным назоўнікам** без паясьняльных словаў ды стаіць **пасьля назоўніка,** да якога датычыць, часта **далучаецца** да гэтага назоўніка **злучком,** прыкл.: Гуля́е ве́цер-**свавольнік.** Сьпе́вам-**гоманам** і звонам поўніцца ўвесь сьвет. Шуміць бярозка над Бярозай-**ракой.** Эй ты, Нёман-**рака́,** ці ты ду́маў, ці сьніў...

9. Коскамі выдзяляюцца **адасобненыя акалічнасьці,** што паясьняюць папярэднія акалічнасьці, прыкл.:

Нéдзе там, **за пустыняй, за морам,** былá другáя зямля́.
Калісьці, **даўны́м-даўно,** праз усю́ Эўропу прайшлí ледавікí.
Доўга, **нáвет цэлыя гады́,** чуваць пах ляснога пажáру.

10. Коскай **аддзяляюцца** сказы ў **складáна-злýчаных** сказах бяз розьніцы, ці гэтыя сказы зьвязаныя злучнікамі, ці бяз злучнікаў. **Складáна-злýчанымі** сказамі завуцца тыя сказы, што складаюцца з колькіх **раўназначных простых** сказаў, **незалежных** адзін ад аднаго, прыкл.:

Нéба сéяла цяпло, цёплы дожджык цярушы́ў.
У дýмках рáдасна было, бéглі пéсьні ад душы́. (Купáла)

Або: Тут рэчка пад бокам, і процьма ў ёй рыбы.

11. Коскамі аддзяляюцца **дадáныя** сказы ад **галоўнага** (у **складáна-залéжных** сказах), прыкл.:

Люблю́ я вечары́, што леглі між гор. Я ня вéдаю, **калí ён прыйдзé.** Тое мéста, **дзе мы плáвалі,** вéльмі мне спадабáлася.

УВÁГА 1. Складáны сказ, у якім адзін просты сказ незалежны, а рэшта простых сказаў залежаць ад яго й паясьняюць яго, завецца **складáна-залéжным.** Залежны сказ, што паясьняе незалежны сказ, завецца **дадáным** сказам, а незалежны сказ, які ён паясьняе, завецца **галоўным.**

УВÁГА 2. **Аднолькавыя даданыя** сказы, зьвязаныя **адзіночным** злучнікам **і (й), ды (=і), ці, або . . .** коскамі **не разьдзяляюцца,** прыкл.:

Добра было прыслухоўвацца, як адарвéцца камéнчык з высокага бéрагу і ўпадзé ў вадý ды прыўскочыць шчупáк з вады́ ў пагоні за палахлíваю рыбкаю.

12. Коскамі аддзяляюцца таксама —

а) **Няпоўныя сказы,** што пачынаюцца злучнікамі: **як, як-бы, бы, быццам-бы,** прыкл.:

Сьнег бліщчы́ць, **як** халодная сталь (М. Багдановіч).
Як-бы на колы вадá тáя, ідзé ды ідзé Міхáл у вабходы (Я. Колас).
Сэрца ны́ла, **бы** з нуды́ (Я. Купала).
Дзяўчынка не адыходзіла ад мáткі, **бы́ццам-бы** баючы́ся яé адну́ пакінуць (І. Мéлеж).

б) Склонавыя формы **назоўнікаў** або **займеньнікаў** з прыназоўнікамі: **апрачá, акрамя́, за вы́няткам, заміж** і іншыя, прыкл.:

У хáце, **апрачá** бáбкі Нáсты, нікога ня было (Я. Колас).
Усé прыйшлí на час, **за вы́няткам** двух хлапцоў.
Вазьмí шáпку, **заміж** капялюшá!

**
*

Commas are used in sentences in the following cases:

1. To separate identical parts of the sentence (**subjects, predicates, objects...**):

a) When there are no conjunctions between them, e.g.:

На сталé ляжáць кнíгі, сшыткí, алавікí. — There are books, notebooks (and) pencils on the table.

Зося напісáла лісты брáту, сястры, сяброўцы. — Zosia wrote letters to her brother, to her sister (and) to her girlfriend.

b) When identical parts of a sentence are joined with the conjunctions **а** (and), **але** (but), and **ды** (=**але**), e.g.:

Спачáтку падýмай, **а** потым адкáзвай. — Think first, **and** then answer.

Мы пойдзем да іх, **але** ня бýдзем доўга бáвіцца. — We shall go to them, **but** we shall not stay long.

Брат прыéхаў, **ды** не надоўга. — My brother came, but not for long.

c) When identical parts of a sentence are joined with the repeatable conjunctions: **і, ды** (=**і**), **ні, то, або** (or), **ці** (or)..., e.g.:

Гáнну праводзілі **і** мáма, **і** тáта, **і** Янка. — Mother, father and John were seeing Hanna off.

У лéсе ня было **ні** грыбоў, **ні** ягад. — There were no mushrooms or berries in the forest.

Ад шчáсьця янá **то плáкала, то** сьмяялася. — She was (now) crying and (now) laughing from happiness.

Або пазванí мне, **або** напішы. — Either phone me or write me.

NOTE 1. Commas are not used in such expressions as:

І так **і** сяк — (this way and that way),
ні туды **ні** сюды — (neither one way nor the other),
то так **то** сяк — (now like this, now like that), etc.

For more examples look at the Byelorussian text § 29-VI, 1в.

NOTE 2. When the conjunctions **і, ды** (=**і**), **ні, то, або** *(or), **ці** *(or) are used only once in the sentence, a comma is not needed, e.g.:

Зося **й** Марынка любяць рысавáць крáскі **ды** размалёўваць іх алавікáмі **або** вадзянымі хвáрбкамі. — Zosia and Marynka like to draw flowers and to colour them with either pencils or watercolours.

***NOTE 3.** **"Або, ці"** may also have the meaning "that is", and in this case they are always preceded by a comma, e.g.:

Беларýскія рэкі налéжаць да двух вадазбораў, **або** басэйнаў.

2. A comma precedes and follows **an address**, words denoting persons or things to which the speech is addressed, e.g.:

Кладзіся спаць, **сы́нку.**	Go to bed, my little son.
А псік, **коце.**	Go away, kitty.

3. A comma precedes and follows **parenthetic words** (words inserted in a sentence, which not being a part of the sentence, express only an additional remark or explanation), e.g.:

Дом быў, **пра́ўда,** невялікі.	The house, I must admit, was not big.
Калі́ ла́ска, зачыні́ дзве́ры.	Please shut the door.

4. Commas (or exclamation marks) follow interjections such as: — **ой, о, ох, гэй...**, e.g.:

О, край родны, [illegible]	Oh, my native country, beautiful country...
Ой ты, ве́цер, не [illegible]	Oh, wind, do not blow.

NOTE. When the interjection is pronounced jointly with the following word, a comma follows [illegible] of the interjection: **ой** ты, ве́цер.

5. A comma always follows the affirmative particles **"але́"** or **"так"** (yes) and the negative particle "не" meaning **"no"**, e.g.:

Так, так, былі [illegible]	Yes, yes, there have been different times.
Але́, гэта было так.	Yes, it was so.
Не, гэта ня ён.	No, it is not he.

6. Adjectives and participles, when they are **used with descriptive** words and **follow the noun** they qualify, **are separated by commas**, e.g.:

Дзед, **звыча́йна ве́льмі** гаваркі, цяпе́р маўча́ў.	The old man, usually very talkative, was now silent.
Стары́я хвоі, **аброслыя мохам,** гарэлі, як сьве́чкі.	Old pine trees, covered with moss, were burning like candles.

7. **Verbal adverbs**, when used **with descriptive verbs**, are **always separated by commas**, e.g.:

Зрабіўшы **ха́тняе зада́ньне,** мы пайшлі ў кіно.	Having done our homework, we went to the movies.
Or — Мы пайшлі ў кіно, **зрабіўшы ха́тняе зада́ньне.**	

NOTE. **Verbal adverbs without descriptive words**, excepting those which answer the question **"як (how)?"**, and which usually stand at the end of the sentence, **are also separated by commas**, e.g.:

Ён ішоў кульга́ючы (як?).	He walked limping.
But — Памы́ўшыся (калі?), хлопчык лёг спаць.	Having washed himself, the little boy went to bed.

8. Commas (or dashes) **separate appositions** — attributes expressed by nouns (with or without the descriptive words) which always agree in case with the words they qualify, e.g.:

Васíль, **брат** майго ся́бры, вéльмі лю́біць палява́ць.	Vasil, my friend's brother, really likes to hunt.
У яго, **Пéтрака**, ніколі ня было ні жонкі, ні дзяцéй.	He, Petrak, never had either a wife or children.

NOTE 1. Christian and family names or names of cities, rivers etc. are preceded with a comma only after personal pronouns. Otherwise commas are not used, e.g.:

Яго, **Антося**, усé любíлі.	He, Antos, was liked by everybody.
Дзя́дзьку **Антося** ўсе любíлі.	Everybody liked Uncle Antos.
Рака́ **Дняпро** ўпада́е ў Чорнае мора.	The Dniapro River runs into the Black Sea.

NOTE 2. When attributive nouns have no descriptive words and follow the noun they qualify, they are joined to those nouns with a hyphen, e.g.:

Уцяка́й, мароз-**дзядýля**!	Go away, Grandfather Frost!
Стаíць бярозка над Бярозай-**ракой**.	The small birch stands (grows) by the River Biaroza.

9. **Adverbial modifiers** describing other adverbs are separated by commas, e.g.:

Нéдзе там, **за пусты́няй, за морам**, былá другáя зямля́.	Somewhere beyond the desert and the sea, there was another land.
Калíсьці, **даўны́м-даўно**, праз усю́ Эўропу прайшлí ледавíкí.	Once upon a time, long, long ago, glaciers moved through all of Europe.

10. In **compound sentences** (складáна-злýчаных), commas separate independent clauses regardless of whether they are joined by a conjunction or not. For example:

Сьвяцíла сонца, цёплы дождж ішоў.	The sun was shining and a warm rain was falling.
Гáнна пайшлá ў тэатр, а Вéра засталáся дома.	Hanna went to the theatre, but Vera remained at home.

11. Commas are also used in **complex sentences** (склáдана-залéжных скáзах) to separate dependent clauses from the independent clause. For example:

Я ня вéдаю, дзе ён жывé.	I do not know where he lives.
Тое мéсца, дзе мы плáвалі, вéльмі мне спадабáлася.	I really liked the place where we swam.

NOTE. Between identical dependent clauses joined with the unrepeatable conjunctions **і (й), ды (=і), або** or **ці**, a comma is not used. For example:

Ён нічога ня пíша, калí прыéдзе ягоны ся́бра ды калí яны́ бýдуць у нас.	He does not write anything about when his friend will arrive and when they will come to us.

12. Commas always separate phrases beginning with the words **як, як-бы, бы́ццам-бы, апрача́, за вы́няткам, заміж..., e.g.:**

І кожны ве́сел, лёгкі, **як** пта́шка, хоць працу́е, **як** та́я мура́шка.	And everybody feels as happy (and) as light as a bird, although everyone works like an ant.
У ха́це, **апрача́** ба́бкі, нікога ня было.	Besides grandmother, there was no one at home.
Усе́ прыйшлі́ на час, **за вы́няткам аднаго** хлапца́.	Everybody came on time, except one boy.
Вазьмі́ ша́пку, **заміж** капялюша́!	Take a cap instead of a hat.
Дзяўчы́нка не адыходзіла ад ма́ткі, бы́ццам-бы баялася, што яна́ пакі́нуць.	The little girl did not move from her mother, as if being afraid to leave her alone.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 301. а) Ву́снае. Пе́ршыя два радкі наста́ўнік чыта́е ўго́лас, а ву́чні па адны́м паўтара́юць. Дале́йшыя радкі ву́чні чыта́юць са́мі.

1. 1905 год;	у 1905 годзе;	ад 1905 году да 1914.
2. 1916 год;	у 1916 годзе;	ад 1916 году да 1941.
3. 1937 год;	у 1937 годзе;	ад 1937 году да 1949.
4. 1954 год;	у 1954 годзе;	ад 1954 году да 1968.
5. 1863 год;	у 1863 годзе;	ад 1863 году да 1918.

б) Дома перапішэце ска́зы паводля ўзору.

УЗОР: 1. Тысяча дзе́вяцьсот пя́ты год; у ты́сяча дзе́вяцьсот пя́тым годзе; ад ты́сяча дзе́вяцьсот пя́тага году да ты́сяча дзе́вяцьсот чатырна́ццатага.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 302. а) У кля́се ву́чні па адны́м чыта́юць ска́зы ўго́лас, да́ты, пада́дзеныя паанге́льску, вымаўля́юць пабелару́ску. Дома ска́зы гэтыя запісваюць, лі́кі пі́шучы словамі.

1. Сёньня the 10th of July, а за ты́дзень on the 17th of July мы паляцём у Эўропу.
2. Ён нарадзі́ўся on the 29th of January 1952 г., а ягоны дзядзю́ля on the 10th of February 1889.
3. Маі́ сяброўка й я нарадзі́ліся ў адны́м годзе — 1954, толькі я нарадзі́лася on the 12th of March, а маі́ сяброўка on the 2nd of March.

б) Перапішэце ска́зы, да́ты напішэце словамі.

1. Два вялі́кія белару́скія паэты Я́нка Купа́ла й Яку́б Колас нарадзі́ліся ў тым са́мым годзе — у 1882-ім.
2. Пе́ршая друкава́ная кні́га ў белару́скай мове — Стары́ Запаве́т Бібліі — была́ вы́дадзеная ў 1517 годзе. Перекла́ў яе́ ў белару́скую мову й вы́друкаваў Франьці́шак Скары́на.
3. У 1905 годзе Я́нка Купа́ла надрукава́ў свой пе́ршы верш "Мужы́к".
4. 25 сакавіка́ 1918 году Белару́ская Ра́да Кангрэсу абве́сьціла Белару́сь незале́жнай дзяржа́вай — Белару́скай Народнай Рэспу́блікай ((БНР).
5. 30—X 1921 году ўрачы́ста быў адчы́нены ў Ме́нску Белару́скі Дзяржа́ўны Ўніве́рсытэт.
6. Друга́я сусьве́тная вайна́ пачала́ся ў ве́расьні 1939 году, а скончылася ў тра́вені 1945 году.

в) 1. У 1956 годзе выда́тнаму белару́скаму пісьме́ньніку й вучонаму Кандра́ту Крапіве́ скончылася 60 гадоў ад дня нараджэньня.
2. У 1973 годзе ўвесь белару́скі народ у Белару́сі і за е́йнымі ме́жамі адзнача́ў 800-тыя ўгодкі ад дня сьме́рці выда́тнае белару́скае асьве́тніцы й патронкі белару́скага народу — сьвятое Ефрасіньні Полацкае.
3. Паэт Максім Багдановіч нарадзіўся 9 сьне́жаня 1891 году, а памёр 25 тра́веня 1917 году, калі́ ямý было ўсяго 25 гадоў жыцьця́.

г) У кля́се вýснае. Дома перапішэце пыта́ньні ды адкажэце на іх пісьмова. Глядзе́це ўзор.

1. Калі́ ты нарадзіўся (нарадзілася)?
2. Калі́ нарадзілася твая́ сястра́?
3. Калі́ нарадзіўся твой брат?
4. Калі́ нарадзілася твая́ сяброўка (твой ся́бра)?

УЗОР. Я нарадзіўся сёмага красавіка́ ты́сяча дзе́вяцьсот шэсьцьдзесят другога году.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 303. Вýснае. Вýчні ўголас паўтара́юць за наста́ўнікам.

1. Колькі табе́ гадоў?	Мне 10 гадоў.
2. Колькі гадоў тваймý бра́ту?	Маймý бра́ту 17 гадоў.
3. Колькі гадоў ягонай сястры́?	Ягонай сястры́ 4 гады́.
4. Колькі гадоў ва́шаму саба́ку?	На́шаму саба́ку толькі 1 год.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 304. а) Перапішэце вы́разы ды зьмянéце іх паводля ўзору.

УЗОР. Адзіна́ццацігадовая дзяўчы́нка - дзяўчы́нцы адзіна́ццаць гадоў.

1. Дзесяцігадовы хлопчык.
2. Васьмімéсячнае дзіця́.
3. Стагадовы дуб.
4. Шасьцідзесяцігадовы чалавéк.

б) Утвораныя звароты напішэце перш у прошлым ча́се, а тады́ ў бу́дучым.

УЗОР. [illegible] гадоў. Дзяўчы́нцы бу́дзе двана́ццаць гадоў.

ПРАКТЫКАВА́ННЕ [illegible] фантычнае. Дома перапіса́ць пыта́ньні й адка́зы.

Каторая цяпе́р гадзі́на?

1. Цяпе́р чацьве́ртая гадзі́на.
2. Цяпе́р палаві́на другое.
3. Цяпе́р восьмая гадзі́на ве́чара.
4. Цяпе́р бяз чве́рці шостая.

Каторая гадзі́на была́, калі́ ты вярну́ўся дамоў?

1. Было пятна́ццаць часі́наў да двана́ццатай.
2. Было чверць да двана́ццатай.
3. Было тры чве́рці па адзіна́ццатай.

б) Напішэце, каторая гадзі́на была́ гадзі́ну пе́рад тым ча́сам, які́ да́дзены ў вадка́зах у пу́нкце а).

в) Каторая гадзі́на бу́дзе гадзі́ну пасьля́?

г) Ператлума́чце да́дзеныя вы́разы ча́су ў белару́скую мову. Усе́ лі́чбіны пішэце словамі.

1. 12:15
2. 1:22
3. 2:30
4. 3:45
5. 26 minutes to 4:00
6. 20 minutes to 6:00
7. a quarter to 5:00
8. 10 minutes to 11:00
9. 7 minutes past 1:00

г) Адкажэце на пытáньні, адвольна падбірáючы час з пýнкту г).

УЗОР. А каторай гадзíне адлятáе твой самалёт?

Мой самалёт адлятáе у 26 часíнаў пéрад чацьвéртай.

1. А каторай гадзíне адлятáе твой самалёт?
2. А каторай гадзíне пачынáецца лéкцыя?
3. А каторай гадзíне пачынáецца пéршы сэанс у кіно?
4. А каторай гадзíне прыйшоў цягнік?
5. А каторай гадзíне ты вярнýўся дамоў?
6. А каторай гадзíне скончыўся мэч?
7. А каторай гадзíне адплы́ў вадаплáў?
8. На каторую гадзíну йдзеш да лéкара?
9. А каторай гадзíне ў цябé спаткáньне з адвакáтам?

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 306. У школе вýчні чытáюць гýтарку па ролях, дома вýчацца яé, каб на другí раз у школе магчы́ вéсьці гэтую гýтарку напáмяць.

КАТОРАЯ ГАДЗÍНА?

Васíль: Сымон, каторая гадзíна ў цябé?

Сымон: За дзéсяць пя́тая.

Васíль: А ў мянé пя́тая ўжо.

Сымон: Твой гадзíньнік сьпяшáецца.

Васíль: Ня можа быць, гэта хібá твой позьніцца.

Сымон: Не, і гэтага ня можа быць. Мой гадзíньнік добры. Заўсёды добра пакáзвае час. А сёньня я чуў сыгнáл у рáдыё, як пéршую гадзíну падавáлі. Гля́нуў, і на маім гадзíньніку былá якráз роўна пéршая.

Васíль: Ну, знáчыцца, мой сьпяшáецца. Пасьля́ таго, як я зрабíў экспэрымэнт, каб пабáчыць, які ваданепранікáльны мой гадзíньнік, ды даў зь ім нырцá, ён пачáў пакрысé позьніцца, а сёньня, бáчу, зьмяніў курс, сьпяшáецца.

Сымон: Ты брáтка, хутчэй нясí яго да мáйстра, да гадзíншчыка. Я знáю дзя́дзьку, які бязь ніякіх экспэрымэнтаў пайшоў плáваць з гадзíньнікам. Нуй бывáй. Гадзíньнік зусім стаў.

Слоўнік (Vocabulary)

гадзіньнік сьпяшáецца the watch (clock) is fast
гадзіньнік позьніцца the watch is slow
гадзіньнік добра пакáзвае час the watch shows the right time
сыгнáл, -у (m.) signal
экспэрымэнт, -у (m.) experiment
ваданепранікáльны, -ая, -ае waterproof
даць нырцá to dive
курс, -у (m.) course, (in this case) direction
máйстар гадзíньнікаў or гадзíншчык, -а (m.) watchmaker
гадзíньнік стаў the watch stopped

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 307. [illegible] скáзы, а тады́ перапíшэце. Падчыркнéце дзеясловы ў скáзах з "каб" ды азнáчце íхны час.

1. Дзéці паскладáлі [illegible] крáлі на сонцы. 2. Вазьмéце парасон, каб ня змоклі. 3. Ня зыч [illegible] давялося самому. 4. Ён надзéў шáпку й рукавíцы, каб было [illegible] паліваем гарод, каб усё добра расло.

б) Прачытáйце скáзы, [illegible] іх у прошлым і бýдучым чáсе.

1. Я́нка просіць тáту, каб тáта купíў ямý самакáт. 2. Гароднік падстрыгáе дрэ́ўцы, каб хораша выглядáлі. 3. Мы чáста хварбýем вокны, каб ня гнілí. 4. Трэба настáвіць будзíньнік, каб набудзíў за пятнáццаць шостая. 5. Яны́ просяць, каб мы чáста пісáлі. 6. Наш дзя́дзька хоча, каб сын быў земляробам. 7. Жадáем вам, каб вы ўсе былí здаровыя й шчасьлíвыя.

ПРАКТЫКАВА́НЬНЕ 308. Перапíшэце вéршыкі, стáвячы дзе трэба адпавéдныя знакí прыпы́нку.

1. ПÉСЬНЯ ВЯСЬНÉ

Уцякáй мароз дзядýля
Чýеш ты стары́ ці не
На пагорках бýлі гýлі
Пéсьні чýюцца вясьнé
Звоніць скáча як дзіця́тка
Гэты жэ́ўжык ручаёк.
На яго бы тáя мáтка
Сонца кíдае свой зрок

Я. Колас

2. ЛЯ́ГЕРНАЯ ПÉСЕНЬКА

Нас клíча вясёлае
поле і гай
бывáй-жа да восені
школа бывáй
А зáўтра цягнік наш
пакоціць удáль
дзе сонца гуля́е
дзе пéніць вадá.

ДОКТАР ФРАНЬЦІ́ШАК СКАРЫ́НА

Найсьвятлéйшая духовая постаць Беларýсі XVI стагодзьдзя, "залатога вéку" старое беларýскае культýры — гэта выдáтны вучоны-гуманíсты ды піянéр друку на беларýскай зямлí доктар Франьцішак Скарына.

Нарадзíўся ён калí 1485 году ў Полацку, у заможнай купéцкай сям'í. Пéршыя асновы навýкі ў мовах беларýскай, царкоўнаславя́нскай ды лацíнскай малады́ Скарына здабывáў у родным Полацку. У 1504 годзе падáўся ён на філязафíчны факультэт, ці як ён тады звáўся — факультэт "сямí навýкаў вызваленых", Крáкаўскага ўнівэрсытэ́ту. Вы́звaленыя навýкі тады абыймáлі грамáтыку, лéгіку, рыторыку, мýзыку, арытмэтыку, геамэтрыю й астраномію. Пасьля́ атрыма́ньня дактара́ту ў галіне вызваленых навýкаў, Скарына вывучáў і мэдыцыну ды ў 1512 годзе ў Італíі, на слáўным тады Падуáнскім унівэрсытэ́це, здабы́ў свой друг[illegible]

Высокая асьвéта, шматбаковыя зацікаўлéньні пры вялíкіх здольна[illegible] аснову для нязвычáйна шырокае дзéйнасьці доктара Скарыны, якáя [illegible] розныя галíны, як друкáрства, літаратýру, мову, маста[illegible] ну, астраномію, батáніку. Выдáтнага, высокае навýкі мýжа з [illegible]анаю сус[illegible] каралéўскіх дварох. А зьвéдаў Скарына за сваім жыцьцём каля дзесяцех кра[illegible] пы — ад Дáніі ды Італíі на зáхадзе да Маскоўшчыны на ўсходзе.

У караля́ Дáніі, Швэды́і й Нарвэгіі Гáнса доктар Скарына быў за сакратара[illegible] віленскага бíскупа Я́на — і за сакратарá, і за надворнага лéкара. Як выдáтнага мýжа прыймáў ды захапля́ўся ягонай вучонасьцяй прýскі гэрцаг Альбрэхт. Кароль і вялíкі князь Жыгімонт Казімéравіч адмысловымі прывілéйнымі грáматамі ўзяў Скарыну, як мýжа высокае навýкі, пад сваю́ асабíстую апéку. У караля́-ж Аўстры́і, Чэхіі й Вугормшчыны Фэрдынáнда I наш вучоны быў за садаўнікá-батáніка на Градчанах у Прáзе. Вялíкае няўдáчы затое дазнáў доктар Скары́на ў Масквé. Там, на загáд маскоўскага кня́зя Васíля́ Івáнавіча, кнíгі ягоныя сканфіскавáлі ды як гэрэты́чныя публíчна спалíлі.

Ня глéдячы на тое, што, дзéля высокае адукáцыі ды выдáтных здольнасьцяў, пéрад доктарам Скарынам былí адчыненыя й двары́ валадароў Эўропы, пачуцьцёва ён чýўся зьвя́заным на́йперш із сваім "лю́дам паспалíтым", із сваім народам. І здабы́тую высокую асьвéту, і ўсе сваé здольнасьці ён тамý й навáжыў аддáць для дабрá й павы́с

У 1520 годзе доктар Скарына перабра́ўся з Пра́гі на сваю́ ба́цькаўшчыну; каб тут, у сталіцы Белару́сі Вільні, у доме бу́рмістра Яку́ба Ба́біча заснава́ць пе́ршую на ўсім усходзе Эўропы друка́рню. У Вільні ў 1522 годзе й вы́йшла пе́ршая на белару́скай зямлі́ друкава́ная кніга — Скары́нава "Мала́я падарожная кніжка".

У гэтай кніжцы Франьці́шак Скарына зьмясьціў падбор малітваў, рэлігійных сьпе́ваў і чыта́ньняў, якія ва́жна мець з сабою падарожнаму, ды далучы́ў каляндар з дава́дкамі пра сьвя́ты, пасты́, зацьме́ньні сонца й ме́сяца, даўжыню́ дня й ночы ў па-асобныя дні ме́сяцаў дзе[illegible]. Вялі́кую патрэбу якра́з такое кніжкі адчува́ў сам доктар Скары́на, [illegible] прабы́ць у падарожжах.

Высакамэ[illegible]фіна аздобленыя ды ілюстрава́ныя дрэварытамі Скары[illegible]мі заставаліся недасяга́льным узорам для іншых выда[illegible]

Ідэ́йным р[illegible]ці доктара Скары́ны была́ ягоная вялі́кая прыва́занасьць [illegible]ны ды роднае мовы. Як сам Скарына піса́ў, ён [illegible]ногі моваю свайго народу "найболей з таé прычы́ны, [illegible]зыка́ на сьвéт пусьці́ў". І чытачоў ён заклі́ка́ў, каб [illegible]ў для паспалі́тага дабра́ й айчыны сваé не шкадава́лі, бо ад прыра[illegible]ходзяць у пустыні, зна́юць я́мы сваé; пту́шкі, што лётаюць па [illegible]ведаюць гнёзды сваé; рыбы, што пла́ваюць па моры і ў рэках, чу́юць віры сваé, пчолы и тым падобныя бароняць ву́льляў сваіх; — та́кжа й лю́дзі, дзе зрадзі́ліся і ўскормленыя па Бозе, к таму́ ме́сцу вялі́кую ла́ску й ма́юць".

Дзе́сьці да канца́ сваé выдаве́цкія пля́ны "для дабра́ й пажы́тку лю́ду паспалі́тага" Скары́на ня здолеў дзе́ля ияста́чы патрэбных на гэта сродкаў. Ка́ля 1535 году ён перабра́ўся да Пра́гі на становішча каралéўскага бата́ніка-садаўніка́. У Пра́зе, у 1540 годзе, доктар Франьці́шак Скары́на й памёр.

Выдаве́цкая ды літарату́рная спа́дчына доктара Скары́ны, хоць і не заве́ршаная ўва ўсёй шырыні ягонае вялі́кае заду́мы, займа́е выда́тнае ме́сца ў гісторыі белару́скага дру́ку й культу́ры. Выда́ньні Скары́ны ся́ньня — кні́гі ве́льмі рэдкія. Іх, як скарб каштоўны, рупліва перахоўваюць бібліятэкі й музэі сьве́ту.

Сымон Бра́га

Слоўнік (Vocabulary)

постаць, -і (f.) figure (personality)
"залаты век" (m.) golden age
вучоны-гуманісты (m.) humanist-scholar
заможны, -ая, -ае well-to-do, prosperous
асновы (pl.) fundamentals
"навукі вызваленыя" humanities, liberal arts
здабыва́ць (I), здабыва́ю, -еш, -юць to obtain
шматбаковы, -ая, -ае versatile
зацікаўле́ньне, -я (n.) interest
здольнасьць, -і (f.) ability, talent
аснова, -ы (f.) base
маста́цтва, -а (n.) art

тэалёгія, -і (f.) theology
астраномія, -і (f.) astronomy
батáніка, -і (f.) botany
сакратáр, -а (m.) secretary
бíскуп, -а (m.) bishop
надворны лéкар, -а (m.) court physician
захапля́цца (I); захапля́юся, -ешся, -юцца to admire
вучонасьць, -і (f.) erudition
адмысловы, -ая, -ае special
сканфíскавáць, I (pf. of **канфíскавáць, I**) to confiscate, to seize
прывілéйная грáмата charter of immunity
асабíсты, -ая, -ае personal
садаўнíк-батáнік, -а (m.) gardener-botanist
гэрэты́чны, -ая, -ае heretical
валадáр, -á (m.) sovereign
паспалíты, -ая, -ае common
надýмаць, (I), (pf.) fut. надýмаю, -еш, -юць to intend
вынахад, -у (m.) invention
майстэрства дрýку art of printing
паясьнéньне, -я (n.) comment
чытáч, -á (m.) reader
талеранцыйны, -ая, -ае tolerant
шчыра (adv.) sincerely
заснавáць, (I), (pf.) fut. заснýю, -éш, -ю́ць to found

“Малáя падарожная кнíжка” “Little Travelling Handbook”
аздоблены, -ая, -ае ornamented
графíчна (adv.) graphically
дрэвары́т, -у (m.) woodcut
выдáньне, -я (n.) (in this case) book
выдавéц, выдаўцá (m.) publisher
недасягáльны, -ая, -ае unattainable
рухавíк, -á (m.) motor
дзéйнасьць, -і (f.) activity
мíласьцíвы, -ая, -ае dear, kind
труд, -у (m.) = **высíлак, высíлку** effort
скарб, -у (m.) treasure
айчы́на = бáцькаўшчына (f.) fatherland
прыражэ́нне -я (n.) birth
вір, -у (m.) pool
вýлей, -я [illegible]
“ускормлены [illegible]
“вялíкую [illegible] affection
пажы́так, -у (m.) [illegible]
спáдчына, -ы (f.) heritage
завéршаны, -ая, -ае complete
задýма, -ы (f.) plan
руплíва (adv.) carefully

ПРАКТЫКАВАНЬНЕ 309. Прачытáўшы ўвáжна пра Францíшка Скарыну, пíсьмова адкажэце на настýпныя пытáньні:

1. Дзе й калí нарадзíўся Францíшак Скарына?
2. Што й дзе студыявáў ён?
3. Якíмі галíнамі навýкі займáўся Скары́на?
4. Паводля гэтага апавядáньня пералíчэце ўсе крáі Эўропы, дзе быў доктар Францíшак Скары́на.
5. Ці ўсю́ды прыязна прыймáлі нáшага вýчонага ды ягоную дзéйнасьць?
6. Якíя, дзе й калí галоўныя кнíгі вы́друкаваў Скары́на? У чым галоўная вáртасьць і выдáтнасьць гэтых кнíгаў?
7. Дзе заснавáў сваю́ друкáрню Скары́на ў Беларýсі?
8. Прачытáйце цытáту з твораў Скарыны, перапíшэце яé ды навучэцеся напáмяць.
9. Што можна меркавáць з гэтых словаў пра íхнага áўтара? Ці Скары́на запраўды́ быў беларýскі патрыёта, з чаго гэта відáць?

TABLES

Declension of Nouns

Table 1. Masculine: a) nouns ending in a **hard** or a **hardened** consonant.

SINGULAR

Case	Stress on ending	Stress on stem		Hardened		
				Stress on ending		
nom.	стол	сын	народ	кош	кравéц	зýбар
gen.	сталá	сы́на	народу	кашá	краўцá	зубрá
dat.	сталý	сы́ну	народу	кашý	краўцý	зубрý
acc.	стол	сы́на	народ	кош	краўцá	зубрá
instr.	сталóм	сы́нам	народам	кашóм	краўцóм	зубрóм
loc.	на сталé	пры сыну	у народзе	у кашы	пры краўцý	аб зубры

PLURAL

Case	Stress on ending		Stress on stem	Stress on ending		
nom.	сталы	сыны	народы	кашы́	краўцы	зубры
gen.	сталóў	сынóў	народаў	кашóў	краўцóў	зубróў
dat.	сталóм	сынóм	народам	кашóм	краўцóм	зубрóм
acc.	сталы	сынóў	народы	кашы	краўцóў	зубры (оў)
instr.	сталáмі	сынáмі	народамі	кашáмі	краўцáмі	зубрáмі
loc.	на сталáх	пры сынóх	у народах	у кашóх	пры краўцóх	аб зубрóх

For hard nouns irregular in the plural such as **селянíн, мянчáнін . . .** , see § 22-V, 1 and 1в.

b) Masculine nouns ending in a **soft** consonant or "й"

SINGULAR

Case	Stress on ending			Stress on stem		
nom.	конь	лось	верабе́й	край	локаць	ву́чань
gen.	каня́	лася́	вераб'я́	кра́ю	локця	ву́чня
dat.	каню́	ласю́	вераб'ю́	кра́ю	локцю	ву́чню
acc.	каня́	лася́	вераб'я́	кра́й	локаць	ву́чня
instr.	канём	ласём	вераб'ём	кра́ем	локцем	ву́чнем
loc.	на кані́	на ласі́	на вераб'і́	у краі́	на локці́	пры ву́чню

PLURAL

Case	Stress on stem	Stress on ending			Stress on stem	
nom.	коні	ласі́	вераб'і́	краі́	локці	ву́чні
gen.	коняй	ласёў	вераб'ёў	краёў	локцяў	ву́чняў
dat.	коням	ласём	вераб'ём	краём	локцям	ву́чням
acc.	коні (яй)	ласі́ (ёў)	вераб'і́ (ёў)	краі́	локці	ву́чняў
instr.	конямі (ьмі)	лася́мі	вераб'я́мі	края́мі	локцямі	ву́чнямі
loc.	на конях	на ласёх	на вераб'ёх	у краёх	на локцях	пры ву́чнях

c) Masculine nouns ending in the **back** consonants (г, к, х)

SINGULAR

Case	Stress on ending		Stress on stem	
nom.	кажу́х	пясо́к	наста́ўнік	луг
gen.	кажуха́	пяску́	наста́ўніка	лу́гу
dat.	кажуху́	пяску́	наста́ўніку	лу́гу
acc.	кажу́х	пясо́к	наста́ўніка	луг
instr.	кажухом	пяско́м	наста́ўнікам	лу́гам
loc.	у кажуху́ й кажу́се	у пяску́	аб наста́ўніку	на лу́зе

PLURAL

Case	Stress on ending		Stress on stem	Stress on ending
nom.	кажухí	пяскí	настáўнікі	лугí
gen.	кажухоў	пяскоў	настáўнікаў	лугоў
dat.	кажухом	пяском	настáўнікам	лугом
acc.	кажухí	пяскí	настáўнікаў	лугí
instr.	кажухáмі	пяскáмі	настáўнікамі	лугáмі
loc.	у кажухох	у пяскох	пры настáўніках	на лугох

d) Masculine nouns

Case	Stress on ending		Stress on stem	PLURAL		
				Stress on stem		
nom.	старшынń	Кузьмá	мужчына	старшынí	Кузьмы	мужчыны
gen.	старшынí	Кузьмы	мужчыны	старшыняў	Кузьмоў	мужчынаў
dat.	старшыню́	Кузьму́	мужчыну	старшыням	Кузьмом	мужчынам
acc.	старшыню́	Кузьму́	мужчыну	старшыняў	Кузьмоў	мужчынаў
instr.	старшынём (ёю)	Кузьмом (ою)	мужчынам	старшынямі	Кузьмáмі	мужчынамі
loc.	пры старшыню́	Кузьму́	мужчыну	пры старшынях	Кузьмох	мужчынах

Table 2. NEUTER NOUNS

a) Nouns with stems ending in a **hard** or a **hardened** consonant.

SINGULAR

Case	Hard		Hardened	
	Stress on ending	Stress on stem	Stress on ending	Stress on stem
nom.	вакно	слова	пяро	вогнішча
gen.	вакнá	слова	пярá	вогнішча
dat.	вакнý	слову	пярý	вогнішчу
acc.	вакно	слова	пяро	вогнішча
instr.	вакном	словам	пяром	вогнішчам
loc.	на вакнé	у слове	на пяры	пры вогнішчы

PLURAL

Case	Hard		Hardened	
	Stress on stem			
nom.	вокны	словы	пёры	вогнішчы
gen.	вокнаў	словаў	пёраў	вогнішчаў
dat.	вокнам	словам	пёрам	вогнішчам
acc.	вокны	словы	пёры	вогнішчы
instr.	вокнамі	словамі	пёрамі	вогнішчамі
loc.	на вокнах	у словах	на пёрах	пры вогнішчах

b) Nouns with stems ending in a **soft** consonant.

	SINGULAR				PLURAL	
	Stress on ending	Stress on stem			Stress on ending	Stress on stem
nom.	жыццё	поле	зада́ньне	здароўе	палі́	зада́ньні
gen.	жыцця́	поля	зада́ньня	здароўя	палёў	зада́ньняў
dat.	жыццю́	полю	зада́ньню	здароўю	палём	зада́ньням
acc.	жыццё	поле	зада́ньне	здароўе	палі́	зада́ньні
instr.	жыццём	полем	зада́ньнем	здароўем	палямі́	зада́ньнямі
loc.	у жыцці́	у полі́	у зада́ньні	аб здароўі	у палёх	у зада́ньнях

The nouns **жыццё, здароўе** are seldom used in the plural.

c) Declension of **вока, вуха** (irregular in the plural)

Case	SINGULAR		PLURAL	
nom.	вока	вуха	вочы	вушы
gen.	вока	вуха	вачэй	вушэй
dat.	воку	вуху	вачом	вушом
acc.	вока	вуха	вочы	вушы
instr.	вокам	вухам	вача́мі, вачмі́	вуша́мі, вушмі́
			or вачыма	or вушыма
loc.	у воку	у вуху or вусе	у вачох, у ваччу́	у вушох, у вушшу́

For the declension of **neuter nouns** such as **імя́, плямя́, дзіцё(я), куранё(я),** see § 22 — V, 1.

Table 3. FEMININE NOUNS

a) Nouns ending in **-а** or in a **hardened** consonant.

SINGULAR

Case	Hard			Hardened		
	Stress on ending	Stress on stem	Stress on ending	Stress on stem		
nom.	зімá	школа	гарá	вéжа	печ	мыш
gen.	зімы	школы	гары	вéжы	пéчы	мы́шы
dat.	зімé	школе	гары	вéжы	пéчы	мы́шы
acc.	зімý	школу	гарý	вéжу	печ	мыш
instr.	зімою(ой)	школаю(ай)	гарою(ой)	вéжаю(ай)	пéчаю(ай) or пéччу	мышаю(ай) or мы́шшу
loc.	аб зімé	у школе	на гары́	у вéжы	у пéчы	аб мышы

PLURAL

Case	Hard			Hardened			
	Stress on stem			Stress on stem			
nom.	зíмы	школы		горы	вéжы	пéчы	мышы
gen.	зíмаў	школаў		гораў	вéжаў	пéчаў	мышэй(мы́шаў)
dat.	зíмам	школам		горам	вéжам	пéчам	мы́шам
acc.	зíмы	школы		горы	вéжы	пéчы	мышэй(мы́шаў)
instr.	зíмамі	школамі		горамі	вéжамі	пéчамі	мы́шамі
loc.	аб зíмах	у школах		у горах	на вéжах	у пéчах	аб мы́шах

b) Nouns ending in **-я** or a **soft** consonant

SINGULAR

Case	Nouns ending in -я				Nouns ending in a soft consonant		
	Stress on ending	Stress on stem			Stress on stem	Stress on ending	
nom.	зямля́	пéсьня	лíнія	хвоя	соль	косьць	кроў
gen.	зямлí	пéсьні	лíніі	хвоі	солі	касьцí	крывí

dat.	зямлí	пéсьнi	лíнiї	хвоí	солí	касьцí	крывí
acc.	зямлю́	пéсьню	лíнію	хвою	соль	косьць	кроў
instr.	зямлёю	пéсьняю	лíнiяй	хвояй	соляю	касьцёю(ёй)	крывёю(ёй)
	or зямлёй	or пéсьняй			or сольлю	or косьцю	or кроўю
loc.	на зямлí	у пéсьнi	на лíнiї	на хвоí	у солí	на касьцí	у крывí

PLURAL

Case	Stress on stem					Stress on ending
nom.	зéмлi	пéсьнi	лíнiї	хвоí	солí	косьцí
gen.	зéмляў	пéсьняў	лíнiяў	хвояў	соляў	касьцéй
	or зямéль					
dat.	зéмлям	пéсьням	лíнiям	хвоям	солям	касьцём
acc.	зéмлi	пéсьнi	лíнiї	хвоí	солí	косьцí
instr.	зéмлямi	пéсьнямi	лíнiямi	хвоямí	солямí	касьця́мi
						or касьцьмí
loc.	на зéмлях	у пéсьнях	на лíнiях	на хвоях	у солях	на касьцёх

Declension of Adjectives (See § 16—I a, b and § 20—I)

Table 4. Hard and Hardened Declensions

a) With stress on ending

	SINGULAR						PLURAL	
Case	m.	f.	n.	m.	f.	n.	for all genders	
nom.	малы	мала́я	малое	чужы	чужа́я	чужое	малыя	чужыя
gen.	малога	малое(й)	малога	чужога	чужое(й)	чужога	малых	чужых
dat.	малому	малой	малому	чужому	чужой	чужому	малым	чужым
acc.	малы	малу́ю	малое	чужы	чужу́ю	чужое	малыя	чужыя
	or малога			or чужога			or малых	or чужых
instr.	малым	малою(й)	малым	чужым	чужою(й)	чужым	малымí	чужы́мí
loc.	малым	малой	малы́м	чужым	чужой	чужым	малых	чужых

b) With stress on stem

Case	SINGULAR m.	f.	n.	m.	f.	n.	PLURAL for all genders	
nom.	босы	босая	босае	шэры	шэрая	шэрае	босыя	шэрыя
gen.	босага	босае(й)	басага	шэрага	шэрае(й)	шэрага	босых	шэрых
dat.	босаму	босай	босаму	шэраму	шэрай	шэраму	босым	шэрым
acc.	босы or босага	босую	босае	шэры or шэрага	шэрую	шэрае	босыя or босых	шэрыя or шэрых
instr.	босым	босаю(й)	босым	шэрым	шэраю(й)	шэрым	босымі	шэрымі
loc.	босым	босай	босым	шэрым	шэрай	шэрым	босых	шэрых

Table 5. Soft Declension (Stress always on stem)

Case	SINGULAR m.	f.	n.	PLURAL for all genders
nom.	сíні	сíняя	сíняе	сíнія
gen.	сíняга	сíняе(й)	сíняга	сíніх
dat.	сíняму	сíняй	сíняму	сíнім
acc.	сíні or сíняга	сíнюю	сíняе	сíнія or сíніх
instr.	сíнім	сíняю(й)	сíнім	сíнімі
loc.	сíнім	сíняй	сíнім	сíніх

Table 6. Mixed declension (Adjectives with stems ending in г, к, х)

Case	SINGULAR Stress on ending m.	f.	n.	Stress on stem m.	f.	n.	PLURAL Stress on ending	stem
							for all genders	
nom.	сухí	сухáя	сухое	высокі	высокая	высокае	сухíя	высокія
gen.	сухога	сухое(й)	сухога	высокага	высокае(й)	высокага	сухíх	высокіх
dat.	сухому	сухой	сухому	высокаму	высокай	высокаму	сухíм	высокім
acc.	сухí or сухога	сухýю	сухое	высокі or высокага	высокую	высокае	сухíя or сухíх	высокія or высокіх
instr.	сухíм	сухою(й)	сухíм	высокім	высокаю(й)	высокім	сухíмі	высокімі
loc.	сухíм	сухой	сухíм	высокім	высокай	высокім	сухíх	высокіх

For the Comparative of Adjectives, see § 21—I, IIa, 1—5
For the Superlative of Adjectives, see § 21—IIa, b

Declension of Pronouns

Table 7. Personal pronouns: я, ты, ён, янá, яно — мы, вы, яны (See § 13—III)

Case	SINGULAR						PLURAL	
	1st person	2nd person	3rd person				1st p.	2nd p.
	for all genders		m.	f.	n.		for all genders	
nom.	я	ты	ён	янá	яно		мы	вы
gen.	мяне́	цябе́	яго	яе́	яго		нас	вас
dat.	мне	табе́	яму́	ёй	яму́		нам	вам
acc.	мяне́	цябе́	яго	яе́	яго		нас	вас
instr.	мною(ой)	табою(ой)	ім	ёю(ёй)	ім		на́мі	ва́мі
loc.	пры мне	пры табе́	пры ім	ёй	ім		пры нас	вас

Table 8. Interrogative and Relative Pronouns

Case	SINGULAR and PLURAL	SINGULAR			PLURAL
	for all genders	m.	f.	n.	for all genders
nom.	хто што	які́	яка́я	якое	які́я
gen.	каго чаго	якога	якое(й)	якога	які́х
dat.	каму́ чаму́	якому	якой	якому	які́м
acc.	каго што	які́ or якога	яку́ю	якое	які́я or які́х
instr.	кім чым	які́м	якою(й)	які́м	які́мі
loc.	пры кім чым	пры які́м	пры якой	пры які́м	пры які́х

a) The **demonstrative** pronoun "такі́" is declined like "які́".

b) For the declension of **indefinite** pronouns:

1. хтосьці, штосьці; 2. хтось, штось; 3. не́хта, не́шта; 4. які́сьці, яка́ясьці, якоесьці; 5. які́сь, яка́ясь, якоесь; 6. не́йкі, не́йкая, не́йкае; 7. не́чый, не́чыя, не́чые; 8. хто-не́будзь, што-не́будзь; 9. які́-не́будзь, яка́я-не́будзь, якое-не́будзь, see § 27-II, 2.

c) For the declension of **negative** pronouns:

1. **ніхто, нішто**; 2. **ніякі, ніякая, ніякае**, see **§ 27-III.**

Table 9. **The Interrogative Pronoun — чый?, чыя? чыё? and the Definite Pronoun — увéсь, уся́, усё**

	SINGULAR						PLURAL	
Case	m.	f.	n.	m.	f.	n.	for all genders	
nom.	чый	чыя́	чыё	увéсь	уся́	усё	чыé	усé
gen.	чыйго	чыé(ёй)	чыйго	усяго	усяé(ёй)	усяго	чыíх	усíх
dat.	чыйму́	чыёй	чыйму́	усяму́	усёй	усяму́	чыíм	усíм
acc.	чый or чыйго	чыю́	чыё	увéсь or усяго	усю́	усё	чыé or чыíх	усé or усíх
instr.	чыíм	чыéю(ёй)	чыíм	усíм	усёю(ёй)	усíм	чыймí	усімі
loc.	пры чыíм	чыёй	чыíм	пры ўсíм	усёй	усíм	пры чыíх	усíх

The **possessive** pronouns **мой, твой, свой** are declined like **"чый"**. **(See § 25—IV, 2.)**

Table 10. **Demonstrative Pronouns**

	SINGULAR						PLURAL	
Case	m.	f.	n.	m.	f.	n.	for all genders	
nom.	гэты	гэтая	гэтае	той	та́я	тое	гэтыя	ты́я
gen.	гэтага	гэтае	гэтага	таго	таé, тэй	таго	гэтых	тых
dat.	гэтаму	гэтай	гэтаму	таму́	тэй(той)	таму́	гэтым	тым
acc.	гэты or гэтага	гэтую	гэтае	той or таго	ту́ю	тое	гэтыя or гэтых	ты́я or тых
instr.	гэтым	гэтаю(ай)	гэтым	тым	тэй(тою)	тым	гэтымі	ты́мі
loc.	у гэтым	гэтай	гэтым	пры тым	тэй(той)	тым	у гэтых	тых

Also **гэны, гэткі**, the possessives **ягоны, éйны; на́ш(ы), ва́ш(ы), іхны, усíхны**, the definite pronouns **уся́кі, ка́жны (кожны), і́ншы**, the interrogative or relative **каторы** and the indefinite **некаторы** are declined like **гэты.**

Table 11. Definite Pronouns

Case	SINGULAR m.	f.	n.	m.	f.	n.	PLURAL for all genders	
nom.	сам	сама́	само	са́мы	са́мая	са́мае	са́мі	са́мыя
gen.	самога	самое(ой)	самога	са́мага	са́мае	са́мага	самі́х	са́мых
dat.	самому	самой	самому	са́маму	са́май	са́маму	самі́м	са́мым
acc.	самога сам	саму́ю	само	са́мы or са́мага	са́мую	са́мае	самі́х	са́мыя or са́мых
instr.	самы́м	самою(ой)	самы́м	са́мым	са́май	са́мым	самі́мі	са́мымі
loc.	пры самым	самой	самы́м	у са́мым	са́май	са́мым	самі́х	са́мых

Table 12. The Reflexive Pronoun — сябе́ (Singular and Plural, All Genders)

nom. none; gen. acc. **сябе́**; dat. loc. **сабе́**; instr. сабою(й). (See § 23—VII.)

VERBS

Table 13. The First Conjugation and the Second Conjugation (See § 4—IV b, c, and § 8—I b, c)

CONJUGATION I	CONJUGATION II
INFINITIVE	
a) пяя́ць, браць b) чыта́ць, піса́ць	a) стая́ць, маўча́ць b) хваліць, вучыць
PRESENT TENSE	
a) Stressed endings	
SINGULAR	SINGULAR
я пяю́ бяру́	я стаю́ маўчу́
ты пяе́ш бярэш	ты стаі́ш маўчыш
ён, яна́, яно пяе́(ць) бярэ(ць)	ён, яна́, яно стаіць маўчы́ць
PLURAL	PLURAL
мы пяём бяро́м	мы стаім маўчы́м
вы пеяцё(це́) бераце́(це́)	вы стаіцё маўчыцё
яны пяю́ць бяру́ць	яны стаяць маўча́ць

b) Unstressed endings

SINGULAR			SINGULAR		
я	чыта́ю	пішу́	я	хвалю́	вучу́
ты	чыта́еш	пі́шаш	ты	хва́ліш	ву́чыш
ён, яна́, яно	чыта́е(ць)	пі́ша(ць)	ён, яна́, яно	хва́ліць(е)	ву́чыць(а)
PLURAL			**PLURAL**		
мы	чыта́ем	пі́шам	мы	хва́лім	ву́чым
вы	чыта́еце	пі́шаце	вы	хва́ліце	ву́чыце
яны	чыта́юць	пі́шуць	яны	хва́ляць	ву́чаць

SECOND FUTURE TENSE
(Imperfective*)

SINGULAR			SINGULAR		
я	буду	пяя́ць, браць	я	бу́ду	стая́ць, маўча́ць
ты	бу́дзеш	чыта́ць, піса́ць	ты	бу́дзеш	хвалі́ць, вучы́ць
ён, яна́, яно	бу́дзе		ён, яна́, яно	бу́дзе	
PLURAL			**PLURAL**		
мы	бу́дзем	пяя́ць, браць	мы	бу́дзем	стая́ць, маўча́ць
вы	бу́дзеце	чыта́ць, піса́ць	вы	бу́дзеце	хвалі́ць, вучы́ць
яны	бу́дуць		яны́	бу́дуць	

PERFECTIVE* FUTURE TENSE

a) Stressed endings

SINGULAR			SINGULAR		
я	запяю́	забяру́	я	пастаю́	памаўчу́
ты	запяе́ш	забярэ́ш	ты	пастаі́ш	памаўчыш
ён, яна́, яно	запяе́(ць)	забярэ́(ць)	ён, яна́, яно	пастаі́ць	памаўчы́ць
PLURAL			**PLURAL**		
мы	запяём	забяро́м	мы	пастаі́м	памаўчым
вы	запеяцё(е́)	забераце́(е́)	вы	пастаі́цё	памаўчыцё
яны	запяю́ць	забяру́ць	яны́	пастаю́ць	памаўча́ць

* For the aspects — the imperfective and the perfective, see § 15-I and 15-II.

b) Unstressed endings

SINGULAR

я	прачыта́ю	напішу́	я	пахвалю́	навучу́
ты	прачыта́**еш**	напі́ша**ш**	ты	пахва́лі**ш**	нав**у́**чы**ш**
ён, яна́, яно	прачыта́**е(ць)**	напі́ша**(ць)**	ён, яна́, яно	пахва́лі**ць(е)**	нав**у́**чы**ць(а)**

PLURAL

мы	прачыта́**ем**	напі́ша**м**	мы	пахва́лі**м**	нав**у́**чы**м**
вы	прачыта́**еце**	напі́ша**це**	вы	пахва́лі**це**	нав**у́**чы**це**
яны́	прачыта́**юць**	напішу́**ць**	яны́	пахва́ля**ць**	нав**у́**ча**ць**

PAST TENSE** (see § 6-II, 1)

SINGULAR

я, ты, ён	бра**ў**	піса́**ў**	я, ты, ён	стая́**ў**
я, ты, яна́	бра́**ла**	піса́**ла**	я, ты, яна́	стая́**ла**
яно	бра́**ла**	піса́**ла**	яно	стая́**ла**

PLURAL

мы, вы, яны	бра́**лі**	стая́**лі**	мы, вы, яны́	піса́**лі**	маўча́**лі**

** **For the past tense of the verbs with the infinitive ending in: -сьці, -зьці, -чы (не́сьці — нёс, ве́зьці — вёз, бе́гчы — бег and ве́сьці — вёў, се́сьці — сеў...), see § 14-II, 1-3**

PLUPERFECT TENSE (see § 28-V, 1)

SINGULAR

я, ты, ён	**быў**	**забра́ўшы***** **напіса́ўшы**	я, ты, ён	**быў**	**пастая́ўшы***** **навучыўшы**
я, ты, яна́	**была́**		я, ты, яна́	**была́**	
яно	**было**		яно	**было**	

PLURAL

мы, вы, яны	**былі**	**забра́ўшы** **напіса́ўшы**	мы, вы, яны́	**былі**	**пастая́ўшы** **навучыўшы**

*** **For verbal adverbs, see § 28-IV, 1-4.**

FUTURE PERFECT TENSE (see § 28-V, 2)

SINGULAR

я	бу́ду	**забра́ўшы*** напіса́ўшы**	я	бу́ду	**пастая́ўшы*** навучы́ўшы**
ты	бу́дзеш		ты	бу́дзеш	
ён, яна́, яно	бу́дзе		ён, яна́, яно	бу́дзе	

PLURAL

[illegible]	[illegible]ем	**забра́ўшы напіса́ўшы**	мы	бу́дзем	**пастая́ўшы навучы́ўшы**
[illegible]	[illegible]еце		вы	бу́дзеце	
[illegible]	[illegible]уць		яны́	бу́дуць	

*** For verbal adverbs, see **§ 28-IV, 1-4.**

IMPERATIVE (see § 14-III, a-e)

SINGULAR	PLURAL

1. Чыта́ць, стая́ць (the present stem ends in a **vowel**)

1st per. none	1st per. чыта́йма, стойма
2nd per. чыта́й, стой	2nd per. чыта́йце, стойце
3rd per. **няха́й** чыта́е, стаі́ць	3rd per. **няха́й** чыта́юць, стая́ць

2. **Не́сьці, кры́кнуць, гавары́ць** (the present stem ends in a single **consonant** and the 1st per. singular **ending** is **stressed**, or the stem ends in a group of consonants.)

1st per. none	1st per. нясе́м(а), гаварэ́м(а), кры́кнем(а)
2nd per. нясі́, гавары́, кры́кні	2nd per. нясе́це, гаварэ́це, крыкне́це
3rd per. **няха́й** нясе́, гаворыць, кры́кне	3rd per. **няха́й** нясу́ць, гавораць, крыкнуць

3. **Се́сьці, рэзаць** (the present stem ends in a single **consonant** and the **stem is stressed.**)

1st per. none	1st per. ся́дзьма, рэжма
2nd per. ся́дзь, рэж	2nd per. ся́дзьце, рэжце
3rd per. **няха́й** ся́дзе, рэжа	3rd per. **няха́й** ся́дуць, рэжуць

CONDITIONAL (see § 27-V)

SINGULAR

я, ты, ён	пяя́ў-бы	піса́ў-бы	я, ты, ён	стая́ў-бы	маўча́ў-бы
я, ты, яна́	пяя́ла-б	піса́ла-б	я, ты, яна́	стая́ла-б	маўча́ла-б
яно	пяя́ла-б	піса́ла-б	яно	стая́ла-б	маўча́ла-б

PLURAL					
мы, вы, яны́	пяя́лі-б	піса́лі-б	мы, вы, яны́	стая́лі-б	маўча́лі-б

For the transitive and intransitive verbs, see § 28-I.
For participles, see § 28-III. For the **active** and **passive** voice of the verbs, see **§ 28-II.**

Table 14. Reflexive Verbs (see § 14-IV, 1-3)

INFINITIVE: мы́цца, пыта́цца

PRESENT TENSE			PAST TENSE		
я	мы́юся	пыта́юся	я, ты, ён	мы́ўся	пыта́ўся
ты	мы́ешся	пыта́ешся	я, ты, яна́	мы́лася	пыта́лася
ён, яна́, яно	мы́ецца	пыта́ецца	яно	мы́лася	пыта́лася
мы	мы́емся	пыта́емся			
вы*	мы́ецеся	пыта́ецеся	мы, вы*, яны́	мы́ліся	пыта́ліся
яны́	мы́юцца	пыта́юцца			

COMPOUND FUTURE TENSE

я	бу́ду	мы́цца	пыта́цца	мы	бу́дзем	мы́цца	пыта́цца
ты	бу́дзеш	мы́цца	пыта́цца	вы*	бу́дзеце	мы́цца	пыта́цца
ён, яна́, яно	бу́дзе́	мы́цца	пыта́цца	яны́	бу́дуць	мы́цца	пыта́цца

IMPERATIVE

1st person	none		мы́ймася	пыта́ймася*
2nd person	мы́йся	пыта́йся	мы́йцеся	пыта́йцеся*
3rd person	няха́й мы́ецца,	пыта́ецца	няха́й мы́юцца,	пыта́юцца

CONDITIONAL

я, ты, ён	мы́ўся-б	пыта́ўся-б	мы	мы́ліся-б	пыта́ліся-б
я, ты, яна́	мы́лася-б	пыта́лася-б	вы*		
яно	мы́лася-б	пыта́лася-б	яны́		

* All second person pl. forms are also used as polite forms of the singular and plural.

VERBAL ADVERBS (present tense): **мы́ючыся, пыта́ючыся**
(past tense pf.): **памы́ўшыся, папыта́ўшыся**

For the impersonal verbs ending in **-цца, -ся, see § 26 V a, b.**
For the reflexive verbs in expression of the **passive voice,** see **§ 28-II, II b 1.**

Table 15. The conjugation of "быць" and the Irregular Verbs "е́сьці" and "даць" pf.

INFINITIVE

быць (to be) **е́сьці (to eat)** **даць (to give)**

PRESENT TENSE

	SINGULAR		PLURAL		
я	**ем**		мы	**ямо, ядзём**	
ты	**ясі́**		вы	**ясьцё(е́), ядзіцё**	None
ён, яна́, яно	**есьць**		яны́	**ядзу́ць**	

PAST TENSE

	SINGULAR			PLURAL	
я	**быў**	**еў**	**даў**	мы, вы, яны́	**былі́, е́лі, далі́**
ты, яна́	**была́**	**е́ла**	**дала́**		
яно	**было**	**е́ла**	**дало**		

PERFECTIVE* FUTURE TENSE

	SINGULAR			PLURAL		
я	**бу́ду**	**зьем**	**дам**	мы	**бу́дзем**	**зьямо**	**дамо, дадзём**
ты	**бу́дзеш**	**зьясі́**	**дасі́**	вы	**бу́дзеце**	**зьясьцё(е́)**	**дасьцё(е́), дадзіцё**
ён, яна́, яно	**бу́дзе**	**зьесьць**	**дасьць**	яны́	**бу́дуць**	**зьядзу́ць**	**дадзу́ць**

* Only the verb "**е́сьці**" has the COMPOUND FUTURE tense: я **бу́ду** е́сьці, ты **бу́дзеш** е́сьці, . . . яны́ **бу́дуць** е́сьці.

IMPERATIVE

	SINGULAR			PLURAL		
1st per.		None		**бу́дзьма**	**е́жма**	**да́йма**
2nd per.	**будзь**	**еж**	**дай**	**бу́дзьце**	**е́жце**	**да́йце**
3rd per.	**няха́й бу́дзе,**	**есьць,**	**дасьць**	**няха́й бу́дуць,**	**ядзу́ць,**	**дадзу́ць**

PARTICIPLE

Present Active:	**бу́дучы, -ая, -ае**	None
Past Active:	**былы́, -а́я, -ае**	None
Past Passive:	None	**зье́дзены, -ая, -ае; да́ны or да́дзены, -ая, -ае**

Table 16. Numerals

a) Cardinal* and Ordinal** Numerals

CARDINAL / КОЛЬКАСНЫЯ	ORDINAL / ПАРАДКАВЫЯ
1. адзі́н, адна́, адно	пе́ршы, -ая, -ае
2. два, дзьве	другі́, -а́я, -ое
3. тры	трэйці, -яя, -яе
4. чатыры	чацьве́рты, -ая, -ае
5. пяць	пя́ты, -ая, -ае
6. шэсьць	шосты, -ая,
7. сем	семы.
8. восем	восьмы. -ая.
9. дзе́вяць	дзявяты, -ая,
10. дзе́сяць	дзясяты, -ая, -ае
11. адзіна́ццаць	адзіна́ццаты, -ая, -ае
12. двана́ццаць	двана́ццаты, -ая, -ае
13. трына́ццаць	трына́ццаты, -ая, -ае
14. чатырна́ццаць	чатырна́ццаты, -ая, -ае
15. пятна́ццаць	пятна́ццаты, -ая, ае
16. шасна́ццаць	шасна́ццаты, -ая, -ае
17. сямна́ццаць	сямна́ццаты, -ая, -ае
18. васьміна́ццаць or васямна́ццаць	васьміна́ццаты or васямна́ццаты, -ая, -ае
19. дзевятна́ццаць	дзевятна́ццаты, -ая, -ае
20. два́ццаць	двацца́ты, -ая, -ае
21 два́ццаць адзі́н, адна́, адно	два́ццаць пе́ршы, ая, -ае
22 два́ццаць два, дзьве	два́ццаць другі́, -а́я, -ое
23 два́ццаць тры	два́ццаць трэйці, -яя, -яе
. . . . .	. . . . .
29 два́ццаць дзе́вяць	два́ццаць дзявя́ты, -ая, -ае
30 трыццаць	трыцца́ты, -ая, -ае
40 сорак	саракавы, -а́е, -ое або сараковы, -ая, -ае
50 пя́ць**дзесят**	пя́ць**дзяся́ты**, -ая, -ае
60 шэсьць**дзесят**	шэсьць**дзяся́ты**, -ая, -ае
70 се́м**дзесят**	се́м**дзяся́ты**, -ая, -ае
80 восем**дзесят**	восем**дзяся́ты**, -ая, -ае
90 дзе́вяць**дзесят**	дзе́вяць**дзяся́ты**, -ая, -ае
100 **сто**	**сотны** (або соты), -ая, -ае
101 **сто** адзі́н (адна́, адно)	сто **пе́ршы**, -ая, -ае
199 **сто** дзе́вяць**дзесят** дзе́вяць	сто дзе́вяць**дзесят** дзявя́ты, -ая, -ае

* For the formation of **cardinal numerals 11-19** and **20, 30 . . . 100,** see § 11-IIIa, b, and § 23-I, 1.
For the formation of **cardinals above 100,** see § 25-Ia.

** For the formation of **ordinal numerals 1-20,** see § 21-IVb 1, 2.
For the formation of **ordinal numerals above 20,** see § 23-I, 2 and § 25-I b-d.

200 дзьвéсьце	дву́х**сотны** or двух**соты** and дву**соты, -ая, -ае**
300 трыста	трох**сотны** or трох**соты** and тры**соты, -ая, -ае**
400 чатырыста	чатырох**сотны** or чатырох**соты** and чатры**соты, -ая, -ае**
500 пя́ць**сот**	пя́ць**сотны** or пя́ць**соты, -ая, -ае**
600 шэсьць**сот**	шэсьць**сотны** or шэсьць**соты, -ая, -ае**
700 се́м**сот**	се́м**сотны** or се́м**соты, -ая, -ае**
800 восем**сот**	восем**сотны** or восем**соты, -ая, -ае**
900 дзе́вяць**сот**	дзе́вяць**сотны** or дзе́вяць**соты, -ая, -ае**
[illegible] тысяча	тысячны, **-ая, -ае**
[illegible]	двухтысячны or двутысячны, **-ая, -ае**
[illegible]	пяцьтысячны, **-ая, -ае**
[illegible]	міліённы, **-ая, -ае**
[illegible]	двухміліённы or двуміліённы, **-ая, -ае**
мілія́рд	мілія́рдны, **-ая, -ае**
(амэрыка́нскі біліён)	

b) For the declension of **cardinal numerals 1-100,** see § 23-III, 1-6.
For the declension of **cardinals above 100,** see § 25-II, 1-4.

c) For the declension of **ordinal numerals 1-20,** see § 21-IV c.
For the declension of **ordinals above 20,** see § 23-II.

d) For the declension of the **collective** numerals **двое, трое, чацьвёра...,** see § 26-I, 3 а, б.

e) For the agreement of **cardinal numerals** with **nouns,** see § 25-IIIa, b.

f) For the agreement of **numerals** with **verbs,** see § 26-IIa, b.

g) For **numerals-fractions** and their declension, see § 26-III 1, 2.

The dance Lavonikha

GUIDE TO THE USE OF THE VOCABULARIES

1. The vocabularies in "Book 2" are designed to complement those of "Book 1". They include all new words used in "Book 2" and some from "Book 1", which were not included in its vocabularies. Thus, when looking for meanings of words, the vocabularies of **both books** should be consulted.

   Byelorussian-English vocabularies should also be consulted whenever there is any doubt about stress, gender, the declension of nouns (the genitive endings are given for all nouns), or any verb forms.

2. As has already been stated in "Book 1", in words containing the vowels "о", "э" or "ё" (excepting those of foreign origin) the stress is not marked. It is indicated by the vowels themselves as in Byelorussian they only appear under stress.

3. Two stresses in one-stem words signify that the word may be used with the either of these stresses.

4. In the entries such as:
   a) **ачы́сьціць (II)** (pf. of **ачышча́ць, I**) fut.... to clear, vacate, clean—the "to" before the first verb refers to and defines the infinitive form for all the listed verbs.
   b) **вы́капаць (I)** (pf. of **выкопваць**) fut.... the unmarked conjugation of the verb "**выкопваць**" signifies that this verb belongs to the same conjugation as the preceding one.
   c) lick, to **лізáць (I), аб-** pf. — a hyphen after the prefix "**аб**" represents the headword "**лізáць**", i.e., perfective aspect of "**лізáць**" is "**аблізáць**".
   d) prosperous **квітнéючы, багáты, заможны, -ая, -ае** — the endings "**-ая, -ае**" refer not only to "**заможны**" but also to the preceding adjectives.
   e) **дву(х)сотны, . . .** — the brackets enclosing letter "**х**" signify that both forms without and with "**х**" are in use.

Abbreviations / СКАРАЧЭНЬНІ

The following abbreviations are used throughout the text and in the vocabularies. Parts of speech are indicated only when confusion might arise.

A. English

acc.	accusative	inter(rog).	interrogative
act.	actual verb	irr.	irregular
adj.	adjective	lit.	literally
adv.	adverb	loc.	locative
arch.	archaic	m.	masculine
c.	century	math.	mathematics
B.	Byelorussian	mus.	music

cf.	compare
coll.	collective
colloq.	colloquial
comp.	comparative
conjunc.	conjunction
dat.	dative
decl.	declined
def.	definite
dim.	diminutive
e.g.	[illegible]mple
[illegible]	[illegible]
[illegible]	[illegible]
[illegible]	[illegible]ive
[illegible]	[illegible]
[illegible]	grammar
[illegible]	habitual verb
[illegible]	that is
[illegible]	imperative
[illegible]	imperfective
impers.	impersonal
indecl.	indeclinable
indef.	indefinite
instr.	instrumental

n.	neuter
neg.	negative
варочаць (I), **-чаю, -еш, -юць** to send (back); refund, make up
варочаць чыéсьці выдáткі to refund to smb. his expenditures
вáрта, -ы (f.) post
вáрта, гэта (impers.) it is worth while
вартавы́, -ога (m.) guard; sentry
варухну́цца (I) (pf. of **варушы́цца**, II), fut. **-ну́ся, -е́шся, -у́цца** to stir, move once
варушы́цца (II), **-шу́ся, -ру́шышся, -ацца** to stir, move
варэньне, -я (n.) cooking; jam
васíлёк, -лькá (m.) cornflower
васьмá (adv.) eight times
васьмá восем eight times eight, eight eights
васьмёра (coll. num.) eight
ад усіх васьмярох from all eight
іх васьмёра they are eight, there are eight of them
васьмігадовы, -ая, -ае eight-year-old; of eight years
в-ая дзяўчы́нка eight-year-old girl
васьмігадовы пэрыяд period of eight years
васьмінáццаты or **васямнáццаты, -ая, -ае** eighteenth
васьмінáццаць or **васямнáццаць, -ёх** eighteen
ваўня́ны, -ая, -ае woolen
вáш(ы), вáша(я), вáша(е) (pron. adj.) your, yours
гэта вáшая кнíга this is your book
Гэта кнíга вáшая? Is this book yours?
мая́ кнíга тут, а вáшая там my book is here and yours is there
Як мáюцца вáшыя? How are your people?
вáшага мне ня трэба I don't want anything of yours
ваяк, -á (m.) warrior
вéда, -ы (f.) knowledge
вéдама, -а (n.) notice, consideration
давéсьці што-н. да чыйго-н. вéдама to inform smb. of smth., to bring smth. to smb's notice
прыймáць нéшта да вéдама to take smth. into consideration
вéдама or вядома it is known; of course
вéдзьма, -ы (f.) witch
вéйка, -і (f.) eyelash
век, -у (m.) century; age; lifetime
на маíм вякý in my lifetime
на наш век стáне it will last through our lifetime
каменны век the Stone Age
бронзавы век the Bronze Age
сярэднія вякí = сярэднявéчча the Middle Ages
на вéкі вéчныя for ever
век (adv.) for ages
век з табою мы ня бáчыліся we have not seen each other for ages
век жывí, в. вучыся live and learn
вéка, -а (n.) lid, cover
вераб'ёў, -ва, -ва sparrow's
вербалоз, -у (m.) osier, bay-leaf willow
вéрны, -ая, -ае loyal, faithful
верх, -у (m.) top, summit; brim
поўны да вéрху brimful
верх кар'éры the summit of a career
верхавíна, -ы (f.) top; summit, peak
верхавíна гары́ peak/summit of the mountain
вéрхні, -яя, -яе upper, top

Зе́рхняя Кана́да Upper Canada
зе́рша, -ы (f.) fishing-basket, creel
зе́села or **вясёла** (adv.) happily
абодвум **весяле́й** both feel happier
зе́стка, -і (f.) information; returns
мець **зе́сткі** пра каго-н. to have information about smb.
згодна з атрыма́нымі **зе́сткамі** according to information received
зе́сьці (I) (act.), **вяду́, -дзе́ш, -ду́ць** to take; keep; manage; lead
зе́сьці гаспада́рку to keep house (for smb.), to manage the household
зе́сьці сход to preside over a meeting
куды́ **вядзе́** гэтая дарога? Where does this road lead to?
зе́сьці рэгуля́рны спосаб жыцьця́ to lead a regular way of life
зе́сьці змага́ньне (з + instr.) to struggle (against, with), combat
зе́сьці сяброўства to be friends
зе́сьці прапага́нду to carry on propaganda
зе́сьці навуковую дзе́йнасьць to do scientific work
зе́сьці перамовы to negotiate
зе́сьці лік to count
зе́сьці кні́гі to keep accounts
зе́сьці пача́так ад чаго-н. to originate from
зе́сьці асе́лае жыцьцё to lead a settled way of life
зе́сьціся (I) to be found
так **вядзе́цца** it is the custom
весяліцца (II), **-лю́ся, -і́шся, -я́цца** to enjoy oneself
ве́тла (adv.) affably, kindly
ве́тласьць, -і (f.) affability, kindness
ве́тлы, -ая, -ае affable, kind
ве́тразь, -і (f.) sail
ве́тразьнік, -а (m.) sailboat
ве́цер, ве́тру (m.) wind
ве́ча, -а (n.) vetcha, popular assembly
вечавы́ звон bell calling the vetcha together
ве́чар, -а (m.) evening; party
Добры ве́чар. Good evening.
сёньня **ўве́чары** this evening
у яе́ на **ве́чары** было шмат моладзі at her party there were many young people
сяброўскі **ве́чар** party
вечары́на, -ы dance party
ве́чна (adv.) always, eternally, for ever; perpetually
гадзі́ньнік в. йдзе the clock works perpetually
ве́чнасьць, -і (f.) eternity
ве́чны, -ая, -ае eternal, everlasting
ве́яць (I), **ве́ю, -еш, -юць** to winnow (grain); to fan; to blow
ве́цер ве́е the wind blows
ве́ялка, -і (f.) winnowing machine
відавочна (adv.) apparently
відаль, -і (f.) view
відаць (predic.) (it) is seen; evidently
мне **відаць** I can see; there is light enough for me
відно, -а́ (n.) light
ад відна́ да відна́ from night to morning, all night long
відовішча, -а (n.) sight, spectacle, show
візыт, -у (m.) visit
скла́сьці в. каму́-н. to pay a visit to smb.
віленскі, -ая, -ае Vilna (adj.), of Vilna
вільгаць, -і (f.) dampness
вільготна (adv.) damp
вільготны, -ая, -ае damp
Ві́льня, -і (f.) Vilnia (Vilna)
вільня́нін, -а (m.) pl. **зільня́не** inhabitant of Vilnia
вільня́нка, -і (f.) inhabitant of Vilnia
вінава́ты, -ая, -ае guilty
вінава́ты позірк guilty look
быць **вінава́тым** пе́рад кім-н. to be guilty before smb.
я(ён) **вінава́ты** I am (he is) to blame; it is my (his) fault
вінава́ты, -а (predic.) to owe
ён **вінава́ты** мне дзе́сяць даля́раў he owes me ten dollars
вінава́ціць (II), **вінава́чу, -ціш, -яць** to blame
ві́нны, -ая, -ае owing; indebted, due
вір, -у (m.) pool; whirlpool, whirl
віск, -у (m.) yell, scream

Вíсла, -ы (f.) Wisla (river)
вітáльны гудок
вітáльня or **вітáльны пакой** front/living room
вітáльны or **прывітáльны**
вітáць (I), **-тáю, -еш, -юць** to greet, welcome; congratulate, wish
вітáць гасцяй to welcome the guest
вітáць [illegible]
[illegible]
Новым Годам New Year
вітрúна, -ы (f.)
віхор, -ру (m.) [illegible]; tornado, whirlwind; storm
[illegible]
віхрыць, -ры, -рыць to wag; prevaricate, shuffle
віхляць хвастом to wag one's tail
Віцебск (Vitebsk) Viciebsk (Vitebsk)
віцябля́нін, -а (m.) inhabitant of Viciebsk
віцябля́нка, -і (f.) inhabitant of Viciebsk
вішнёвы, -ая, -ае cherry (adj.); cherry-coloured
вішнёвае дрэва/сочыва or варэньне cherry tree/jam
вішнёвы сад cherry orchard
вішчэць (II), **вішчу́, -ыш, -а́ць** to yell, scream
воблака, -а (n.) (pl. **воблакі** or **аблокі**) cloud
вобмірам (adv.) in a blink
вобраз, -у (m.) image
вогка (adv.) damp
вогкасьць, -і (f.) dampness
вогкі, -ая, -ае damp
воддаль (adv.) far from, far off
воддаль ад вёскі far from the village
ён адыйшоўся й стаў **воддаль** he went away and stopped at a distance
возьме ля́жа, пойдзе (he) will lay down, go
войска, -а (n.) army
войстраносы, -ая, -ае sharp-nosed
вока, -а (n.) pl. **вочы** eye
кі́дацца ў **вочы** to strike one's eyes, to be striking
за **вочы** behind someone's back
хоць **вока** вы́калі it is pitch-dark
кі́нуць **вока** на не́шта to glance at smth.

вокамгне́ньне, -я (n.) blink
воласьць, -і (f.) small rural district in Byelorussia before the First World War
волыа (adv.) freely; at ease
Вольна! (кама́нда) Stand at ease!
вольны, -ая, -ае free; vacant
вольха, -і (f.) alder tree
ў вомірг or **воміргам** (adv.) in no time
вонкавы, -ая, -ае external; superficial; outdoor
вонкі (adv.) out of doors
ў вонках (adv.) outside, outdoors
вопратка, -і (f.) = ве́рхняе адзе́ньне apparel, clothing
ворная зямля́, -і (f.) arable land
восемдзесят, -ёх or **восьмідзесят** eighty
в-дзесят даля́раў eighty dollars
у васьмідзесяцёх кілямэтрах (ад) eighty kilometres (from)
восемдзяся́ты or **васьмідзяся́ты, -ая, -ае** eightieth
в-дзяся́тая балонка page eighty
ямý пайшоў he is in his eighth year
восемдзяся́ты год year
восемсот or **восьмісот** eight hundred
восемсот(н)ы or **восьмісотны, -ая, -ае** eight-hundredth
в-сотная балонка page eight hundred
восемсотны год the year eight hundred
в-сотныя ўгодкі eight-hundredth anniversary
восенскі, -ая, -ае autumnal
востраў, востpава (m.) island
восыпка, -і (f.) rash, eruption; flour/bran used with cattle food
вы́сыпала **восыпка** a rash broke out
вось-вось, во-во (adv.) just about, on the point
ён **вось-вось** пойдзе he is just about to go
вось-вось! (particle) that's it!
восьмы, -ая, -ае eighth
восьмага сту́дзеня the eighth of January, January the eighth
восьмая балонка page eight
в-ы радок, разьдзе́л line (chapter) eight
ямý пайшоў **в-ы** год he is in his eighth year

ужо **восьмая** гадзіна — it is eight o'clock
палавіна **восьмае** — half past seven
адна́ **восьмая** — one-eighth
ят (=вось) цяпе́р — right now
ячка, -а (n.) — dim. of **вока**; stitch in knitting, crocheting

очнік, -а (m.) — oculist
очны, -ая, -ае — eye (adj.); ocular, optic
вочны ле́кар — eye specialist
очы, вачэй (pl.) — eyes (see **вока**)
ошчуп, -у (m.) — touch (sense)
уга́льле, каме́ннае — coal
уж, -а́ (m.) — snake
ужа́ка, -і (f.) — snake
узёл(ву́зел), вузла́ (m.) — knot
завя́зваць **вузёл** — to tie/make a knot
разьвя́зваць **вузёл** — to undo a knot
зу́лей, вульля́ (m.) — hive
ву́лічны, -ая, -ае — street (adj.)
ву́нія, -і (f.) — union
вуніят, -а (m.) and **вуніятка, -і** (f.) — member of the Uniat(e) Church
вуніяцкі, -ая, -ае — uniat(e) (adj.)
ву́сьцішна (predic.); ямý **ву́сьцішна** — he is terrified

ву́сьцішны, -ая, -ае — terrifying, sinister
вучнёўскі, -ая, -ае — pupil (adj.)
вучнёўская форма — school uniform
вучнёўская моладзь — students
вучонасьць, -і (f.) — erudition
вучоная, -ае (f.) and **вучоны, -ага** (m.) — scientist, scholar

вучоны, -ая, -ае — educated, erudite
вучы́цца (II), **вучу́ся, -ышся, -ацца** (+gen.) — to learn, study
вучы́цца мовы (матэма́тыкі) — to learn language (mathematics)
вучы́цца чыта́ць — to learn to read
добра **вучы́цца** — to study well, to do well at school

вучы́цца ў школе — to go to school
вучы́цца на ўнівэрсыце́це — to study at the university
вучэньне, -я (n.) — learning; studies; teaching

гады́ **вучэньня** — school years
час **вучэньня** — classes (pl.)
філязафі́чнае в. — teaching

вуша́к, -а́ (m.) — doorpost
вуша́к вакна́ — jamb
ву́шка, -а (dim. of **ву́ха**) — ear; eye; handle
ву́шка (і)голкі — eye of a needle
ву́шка збанка́ — handle of a jug
вушны́, -а́я, -ое — ear (adj.), aural
вушны́ боль — earache
ву́шы, -эй (pl. of **ву́ха**) — ears
па **ву́шы** — over head
пусьці́ць па́ міма **ву́шы** — to

выбача́й, выбача́йце (pl. and polite) — [illegible]
вы́бег, -у (m.) — [illegible]
вы́беліць or **вы́бяліць** (II) (pf. of **бяліць**), fut. -белю, -бе́ліш, -яць — [illegible]
выбіра́цца (I), -ра́юся, -е́шся, -юцца — to move out; [illegible]
вада́ **выбіра́ецца** — all water is being taken out
выборны, -ая, -ае — finest, choicest; first-rate/grade
вы́бірацца (I) (pf. of **выбіра́цца**), fut. **вы́беруся, -а́шся, -уцца** — to move out (of the house); get out
вы́браць (I) (pf. of **выбіра́ць**), fut. **-беру, -аш, -уць** — to choose, select, pick out; elect; take everything out
вы́бух, -у (m.) — explosion; outbreak; eruption
вы́бух бомбы — a bomb explosion
вы́бух эпідэ́міі — outbreak of an epidemic
вы́бух гне́ву — gust of temper
выбуха́ць (I), **-ха́ю, -еш, -юць** — to explode, burst out
выбуха́ць сьме́хам — to burst out laughing
вы́бухнуць (I) (pf. of **выбуха́ць**), fut. **-бухну, -еш, -уць** — to explode, burst out, break out
бомба **вы́бухнула** — the bomb exploded
вайна́ **вы́бухнула** — the war broke out
вывуча́ць (I), **-ча́ю, -еш, -юць** — to study
выгаворваць (I), **-ваю, -еш, -юць** — to rebuke; reprimand; lecture
вы́ган, -у (m.) — common pasture

выганя́ць (I), **-ня́ю, -еш, -юць** to drive out
выганя́ць з ха́ты to turn out of the house
выганя́ць із школы to expel from school
выганя́ць ста́так у поле to drive the cattle out to the pasture
выгара́ць (I), **-ра́е, -юць** to burn out
выгара́ць на сонцы to fade in the sun
выглада́ць (I), **-да́ю, -еш, -юць** to look; expect (imp.)
добра, бл[illegible] to look well, bad
выгляда́ш[illegible] to expect someone
выглада́ць з [illegible] to look out of the window
выглада́ць зза чаго-н a) to peek out from behind smth. b) to emerge from behind smth.
выглядае́, што (impers.) it seems that
вы́глянуць (I) (pf. of **выглада́ць**), fut. **-гляну, -еш, -уць** to look out, emerge from behind smth.
вы́гнаць (II) pf. of **выганя́ць** (I), fut. **-ганю, -і́ш, -яць** to drive out, expel
выгода, -ы (f.) advantage; commodity
выгодна (adv.) comfortably, at ease
сёсьці **выгодна** to seat down comfortably/at ease
выгодны, -ая, -ае comfortable; advantageous, profitable; remunerative
выгрыва́ць (I), **-граю́, -е́ш, -ю́ць** to win; gain
выдава́цца (I), **выдаю́ся, -е́шся, -ю́цца** to seem, appear
выдава́ць (I), **-даю́, -е́ш -ю́ць** to give out, hand; betray; publish
выдава́ць каму́-н. **паквітава́ньне** to give smb. a receipt
выдава́ць грошы to spend money
выдава́ць кні́гі to publish books
выдава́ць за́муж каго-н. за каго-н. to give smb. to smb. in marriage
выдаве́ц, выдаўца́ (m.) publisher
выдаве́цкі, -ая, -ае publishing (adj.)
выдаве́цтва, -а (n.) publication; publishing
выда́ньне, -я (n.) published book; edition (of a book); delivery (of a person)
выда́так, -тку (m.) expense
выда́тна (predic.) it is excellent
Выда́тна! (выкліч́нік) Excellent!
выда́тна (adv.) excellently, perfectly
выда́тна не́шта ве́даць to know smth. perfectly well
выда́тна (noun indecl.) excellent (mark in school)
скончыць школу на **выда́тна** to finish school with excellent marks
наста́ўнік паста́віў **выда́тна** the teacher gave an excellent mark
выда́тны, -ая, -ае excellent, very good; outstanding; prominent
выда́тны твор an excellent book
выда́тны вучоны an outstanding/prominent scientist/scholar
вы́даўблены, -ая, -ае hollow
вы́дацца or **зда́цца** (pf.) fut. **вы́дамся, вы́дасца, вы́дадуцца** to seem, appear
вы́даць (irr.) (pf. of **выдава́ць**, I), fut. **вы́дам, -дасі, -дадуць** to give, distribute; publish
вы́даць таямні́цу to betray/reveal/disclose a secret
вы́дзелены, -ая, -ае separated
слова **вы́дзеленае** коскамі a word separated with commas
вы́дзьма, -ы (f.) (sand) dune
вы́друкаваны, -ая, -ае printed
вы́друкаваць (I) (pf. of **друкава́ць**), fut. **-кую, -еш, -юць** to print
вы́думка, -і (f.) invention, fiction, fable; device
вы́жыць (I) (pf. of **выжыва́ць**), fut. **-жыву, -еш, -уць** to survive
вы́звалены, -ая, -ае liberated
вы́зваленыя наву́кі liberal arts, humanities
вызна́ньне, -я (n.) denomination, faith

вы́йграць or **вы́граць** (I) (pf. of **выграва́ць**), fut. **вы́(й)граю, -еш, -юць** — to win; gain

вы́йгрыш, -у (m.) — winning, gain; prize

вы́йшла, што — it turned out that...

выка́знік, -а (m.) — predicate

выкана́льнік, -а (m.) — performer, executor

вы́капаць (I) (pf. of **выкопваць**), fut. **вы́капаю, -еш, -юць** — to dig out

выкіда́ць (I), **-да́ю, -еш, -юць** — to throw out; (fig.) to discard

выкіда́ць праз вакно — to throw out of the window

вы́кінуць (I) (pf. of **выкіда́ць**), fut. **вы́кіну, -еш, -уць** — to throw out

выкла́дчык, -а (m.) — teacher, professor

выкліка́ць (I), **-ка́ю, -еш, -юць** — to call; to send for

выкліка́ць ле́кара — to call the doctor

выкліка́ць ву́чняў да дошкі — to call students to the blackboard

выкліка́ць з пакою — to call out of the room

выкліка́ць ціка́васьць — to excite the curiosity

вы́клікаць (I) (pf. of **выкліка́ць**), fut. **вы́-клічу, -аш, -уць** — to call; entail, involve

вы́клікаць у каго-н. сьлёзы — to move smb. to tears

в. падазрэньне — to arouse suspicion

выклічнік, -а** (m.) — interjection

выключа́ць (I), **-ча́ю, -еш, -юць** — to exclude, except, rule out, eliminate

вы́ключыць (II) (pf. of **выключа́ць**, I), fut. **-ключу, -ыш, -аць** — to expel, exclude; rule out; eliminate

вы́ключыць із школы — to expel from school

выключэньне, -я (n.) — exclusion; expulsion; (math.) elimination

выконваць (I), **-ваю, -еш, -юць** — to carry out; to act (as)

выконваць пра́цу — to do the work

выконваць дзе́яньне — to perform an action

выконваць просьбу — to comply with a request

выкопваць (I), **-ваю, -еш, -юць** — to dig out

вы́купіць (II) (pf. of **выкупля́ць**, I), fut. **вы́куплю, -піш, -яць** — to ransom; make amends for, redeem

вы́купіць віну́ — to make amends for one's fault

вы́купіць палонных — to ransom prisoners of war

выкупля́ць (I), **-ля́ю, -еш, -юць** — see **вы́купіць**

вы́курыць (II) (pf. of **куры́ць**), fut. **-куру, -ыш, -аць** — to smoke

вы́лечыць (II) (pf. of **вылéчваць**, I), fut. **-лечу** (or **-ляч**[illegible]), **-аць** — to cure

вы́лечыцца (II) (pf. gen.) — to be cured (of smth.), recover from

вы́лічыць (II) (pf. of **вылічáць**, I), fut. **-лічу, -ыш, -аць** — to calculate; name, list

вы́лічыць каму́ ўсе́ кры́ўды — to list to smb. all injuries/wrongs

вы́мавіць (II) (pf. of **вымаўля́ць**, I), fut. **-маўлю, -віш, -яць** — to pronounce, articulate; utter, say

ён ледзь **вы́мавіў** па́ру словаў — he could hardly say/utter a few words

вымаўле́ньне, -я (n.) — pronunciation

вымéньваць (I), **-ваю, -еш, -юць** — to trade

вымова, -ы (f.) — reprimand; pronunciation

дава́ць **вымову** — to reprimand

вы́мушаны, -ая, -ае — forced

вы́нахад, -у (m.) — invention

вынаходлівы, -ая, -ае — inventive

вы́несьці (I) (pf. of **выно́сіць**, II), fut. **вы́несу** (or **-нясу**), **-еш, -уць** — to carry out, take out; remove

вынікáць (I), **-ка́е, -юць** — to follow

з гэтага **вынікáе**, што... — it follows from this that...

як **вынікáе** із ска́занага — as it appears from the above

выно́сіць (II), **выношу, -сіш, -яць** — to carry out, take out, remove

выносіць над нябёсы — to extol to the skies
вы́нятак, -тку (m.) — exception
за выняткам (+gen.) — with the exception (of)
вы́няткавы, -ая, -ае — exceptional, particular
[illegible] — particular
ва́жнасьці — importance
выпа́дак, -дку (m.) — occurrence, incident; [illegible]t; case; chance
у нія́кім выпа́дку — on no account
няшча́сны выпа́дак — accident
выпада́ць (I), [illegible] — to fall out, slip out; [illegible] — [illegible]oper/fit
валасы́ выпада́юць — hair is falling out
выпадае пайсці туды́ — it is proper/fit to go
[illegible] — [illegible]s not proper
— b) it is inconvenient
[illegible] — to burn out, to burn down
выпа́льваць, I), fut. **-палю, -іш, -яць**
вы́пасьці (I) (pf. of **выпада́ць**), fut. **-паду, -дзеш, -уць** — to fall out, slip out; to happen, occur
вы́пала з рук — it dropped out of (one's) hands
вы́пала так, што — it happened that
ня вы́пала нам прыйсьці — it was inconvenient for us to come
выпераджа́ць (I), **-джа́ю, -еш, -юць** — to outrun
вы́перадзіць (II) (pf. of **выпераджа́ць**, I), fut. **-пераджу, -дзіш, -яць** — to outrun
вы́перадкі, -аў (pl. only) — competition, contest
вы́перадкі ў бе́гу — race
вы́пісацца (I) (pf. of **выпі́свацца**), fut. **вы́пішуся, -ашся, -уцца** — to be signed out
вы́пісацца із шпіта́лю — to be signed out of the hospital
вы́пісаць (I) (pf. of **выпі́сваць**), fut. **вы́пішу, -аш, -уць** — to write out; order; subscribe; send for; sign out
вы́пісаць няве́дамыя словы — to write unknown words
выпі́свацца (I), **-ваюся, -ешся, -юцца** — to be signed out
выпі́сваць (I), **-ваю, -еш, -юць** — to write out/extract; order; subscribe
выпі́сваць газэту — to subscribe to a newspaper
вы́піць (I) (pf. of **выпіва́ць**), fut. **вы́п'ю, -еш, -юць** — to drink (out, off, up)
вы́піць малака́ — to drink/have some milk
вы́піць усё малако — to drink all the milk
вы́плата, -ы (f.) — payment; pay
вы́плата даўгу́ — payment of a debt
сёньня **вы́плата** — today is payday
выплыва́ць (I), **-ва́ю, -еш, -юць** — to swim out; come to the surface, emerge
в. у вадкры́тае мора — to swim out to sea
ха́та пачала́ **выплыва́ць** зь ле́су — the house began to appear from the forest
вы́плысьці (I) (pf. of **выплыва́ць**), fut. **-плыву, -еш, -уць** — to swim out; come to the surface, emerge
ме́сяц **вы́плыў** зза хма́раў — the moon emerged/appeared from behind the clouds
выпрабава́ньне, -я (n.) — test, trial; (fig.) ordeal
быць на **выпрабава́ньні** — to be on trial, probation
вы́правіць (II) (pf.), fut. **-праўлю, -віш, -яць** — to send; to correct
вы́правіць сы́на вучы́цца — to send one's son to school
вы́правіць памы́лкі — to correct mistakes
вы́прадаж, -у (m.) — sale
вы́прастаць (I) (pf. of **выпрастоўваць**), fut. **-стую, -еш, -юць** — to straighten
вы́прастаць ногі — to stretch one's legs
выпраўля́ць (I), **-ля́ю, -еш, -юць** — to send; correct, rectify
вы́пусьціць (II) (pf. of **выпушча́ць**, I), fut. **-пушчу, -сьціш, -яць** — to let out
выпушча́цца (I), **-ча́ецца, -юцца** — to be let out/omitted
выпушча́ць (I), **-шча́ю, -еш, -юць** — to let go; to let out; to set free; to publish
выпушча́ць ваду́ з басэ́йну — to let the water out of the pool
выпушча́ць з рук — to let go

выпушча́ць газэту — to publish/issue a newspaper

вы́раб, -у (m.) — article; make
вырабля́ць (I), **выраблю́, -е́ш, -юць** — to produce

вы́радак, -дка (m. & f.) — degenerate
вы́ражаны, -ая, -ае — expressed
выража́ць (I), **выража́ю, -е́ш, -юць** — to express

вы́разіць (II) (pf. of **выража́ць**, I), fut. **-ражу, -зіш, -яць** — to express

выраста́ць (I), **выраста́ю, -е́ш, -юць** — to grow; grow (up, out), increase
дзе́ці ху́тка **выраста́юць** — children grow up quickly
ён **выраста́е** з вопраткі — he grows out of his clothes
вы́расьці (I) (pf. of **выраста́ць/выростаць**), **-расту, -цеш, -туць** — to grow; grow (up, out); increase
тут **вы́рас** новы горад — a new town has sprung up here

вы́ратавацца (I) (pf. of **ратава́цца**) — to save oneself; escape
ён ледзь **в-ваўся** — he had a narrow escape
вы́ратаваць (I) (pf. of **ратава́ць**), fut. **-ратую, -еш -юць** — to save; rescue
в. каму́ жыцьцё — to save smb's life
в. ад небясьпе́кі — to rescue from danger

вы́рваць (I) (pf. of **вырыва́ць**), fut. **-рву, -е́ш, -уць** — to pull out; snatch, tear out
вы́рваць моркву — to pull up a carrot
вы́рваць не́шта з рук у каго-н. — to snatch smth. out of smb's hands

выростаць (I) — see **выраста́ць**

вырыва́цца (I), **-ва́юся, -е́шся, -юцца** — to tear oneself away, break away

вырыва́ць (I), **-ва́ю, -еш, -юць** — to tear out, pull (out, up)
вырыва́ць ліст з кнігі — to tear a page out of a book
вырыва́ць зуб — to pull out/extract a tooth

высакародны, -ая, -ае — noble; rare; noble/precious
высакародны ўчы́нак — noble action
высакародныя мэта́лі — noble/precious metals

высакосны/пераступны́ год — leap year

выснова, -ы (f.) — conclusion, deduction
зрабіць **выснову** — to draw a conclusion, to infer
прыйсьці да **высновы** — to come to conclusion

высозны, -ая, -ае — very high, tall, lofty
высок, -а, -а (short of **высокі**) — tall, high
высока́ць, … — to rise, …
вы́стаўка … — exhibition, …
вы́страіць, … — to …
-стро́ю, -… — …
вы́сіць, … — to …
вы́сіць (I), **-пе́ю, -е́ш, -юць** — to empty, …
высыпа́ць пясок — to empty/pour out the sand

вы́сыпаць (I) (pf. of **высыпа́ць**), fut. **-сыплю, -п(л)еш, -(л)юць** — to empty, pour out; break out
вы́сыпаць незнарок — to spill
у яго **вы́сыпала** на тва́ры — a rash has broken out on his face

высь, -і (f.) — height
у **высь** глядзе́ць — to look up at the heights

высьме́йваць (I), **-ваю, -еш, -юць** (каго) — to ridicule, make fun; deride/scoff (at)

вы́твараны, -ая, -ае — formed

вы́тлумачыць (II) (pf. of **тлума́чыць**, II), fut. **-тлумачу, -ыш, -аць** — to explain

вытока, -і (f.) — source
вытокі ракі — source of the river

вы́трываць (I) (pf. of **вытры́мваць**, I), fut. **-трываю, -еш, -юць** — to survive; endure, bear, stand; to refrain, contain oneself
ён ня мог **вы́трываць** гэтага — he could not bear/stand it
ён ня **вы́трываў** і расьсьмяя́ўся — he could not refrain from laughing

вы́трыманасьць, -і (f.) — firmness, steadfastness; self-control; consistency

вы́трыманы, -ая, -ае self-possessed, self-restrained; steadfast; consistent

вытры́мваць (I), **-ваю, -еш, -юць** to bear, sustain, endure; survive; refrain

вы́хапіць (II) (pf. of **выхапля́ць**, I), fut. **-хаплю, -іш, -яць** to snatch out

вы́цяг, -у (m.) excerpt

выця́гваць (I), **-ваю, -еш, -юць** to draw out, extract; stretch, pull out

выця́гваць рукі, ногі to stretch out one's arms, legs

вы́цягнуты, -ая, -ае drawn out; stretched, pulled out

вы́цягнуць (I), **-цягну, -еш, -уць** to draw out; extract; stretch, hold out

ён доўга ня вы́цягне he will not stand it for long

выцяка́ць (I), **выцяка́е, -юць** to flow out

вы́шка, -і (f.) derric; tower

вы́шні, -яя,-яе upper

вы́шні Дняпро Upper Dniapro

вышняві́ны, -аў (pl. only) upper reaches

вышыва́ць (I), **-ва́ю, -еш, -юць** to embroider

вышыня́, -і (f.) height

вы́шыць (I) (pf. of **вышыва́ць**), fut. **-шыю, -еш, -юць** to embroider

вышэй (adv. comparative of **вы́сака**) higher (up)

падыма́й **вышэй**! Lift higher up!

вышэй (prep. + gen.) above, over, beyond

вышэй за нуля́ above zero

як сказа́на **вышэй** as stated above

гэта в. за маі́ сі́лы it is beyond my power

вышэйшасьць, -і (f.) superiority

вы́явіць (II) (pf. of **выяўля́ць**, I), fut. **-яўлю, -віш, -яць** to show, display; discover, find out, reveal

вы́явіць пава́жныя недахопы to discover/reveal serious shortcomings

выяўля́ць (I), **-ля́ю, -еш, -юць** see **выявіць**

выяўля́ць ра́дасьць/ініцыя́тыву to show joy/initiative

вэра́нда, -ы (f.) porch, veranda(h)

вэлюм, -у (m.) veil

вядро, -а́ (n.) (pl. **вёдры**) pail

вяза́ць (I), **вяжу́, -аш, -уць** to bind, tie up

вяза́ць клу́нкі to bind parcels

вяза́ць на пруткох to knit

вяза́ць кручком to crochet

вя́зка, -і (f.) pack

вя́ла (adv.) limply, sluggishly, inertly

вя́ла працава́ць to work without spirit

вялі́зны, -ая, -ае huge; vast

Вялі́кдзень, -кадня (m.) Easter

вялі́кі, -ая, -ае big; well-grown; great; important; grand

вялі́кі стол big table

вялі́кі (выда́тны) чалаве́к great man

вялі́кі пісьме́ньнік, вучоны prominent/outstanding writer, scientist

вялі́кі князь (m.) Grand Duke

вялікодны, -ая, -ае Easter (adj.)

вялічыня́, -і (f.) size; magnitude; (math.) quantity

якой **вялічыні**? How big?

нявёдамая **вялічыня́** unknown quantity

вя́лы, -ая, -ае flabby, flaccid; sluggish, limp, slack; inert, dull

вя́лая йгра арты́стых dull performing

Вяльля́, -і (f.) Vialla, tributary of Nioman River

вярну́ць (I) (pf. of **варочаць**), fut. **вярну́, ве́рнеш, -уць** to return; compensate, refund, make up

вяроўка, -і (f.) rope, cord

вяртáньне, -я (n.) recurrence; return

вяршáліна, -ы (f.) top, peak

вяршáліна дрэва top of the tree

вясёла or **ве́села** (adv.) merrily, gayly, cheerfully

в. правёсьці час to have a good time

было ве́льмі **в.** there was lots of fun

вясёла (predic.): мне **в.** I am enjoying myself

табе́ в., а мне су́мна — you are gay while I am sad
вясло, -а́ (n.) — paddle
вясьня́ны, -ая, -ае — spring (adj.)
вятра́к, -а́ (m.) — windmill
вячо́рны, -ая, -ае — evening (adj.)
вячы́сты, -ая, -ае — everlasting
вяшча́ць (I), **вяшча́ю, -еш, -юць** — to announce

Г

газ, -у (m.) — gas
га́за, -ы (f.) — petroleum
геаграфі́чны, -ая, -ае — geographical
геалёгія, -і (f.) — geology
генера́л, -а (m.) — general
генера́льны, -ая, -ае — general (adj.)
генера́льскі, -ая, -ае — general's
геоляг, -а (m.) — geologist

Г

гаваркі́, -а́я, -ое — talkative
гаворка, -і (f.) — talk; dialect
гадава́ць (I), **-ду́ю, -еш, -юць** — to grow, cultivate; raise, breed; bring up, train
гадава́ць дзе́ці — to bring up children
гадава́ць жывёлу — to raise/breed cattle
гадава́ць расьці́ны — to grow/cultivate plants
гадаві́на, -ы (f.) — anniversary
га́дзіна, -ы (f.) — viper
гадзі́на, -ы (f.) — hour
каторая г. цяпе́р? — What time is it now?
цяпе́р пе́ршая (пя́тая) **гадзі́на** — it is one (five) o'clock
а каторай **гадзі́не?** — At what time?
гадзі́ншчык, -а (m.) — watchmaker
гадзі́ньнік, -а (m.) — watch, clock
г. добра йдзе — the watch/clock shows/ tells the right time
г. позьніцца — the watch/clock is slow
г. стаў — the watch/clock stopped
г. сьпяша́ецца — the watch/clock is fast
гадзю́ка, -і (f.) — adder, viper
гаі́цца (II), **гоіцца, -яцца** — to heal
ра́на **гоіцца** — the wound is healing
Га́йна, -ы (f.) — Hajna River
галава́р, -а́ (m.) — chief
галасава́ць, галасу́ю, -еш, -юць — to vote
галасі́ць (II), **галашу́, галосіш, -яць** — to cry, to scream
гале́ча, -ы (f.) — poverty
галё! — hello!
галі́на, -ы (f.) — branch
галі́на дрэва — branch of a tree
галіна́, -ы (f.) — branch, field
галіна́ ве́ды — field of knowledge
галі́ны дрэ́ва (ве́ды) — branches of a tree (of knowledge
галі́ны эканомікі — branches of economics
галі́цца (II), **галю́ся, голішся, -яцца** — to shave oneself
галі́ць (II), **галю́, голіш, -яць** — to shave
галоўна (adv.) — chiefly, above all; principally
галоўнае, -ага (n.) — the chief/main thing
галоўны, -ая, -ае — chief; principal; head (adj.); main
галоўнае ме́ста — chief city, capital
галоўная ву́ліца — main street
галоўны сказ — main clause
галоўным пара́дкам — mainly, principally
галу́б or **голуб, -а** (m.) — pigeon
галу́бка, -і (f.) — female pigeon; my dear
га́льштук, -а (m.) — necktie, tie
завяза́ць **га́льштук** — to tie one's necktie
галярэя, -і (f.) — gallery
гама́да, -ы (f.) — Arab measure of length
гаманлі́вы, -ая, -ае — talkative, loquacious
гаманкі́, -а́я, -ое — noisy, talkative
гаманкі́ лес — murmuring forest
гамонкі, -ая, -ае — see **гаманкі́**
ганаровы, -ая, -ае — honorary
ганаровы ся́бра — honorary member
ганары́стасьць, -і (f.) — hautiness, arrogance; disdain
ганары́сты, -ая, -ае — vain; haughty, arrogant
га́ндаль, -длю (m.) — trade, commerce
гандлёвы, -ая, -ае — trading, commercial
г-ае прадпрыёмства — business
г-ая пляцоўка — trading post

гандлёва-прамысловы, -ая, -ае commercial and industrial
ганец, -нца (m.) messenger
ганіць (II), ганю, -іш, -іць to reprove
ганяцца (I), -яюся, -ешся, -юцца to chase, pursue
дзеці ганяюцца з матылямі dren chase butterflies
ганяць (, drive away
om place to
nd is driving the
urch bell-tower
site of an ancient town
inhabitant of Horadna
inhabitant of Horadna
heat
tea
strong tea
gardener
garden (adj.)
in a hoarse voice
larynx
mustard
pot
horizontal
horizon
host; landlord; master, owner; sovereign
master, owner of the house
masters of their own lives
host
landlord
thrifty
master's; economic
a thrifty master's eye
economy of the country
apartment
in a hospitable way
hospitable

гатовы, -ая, -ае ready, prepared (for); willing; finished
вячэра ўжо **гатовая** supper is ready
гатовы на ўсякія ахвяры ready/prepared to make any sacrifice
гатовая вопратка ready made clothes
гатунак, -нку (m.) grade, sort, kind
геніяльны, -ая, -ае of genius; great
г-ы кампазытар composer of genius
г-ае адкрыццё great discovery
гераічны, -ая, -ае heroic
гераічная эпоха heroic age
германскія мовы Germanic languages
герой or **гэрой, -я** (m.) hero
геройскі, -ая, -ае heroic
геройскі ўчынак act of heroism
гібець (I), гібею, -еш, -юць to vegetate
гігіена, -ы (f.) hygiene, hygienics
гімназістка, -і (f.) secondary-schoolgirl/high-schoolgirl
гімназісты, -ага (m.) secondary-schoolboy/high-schoolboy
гімназія, -і (f.) high school, secondary school
гімнастыка, -і (f.) gymnastics
гістарычны, -ая, -ае historic
гістарычны помнік (m.) historic monument
гісторык, -а (m.) historian
гітара, -ы (f.) guitar
гітарысты, -тага (m.) guitarist, guitar player
Гішпанец, -нца (m.) Spaniard
гладак, -дка, -дка (short of **гладкі**) smooth; well-fed, well-nourished, plump
гладзь, -і (f.) glassy mirrorlike surface
гладкі, -ая, -ае smooth; well-fed, well-nourished
гладкі камень smooth stone
гладкі чалавек well-nourished/plump person
глеба, -ы (f.) soil
гледзішча, -а (n.) point of view, view
глыб, -і (f.) depth, heart
у **глыбі** акіяну in the depths of the ocean
у **глыбі** краю in the heart of the country

глы́бака or **глыбока** (adv.) — deep, deeply
глыбіня́, -і́ (f.) — depth
  глыбіня́ рэчкі — depth of the river
  глыбіня́ ле́су (кра́ю) — heart of the forest (country)
глыбока (adv.) — deeply, deep
глыбокенькі, -ая, -ае (term of endearm.) — deep
глыта́ць (I), **глыта́ю, -еш, -юць** — to swallow; to gulp down
глыток, -тка́ (m.) — mouthful sip, drink
  піць малы́мі **г-ка́мі** — to sip slowly
гляда́ч, гляда́ча́ (m.) — spectator
глядзе́ць (II), **-джу́ся, -і́шся, -я́ць** — to look
гна́ць (II), **ганю́ся, гонішся, -яць** (за + instr.) — to pursue; (fig.) to seek (after), strive (for)
  гна́ць за кім — to pursue smb.
  гна́ць за сла́вай — to seek fame
гнаць (II), **ганю́, гоніш, -яць** — to drive, turn out; urge, drive (on); distil
  гнаць ста́так — to drive a herd
  гане́це яго! — Turn him out!
  гнаць сьпірт — to distil alcohol
гне́вацца (I), **-ваюся, -ешся, -юцца** — to be angry, to be cross with smb.
гнеў, гне́ву (m.) — anger, wrath, temper
гнілы́, -а́я, -ое — rotten
гніць (I), **гнію́, -е́ш, -ю́ць** — to rot, putrefy, decompose
гну́ткі, -ая, -ае — flexible
гну́цца (I), **гнуся, гне́шся, -у́цца** — to bend, be flexible
гнуць (I), **гну, -еш, -уць** — to inflect, bend
гнюсі́ць (I), **гнюсіць, -яць** — to stain, make filthy
гняту́чы, -ая, -ае — oppressive
год, -у (m.) — year
  ямý два́цца два **гады́** — he is twenty-two (years old)
  ямý пайшоў пя́ты **год** — he is in his fifth year
годна (adv.) — in appropriate/proper manner, appropriately
годны, -ая, -ае — appropriate
гож, -а, -а (short of **гожы**) — beautiful, handsome
гойданка, -і (f.) — swing
гойдацца or **гайда́цца** (I), **гойдаюся, -ешся, -юцца** — to rock, swing
  човен **гойдаецца** — a boat is rocking
голка, -і (f.) — needle
гоман, -у (m.) — sound of voices, noise; (fig.) drone, hooting, buzz(ing)
  ціхі **гоман** — low murm[illegible]
  гоман ле́су — [illegible]
  галасны гоман — [illegible]
гонар, -у (m.) — [illegible]
гонкі, [illegible] — [illegible] nd slender
гора, -[illegible] — [illegible]
Гор[illegible] — [illegible] ity
  Г[illegible]
горб, [illegible] — [illegible] h
горбік, -а (dim. of **горб**) — [illegible] hill
горка, -і (f.) (dim. of **гара́**) — hill
горка (adv.) — bitterly
горш (adv.) — worse
госьць, гасьця́ (m.) — guest, visitor; company
  быць ра́дым/-ай **гасьцю́** — to be glad of a guest
града́, -ы (f.) — garden bed
  града́ гораў — ridge/range of mountains
гра́дус, -а (f.) — degree (temp.)
  адзін **гра́дус** марозу — one degree below freezing
гразіць (II), **гражу́, грозіш, -яць** — to threaten, imperil, jeopardize
гра́зкі, -ая, -ае — muddy
  гра́зкая дарога — muddy road
грамада́, -ы́ (f.) — crowd; band; community
  жыць **грамадою** — to live in community
грама́дзкасьць, -і (f.) — community, public; public opinion
грама́дзкі, -ая, -ае — public, social
  г-ая собскасьць — public property
  грама́дзкія навýкі — social sciences
  грама́дзкае жыцьцё — public life
  грама́дзкая пра́ца/дзе́йнасьць — public activities

грама́дзтва, -а (n.) society
грамадзя́нін, -а (m.) citizen
грамадзя́нка, -і (f.) citizen
грамадзя́нства, -а (n.) citizenship
гра́мата, -ы (f.) charter, deed; reading and writing
вучы́цца гра́маты to learn to read and write
графі́ць (II), **графлю́, -фі́ш, -я́ць** to rule (make lines)
графі́чна [illegible]ghically
грашаві́ты noneyed, having a lot of money
[illegible] man of means, moneyed man
[illegible] terrible
[illegible]
[illegible] terrible
грозьба́, -ы (f.) threat, menace
грубія́нскі, -ая, -ае ill-bred; impolite, rude
грубія́н, -а (m.) ill-bred man
грубія́нскія словы impolite/rude uncivil words
гругá́н, -а́ (m.) raven
грузаві́к, -а́ (m.) truck
грузі́цца (II), **гружу́ся, -зі́шся, -яцца** to embark
грузі́ць (II), **гружу́, гру́зіш, -яць** to load (on); to embark (people)
груката́ць (I), **грукачу́, -кочаш, -уць** to knock, make a noise; crash, roar
грунтоўны, -ая, -ае basic
гру́па, -ы (f.) group; grade (in school)
грыбны́, -а́я, -ое mushroom (adj.)
грыбны́ суп mushroom soup
гры́ва, -ы (f.) mane
грыва́стая галава́ head with a mane
грымоты, -аў (pl. only) thunder
грып, -а (f.) influenza, (colloq.) flu
ён ма́е **грып** he has the flu
грэбаваць (I), **грэбую, -еш, -юць** (+instr.) to despise; be squeamish about
грэбаваць кім to despise smb.
грэбаваць чым to be squeamish about
грэблівы, -ая, -ае squeamish
грэх, -у or **граху́** (m.) sin
грэцца (I), **грэюся, -ешся, -юцца** to warm oneself
грэцца на сонцы to bask in the sun
губа́, -ы́ (f.) lip
гу́ба or **гу́бы** (pl.) lips
губля́цца (I), **губля́юся, -ешся, -юцца** to lose one's presence of mind
ня губля́цца ў бядзе not to lose one's presence of mind in trouble
губля́ць (I), **губля́ю, -еш, -юць** to lose
губны́, -а́я, -ое lip (adj.)
губны́ зы́чны (gram.) labial consonant
губэрна́тар, -а (m.) governor
гуд, -у (m.) drone
гудзе́ньне, -я (n.) buzzing, hooting, toot, honk
гудок, -дка́ (m.) hooter, whistle, horn
гуж, -а́ (m.) tug (at a horse collar)
гуле́ц, -льца́ (m.) player
гульта́й, -ая́ (m.) lazy person/bones; idl
гу́ма, -ы (f.) rubber
гумані́сты, -ага (m.) humanist
гумані́стыка, -і (f.) humanities
гуманісты́чны, -ая, -ае humanities (adj.)
гума́нны, -ая, -ае humane
гумарысты́чны, -ая, -ае humoristic, comic
гу́мка, -і (f.) elastic, rubber band; eraser
гумовы, -ая, -ае rubber (adj.), rubbery
гумовыя боты rubber boots
гу́рба, -ы (f.) snow-drift; crowd
гурт, -у (m.) crowd, bunch; flock, herd
гуртава́цца (I), **гуртую́ся, -ешся, -юцца** to unite
гу́ртам, гуртом (adv.) together, jointly
гуртовы, -ая, -ае wholesale (adj.)
гу́ста (adv.) thickly, densely
гу́ста пасе́яць to sow densely
г. замясі́ць це́ста to make thick dough
гу́сьлі, -яў (pl. only) psaltery
гусьці́ (I), **гуду́, -е́ш, -у́ць** to buzz; to hoot
камары́ **гуду́ць** mosquitoes are buzzin
самалёт **гудзе́** the plane is droning
гу́тарка, -і (f.) conversation; speech, talk; discussion, debate; interview

ня можа быць **гу́таркі** it is out of the question
пра гэта
гу́таркавы, -ая, -ае colloquial
гу́чны, -ая, -ае resounding, sonorous
гу́чны голас sonorous/rich voice
гу́чны/санорны зы́чны sonant (gram.)
гушча́р, -у (m.) thicket
лясны́ **гушча́р** thick forest
гэкта́р, -а (m.) hectare
гэрцаг пру́скі duke of Prussia
гэрэты́чны, -ая, -ае heretical
гэтак (adv.) so; in this manner; thus; like this, as follows
і **гэтак** дале́й (іг.д.) etc.
гэтак стра́шна so terrible
ён адказа́ў **гэтак:...** he answered as follows...
гэткі, -ая, -ае such

Д

дабрадзе́й, -дзе́я (m.) benefactor; philanthropist
дабраду́шны, -ая, -ае kind-hearted, good-natured
дабра́нач! Good night!
дабрая́касны, -ая, -ае of good quality
дабро, -а́ (n.) good, benefit; belongings, property
жада́ць каму́ **дабра́** to wish smb. well
для агу́льнага **дабра́** for the common benefit/good
дабудзі́цца (II) (pf.) fut. **дабуджу́ся, -і́шся, -яцца** to manage to wake up/rouse
дава́цца (I), **даю́ся, -е́шся, -ю́цца** to let, allow
лёгка **дава́цца** to come easy
не **дава́цца** to evade, dodge
дава́ць (I), **даю́, -е́ш, -ю́ць** to give; let, allow
яму́ не **дава́лі** гаварыць they did not let him speak
дава́й(це) гуля́ць let us play
даве́дка, -і (f.) information, reference; certificate, mid-term (school) report
даве́р, -у (m.) confidence
мець **даве́р** (да + gen.) to have faith/confidence in; to trust
даве́сьці не́шта да канца́ to complete smth., carry smth. through
даве́сьціся (I) (pf. of **даводзіцца**, II) to happen; have to; have occasion/opportunity
мне **давялося** йсьці a) I happened to walk, b) I had to go
мне не **даводзілася** ба́чыць... I did not have the opportunity to see
дагары́ (adv.) up
дагары́ нага́мі upside down
дном **дагары́** upside down
дагістары́чны час prehistoric times
дагле́джаны, -ая, -ае looked after
дагле́дзець (II) (pf. of **даглядаць**, I), fut. **-гле́джу, -дзіш, -яць** to look after, nurse, attend
даглядаць (I), **-да́ю, -еш, -юць** to look after
дагэтуль (adv.) up to here
дадава́ць (I), **-даю́, -е́ш, -ю́ць** to give; to add
дада́ны, -ая, -ае (part.) added; subordinate (gram.)
д-ы сказ мэты, ча́су subordinate clause of purpose, time
дадатковы, -ая, -ае additional, supplementary
дада́ць (irr.) (pf. of **дава́ць**, I), fut. **-да́м, -дасі́, -даду́ць** to give; to add
да́дзены, -ая, -ае (part.) given; present
дадолу (adv.) down
дажджаны́ or **дажджавы́, -а́я, -ое** rain (adj.)
д-а́я вада́ rain water
дажджы́сты or **дажджлі́вы, -ая, -ае** rainy
д-ае надвор'е rainy weather
дажы́ць (I) (pf. of **дажыва́ць**), fut. **-жыву́, -е́ш, -у́ць** to survive
дазна́ць (I), (pf. of **дазнава́ць**), fut. **-зна́ю, -еш, -юць** to endure, undergo; experience
дакара́ць (I), **-ра́ю, -еш, -юць** to reproach, rebuke

дакары́ць (II) (pf. of **дакара́ць**, I), fut. **-ру́, дакорыш, -аць** — to reproach, rebuke

дакла́д, -у (m.) — report; lecture

дакладна́ць (I), **-да́ю, -еш, -юць** — to add, report on; announce

[illegible] — exactly, precisely; punctually

дакла́дна а пя́тай гадзі[illegible] — at five (o'clock) sharp

[illegible] — exact, precise

дакла́дчык, -а (m.) — speaker, lecturer

дакла́сьці (I) (pf. of да-[illegible]) — to add; to report (on)

[illegible]

закончыць (II) (pf. of [illegible]) — to end, finish

дакор, -у (m.) — reproach

[illegible] — reproachfully, reprovingly

дакрану́цца (I) (pf. of **дакрана́цца**), fut. **-ну́ся, -не́шся, -ну́цца** — to touch

дактара́т, -у (m.) — degree of doctor, doctorate

дакуча́ць (I), **-ча́ю, -еш, -юць** — to harass, trouble

даку́члівы or даку́чны, -ая, -ае — bothersome, bothering, tiresome, annoying

далажы́ць (II) (pf. of **дакладна́ць**, I), fut. **-лажу́, -ложыш, -аць** — see **дакла́сьці**

дале́йшы, -ая, -ае — farther

далёкі, -ая, -ае — distant, remote; long

далёкія краі — distant lands

далёкая мінýўшчына — remote/distant past

далёкая дарога — long way

далібог — honestly, I swear

далічы́ць (II) (pf. of **далічваць**, I), fut. **-лічу́, -ыш, -аць** — to finish counting, to count

далічы́м грошы — we shall finish counting the money

далічы́ць да сотні — to count to a hundred

далонька, -і (f.) (dim. of **даланя́**) — palm

далуча́ць (I), **-ча́ю, -еш, -юць** — to join, add

далучы́ць (II) (pf. of **далуча́ць**, I), fut. **-лучу́, -ыш, -аць** — to add, join

далучы́цца (II) (pf. of **далуча́цца**, I), fut. **-чу́ся, -ышся, -ацца** — to join

даля́р, -а (m.) — dollar

дамовіцца (II) (pf. of **дамаўля́цца**, I), fut. **-моўлюся, -вішся, -яцца** — to agree; arrange, settle

дамэтны, -ая, -ае — expedient, suitable, advisable

данізу (adv.) — down

Да́нія,-і (f.) — Denmark

да́ны, -ая, -ае (part.) — see **да́дзены**

дапамагчы́ (I) (pf. of **дапамага́ць**), fut. **-магу́, -можаш, -гуць** — to help

дапаўне́ньне, -я (n.) — addition, supplement; object (gram.)

простае д. — direct object

ускоснае д. — indirect object

дапіса́ць (I) (pf. of **дапі́сваць**), fut. **-пішу́, -аш, -уць** — to finish writing, to write/add to

дапіса́ць ліст — to finish writing a letter

да прыме́тнікаў д. назоўнікі — to write/add the nouns to the adjectives

дапі́сваць (I), **-ваю, -еш, -юць** — to finish writing; to write, add

дапоўніць (II) (pf. of **дапаўня́ць**, I), fut. **-поўню, -ніш, -яць** — to supplement

дапусьці́ць (II) (pf. of **дапушча́ць**, I), fut. **дапушчу́, -сьціш, -яць** — to admit; allow, tolerate; assume, suppose

не д. да +gen. — to bar from

дапусьце́м or дапусьце́ма — let us assume/suppose

дапушча́цца (I), **-пушча́ецца, -юцца** — to be admissible

дапушча́льны, -ая, -ае — admissible

дапушча́ць (I), **-ча́ю, -еш, -юць** — to admit, allow, tolerate

дапушча́ць да экза́мену — to admit to an examination

гэтага не́льга д. — it can not be allowed
дапыта́цца (I) (pf. of **дапы́твацца**), fut. **-та́юся, -ешся, -юцца** — to find out (by inquiring)
дапы́твацца (I), **-ваюся, -ешся, -юцца** — to inquire
дапы́тліва (adv.) — inquisitively
дар, -у (m.) — gift
дарагоўля, -і (f.) — see **даражыня́**
даражыня́, -і (f.) — high prices/cost of living
даражэнькі, -ая, -ае (term of endearment of **дарагі́**) — dear, beloved (sometimes merely polite or ironical)
дарма́ (adv.) — in vain
дарога, -і (f.) — road, way
у дарозе — on the way
дарожка, -і (f.) — small/narrow road
дарожны, -ая, -ае — road (adj.); travelling
дарожны знак — road sign
дарожная вопратка — travelling dress
дарослая, -ае (f.) — adult/grown up
дарослы, -ага (m.) — adult/grown up
даручэньне, -я (n.) — commission, assignment; instruction; message
перада́ць д. — to deliver an instruction, a message
дарыхтава́цца (I) (pf. of **рыхтава́цца**), fut. **дарыхту́юся, -ешся, -юцца** — to prepare oneself
дарыхтава́ць (I) (pf. of **рыхтава́ць**), fut. **-рыхту́ю, -еш, -юць** — to make ready, to prepare
дары́ць (II), **дару́**, **дорыш, дораць** (каго чым) — to present
дарэмна (adv.) — in vain
дарэмны, -ая, -ае — vain
даскана́льны, -ая, -ае — perfect, excellent
даслоўны, -ая, -ае — literal, word for word
д-ае зна́чаньне — literal meaning/sense
дастава́ць (I), **дастаю́, -е́ш, -ю́ць** — to receive, get; reach; get out
доста́тны, -ая, -ае — sufficient
доста́ць (I) (pf. of **дастава́ць**), fut. **-ста́ну, -еш, -уць** — see **дастава́ць**

доста́ча, -ы (f.) — wealth
дастача́ньне, -я (n.) — delivery
дастача́ць (I), **-ча́ю, -еш, -юць** — to deliver, supply
доста́чыць (II) (pf. of **дастача́ць**, I), fut. **-ста́чу, -ыш, -аць** — to deliver, supply
досту́пны, -ая, -ае — accessible; available, open; simple, [illegible] understood, [illegible] approachable [illegible] person
досту́пныя [illegible] — reasonable, moderate prices
[illegible] (part.) — explored
[illegible] — explorer
[illegible] — researcher
[illegible] — research
досю́ль (adv.) — up to here
да́та, -ы (f.) — date
датарнава́цца (I) (pf. of **датарноўвацца**), fut. **-ну́юся, -ешся, -юцца** — to adapt adjust oneself
датарнава́ць (I) (pf. of **датарноўваць**), **-ну́ю, -еш, -юць** — to adjust
датуль, пакуль (conjunc.) — until
даты́чыць (II), **-ты́чу, -ыш, -аць** — to apply
гэтае пра́віла да ўсіх даты́чыць — this rule applies to all

даўгаве́чны, -ая, -ае — long living; long lasting
даўганосы, -ая, -ае — long-nosed
Даўгое возера — Lake Dowhoe
даўжыня́, -і (f.) — length
да́ўкі́, -ая, -ае — astringent
даўне́й (adv.) — in former times
даўне́йшы, -ая, -ае — old, ancient, bygone; previous, former
даўне́йшыя часы́ — old/bygone times
даўне́йшы плян — previous plan
даўны́м-даўно (adv.) — very long ago, long long ago

дах, -у (m.) — roof
даць (irr.) (pf. of **дава́ць**, I), fut. **дам, дасі́, -ду́ць** — to give; let, allow

не далі́ паспа́ць — (they) did not let (me) sleep

даць каму́-н. добра — to beat hit smb.
дачака́ць (I) (=дачака́цца), fut. **-чака́ю-(ся), -еш(ся), -юць (юцца)** — to wait till

дачу́шка, -і (f.) — little daughter/girl
дачыне́ньне, -я (n.) — relation; connection; respect; ratio (math.)

у д-ні [illegible] — in relation to him
[illegible] — in this respect

дачыта́ць (I) (pt. of да-чыта́ць) **-ыта́ю, -еш, -юць** (да+gen.) — to read to/ as far as
[illegible] — to read to the end (to the middle)

дачы́тваць (I), **-ваю, -еш, -юць** — to read to/as far as

дашчэ́нту (adv.) — completely
дба́йна (adv.) — carefully
дба́йны, -ая, -ае — thoughtful; diligent
дванаццаты, -ая, -ае — twelfth
д-га сакавіка́ — the twelfth of March
дванаццатая балона — page twelve
адна́ **дванаццатая** — one-twelfth
дваццаты, -ая, -ае — twentieth
дваццатага лі́пеня — the twentieth of July
дваццаты разьдзе́л — chapter twenty
два́ццаць адзі́н (два) — twenty-one (-two)
двое (coll. num.) — two
нас **двое** — there are two of us
для **дваі́х** дзяце́й — for two children
двойчы (adv.) — twice, doubly; two times
двойчы пяць — two times five, two fives
двор, двара́ (m.) — yard; outdoors; court; estate

на **двары́** от **дварэ** — outside, out of doors
на **дварэ** мароз — it is freezing out of doors

на **двары́** вясна́ — spring has come
двукроп'е, -я (n.) — colon
дву(х)гадзі́нны, -ая, -ае — two-hour
д-ая работа — two-hour job
дву(х)гадовы, -ая, -ае — two-year, two-year-old; biennial

д-ы хлопчык — two-year-old boy
д-ая сустрэча — biennial convention

дву(х)даляровы, -ая, -ае — two-dollar
д-ы банкнот — two-dollar bill
дву(х)ме́сячны, -ая, -ае — two-month
д-ыя вака́цыі — two-month holiday
д-ае кацянё — two-month-old kitten
дву(х)паве́рхавы, -ая, -ае — two-storied

дву(х)сотны or **дву(х)соты, -ая, -ае** — two-hundredth
д-ы ну́мар — number two hundred
двухсотныя ўгодкі — two-hundredth/bicentennial anniversary

дву(х)ты́сячны or **дзьвюхтысячны, -ая, -ае** — two-thousandth
джгаць (I), **-а́е, -юць** — to sting
джу́нглі, -яў (pl. only) — jungle
дзевятна́ццаты, -ая, -ае — nineteenth
дзевятна́ццатага лю́тага — the nineteenth of February, February the nineteenth

дз-ты радок — line nineteen
дзевяцёра (coll. num.) — nine
іх **дзевяцёра** — there are nine of them
для ўсіх **дзевяцярох** — for all nine
дзе́вяцьдзесят, -цёх — ninety
дз. даля́раў — ninety dollars
дз. адзі́н і г.д. — ninety-one, etc.
дзевяцьдзяся́ты, -ая, -ае — ninetieth
дз-ая балона — page ninety
дзевяцьма́ (adv.) — nine times
дзевяцьма́ дзе́вяць — nine times nine, nine nines
дзевяцьсот — nine hundred
дзевяцьсотны or **дзевяцьсоты, -ая, -ае** — nine-hundredth
дзевяцьсотны ну́мар — number nine hundred
дзевяцьсотны год — the year nine hundred
дз-ыя ўгодкі — nine-hundredth anniversary

дзе́іць (I), **дзе́ю, -еш, -юць** — to act
дзе́йнасьць, -і (f.) — activity, action
дзе́йнік, -а (m.) — subject (gram.); factor
дзе́йны, -ая, -ае — active
дзе́йны стан — active voice
дзе́ліва, -а (n.) — dividend (math.)
дзель, -і (f.) — quotient

дзе́льнік, -а (m.) divisor
дзе-не́будзь (adv.) somewhere; anywhere
дзе-ні-дзе́ or **дзе-нідзе́** here and there
дзе́рава or **дрэва, -а** tree; wood
дзе́сь(ці) (adv.) somewhere
дзесяток, -тка́ (m.) ten (noun)
дзесяток гадоў ten years
дзесяцёра (coll. num.) ten
іх дзесяцёра there are ten of them
з усіх дзесяцярох/ дзесяцёра from all ten

дзесяцігадовы, -ая, -ае ten-year, of ten years
дз-гадовы хлопчык a boy of ten, a ten-year-old boy
дзесяцьма́ (adv.) ten times
дзесяцьма́ дзе́сяць ten times ten, ten tens
дзе́тка, -і (f.) child
скажы́, дзе́тка tell me, my child
дзе́ўка, -і (f.) maid, girl
дзе́ці, дзяце́й (pl. of **дзіця́**) children

дзе́яньне, -я (n.) action, activity; operation
чаты́ры арытмэты́чныя дзе́яньні (math) the four rules of arithmetic
дзе́япрыме́тнік, -а (m.) participle
дзе́япрыслоўе, -я (n.) verbal adverb
дзе́яч, -а (m.) worker
грама́дзкі, культу́рны дзе́яч public, cultural worker

дзёньнік, -а (m.) diary
